ЛІМАЎСКІ ФАЛЬВАРАК

Андрэй ФЕДАРЭНКА

# Мяжа



*Лімаўскі фальварак*

Андрэй ФЕДАРЭНКА

# Мяжа

*Раман-эсэ, апавяданні*

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2011

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
Ф32

*Серыя заснавана ў 2007 годзе*

**Федарэнка, А. М.**

Ф32 Мяжа : раман-эсэ, апавяданні / А. М. Федарэнка. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. — 264 с. — (Лімаўскі фальварак).

ISBN 978-985-6994-07-7.

Новую кнігу Андрэя Федарэнкі склаў аўтабіяграфічны раман «Мяжа», а таксама выбраныя лепшыя апавяданні, якія ўпершыню выходзяць пад адной вокладкай. Раман-эсэ «Мяжа» пасля часопіснай публікацыі стаўся, паводле шматлікіх выказванняў крытыкі, з'явай у беларускай прозе. У творы выяўляецца своеасаблівае ўспрыманне рэчаіснасці галоўным героем, абвостранае пачуццё справядлівасці і прыгажосці.

**УДК 821.161.3-31**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-6994-07-7**

© Федарэнка А. М., 2011
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2011

# Раман-эссэ



# ЧАСТКА ПЕРШАЯ

## 1. «Хвабула»

Звоніць аднойчы Анатоль Сыс, раніцаю, гадзін у сем, і плача так, што ў мяне на другім канцы тэлефонная трубка мокрая:

— Чуеш, Андруша, хачу пісаць раман на (...), дык трэба хвабула! Мы ў Анатоля Жука, а ён расказвае мне эпілёг на (...)! А на (...) мацеры мне твой эпілёг, калі я прашу ў цябе хвабулу?!

І плача — раўчуком цячэ!

Так і я цяпер. Сабраўся пісаць раман, матэрыялу мора, нават «эпілёг» праглядваецца — а вось «хвабула»...

## 2. Сорак пяць

У «ЛіМе» загаловак артыкула пра Максіма Гарэцкага: «Без тыдня 45 гадоў».

І ўбачыўся мне масіўны, грунтоўна ўкапаны паласаты пагранічны слуп з лічбай «45» у прыбітым на ім бляшаным квадрацiку.

І ўспомнілася мне, як некалі горача і шчыра прасіў Бога даць дажыць хаця б да сарака...

І захацелася мне стаць пад гэтым слупам і азірнуцца на сваё жыццё, як дакаціўся да яго, як дайшоў да гэтай мяжы, маючы ўсе шансы не пражыць і палавіны.

Сорак пяць... Сур'ёзная лічба. Крытычная, небяспечная мяжа. З ёю не пажартуеш. Не па мне былі, хто гэтай мяжы нават не перасёк, — першыя імёны, якія прыходзяць у галаву: Чэхаў, Мапасан... Шукшын? І Шукшын. Зрэшты, хіба ў нас сваіх не хапае? Палуян, Багдановіч, Калюга... І тыя, хто дасягнуў гэтага слупа і проста на памежжы, на пагранічнай паласе зваліўся: Чорны, Гарэцкі... І тыя, хто ненамнога яе перасягнуў: Сыс, Пісьмянкоў, Асташонак... І яшчэ лічанае-нязлічанае мноства загінуўшых сваёй і не сваёй смерцю,

якія не дапалі не тое што да 45, а да 30 і нават менш (чытайце кнігі-мартыралогі Л. Маракова).

...Колькі талентаў звялося,
Колькі іх і дзе ляжыць
Невядомых, непрызнаных,
Не аплаканых нікім,
Толькі ў полі адспяваных
Ветру посвістам пустым!

Так што проста фізічна дажыць да гэтай лічбы — хаця б дзеля таго, каб мець магчымасць і гонар упісаць яе ў анкету, назваць у паліклініцы ці, не дай Бог, у аддзяленні міліцыі — гэта, скажу вам, ужо маленькі подзвіг.

Але вось ён здзейснены. І пазіраеш ты яшчэ на свет Божы, і топчаш пакуль гэтую зямлю, і трэба неяк апраўдваць сваё тут існаванне.

Карацей: заступіўшы адной нагой на мяжу са слупам з лічбаю «45», адчуў я цягу да падрахункаў, чысткі, рэвізіі — у галаве, у жыцці, у літаратуры, пачаў перабіраць, пераглядаць папкі з рэалізаваным і нерэалізаваным, розныя канспекты, планы, чарнавікі, пісьмы, дзённікі, скідваць сёе-тое на камп'ютар, не надта задумваючыся, навошта.

І са здзіўленнем убачыў, колькі ж многа ўсяго. Аповесці, раманы, абрыўкі апавяданняў, п'есы, сцэнарыі, проста думкі... На белай фінскай і таннай жоўценькай паперах, на сурвэтках, «манжэтах», на пачках з-пад цыгарэт, у рознакаліберных бедных нататнічках і дарагіх тоўстых арганайзарах...

І з горыччу адчуў, што не ведаю, якое знайсці гэтаму прымяненне.

А то яшчэ сумны прыклад некаторых з калег. Набачыўся я за сваё рэдактарства такога дабра. Да 45–50 гадоў пісьменнік набывае ўжо, як правіла, нейкае імя, а таксама нейкую пасаду, г. зн. робіцца недасягальным для крытыкі (і, сам таго не разумеючы, для чытача), і вось аднойчы надумваецца і дастае з антрэсоляў запыленыя, з выцвілымі чарніламі студэнцкія, ледзь не школьныя сшыткі, набірае на камп'ютары і, як правільна напісана ў геніяльнай паэме, увесь гэты цяп-ляп прэ ў друк. Разлік просты: сярод мора пошлай, левай нагой намаханай прадукцыі навошта выкладвацца, цяпер што ні напішы, пойдзе, а калі яшчэ без граматычных памылак, ды з мінімальным веданнем законаў жанру — з радасцю надрукуецца, а надрукаваўшыся, і пачытаецца, і пахваліцца...

Вось што мяне напачатку не тое што ахалоджвала, а бянтэжыла. І рваць, нішчыць шкада. Напрыклад:

## 2(а). Круці не круці, а трэба памярці

Чым больш жывеш, думаеш, чытаеш, тым большае жаданне абагульняць.

Яшчэ адзін мастацкі твор. Яшчэ адно прозвішча героя, партрэт яго, імя па бацьку — «Іван Мікалаевіч быў...», апісанне твару, рук, ног, хады, адзення, асаблівасцей размовы... Яшчэ адзін малюнак прыроды з небам, сонцам, парой года. Яшчэ адна гісторыя, якую сам аўтар у тым ці іншым варыянце перажыў; яшчэ адно каханне да жанчыны, шчаслівае або не, узаемнае або без...

Аўтар піша, абагульняючы такім чынам, каб іншаму — чытачу — можна было ўспомніць сваё і параўнаць. Аўтар нібы кажа: «У цябе, мой незнаёмец, не было вольнага часу заўважыць усё гэта, а жыццё такое кароткае, хуткаплыннае, і трэба радавацца кожнай хвіліне яго, навучыцца любіць, цаніць моманты яго... Вось ты, мой чытач, праходзіш кожны раз і не заўважаеш, напр., малюнкі прыроды, а я паказваю табе іх; заўваж і ты, і парадуемся разам! Тысяча драбязы, якая робіць жыццё больш радасным, больш поўным, хвалюючым — дык навучыся разам са мною (калі ў цябе няма часу ці ўмення) заўважаць гэтыя драбніцы, адкрываць іх у будзённым, і тады жыць стане элементарна цікавей».

Так тлумачыць аўтар, апраўдваючы сваю паўтаральнасць. «Я ведаю, што мільён разоў да мяне апісвалася вясна і каханне вясною да жанчыны, але я апішу гэта ў мільён першы раз».

«Гісторый — асноўных літаратурных сюжэтаў — усяго чатыры», Борхес.

«За сваё доўгае жыццё я зрабіў высновы наконт самых бясспрэчных ісцін і наконт магчымасці паўтараць гэтыя ісціны без усялякай рызыкі», Бунін.

Выдатна. Аўтар, калі ён разумны чалавек, ведае, што не скажа, па вялікім рахунку, ніякай новай думкі. Яму застаецца толькі паўтараць. І тады якая розніца: ці ахутваць паўтаральнасць арэолам г. зв. мастацкасці, разбаўляць сваімі ўласнымі ўспамінамі, ці проста пісаць эпізоды з уласнага жыцця, або стараючыся рабіць з гэтага нейкія высновы (ведаючы, што ніякай новай не зробіш), або наогул не рабіць іх, а проста падаваць кароткімі кавалкамі, — галоўнае, каб чытач ухапіў гэты кавалак вокам, затрымаўся на ім...

*

...Пісалася гадоў 15 назад, прадвесніцай «Сечкі». Шкада знішчаць? Шкада. Як выкарыстаць? Не ведаю.

Бедныя мы, літаратары, людзі. Безабаронныя, аголеныя, якія тое і робяць, што падстаўляюцца, і глыбока яны няшчасныя, бо няма ў іх нічога асабістага — усё напаказ, як, выбачайце, у публічнай дзеўкі.

Всё на месте, все при деле,
И торгует всяк собой:
Проститутка — статным телом,
Я — талантом и душой...

Ты можаш з горкай зайздрасцю толькі назіраць чужое жыццё, амаль не прымаючы ў ім ўдзелу. Людзі вакол жывуць — ты адлюстроўваеш гэтае жыццё, усё піхаеш, усё ўкладаеш, як пракляты, самае лепшае сваё ў нейкі беспрацэнтны, банкрутны банк — без надзеі на аддачу...

І ўсё ж настае момант, толькі трэба яго дачакацца, фізічна дажыць да яго, калі літаратура пачынае не толькі браць, а і аддаваць. Па чым гэта пазнаецца? Па рэакцыі людзей. Настае момант, калі спыняецца бег, які заключаўся ў пашырэнні, накапленні і павелічэнні матэрыяльнага: кватэра на большую, дача на бліжнюю, машына на даражэйшую... І вось раптам заўважаецца жоўты кляновы ліст пад нагамі... І ўспамінаецца іншая восень... І замаруджваюцца крокі... І думка — ці не ўпершыню ў жыцці — а засталося ж менш, чым прайшло! Круці не круці, а трэба памярці... «Холодильник, рыдая, за гробом твоим не пойдёт»...

Вось гэта і ёсць вышняя ўзнагарода літаратару-аўтару — калі тое, што так часта праклінаў: ну чаму, чаму не такі як усе?! — пачынае адкрывацца ў іншым святле.

## 3. Пахілае дрэва

У 40 гадоў чалавек або сам сабе доктар, або проста дурань.

Слабае, пахілае дрэва даўжэй рыпіць. Шукшын ці Сыс са сваім магутным здароўем маглі за пару дзён, жартуючы, намахаць чарговы шэдэўр, а потым два тыдні гуляць — хадзі хата, хадзі печ...

А чаму? Здароўе дазваляла. Як мне да 30 гадоў. Калі думаў (як усе мы ў нашую маладую бесклапотную пару), што мне зносу не будзе. Да абеду — раман, аповесць, п’еса, сцэнарый, пасля абеду — рэдакцыя, работа з аўтарамі (і ўсё паспяваеш: і сваё напісаць, і чужое адрэдагаваць), увечары — кавярня, сябры, чаркі-шкваркі, літаратурныя (дурныя) спрэчкі, цераз раз таксоўка, бо ногі не трымаюць,

а наступнай раніцай, толькі крышку моршчачыся! — за стол, за ручку, да паперы...

Дай мне цяпер такі рэжым, ад мяне на першую ж раніцу мокрага месца не застанецца.

А ці не прасцей, не разумней з большым толкам разлічваць свае сілы? Два месяцы, а то і два гады пісаць апавяданне, а там ужо, так і быць, гульнуць — дазволіць сабе ажно паўшклянкі чырвонага віна?

*

На сваім «рэдактарскім пасту» часта даводзіцца задаваць аўтарам пытанне: дзеля чаго, нашто гэта пішацца?

І часта чуць у адказ: не ведаю і ведаць не хачу, на тое ёсць крытыка; пачытаю і сам даведаюся, што я хацеў сказаць.

Дык вось, каб не прыпадабняцца такім — увесь час, з настойлівасцю, нават з настырнасцю будзем вяртацца да пытання:

— Якая мэта нашага рамана?

Яна пакуль такая: чалавек можа хоць крышку ўплываць на свой лёс, карэкціраваць, рэдагаваць яго? Ён можа, нават не маючы моцнага здароўя, пры пэўным раскладзе, пры пэўных адносінах да сябе хоць трохі падоўжыць свой век?

## 4. Смерці няма?

Калі ўспамінаю сябе чатырох-, трох-, асабліва двухгадовага — чым далей туды, да нараджэння, тым робіцца больш жудасна: вісіш як на валасінцы, як маятнік гайдаецца: усведамленне таго, што навокал — назад, у цемру «да-нараджэння». Гады ў два гэта пачалося. Клыпаю-бягу некуды, зямля такая блізкая, трава такая высокая, сонейка такое вялікае — і раптам думка: я жыву, існую, ВЯРНУЎСЯ, я зноў ГЭТА бачу, а яшчэ зусім нядаўна так баяўся паміраць, будучы ўпэўненым, што гэта небыццё, тлен, чарната... Нічога, аказваецца, падобнага! І жаданне затрымаць гэты свет і гэтае святло фізічна, ручкамі ў яго ўчапіцца, распластацца, упасці, не даць зямлі выкруціцца з-пад сябе... І звон у галаве, і правал у памяці, і зноў нечалавечы страх смерці і небыцця — вяртанне ў той кашмар, які суправаджаў усё ПАПЯРЭДНЯЕ жыццё, асабліва апошні яго перыяд.

Спатыкаюся, падаю, стукаюся аб цвёрдую зямлю, раву-захліпваюся на ўвесь двор, але не ад болю, не ад крыві, што льецца з носа — ад жаху вяртання ў гэтае новае жыццё, якое таксама будзе

захінута ценем смерці, у якім таксама ў канцы давядзецца паміраць... Я раву ад жудасці, што хутка забуду (я ведаю) гэты боскі перыяд — пераход з аднаго жыцця ў другое.

Потым часы вяртання назад, у амаль небыццё, у пячорны стан, пайшлі радзей, праблiскі шырыліся, большалі і разам з жахам вяртання назад, правaламі ў цемру я пакрысе пачынаў асвойтвацца ў гэтым новым-старым свеце, прывыкаючы да яго — прывыкаючы і да таго, што ён у чарговы (каторы па ліку?) раз скончыцца.

Відаць, такое ж адчуванне ў вар'ятаў: пробліск, жаданне ўтрымаць, жудасць, што ўтрымаць немагчыма, што зямля пад нагамі сплывае, і — правал назад, у цемру, у кашу ў галаве.

Два хлопчыкі так міла гуляюць, шчабечуць, раптам адзін ні з таго ні з сяго разбягаецца — у лужыну скок, абпырскаў нядаўняга сябрука гразёй і пабег, не азіраючыся. Гэты плача, а той і невінаваты. Адбылося зацямненне, кароткае замыканне ў мазгах, «змяшэнне жанру» — пераходны стан усведамлення рэальнасці і пячорных рэфлексаў.

## 5. Хлеб

Ранняя вясна. Сонныя пчолы, лёд і снег. І гісторыя пра чырвоную лотаць — як у школе задалі заданне намаляваць гэтую раннюю кветку, а ў дзяўчынкі не аказалася жоўтага алоўка, і сяброўка ёй свой пашкадавала, і давялося карыстацца чырвоным — усё роўна яе лотаць атрымалася лепшаю. Выдатнае апавяданне, з падтэкстам: мастацтва не ёсць фатаграфія.

Высыпалі на поплаў, на сонейка. Расквашаная зямля, у футбол гуляць рана, ды і малыя яшчэ — па 5–6 гадкоў нам. Гуляем у разведчыкаў. Адзін дурань, наслухаўшыся сваіх «багатых» бацькоў (дзве каровы ў іх), пагарджае намі, «беднымі». Ён хоць і гуляе цераз сілу, але ўсё плявузгае: хэ, разведчыкі, рабіць няма чаго, работу рабіць трэба... Нам па 5–6 гадоў, паўтаруся.

Цяпер гэта дарослае дурыла, двое дзяцей у яго і ўсе іншыя, неабходныя для такіх рабацяг кампаненты; завуць яго, смела пішу — Адам — бо ніколі ён гэтых слоў не пачытае, тут мы, беларускія пісьменнікі, у выйгрышы, можам пісаць пра сваіх блізкіх, знаёмых, суседзяў без асаблівай рызыкі быць выкрытымі.

Нехта з «нашых» трапляе ў палон, трэба перадаць яму ежу праз адзіную сярод нас дзяўчынку, «падпольшчыцу» Нату. Я выношу з дому лусту хлеба, добры кусман; хлеб свежы, мяккі, цёплы —

рукі грэе — пахучы... Раптам стрымгалоў гэтае дурыла, гэты Адам кідаецца да мяне, выхоплівае хлеб і:

— В-в-в-в! — круцячы правай рукою, нібы газу паддае ў матацыкле, уцякае па вуліцы з незвычайнай хуткасцю.

## 6. Стрыечны брат

Чаму адно так убіваецца ў сякір-башку, чаму адны ўспаміны-выпадкі пракручваеш у памяці 100 разоў, а другія не ўспомняцца пад пісталетам?

Цудоўная старая мініяцюрка Брыля ў звязі з гэтым. Швэндаецца ў рэдакцыю раёнкі кабеціна з Наваградка, паэтэса з такім узорам паэзіі:

Пры Польшчы быўшы халуём —
Цяпер у «Волгі» за рулём...

І вось жа, піша Брыль, колькі класікі ведаю, колькі сапраўднай паэзіі наслухаўся ў цудоўным выкананні, а засела ж у памяць менавіта гэтае!

Другі клас. Я люблю школу, добра вучуся, бо рана ўмеў чытаць, а гэта — умець чытаць і пісаць — галоўнае, дзеля чаго нас і вучаць. Пасля ўрокаў накідваецца на мяне цэлая банда, лупяць снежкамі, нагамі, рукамі, партфелямі... Нехта абараняе, нехта крычыць: «Утапіць яго, павесіць! Скажам, што сам!»

Нарэшце адступаюцца, я ў крыві, самае жахлівае — гэта ж кожны дзень такое можа быць!

Матцы сказаў, што катаўся на лыжах з трампліна і ўпаў. Назаўтра раніцай з запечанай у носе крывёю іду ў школу. І ўсё роўна адчуваю, як соладка, вельмі моцна пахне снег. Раптам бачу наперадзе дваіх учарашніх завадатараў, адзін, канечне ж, той самы Адам.

У адчаі, упэўнены, што паўторыцца ўчарашняе, падыходжу.

— Ой, Андрушка, ты такі разумненькі...

— Не кажы настаўніцы, Вользе Савельеўне... Не скажаш?

— Ты скажы, што Сцяпан цябе біў. А мы цябе за гэта будзем хваліць, дружыць з табою...

Божа! Бываюць жа дзівы на свеце! Ды я за вас... гатовы... Як жа мне пашэнціла! Сцяпан — мой старэйшы стрыечны брат, але чаго не зробіш дзеля шчасця быць прынятым у кампанію!

Настаўніца, у якой я любімчык, глянула на маю морду і пляснула рукамі.

— Цябе што, білі ўчора? Хто?

— Сцяпан, — мармычу. Сцяпан сядзіць тут жа, пачатковыя класы, і першы і трэці, у адным памяшканні.

У Вольгі Савелеўны ад гневу твар ідзе плямамі. Яна падскоквае і лупіць непавіннага чалавека лінейкаю, рукамі...

Сцяпан плача горкімі слязьмі.

## 7. Вольнаму — воля, уратаваным — рай

Ну што? Даволі міленькія, сімпатычныя фрэскі. Мазаіка, асколкі... Нават нібыта не схаластычныя, а сістэмныя — адлежаныя ў часе, працэджаныя памяццю... Маючыя права на існаванне.

І гэта ўсё? Як у тым анекдоце, дзе п'яны міліцыянер спыняе п'янага вадзіцеля: «Чаму двое за рулём?» — «Варта з-за гэтага машыну акружаць?»

Варта дзеля гэтага столькі псаваць паперы і забіраць у сябе і ў людзей такі каштоўны, так хутка лятучы час?

Як гэтыя фрагменты скласці ў адно цэлае, каб атрымалася карціна, як знайсці кожнай фрэсцы, кожнаму фрагменту сваё месца?

Як удыхнуць у гэты кавалак гліны жыццё?

Не можа ж быць, каб рана ці позна колькасць не пачала перарастаць у якасць.

Некаторыя мініяцюры-штучкі-карацелькі пісаліся гадоў 15, нават 20 назад — і так і не пабачылі свет. Іншыя, у т. л. і вялікія апавяданні — друкаваліся, але па сённяшні дзень не выйшлі асобнай кнігаю. І ведаеце, чакаць не збіраюся, калі выйдуць, тым больш ніякіх асаблівых перспектыў на гарызонце не маячыць. Да таго ж, мой матэрыял, як хачу, так ім кручу.

Тады — далей. Прыблізна гэтак, як ёсць, форма збольшага акрэсліваецца. Уступ, падрыхтоўка, кавалачак мастацкага, абагульненне, вынік... І ўсё гэта перасыпана разважаннямі сябе цяперашняга, адступленнямі, тлумачэннямі...

Галоўнае — шырэй, глыбей, свабодней! Вольнаму воля, уратаваным рай. Раман-эсэ, гэта так здорава, нібы плыць па цячэнні на спіне, легці, раскінуць ушыркі стамлёныя рукі... Не, лепш скласці іх на грудзях і — «плыть, плыть, плыть —

Мимо могильных плит,
Мимо церковных рам,
Мимо семейных драм,
Мимо родной ветлы,

Мимо зовущих нас
Милых сиротских глаз...»

Толькі хочацца памяняць на «милых влюблённых глаз».

## 8. Кнігі

Шэсць-сем гадоў, 1–2 клас.

Кнігі са школьнай бібліятэкі (дзве паліцы ў шафе) выдаюцца нам толькі па суботах. Адна кніжачка ў рукі — на ўвесь тыдзень. Не будзем забываць, што ні тэлевізара, ні камп'ютара, ні мабільніка; кнігі — адзіная забава і ўцеха, а дзіцячы розум яшчэ такі чысты, нечапаны і так гатовы ўбіраць у сябе, насычацца, напітвацца добрым, карысным, новым...

Аднак мазгі нашы пільна ахоўваюцца. Няма чаго іх чыткаю засмечваць, «усе беды ад філалогіі» (Іянеску).

Кніжачка тоненькая, зазвычай там усяго адна казачка ці апавяданне з камарыны нос — прачытваецца на хаду, пакуль ідзеш ад школы да хаты, і да наступнай суботы літаральна вывучваецца на памяць.

У суботу, перш чым атрымаць новую брашурку, трэба расказаць змест прачытанай. Выходзім па чарзе да стала, кладзем кніжку, яна абглядваецца, ці не ставілі патэльню, ці ўсе старонкі на месцы.

— Прачытаў?

— Мгу.

— Расказвай.

«Расказвай» маецца на ўвазе менавіта перадавай слова ў слова. І не дай Бог адступіць ад аўтарскага тэксту — новай кнігі табе не відаць, забярэш старую.

— «Звери собрались на день рождения к слону. Мать-слониха испекла вкусного печенья...»

Была ў нас адна-адзіная тоўстая, у цвёрдай вокладцы кніжка, «Пастка» Сымона Баранавых, усіхняя наша мара. Але як забраў яе той самы дурань Адам, так і пратрымаў у сябе роўна год. Кожную суботу адна і тая ж камедыя — Адам выходзіць:

— Да нас прыехаў дзядзька Цімох. Маці спякла смачную яечню.

І ўсё. Два сказы. Як мы яго ненавідзелі за гэтую яечню! І як з таго часу ў нас, аднакласнікаў, доўга яшчэ крылатым выразам абазначэння тупасці было: «Усё гэта на ўзроўні «да нас прыехаў дзядзька Цімох».

Калі ж нарэшце я змог яе атрымаць, і прачытаў, мяне чакала моцнае расчараванне. Справа ў тым, што я палюбіў менавіта гэ-

тага адмоўнага героя, кулака-міраеда дзядзьку Цімоха. Ён мне так спадабаўся сваёй вясковасцю, грунтоўнасцю, беларускасцю, і так шкада было, калі яго арыштавалі органы.

## 9. Слівы

12 гадоў. Рэчка ад маёй хаты метраў пяцьдзясят. Лета. Я лаўлю таптухаю ўюноў. Валодзя, аднагодак і сябар, узахвоціўся насіць па беразе вядро. У яго сястра Ната (тая самая колішняя «падпольшчыца»), я кахаю яе, памагаю рабіць ёй урокі, мне прыемна ўсё, што з ёю звязана: кнігі, якія яна чытае, адзенне, якое яна носіць, брат Валодзя, якога яна мае...

Ловіцца слабавата, за пяць заходаў адзін-два ўюны, праўда, вялікія, з ікрою.

— Давай я буду ў двор адносіць, — кажа Валодзя. У сэнсе, будзе чамусьці насіць у мой двор.

Я тугадум, я нічога не разумею ў людской хітрасці, не разумею асалоды падману, хаця здагадваюся, што такая павінна быць.

Чаму ты хочаш насіць у двор, калі вядро ў цябе ў руках? Але насі... Раз панёс. Другі панёс, трэці — няма і няма. Я злавіў уюна, пусціў у вядро... І раптам цюкнула — ён жа ў хату лазіць! Грошы там... Увогуле, лазіць у чужую хату... Яна адкрытая, бо рэчка блізка, і хто б заходзіў у двор, відаць было б.

Іду, мокры, злы, больш таго — спалоханы крыху. Усё правільна — дзверы насцеж у веранду. Заходжу ў хату — Валодзя саскоквае з поліка, закрываючы рукамі галаву, прашмыгвае паўз мяне ў веранду, на двор, і ўцякае... На поліку — вядзерца сліў, было поўнае, цяпер — напалову пустое. Носячы ўюны, ён забягаў у хату і ласаваўся слівамі.

Сліў у тым годзе было столькі, што ламаліся галіны і дзерліся напапалам ствалы, іх, слівы, давалі бясплатна людзям, дачнікам, і ніхто браць не хацеў. Самы большы слівовы сад быў акурат у Валодзі.

## 10. «Адзін летні дзень»

РАНІЦА.

Мне — трынаццаць гадоў, і я вяртаюся з лесу з поўнай сеткаю грыбоў. Іду пожняю, паўз могілкі, і доўгім аблупленым дубцом ніжу наперадзе, разбіваю бліскучую расу і мокрае белае павуцінне.

Следам зморана цягнецца рабенькі шчанюк, сам сабе ціхенька скуголіць, але варта мне нагнуцца, каб пагладзіць яго, пішчыць і адбягае. Нават бурчыць. Ён злы на мяне: вядома, я яшчэ ў прыцемках успароў яго, маленькага, з цёплага сена ў хляве, пасля ў лесе нацкаваў яго на вожыка, аб якога ён пакалоў і лапы, і нос, а цяпер пужаю свістам дубца. Да ўсяго, ён галодны.

Наперадзе — вёска, а за могілкамі, трошкі ўлева, поўна дач. Нехта грукае там малатком, а рэха адгукаецца і за спінаю, у лесе, і наперадзе, у вёсцы, — адбіваецца ад нечае хаты. Дачы фігурыстымі церамамі раскінуліся па ўсім полі за могілкамі, пад самы лес, прыгожа паблісквацюць на сонцы сваімі разнаколернымі акенцамі, а здалёк гэты відарыс нагадвае святочны гарадскі парк з рознымі каруселямі, будачкамі-атракцыёнамі, чортавым колам і пабітым аўтобусам-цірам.

У адным з гэтых церамоў — Божа мілы, як радасна і шчасліва пра гэтае ўвесь час ведаць! — жыве такое белагаловае, адзетае ў зялёнае з чырвоным, адных са мною гадоў, але якое тварам і голасам такое падобнае на дарослую гарадскую дзяўчыну!.. Завецца яно чамусьці Анжэла, а вечарам гэтае прыгожае і белагаловае можна ўзяць за руку, прыціснуцца да яго і слухаць сур'ёзны, павучальны галасок: «Знаешь, когда парень с девушкой начинают вспоминать, как они знакомились, разные подробности или ещё что-нибудь в этом роде — у них не будет будущего...».

Я сабе пад нос спяваю:
...Нават рэхам не гукае —
Адлятае... адплывае...
Вось і следу ўжо няма.

Ужо гадзіны з тры, пакуль цягаўся па лесе, гэтае сядзіць у маёй галаве — не пачаткам ці канцоўкаю нейкага верша, а так, ад таго, што жнівеньскай раніцаю я іду дадому і пазіраю на вёску і на дачы. А можа, і не ад таго. Адзін мой сябра, Васіль, любіць падманваць дачнікаў; ён знарок залазіць у маладую бярозавую пасадку, дзе пасаромеецца расці людскі мухамор, і на ўвесь лес раве: «Ва-а-анька! Сю-у-уда! Грибы есть!» Так і крычыць, па-гарадскому. Я не хачу сказаць, што дачнікі такія ўжо дурні, але гэта ўсё ж не мясцовы люд, — і з трэскам, з перагукваннем чалавек колькі прэцца ў пасадку. А Васіль верашчыць: «Машенька-а-а! Грибов-то здесь сколь-ко!», а рэха носіць па ўсім лесе, і вось цяпер я спяваю:

...Нават рэхам не гукае —
Адлятае... адплывае...
Вось і знаку ўжо няма!

«Адлятае» — гэта нечы чужы, падсвядома запазычаны штамп: адлятае летні настрой, канікулы, «журавы ў вырай», пух з таполі, адлятае сум «белымі ніткамі-павуцінамі», хоць таполі даўно ўжо адцвілі, а да бабскага лета з журавамі і з павуцінамі — як да неба.

Мой шчанючок круціць галавою, не разумеючы, што яго грэе, і спрабуе нюхаць сонечныя промні. Можна ўявіць, як цяпер ягонаму носу, калі мой адрознівае сто пахаў! Я з усяе сілы цягну носам, захлынаюся паветрам, і робіцца, быццам нырнуў і набраў у нос вады, а ад майго лупленага арэшнікавага дубца пахне свежазламаным аерам і шчупаком... Арэшнік — вудка — вада ў носе — пах рыбы...

Паўз могілкавую агароджу растуць старыя высокія вішні; у іх цяпер ствалы з аднаго боку бліскучыя, падсушаныя сонцам, у залатых шарыках соку, а з другога — шурпатыя, мокрыя ад расы і ад туману, дык вось — вішні мне пахнуць цвёрдымі белабокімі гуркамі, свежым расолам...

Матка кладзе вішнёвыя галінкі ў бочку з гуркамі...

Пахі рэзка наплываюць, змяняюцца, я ледзь перастаўляю ногі. Шчанючок таўчэцца носам у кеда, аббягае мяне, каб ісці далей самому, але пожня драпае яму па голым жываце, спераду нічога не відно, і ён, скуголячы, падае на хвост і ліжа жывот і лапы.

Я задзіраю галаву. Неба далёкае, вымытае начным туманам і высушанае ранішнім сонцам да бела-сіні. Пахне яно сама трывожна: Анжэлаю, духамі, горадам і сном, калі лятаеш над лугам, «па якім гуляюць жанчыны і коні»... Гэтыя пахі адначасна музыка: я выразна лаўлю мелодыю, паўтараю яе вуснамі, яна гайдае мяне каруселяю...

— Ды што ж гэта такое?!

Ходырам ходзіць пад нагамі пожня, падаюць з бабак снапы, рассыпаюцца, вішні пераварочваюцца дагары... хачу падумаць усё гэтае, а гук доўга, ліпуча, нудна цягне: «Сна-а-а...», і нават «снапы» не выходзіць падумаць. Мне млосна, я апускаюся на калені лбом у пожню і нюхаю часта-часта мокрае павуцінне і зелле... Ад сэрца млявасць паўзе па грудзях, па шыі, ніжэй — у лоб. Зямля паволі выцягвае яе... знікае і мелодыя... знікае... вось і следу ўжо няма.

Тое, што было МНОЮ, узлятае ўверх і трошкі ўправа, і адсюль, зверху, цікаўна і здзіўлена глядзіць, як устае з зямлі белагаловы хлопчык, абцірае штаны, кашулю, хістаючыся на роўным полі, ідзе да хатаў, заходзіць у адну, высыпае на посцілку каля поліка грыбы, сцягвае адзін аб другі кеды і валіцца ў ложак. Ужо ні голад, ні бразганне і тупат каля печы, ні радыё, ні сакатанне куры пад саменькім акном не разбудзяць яго аж да

ПОЎДНЯ.

— ...а мо, як ты кажаш, і будзе які толк, — чуваць з меншае хаты салодзенькі матчын голас. — Ён жа вучыцца, маладзічко, на круглые пяць! Мо, Бог дасць, хоць ён куды выб'ецца...

— Маладзіцо — выб'ецца! — пераконвае матку паштальёнчын голас. — Ён жа і на алімпіяды нейкія ездзіць...

— Куды хочаш ездзіць...

Гэта пра мяне. Матка заўсёды і ўсім мяне хваліць, але мне гэта ні прыемна, ні непрыемна, а ніяк, а «так і павінна», бо такое заўсёды: сем гадоў я добра вучуся, і сем гадоў мяне хваляць — з чым параўнаць, каб уведаць, што пахвальба гэтая заслужаная, а не... ох, заблытаюся! — а не «так і павінна быць»?

Калі матка з паштальёнкаю выходзяць, я саскокваю з ложка, бягу ў меншую хату і ем маладыя смажаныя ў смятане грыбы, запіваючы халодным кісялём з малін. Выходжу на двор, за хату.

За хатаю дзядзька Сцяпан косіць на поплаўчыку атаву, а матка ходзіць следам, растрасае. Дзядзька ў керзавых чобатах, у светлых картовых штанах, з сівымі вусамі і з моцнай загарэлай лысінаю — гэта коласаўскі дзядзька Антось! Я залажу на жэрдку і сонна пазіраю. Па плоце бяжыць некуды бліскуча-попельны кот у белых панчошках, а за ім знізу скача пад'еты шчанючок — скача як заяц, лезе на ніжнюю жэрдку і зрываецца лапамі.

Ідуць касцы, звіняць іх косы,
Вітаюць іх буйныя росы...
Вялізны кот з касою ў лапах і падперазаны хвастом...

Усё, «Новая зямля» мяне цяпер не адпусціць. Гэта дзядзька вінаваты са сваімі вусамі і з чобатамі. Заплюшчыўшы вочы, я гартаю па памяці знаёмую кніжку... вось старонка з прысохлым камаром: ясна бачу кожную лапку, аднаго крыльца няма, а ўверсе тэкст:

І вось над садам, загуменнем
Сняжынкі жвавыя гуляюць,
Садок і дворык засцілаюць
Бялюткім, чыстым...

— Вой, вужака!

— Бі, бі! — крычыць матка і круціцца, шукаючы што ў руку ўзяць. — Сынок, дай граблі, палку!

— Біце, дзядзька Сцяпан! — крычу і я здалёку, але, босы, і не думаю нават злазіць са сваёй жэрдкі.

Дзядзька, не сказаць, каб смела, тыркае кассём абы-куды. Матка самая актыўная: шукае, пора граблямі ў траву, выглядае ў баразне паўз пожню...

— У лес пабегла даўно, — махае рукою дзядзька. Ён падходзіць да мяне, садзіцца побач, закурвае.

— Добра, як у лес, а як у сноп, падлюка, зашылася, — матка шукае і ў снапах аўса, якія побач, разгорнутыя, сушацца на пожні.

Ад дыму я зусім п'янею. На імгненне раптам нашыя шулы ад варотаў робяцца беленькімі мармуровымі калонамі, бетонныя прыступкі паміж імі вядуць у нейкія дзверы, і я сам іду па гэтых прыступках, а злева — прыгожая шыльда, і пад ёй на сцяне патрэскаўся тынк формаю лацінскай літары S. Бр-р!

Дзядзька тым часам паказвае папяросаю на голую сенажаць і бубніць:

— ...А тут жыў сярбеец. Хата стаяла.

— А адкуль ён узяўся, дзядзька?

— Гм, чорт яго матку знае. Мы тады сільно бедненько жылі, і вось неяк я ару, матка гліцу пайшла грабці, а Валодзя ляжыць пад плотам, з голаду паміpae...

Шулы як шулы. Мабыць, гэтыя калоны проста мне сёння прысніліся, і так нечакана ўспомніўся сон.

— ...А тут, — дзядзька ківае за поплаўчык, дзе расце цімалы лес, — тут жыў Чуб.

— А чаго яго дражняць Чуб?

— Бо ён быў вельмі паганы! Кульгаў, падла. Неяк палез на нейкую крышу, шыфер ён хацеў там слаць ці хвароба яго знае, што ён там хацеў, да паслізнуўся, да ўпаў, да ўбіўся к... мацеры і стаў кульгаць. Яго бацька вожыкаў еў. Назбірае па лесе цэлага кашаля, павысыпае іх у печ, прыпрэ засланку кірпічом, а яны пішчаць, пішчаць на ўсю хату! Пёк іх так, жывымі. Там трошкі туды, — тыча дзядзька за нашыя спіны, — жыў Палізан такі. Іхняя хата згарэла. Ён у вайну, як быў маленькі, сільненько баяўся парцізанаў. Раз парцізаны прыйшлі забіраць кабана, а маткі дома не было, ён у сена залез і калоціцца! Так баяўся. А пасля от папаплакаў: «Мамо, палізаны ходзяць, а я длізу-длізу!» Дрыжу-дрыжу, хацеў сказаць. Так і стаў — Палізан...

Дзядзька плюецца, сморкаецца, шкрабае пару разоў бруском па палатне і ідзе дакошваць. Дый пара — ужо сонца пячэ ва ўсю, ужо стаіць добры

ДЗЕНЬ.

Гады з тры таму, яшчэ добра на маёй памяці, паўз самую хату, вось паўз гэты поплаўчык, дзе дзядзька цяпер косіць, цякла такая чысценькая, прыгожая, вілюжная паміж алешчынаў і вербавых карчоў рэчка. Яна паіла Прыпяць. Увесну і ўвосень яна разлівалася. Ніколі не забуду, як адзін раз вясною вада ад нечага рэзка схлынула,

і ў нізінцы, на сваіх сотках, я спаймаў двух шчупакоў — даўжынёю мне да калена. Але вясновы разліў я не так любіў, як калі мая рэчка замярзала на зіму і ад хат аж да лесу рабілася шырокае лёдавае поле. Лёд быў празрысценькі, свяціўся да самага дна. Каля карчоў можна было напарвацца на ўмерзлых у лёд уюноў. Я лягаў тады на гэты лёд і ўглядаўся, якія ў уюна вусікі, плаўнікі, сагнуты кручком хвост і калючая палачка каля рота. Я бег дадому па сякеру, асцярожна цюкаючы, высякаў іх усіх да аднаго, і ў цёплых далонях яны адыходзілі і пачыналі слаба варушыцца... Я ў дзесяць гадоў здабываў і сабе, і матцы цэлую вячэру! Ды яшчэ якую! Ай, хопіць, не буду ўспамінаць...

Яшчэ да таго, як пабудаваліся тут дачы, нешта недзе асушылі, каля Нароўлі, казалі, зрабілі плаціну, а калі асушалі, перабілі крыніцу, і яна збегла ў зямлю: рэчка зрабілася вузкай доўгай сажалкаю са стаячай вадою, перастала разлівацца, але, на шчасце, перасыхала поўнасцю толькі ў вельмі сухое лета. Рыба тут жыла, нягледзячы ні на што. Але калі б рыба тут поўнасцю перадохла ці вывелася, я ўсё роўна ставіў бы кожны вечар свае донкі — лескі з некалькімі кручкамі і з гумкаю на канцы; калі б знікла і вада, я б закідваў вудку ў калодзеж, у карыта, у вядро: без вады і рыбы жыцця мне няма.

Я сяджу цяпер пад алешнікавым пахучым карчом і баюся падняць вочы на ваду, на чараты, на жоўтыя кветкі казакі, якія растуць пасярэдзіне гэтай канавы-копанкі-балотца. Мне здаецца, што, калі я гляну, там усё заходзіць ходырам.

«Божанька, хай сёння ўночы я не буду абдымацца з Анжэлаю, але пашлі мне за гэта шчуку ці акуня!» — зусім па-дзіцячы, шчыра малюся я. Вось гэты час, пакуль настройваешся, пакуль баішся глядзець на ўтыркнутую ў бераг палачку ад донкі, пакуль носяцца ў галаве малюнкі зімы, сябе малога, калі сонца залівае чырвона-малінавым золатам лёд, а шчокі гараць, і каля студні бразкае нечае вядро, пахне дымам, лёдам, зімою, і хутка ўжо вячэра, а там — цёплая печ і зашмальцаваная кніжка Мележа, якую разгортваеш у любым месцы, і дрыжыкі бягуць па целе ад незвычайнай, чароўнай музыкі простых слоў, якія нейкім дзіўным чынам пастаўлены ў такі парадак, што ўжо не проста словы, а пахі, музыка, нейкі сум, нейкая весялосць, гэты час няўлоўных думак-успамінаў для мяне — шчасце.

Леска не нацягнутая, а каля берага нават звітая ў кольцы. Я ўжо ведаю, што гэта значыць. Дрыготкімі пальцамі вырываю палку, паціху спрабую на сябе. Наўскасяк, амаль каля другога берага на ваду выплывае вялікая пляма чорнае каламуці. «Божанька, рыба і без цябе злавілася, пашлі мне лепш ноч з Анжэлаю...» А рукі па сан-

тыметры цягнуць, перабіраюць леску — бух! Тое, што ўзняло каламуць, ажыло — вада ў тым месцы пачынае раптам лапатаць, быццам там вынырнула качка. І зноў ціха. Леска не ідзе далей, я ў штанах, перабіраючы яе, лезу ў гэтую ваду і ў гразь... Ужо мне не да Анжэлы і не да Бога — рыба, мая рыба рвецца, плюскоча і блішча раз-пораз жоўта-белым бокам — у двух метрах, за метр ад мяне! Леска заблыталася ў траве, і я выдзіраю з карэннем цэлы корч аеру — гэта ўжо каля самага карасёвага носа, і разам з карчом, з гразёю кідаю ўсё гэта на бліжэйшы бераг. Ёсць... Карась адчайна лупіць хвастом па траве, але хутка супакойваецца, слізь і гразь на яго баках падсыхаюць, і вось ён ужо сонным, абыякавым вокам глядзіць у неба. Буйная, як пазногаць вялікага пальца, луска выклікае асацыяцыі з металічным, ці «белым», як у нас кажуць, рублём. Я абмываю ў чысцейшай вадзе штаны і рукавы кашулі. Сонца варыць так, што здаецца, сам адчуваеш, як яшчэ больш бялеюць гарачыя валасы.

Карась мой трошкі не дацягвае да локця. Ён заглынуў кручок у самыя кішкі, і я не выдзіраю, а перакусваю леску каля рота і нясу дадому.

— Паймаў? Да якая ж здаравенная! Я табе яе звару, добра?

Мне трохі крыўдна — матка прывыкла ўжо, што я заўсёды нешта цягаю ў селішча: ці то рыбу, ці грыбы, ці арэхі, ажыну, і здзіўляецца менш, як мне таго хочацца. Яна пускае карася ў вялікую міску, у якой нядаўна мылася, але карась і ў гэтай мыльнай вадзе ажывае і з разгону выскоквае на траву. Пускаем яго ў поўненькае вядро з чыстай вадою, матка зверху яшчэ і накрывае хусткаю.

— А што ты там напісаў у газету, што цябе напячаталі? — пытаецца матка.

— Дзе? Дзе яна?!

— У калідоры, на лаўцы. Пачталёнка паказала мне...

Я хапаю з лаўкі згорнутую раёнку і не ведаю, куды дзецца; подбегам заварочваю за хату, адтуль — у высокі, стаптаны дарожкамі маліннік. Як у шалашы. «Поўным ходам ідзе жніво...», «закончылася нарыхтоўка сіласу ў саўгасе...», «сямейны экіпаж», «ганаровы сцяг узняты ў гонар...»

— Чаго ты залез туды — шчэ вужака ні ўкусіла? — крычыць матка.

А — вось:

Ночью белый снег покрыл
Города и села,
Под пушистым ковром
Спят леса и горы...

Не, дачытаць ад сораму не магу. А я ўжо і забыўся, калі пасылаў яго. І надрукавалі — у самы час. Ай, як сорамна!..

...У цяньку ўжо пясок пад нагамі робіцца халодны. Куры з пожні, з пакошы падабраліся бліжэй да куратніка, абступілі вядро для свінячай яды і дзяўбуць нешта ўсярэдзіне і з бакоў. Я ламаю кабанам бацвінне, і лісты холадна і пругка скрыпяць — як добра, што скора вечар, як я заўсёды люблю

ВЕЧАР.

Пазней, значна пазней, адразу пасля войска, я вычытаў у Купрына, што адзін ягоны герой раніцаю, «как и всегда это бывает с людьми со слабыми или обострёнными нервами», пачуваўся вельмі кепска. У трынаццаць гадоў я не думаў, не ведаў і ведаць не хацеў пра нейкія нервы. Але напраўду, раніцаю ў мяне часта без дай прычыны балела галава, а ў лесе я пачынаў слаба бачыць і прыносіў грыбоў менш за матку, хоць хадзіў удвая даўжэй. Ажываў я звычайна ў другой палове дня, і чым бліжэй да ночы, тым здаравей, весялей мне рабілася.

Увечары, калі не было чаго рабіць, я залазіў на калідор, на цёплы шыфер, і пачынаў сумаваць. Святлей за той, падлеткавы, сум у мяне пасля ў жыцці нічога больш не было... Унізе па дарозе хадзілі людзі: з крамы, з лесу, з поля, везлі снапы ці мяшкі з картоплямі; каля могілак на пожні пасвіліся каровы, а я сумаваў, што нарадзіўся тут, а не ў горадзе. Там — я ведаю з тэлевізара і з кніжак — мае аднагодкі не гнуць маты, не кураць, дзяўчынкі шэптам выказваюць хлопчыкам сваё каханне, а тыя — «это было, это было, он вторую ночь не спит, и о чём она спросила — никому не говорит»; яны не ўстаюць у пяць гадзін раніцы па грыбы, не малоцяць, не цягаюць сена, не капаюць бульбы; яны выпускаюць сценгазеты... і ўвогуле, чаго толькі не робяць. І я ўсё гэтае змог бы рабіць, разоў у дзесяць лепш. Мне б іхні клопат. «Витька, обедать сегодня будешь сам. На кухне разогреешь суп, в холодильнике — колбаса, рыба... Смотри, съешь всё...» А мая матка неяк захварэла, ляжала ў бальніцы, і я цэлы тыдзень паліў сам у печы, карміў курэй, кабаноў і сам сябе — якая там «колбаса в холодильнике», — што Бог пашле... А ў тэлевізары «разогревают супы», і «мальчишка злится — есть на то причина, не век же во дворе ему торчать; о, чтоб ты завтра двойку получила, девчонка из квартиры сорок пять!».

Я мрою не горад, а познюю восень, загоны, на якіх капаюць бульбу, а ўвечары Васіль з рознага колеру вачыма стаіць пад грушаю з Ганнаю, і яна смешна раўнуе: «Ідзі ўжэ к Просі гарбатуй...», а тут кулакі з абрэзамі... Мне мроіцца балота, прысыпаныя снегам

журавіны, сляды акуратных лапцікаў на снезе і пахі паленай саломы, якою смаляць кабаноў... Мне там хочацца жыць і там апынуцца...

— Сыночак, — гукае знізу матка, — назбірай яблыкаў таму кабану маленькаму.

— Колькі ён ужэ можа жраць?! Дай мне пасядзець трохі — у мяне ногі баляць!

— А рукі ў цябе не баляць? Есці?

— Гэта лёгка, па-твойму, так рана па твае грыбы ўставаць?

— Не трэба цягацца ўсю ноч!..

Спускаюся па драбіне ўніз, а ў вушах з усёй інтанацыяю звіняць апошнія матчыны словы, і асабліва самае апошняе —

НОЧ.

Праўда ж, ёсць такое, што, калі ўночы глядзіш на дзяўчыну ў профіль, яе твар здаецца набагата святлейшы за хлопцавы?

Вясковая ідылія васьмідзясятых: лаўка пад плотам, яблыня, паплёўванне семкамі ўкрадзенага здаравеннага сланечніка — Анжэла сядзіць пасярэдзіне, а мы з Васілём — з бакоў. Я не зводжу вачэй з белае плямы Анжэлінага тварыку; ноч цёмная, без аніякіх зорак (а ў класіка Маякоўскага — «ночи августа звездой забиты нагусто»... Зрэшты, Маякоўскі — цудоўны. Проста ён меў на ўвазе не беларускія ночы.).

— ...Тады дзеўка сказала, — не зачыняецца ў Васіля рот, — кажа, ідзі на могілкі, забі ў крыжа цвік. Пайшоў, ідзе, ідзе, ідзе... Нешта — трэсь пад нагою!

— Фу, ни капельки не страшно!

Такі ў яе прыгожанькі нос, рот, такія вабныя... не ведаю нават, як сказаць, — можа, «рысы твару». Добрая, мілая! Хочацца кранаць яе, гладзіць, шкадаваць, а гэтага не толькі не можаш набрацца адвагі зрабіць, але адчуваеш, што і думаць пра гэтае нельга. (Пасля разумныя кніжкі растлумачаць мне, што такое раздваенне, такі прымус увесьчасна хаваць ад самога сябе свае жаданні і думкі — звычайны стан падлеткавага ўзросту. Ды што мне цяпер да таго, што я даведаюся пра свой стан пасля!)

— ...Забівае ён цвік, забіў, ісці — не пускае нешта. Ён дрыг-дрыг, упаў — і разрыў сэрца на месцы! Аказалася, прыбіў, не пабачыўшы, край свайго пінжака.

— Ну и что? Я тебе таких историй десять выдумаю.

— Слухайце далей. Калі мерцвяка закопваюць, праз тры дні з яго выходзіць...

— Ну знаю — фосфор. Надоел уже. Сам иди на кладбище.

— Анжэлка, чаго ж ты сёння са мною такая нелюбезная? Куды ж ты мяне пасылаеш?

— Да куда тебя пошлёшь? Ты ж трус!

— Я? А я і не спору.

— Если не трус, иди на кладбище и принеси мне щепку от креста.

— Я ж кажу, я баюся.

— Да иди ты хоть куда-нибудь!

— Я пайду, — падхопліваюся я.

— Сиди, — Анжэла прыціскае сваёй далоняю маю да лаўкі.

— А, паняў... Вір ален фэрштэй.

Васіль устае, зафутбольвае ў цемру свой кавалак сланечніка, падае на развітанне руку мне, Анжэле і сыходзіць некуды па вуліцы, у другі бок ад таго, дзе яго хата.

— Хадзем паглядзім за ім, — горача шапчу я ў самае яе вуха і, прашаптаўшы, не адхіляюся.

— Сиди. Ни на какое кладбище он не пойдёт. Дурак он, глупый, — шэпча яна і не адрываецца, нічога, толькі мацней прыціскае да лаўкі мае пальцы і гладзіць, гладзіць іх — кожны паасобку. — А ты — умница... Это правда, что ты выиграл какую-то олимпиаду?

— Я не выйграў, тоесьць, на другім месце быў. Гэта рэспубліканская алімпіяда была, па рускай мове.

— Ой, как здорово! Ты ж ни слова по-русски не умеешь, — яе голас трошкі ўздрыгвае, але мяккі і пяшчотны.

— Умею... Проста не знаю, як табе сказаць... Нахіліся трошкі... Сорамна гаварыць па-руску!

— Чего, дурачок ты?

— Дражніцца будуць.

— Ах ты, хорошенький мой! Ну, идём...

Я падымаюся амаль з радасцю, бо пачынаю ўжо баяцца гэтага шэпту.

Мы ідзём тым самым шляхам, якім я раніцаю ішоў з грыбоў, толькі трошкі бліжэй да дач. Мне хочацца вырваць руку і ўцячы, а Анжэла маўчыць. Пералазім нейкі нізкі абвіслы дрот, ідзём па нечых агародах; я спатыкаюся на разоры...

— Держись за меня...

— А куды мы, Анжэла?

— Это наш участок, а вот — дача...

Я тупа гляджу на нейкія цёмныя пабудовы. А здалёк здаваліся такімі церамамі! Анжэла вядзе мяне паміж нейкіх буданчыкаў, паўз хлеў, адмыкае дзверы, і мы трапляем з цемры ў цемру яшчэ большую. Свецяцца толькі чатыры плямы па кутках — вокны. Пахне — як у кінутай хаце ці ў пограбе: бульбаю, морквою, буракамі, свежай

зямлёю — ну, пустка-пусткаю! Я паслушліва сядаю там, дзе маю руку пацягнулі ўніз, на нешта шырокае і мяккае.

— Мы не будем зажигать свет, хорошо? Нет, не бойся, никого нет и не будет, старики приедут только завтра днём... Милый какой... Хороший мой...

Яна гладзіць і моцна цісне мяне за шыю, гарачымі і мокрымі вуснамі прыкладаецца то да носа, то да падбародка, да маіх вуснаў... І ўсё часцей, часцей і мацней...

— Мальчик мой, ты что?! Не пугай меня!

Са мною здарыўся (тут я смела выкарыстоўваю стары расійскі штамп, бо беларускія словы, якія абазначаюць гэты стан, мне не падабаюцца) — са мною здарыўся «короткий обморок». Секунд праз дваццаць я ачомаўся і ўпершыню ясна і да страшнага востра зразумеў, як мне нялёгка будзе жыць.

— Тебя что, ни разу не целовали? Я боюсь притрагиваться к тебе... — а між тым яшчэ мацней сціскала маю шыю, гладзіла па назе...

Я вырваўся, знайшоў дзверы, выскачыў на дворык і адносна лёгка, па разоры, выйшаў з агародаў на вуліцу. Мне хацелася плакаць, не плакаць, а раўці на ўвесь голас.

Чаго? Тады я не ведаў. Я ўвогуле вельмі мала ведаў тады, бо думаў, што ўвесь свет — гэта толькі я, прычым я — нейкі не такі, як іншыя.

«Можа, для пачатку і гэтага нямала?» — паныла цешу сябе я і цвёрда ведаю — не толькі нямала, а гэта ўсё, нічога, нідзе і ніколі з гэтай дзяўчынкаю ў мяне больш не будзе.

На нашай лаўцы сядзіць Васіль і плюецца семкамі. Разламаны сланечнік — як кола з воза.

— Васіль, што толькі што было... Толькі не кажы нікому. Анжэла як стала мяне цалаваць!..

— Так? Цьфу, такіе семкі вялікіе, я аб'еўся — жую цераз сілу... А мяне яна ўчора цалавала. Сучка. Ты нешта ж мала з ёю быў, а я — трохі не да ранку. Яна заснула, а я ўцёк. Затое і рабіў з ёю, што хацеў. Чуў, як яна сёння — трус, трус...

— Нашто ты яе чапаў!..

У мяне не словы, а нейкі стогн.

— Яна сама! Ну, што ты, ё-маё... Мала іх яшчэ ў нас будзе!..

## 11. «Таварыства цвярозасці»

Адна знаёмая, прачытаўшы гэта, спытала: «А чаго ён не застаўся? Чаму ўцёк?» — і я і цяпер, у 44, не знайшоўся, што ёй адказаць. І праўда, прыйшоў, прывялі цябе за руку, дык будзь ласка, рабі тое, што ў такіх выпадках робіцца.

«Таварыствы цвярозасці? — як пытаў некалі Талстой. — Гэта калі збіраюцца разам, каб гарэлку не піць? Лухта. Каб не піць, не трэба збірацца. А калі збірацца, дык трэба піць».

Калі ж сур'ёзна — сёе-тое ў нас ужо ёсць.

Тут і раёнка, а значыць, спробы пісьма, і рыбалка, а значыць цяга да адзіноты, і самалюбства — калі ўсе хваляць, і дзядзька — як ураўнаважваючая сіла, што не дае шалапутным мазгам развіхляцца (гэта пазней паможа ў прозе, якая патрабуе сялянскай упартасці), і намёк кахання — дзіўнага, не ўсіхняга...

Цяпер што? — пераход да зімы. І дастакова будзе. Лета — зіма. На чым скончыцца наш рай.

## 12. «Адзін зімовы дзень»

У нашай вёсцы гулялі Міколу-зімовага. Як цяпер помню той дзень, дзевятнаццатага снежня, калі

Снег у ружовыя фарбы расквечаны,
Сонца дыміцца ў стыні марознай,
Па-над платамі сумёты намецены,
Сцены патрэскваюць пошчакам грозным,

складалася ў пятым, ці што, класе. Цяпер бы сто разоў падумаў, перш чым пісаць такое; калі сумёты, калі многа снегу, пачало б аналізавацца цяпер, дык хіба такі мароз, каб аж сцены трашчалі? А вось і правільна тады, у дванаццаць гадкоў, пісаў! І снегу, бывала, наваліць па вокны, і вуглы ў хаце страляюць.

Яшчэ Мікола, святы заступнічак наш, запомніўся днём вялікага свінога пабоішча. З самай ранняй раніцы, з цямна яшчэ не сціхаў у дварах сабачы брэх, рэзалі вушы пранізлівыя парасячыя віскі, паветра насычана было пахам паленага шчаціння, басіста гулі паяльныя лямпы. Але самае моцнае, чым засталося ў памяці дзевятнаццатага снежня — гэта крывёю, плямамі чырвонай крыві на белым снезе. У першы дзень — крыві свінячай, у дварах, каля дрывотняў і паветак, а на другі, «пахмельны», — чалавечай, якой пазначана

была і стаптаная, слізкая, з жоўтымі пісюнамі на ўзбочыне дарога і асабліва «цэнтар», пляцоўка каля вясковага клуба, дзе ляжаў павалены, разварочаны штыкетнік і на крывавым снезе валяліся абломкі дошак.

Даўно тое было! Даўно ўжо зусім іншыя асацыяцыі выклікае чырвонае на белым, даўно не адчуваеш радасці ні ў свята, ні ў будзень… Прачнешся, расчухаешся, планы на дзень прыкінеш, на працу ды назад з'ездзіш — вось табе і дня няма; і толькі засынаючы, здрыганешся раптам: ды гэта ж Мікола быў сёння! І празвініць у вушах нейкі далёкі адгалосак, ён жа прадвеснік, першы акорд будучага апавядання, расповеду пра часы, калі кароткі зімовы дзень здаваўся даўжынёю ў год, бо і ўбіраў у сябе столькі ўсяго, што хапала пасля на цэлы год успамінаў…

Было, было! Калі прачынаўся рана ад цішыні выключанага «радзьва», ад матчынага грукання ў меншай хаце, ад радасці, што хутка канікулы. Ад таго, што нядзеля сёння, заўтра ў школу, а ўрокі загадзя параблены. Ад таго, што раніца, а светла ад снегу за акном. Ды яшчэ — ад ціхага, да пустаты ў жываце прыемнага адчування сапраўднага свята, адчування такога знаёмага жыцця вакол і прысутнасці ***сябе*** ў гэтым жыцці, і ад боязі праспаць, не паспець ухапіць нават аднаго дня гэтага жыцця — а яго трэба ўвабраць без астатку, насыціцца кожнай хвілінай яго, кожным яго пахам, колерам, кожным яго эпізодам!

Першае, што робіш, лежачы ў цёплым ложку, — гэта просіш святога Міколу, каб маці не здагадалася выцягнуць з пячуркі рукавіцы. У адной з іх дзве цыгарэты, якія выкленчыў учора ў свайго класнага кіраўніка Кацмана, паабяцаўшы яму ўвесну саджанцы чырвоных сліў; такія на ўсю вёску чамусьці толькі ў нас і растуць. Што яшчэ? Паесці. Пакурыць з Сержыкам у кустах на рэчцы, дзе ў нас хакейнае поле. Дамовіцца, хто будзе красці з дому выпіўку, хто закуску… Праўда, сёння нам і так дазволена амаль усё — сядай за стол, еж, выпівай, калі дурны і хочацца… Але што ж тады за кайф? Украсці ж цікавей.

Пра Сержыка размова асобная. Мы аднагодкі, але я вучуся ў сёмым класе, ён — трэці год у пятым. Я без бацькі, радні няма, жывём з маці, канечне, бедненька. У яго бацька, матка, тры старэйшыя сястры, плойма дзядзькоў, цётак у вёсцы і ў горадзе. Я выдатнік, ён у вучобе не проста дуб, а дубалом, пень пнём, і даўно адправілі б яго ў спецшколу для разумова адсталых, каб не бацька. Бацька ў яго «хрантавік» («хрэнтавік», як сам Сержык жартуе), ваяваў разам з Гарасёвым, а Гарасёў самы большы начальнік горада і раёна.

Калі-нікалі Гарасёў прыязджае да франтавога сябра ў госці, Сержык кажа — на «Волгі» (**мініяцюрка Брыля**), а часцей сам бацька Сержыкаў, напакаваўшы сумкі, цягнецца да яго ў горад. Так што чапаць Сержыка не пажадана нікому: ні дырэктару, ні завучу, і можна толькі ўявіць, што ён за падарунак, калі сам Гарасёў трэці год не можа выцягнуць яго з пятага класа! Адзіны ў сям'і сынок, позняе дзіця, з ім нянькаюцца і разбэшчваюць яго, як толькі можна. Расказвалі — ды сама яго маці і расказвала — як тры сястры выстрайваліся адна за адной каля калыскі маленькага Сержыка і дзьмулі яму па чарзе ў голы пульхны зад; ілюстрацыя да раблеўскага Гарганцюа! Яму дазволена ўсё. Кожнае яго жаданне выконваецца без прамаруды. Захацеў раз Сержык мапеду — калі ласка, назаўтра атрымоўвай, ды не звычайную «Рыгу», а «Верхавіну», дзве хуткасці, амаль матацыкл. Зажадаў стрэльбу — на, сынок, бацькаву аднастволачку, «ды глядзі ж, беражыся, вочкі не павыбівай» (сабе, канечне, вочкі, не людзям). Канькі-«канадкі», клюшка за шэсць з нечым, шлем, шчыткі, накаленнікі — во да чаго зайздрасць сапраўдная, да амуніцыі хакейнай, а не да «Верхавіны» нават і не да стрэльбы... Раз захварэў Сержык, зажадалася яму, як многім хворым, што часта самі не ведаюць, чаго хочуць, — шахматаў. Лета, сенакос, бацька кідае ўсю работу, едзе на цэлы дзень у горад, прывозіць шахматы. Ды не простыя, не нашы лакіраваныя дзеравяшкі за тры шэсцьдзесят — касцяныя, з пазалочанай інкрустацыяй, у скрыначцы, абабітай усярэдзіне карычневым аксамітам. На, сынку, папраўляйся! Сынку пагуляў сам з сабою ў Чапаева, пстрычкамі збіваючы пешкі, адламаў ферзю галаву і на тым скончылася.

Я люблю яго. Мы сябры. З ім лёгка, цікава і пляваць на тое, што ён двоечнік. Затое ён умее, як Бядулеў Салавей, размаўляць рознымі галасамі, мужчынскімі і жаночымі. Да ўсяго ж у нас з ім аднолькавае адчуванне жыцця. Нам мала яго, гэтага, калі шчыра, даволі такі нудненькага рэальнага вясковага жыцця, мала простага сузірання гэтых хат, людзей, настаўнікаў, школы; нам хочацца самім тварыць яго, хай сабе толькі ў марах, затое па-свойму.

Фантазіі ў нас бываюць смешныя, дасціпныя, бываюць банальныя і, вядома ж, далёка не заўсёды бяскрыўдныя Мы выдумляем-фантазіруем, перабіваючы адзін аднаго, устаўляючы розныя падрабязнасці, на тэму Сержыкавага суседа дзядзькі Міколы Піцерскага. Напрыклад, як ён мог служыць у войску? Прымітыўны, непісьменны, акрамя таго, дылда пад два метры ростам — усю форму, ад ботаў да пілоткі, яму шылі па спецзаказе, мы самі бачылі дакументы, калі неяк залезлі да яго ў пограб і знайшлі кіпу пажоўклых

лісткоў з выцвілымі, пад капірку напісанымі параметрамі. Чаму так не па-беларуску Піцерскі? — неяк з жонкаю паехалі яны ў горад Ленінград (гэта не прыдумкі, а праўда), пачалі спускацца ў метро. Жонцы, вясковай цёмнай бабе, якая дасюль не была нават у райцэнтры, зрабілася блага — яшчэ б, нейкі страшны чорт жывую апускае ў апраметную! Нема яна загаласіла і, задзіраючы ногі, пачала пералазіць на суседні эскалатар, які падымаўся ўверх, які мог уратаваць яе, вынесці з гэтага пекла… Мікола хапаў за спадніцу, сцягваў назад… Дарэчы, хутка пасля паездкі яна памерла, цалкам магчыма, што і ад стрэсу, а Мікола стаў Піцерскім. Дзякуючы Сержыку і папулярнаму тады «джэнцельменскаму» фільму.

А то мы ўкладваем майго класнага кіраўніка Кацмана, ціхмянага сарамлівага яўрэйчыка, які чамусьці баіцца жанчын, у адзін ложак з Кацяй, маладой і «ранняй» настаўніцай нямецкай мовы; цымус яшчэ і ў тым, што ў нашай інтэрпрэтацыі яны нават у ложку размаўляюць на «вы».

Я: «Повернитесь, пожайлюйста, на бочёк, дорогая Катюшенька... Так мне будет удобнее…» Сержык (Каціным голасам): «Я вам чьто, гимнастка? Может, ещё мостик прикажете сделать?!» У мяне аж дрыжыкі бягуць па спіне, бо не толькі голас, і твар у яго робіцца падобным на Кацін, і міжволі мільгане думка: ды адкуль гэта ў цябе, двоечніка, невука, які ніводнай кніжкі ў жыцці не прачытаў?! Ды ці не прыдурваешся ты, пад прасцячка ламаючыся?! Каб рабіць усё, што хочаш?!

Мы з Сержыкам залезлі ў лазовы куст, што расце проста з лёду, адразу за варотамі хакейнай пляцоўкі. Куст вялізны, памяшчаецца ў ім чалавек дваццаць і можна сядзець на галінах, як на лаўках. Іншым часам тут наша раздзявальня. Цяпер мы пакурваем тут, ганяем «цыганачку»… Ах, тая першая ранішняя зацяжка! Той шум у вушах, салодкі транс, раптоўнае абвастрэнне зроку, слыху, нюху!.. Гэта пазней, пазней забухаюць кашлем лёгкія, пазней прыйдзе расплата — задышкаю, арытміяй… А пакуль што смялей! — давай, зацягвайся, каўтай дым, здароўя ж не мерана, скура гладзенькая, зубкі белыя, пальцы нікацінам не смярдзяць…

Сержык робіць доўгія зацяжкі і, выпускаючы дым, заплюшчваецца. Я падганяю: ды расказвай хутчэй! Пакуль я ўчора ўрокі рабіў, ён не спаў у шапку. Госці пачалі з'язджацца яшчэ з вечара. Да Гермачыхі-штунды прыехаў сын, імяніннік Мікола, таксама штунда (так у нас завуць баптыстаў), не адзін, а з дзеўкаю, нават з дзвюма дзеўкамі! Абедзве гарадскія, бялявенькія, абедзве, калі Сержыка паслухаць, у Бога веруюць. Мікола Гермачышын іх у малітоўным доме недзе і знайшоў.

Сержык расказвае ў ролях, разыгрывае цэлы спектакль. Гэта трэба чуць і бачыць. Канечне, ён яшчэ ўчора ўсё падглядзеў, усё выведаў.

— …Коля на гітары іграе, дзеўкі параздзяваліся і таньчаць голыя, а Гермачыха на поліку сядзіць, у ладкі пляскае… Фу-у-у! — шумна выдыхае ён дым з рота.

Трэба ж! Такі абыякавы голас, такая нявіннасць у сумленных вачах! Нават і ведаючы яго, як аблупленага, міжволі засумняваешся — а мо праўда?

— Дык а што ён ім іграў?

І на гэта ў Сержыка ёсць адказ. Словы і нават мелодыю ўдалося яму запомніць. Ён перабірае, як па струнах, пальцамі па крысе новенькага свайго паліто і спявае рыхтык голасам Кабзона, на матыў колішніх «бамаўскіх» шлягераў:

Верце ў Бога
Ісуса Хрыста,
І спамінайце
Ліхіе дзела!

— Ды не брашы ты!

— Бля буду, — клянецца Сержык. — Яны ведаеш як усе ў Бога вераць? Ты што!

Я ўздыхаю.

— Вось каб паглядзець…

— На дзевак голых? Шчасце такое!

Сержык сплёўвае. Канечне! Тры сястры дома, на вачах, хочаш не хочаш, усяго наглядзішся…

Аднак хутка першы рэйс аўтобуса. Варушыцца трэба. А то засядзеліся тут, закурыліся — так і галоўнае, чаго добрага, прапусціш.

Хуценька ідзем да клуба. Мароз, сонца, ружовы снег, які скрып-скрып пад чаравікамі. Здорава! Проста нейкая дурная радасць у душы. А на прыпынку ўжо людзі. І два Міколы-імяніннікі сярод іх. Адзін — Піцерскі, двухметровая тычка, у новым кажусе, у хромавых ботах, якія блішчаць на сонцы халявамі; другі — гадоў пад шэсцьдзесят інвалід па мянушцы Пісталет. Абодва чакаюць гасцей. Піцерскі — свата, якога завуць Сідар (нам напярод, ад аднаго гэтага імені ўжо радасна), Пісталет — сына з горада Варапаева.

— Здароў, дзяды! З празьнічком!

Сержык сама ветлівасць. Нават галаву пачціва схіліў, нават да шапкі дакрануўся. Але добра нас усе ведаюць тут. Мікола Піцерскі адварочваецца, не жадаючы не тое што гаварыць, а і пазіраць на нас.

— Сына з Варапаева жджэце? — мядовым голасам пытае Сержык у другога Міколы.

— Якое тваё сабачае дзела, — адказвае Пісталет, — каго я жду?

Значыць, у настроі, раз так кажа. Звычайна замахваецца каменькаю[1] і крычыць на ўсю вуліцу: «Пайшоў на …, паскуства-гадасць!» Апошнія — самыя любімыя яго словы.

Скача Пісталецік з каменькаю, прытупвае, узяў ужо, канечне, пару «сотак» на грудзі. Паддзёўка на ім, афіцэрскім рамянём падперазаная. На адной назе валёнак у галёшы, на другой чаравік, падобны на артапедычны. Калі цёзку Піцерскага выгнала ў вышыню, дык гэтага ў шырыню — квадратная такая на неаднолькавых ножках трансфарматарная будка, з якой расце галава, што таксама здаецца квадратнай, бо на ёй салдацкая шапка з апушчанымі вушамі.

Такога кадра яшчэ пашукаць. У дзядзькі Міколы Піцерскага, акрамя службы ў войску і паездкі ў Ленінград, нічога больш за душою і няма; пра гэтага ж можна расказваць па гісторыі на кожную літару алфавіта.

а) — стральба кабана. Справа ў тым, што наш Мікола баіцца, калі свіней рэжуць ці колюць (дарма што хлусіць, што ваяваў, нават з пісталета страляў — адсюль мянушка), і заве на такія выпадкі лесніка са стрэльбаю, таксама, дарэчы, Міколу. Пісталетава хата роўненька праз вуліцу насупраць крамы. Аднойчы Мікола-ляснік прамазаў. Куля прабіла кабану лыч і ўляпілася ў магазінскія дзверы. Спрацавала сігналізацыя. Выхадны дзень, раніца, магазіншчыца ў нас з горада, а як у той горад паведаміць? Як туды дазваніцца, калі адзіны тэлефон стаіць у гэтай самай краме? Словам, сірэна выла больш за суткі, пакуль не прыехала ў панядзелак і не спыніла гэты кашмар прадаўшчыца… А заманліва, праўда, гэтую лінію развіць? Як з таго часу сігналізацыя пашкодзілася і пачала спрацоўваць самавольна, і да яе так прывыклі, што калі аднойчы ўночы да крамы ціха падрыліла аўто з фургонам...

б) — халяўная выпіўка. Летні вечар, каля крамы змораныя за дзень мужчынкі п'юць «Праменнае» нуль восем. Паселі ў радок, як ластаўкі на правадах, на жэрдках. Закусваюць вахлямі. Пісталет, глытаючы слінкі, скача побач — не завуць яго! Тады прыдумваецца наступнае. Мікола падчыльгіквае да дзядзькі Агуста, худзюшчага і з чорным ад жыцця і ад п'янкі тварам, і пачынае выціраць яму далоняю вусны. «То я ваклю еў», — вяла адмахваецца Агуст. —

[1] Каменька; на Мазыршчыне яшчэ чапялу называюць *камянёй.*

«Я не знаю, што ты еў! Мо ты мел[2] еў! Стой смірна, паскуства ты, гадасць!» Ну, як пасля такога не аддзячыць чалавека? Не наліць «чарніла» паўшклянкі?

в) — як жывога бацьку пахаваў. Рэвізія ў краме (чамусьці з крамаю гісторыі ўсе звязаныя, цяпер толькі заўважаю; нейкія ўсе «крамныя», ці «крамольныя»?..). Рэвізія рэвізіяю, а піць жа трэба! Пісталет бярэ сваю Аксеню, якой яшчэ раней паленам адбіў мазгі і яна развучылася гаварыць, ідуць у магазін, так і так, бацька (на другім канцы вёскі жыве) памёр. Ну, раз так… Колькі будзеце браць? Скрынку «чарніла». Узяліся з Аксеняю з двух бакоў, перанеслі праз вуліцу. Да канца рэвізіі хапіла. А стары бацька перажыў сына гадоў на дваццаць.

г) — як бульбу капаў («Аксеня, пасунь каша, паскуства ты, гадасць!» д) — як тавар пасвіў, на лісапеце, з будзільнікам у кішэні. ж)… з)… Каму не смешна ці не цікава ўсё гэта, раю паслухаць у Сержыкавым выкананні… вось толькі, праўда, не скора такое стане магчымым. Сядзіць недзе ў «суровай» аршанскай турме Салавей наш, матчын сынок наш, анёльчык, якому ў задніцу дзьмухалі, тэрмін «цягне», трэцяя ходка — і ўсё па дурасці, усё ад разбэшчанасці, інфантыльнасці, ад таго, культывуемага некалі намі стаўлення да жыцця як да нечага несапраўднага, несур'ёзнага!.. Першы раз па п'яні ўтапіў Сержык дзяржаўную машыну ў рэчцы — год з паловай. Другі — недзе ў Калінкавічах (Гарасёў па блату зрабіў яму там кватэру) пабіўся з нейкім дзедам, пенсіянерам нейкім, на трыццаць тры савецкія рублі[3], вызначыць суд, «знёс» яму ўстаўных зубоў — два гады плюс кампенсацыя. І вось цяпер трэці раз, за штосьці, здаецца, зноў з нейкім пенсіянерам звязанае — можа, і з тым самым.

Аднак Пісталета забылі. е) — вось хоць бы і гэты сын з Варапаева. Ніколі ніхто яго ў вочы не бачыў, як і ніхто не чуў, дзе гэтае таямнічае Варапаева?.. У тыя далёкія, дарагія гады я і падумаць не мог, што сам некалі буду мець да гэтага горада дачыненне. У 80-я з літсуполкаю «Тутэйшыя» выправіліся цягнікам у Дрысу, каб адтуль на лодках плыць у Дзвінск, пратэставаць супраць будаўніцтва ГРЭС, ці што, не помню («хто без чаўна, хто на чаўне, мы шпацыруем па Дзвіне»), і вось уночы, калі рабілі перасадку на глухой, пустой і цёмнай станцыі, раптам кінулася ў вочы — Варапаева!

Аднак да-а-лёка яшчэ да начной перасадкі і да шпацыру па Дзвіне. Пакуль і без таго цікава. Вунь аўтобус ужо выплывае з-за

[2] Крэйду.

[3] Паставіць звычайны жалезны зуб каштавала тады штосьці каля рубля.

павароту. Тармазнуў, праехаў юзам па слізкай шашы. Расчыніліся дзверы — і вось нам першая ўзнагарода за чаканне. З пярэдніх дзвярэй вывальваецца, не выходзіць, не саскоквае, а акурат неяк бокам вывальваецца Міколаў сват дзядзька Сідар. Упаў на калена, падхапіўся і выдаў на ўсю вуліцу наступнае:

— Э-эх, ты, маць перамаць тваю Прасвятую Багародзіцу... у Пятра і Паўла рогі маць!..

Ашаломленыя, мы з Сержыкам нават не смяемся. Ну, калі такі зачын, сумна сёння не будзе!

— Сват, а мо не гнявіце ў Бога? — просіць Мікола, азіраючыся.

Яму сорамна за свайго госця перад людзьмі. За гэтыя брыдкія яго словы, за тое, што прыехаў паддаты і з пустымі рукамі. Што боцікі ў яго нячышчаныя, дзіравыя, і ў адзін калашына ўбілася. Што зялёнае паліточка расхлістанае, без гузікаў, шаліка няма, праз расшпіленую брудную кашулю свеціцца худая шыйка... Росту дзядзька Сідар нашага, падлеткавага. І калі сваты пайшлі па вуліцы — Мікола далікатна падтрымліваў Сідара за локаць, вялікі з малым, дык ззаду здавалася, што дзед вядзе дамоў наравістага ўнука.

Астатнія пасажыры прывезлі хоць нейкае адчуванне свята. З гасцінцамі, з тортамі ў руках цэлай працэсіяй расцягнуліся па вуліцы. Апошнім сіратліва клыпае Пісталет. Зноў да яго так і не прыехаў сын з Варапаева. Нічога, будзем старымі гісторыямі жывіцца! Хай сабе клыпае, балазе, яму недалёка, вунь насупраць крамы хата, — ды «квасіць» там са сваёй Аксеняю. А тое, што не пагаворыш з ёю, хай на сябе крыўдуе — не трэба людзей біць паленам па галаве, тым больш жонку.

Бліжэй да абеда пад'ехаў яшчэ аўтобус. Ажыўленне, рух на вуліцы і ў дварах! Напаўняецца вёска людзьмі. Нарэшце пад вечар яшчэ навіна, самая важная — музыкаў «пазік» прывёз! Да гэтага часу паспелі ўжо напіцца, наесціся, наспявацца, хто і пакімарыць, набіраючыся сілы перад другім таймам... Самы час пахмяліцца, асвяжыць халоднай вадою рыла — і ў клуб, на танцы!

Мы з Сержыкам пабылі ў мяне, потым у яго. І там, і там сядзелі за сталом і ўсё адно ўмудрыліся застацца амаль галоднымі сярод гэтага банкетавання, гэтага багацця розных смажанняў, тушэнняў, марынадаў, грыбкоў-гуркоў-памідораў... Ну, не лезе дома! — асабліва калі яшчэ госці, ды ў рот пазіраюць... Гэта за вуглом дзе-небудзь, у тых жа карчах на рэчцы, калі гаварыць трэба шэпатам, азіраючыся, піць з рыльца, закусваць якім-небудзь белым ад тлушчу кавалкам гусяціны, што толькі што выслізнуў з рук пад ногі, а ты падбіраеш, абдзьмухваеш — і ў рот, «зубамі яго, зубамі»!

Можна было б і ў карчы, але ж часу шкада. Ужо нават у нашым канцы чутно, як у клубе наладжваюць інструменты, як зуммерыць бас-гітара, піліць, нібы скрыпка, сола-, пераліваецца іоніка, бохае барабан-«нажнік» і медна бразгочуць ударныя талеркі…. Вось-вось пачнецца першы этап гульбы; тут свая традыцыйная іерархія. Гадзін да дзевяці-дзесяці вечара будуць тупаць-шоргаць свае «падыспані» з «карапетамі» старыя, потым перапынак — пакарміць-папаіць музыкаў — і другая, маладзёва-«культурная» частка, танцы да ўпаду, гэта значыць, да бойкі.

Аднак нам з Сержыкам і на першую, «нямодную» частку трэба паспець кроў з носу. Бяжым ледзь не бягом. У меншай хаце Міколы Пісталета гарыць святло. Ну як тут не спакусіцца, як тут прайсці спакойна? Прабіраемся паўз сцяну да акна, я з аднаго боку рамы, Сержык з другога прыліпаем насамі да халоднага, заінелага з сярэдзіны халоднай, няпаленай хаты шкла. Сёе-тое можна разгледзець. Аксеня, сухая, сівая і страшная, як смерць, сядзіць адна за сталом. Прыставіла да вуха будзільнік, той самы, з якім Пісталет Мікола кароў пасвіць... На твары — жудкаватая ўхмылка шчасця. Цікае!

— Ксеня, паскуства ты, гадасць! — крычыць Сержык Пісталетавым голасам і барабаніць у шыбіну.

Бразкае аб стол будзільнік. Аксеня падскоквае і бяжыць за печ хавацца, а мы з лёгкасцю ў душах, з пачуццём выкананага абавязку, не забыўшы зачыніць за сабою веснічкі, спяшаемся ў клуб.

Яшчэ здалёк нас сустракаюць гукі «полькі». Усярэдзіне ў клубе пакуль чыста, не накурана, не наплёвана, падлога вымытая. Музыкі размясціліся на сцэне, збітай з новых дошак; паўз сцены — лавы. Парассядаўся народ, самае старыччо і тыя , хто не танчыць ніколі, толькі назірае, запамінае, каб потым цэлы год абгаворваць, як хто Міколу гуляў.

Мы выбіраем месца, адкуль нам усё відаць, а самі мы і незаўважныя, ціхенькія, сарамлівыя, смірнененькія.

Ідуць танцы! Мужчыны мокрыя ад поту, але ніводзін не расшпіліць верхні гузік цеснай кашулі — ён замест гальштука. Жанчыны ў хустках, у аднолькавых панчохах і ў аднолькавых дубаскурых тухлях, якія, раз у год надзетыя, націраюць ногі да крыві, адсюль і пакута ў вачах замест радасці… Зрэшты, і мужчыны такія ж самыя. Сур'ёзна, спаважна танчаць людзі, як павіннасць адбываючы, туп-туп-туп, раз-два-тры, паварот, і ўсё гэта моўчкі, без усмешак, без ахвоты, з выглядам, што трэба ж неяк перабыць і гэты, раз на год патрэбны абавязак.

Пасіўны настрой іхні перадаецца і музыкам. Іграюць яны ляніва, неахвотна, знарок збіваюцца, фальшывяць… На тварах — пагарда да

«крастоў» з іхнімі «калхознымі» танцамі. Яшчэ і ўпрошваць музыкаў даводзіцца, каб сыгралі той жа «карапет» ці «рэчаньку». «Мы ж таксама грошы давалі!» — нават да такіх аргументаў даводзіцца апускацца. Толькі чыхаць музыкам на вашыя праблемы. Ім што, цікава, як вы гэтага дня чакалі, як рыхтаваліся да яго, як прыбіралі клуб, сцэну рабілі, падлогу вышароўвалі; як яшчэ месяцы за два да свята хадзілі старэйшыя хлопцы па хатах, грошы на музыку збіраць, і як адрывалі ад сэрца скупаватыя людцы траячкі і пяцёркі — у залежнасці ад таго, колькі танцораў у сям'і, і як дзівіўся: «Чаго так многа, заўсёды ж па рублю было!», на што ім цярпліва, з разуменнем цемнаты іхняй адказвалі: «Дык цяпер жа ансамбль будзе!» Што там ужо за ансамбль, хоць бы глянуць адным вокам, паслухаць адным вухам… Глянулі? Паслухалі? Гэта вам не баян з бубнам (апетыя некалі мексіканцам нашым, Клімовічам Вовам з-пад Ліды), тут культура — разумець трэба!

Аднак хоць так, хоць з горам папалам, а ідзе гульба. Падцягваецца памалу моладзь. Пайшлі ўжо ў танцах змешаныя пары-тройкі: стары з маладою, ці наадварот. Каму сапраўды тут весела, дык гэта Міколу Пісталету. Прыстроіўся да сцэны, бліжэй да музыкаў, знайшоў занятак — танцы агучваць.

Выйду на рэчаньку
Гляну на сяло-о-о!

— спявае ён, свецячы жалеззем у роце, трымаючы перад сабою, як мікрафон, каменьку. І не выцягвае, заходзіцца ў кашлі. Нічога — з другога канца клуба Сержык яго голасам яму памагае:

Дзеўкі гуляюць —
А мне не весяло!

Эфект! Нават музыка на нейкі міг разладжваецца, нават танцоры застываюць у нямой сцэне: што такое?! Хто спявае? Два Пісталеты ў клубе, па розных кутках, ці што?!

— Ідзі вон адсюль, паскуства ты, гадасць! — крычыць Пісталет, не бачачы Сержыка.

А той штурхае мяне ў бок. «Вунь, глядзі, дзеўкі-штунды Гермачышыныя!» Гляджу. Дзеўкі як дзеўкі. Беленькія, прыгожыя. У джынсіках. Ні на якіх штундаў-цемрашалаў (так нас у школе вучаць) не падобныя. Адна нават пайшла «падыспань» танчыць, з высокім Міколам і нізенькім Сідарам. Тры крокі ўперад, тры назад, перакрутка… Дзядзька Сідар у захапленні.

— Э-э-эх, ты ж і дзеўка… я б табе яшчэ…

— Сват, не гнявіце ў Бога! — крычыць Сержык. Мы з ім заходзімся ад рогату.

Дзеўка толькі рдзеецца і патупляе вочы…

Перапынак. Музыкі п'юць і закусваюць проста на сцэне. Народ вывальвае на двор — перакурыць, таксама падзаправіцца… Нарэшце вось яна, кульмінацыя! Падняў бубнач над галавою палачкі, стукнуў тройчы — панеслася! Расступіся, старычча, хавайся пад лаўкі, да сцен туліся! Адэса-мама, гэта табе не дулі вераб'ям паказваць! Саступі, Пісталет, месца профі!

Спявае саліст. Не так спявае, як выкідвае з сябе словы, крыўляецца, манернічае, ніжнюю губу аттатурчвае. На твары — адчуванне сваёй значнасці, ці нават так: месіянерскай важнасці носьбіта культуры ў масы.

…И если вам в Одессе выбьют глаз…

«А может два!!!» — падхоплівае клуб.

…То этот глаз не вставит сам Филатов!..

Опа, опа, опа! Давай, давай! Вучыся, цемната на босу ногу, гэта табе не «карапет» з «падыспанем», тут «ансамбля» цэлая! Гудзе клуб, стаіць тупат, звіняць шыбы, пагрозліва калываецца грубка без коміну — цагляная бандурына, паралелепіпед метры два ў сячэнні і тры ў вышыню…

Клуб, калідор поўныя народу. Але на дварэ яшчэ больш. Кучкуюцца, выпіваюць хто стоячы, хто на якіх бярвеннях, на жэрдках, на выступе падмурка седзячы… Накаляецца патроху атмасфера. Ужо нават лакальныя, лёгкія сутычкі сям-там. Але ўсё гэта пакуль пакуль несур'ёзна, так, размінка.

Мы з Сержыкам цягнемся ў самы дальні, глухі кутох двара і натыкаемся на кампанію чалавек з дзесяці. Сярод іх і нашая бялявенькая «штунда», што так зачаравала дзядзьку Сідара. У адной руцэ ў яе цыгарэта, у другой чарка. На нас ніхто не звяртае ўвагі. Толькі гэтая бялявая.

— Вазьмі да сябе начаваць, — просіць яна раптам Сержыка п'яным голасам. — Што такое!? Сябар мой, ды ты разгубіўся?! Не пазнаю цябе! Можа, ты нават пачырванеў? Шкада, не ўбачыць гэтага ў цемры…

— У мяне сваіх, такіх, як ты, поўная хата, — знаходзіцца Сержык нарэшце.

— Якія вы шчаслівыя, што нарадзіліся хлопцамі, — кажа яна з уздыхам. — Як я вам зайздрошчу...

Мы нічога не разумеем.

А час ідзе. Пакрысе пусцее клуб, разбрыдаюцца па хатах старыя. Усё даўжэйшымі робяцца паўзы паміж танцамі. І ўсё прыбывае агрэсіўнага, гарэлкаю і адэскімі скокамі заведзенага народу ў двары.

Хутка фінал! Ужо нецікава. Як ні не ўвязваецца з хрысціянскім Святам усё папярэдняе, але канцоўка ў яго ўжо проста пачварная. І дзеўкі! — нават малыя дзеўкі не разыходзяцца, а назіраюць — з прагнасцю, з шалам у вачах, аблізваючы вусны... Крыкі, трэск платоў, удары, падзенне целаў, мацюкі, жаласлівыя просьбы не біць больш і жывёльнае мангола-татарскае гіканне пераможцаў...

— Э-эх ты... тваю Госпада Пятра-Паўла-Камчацкую... маць перамаць Святую Дзеву!..

Вылятае з клуба на ганак спінаю да людзей дзядзька Сідар — і не ўстойвае на нагах. Пакаціўся па прыступках, як Чарлі Чаплін у кіно, стукаючыся задніцай. Пад ганкам лёд, цвёрды, бетон, а не лёд... Бух!

Тыя, хто бліжэй, выразна пачулі, як з трэскам сухой палкі хруснула костка.

— Сват, я вас жа прасіў — не гнявіце ў Бога!..

Мікола Піцерскі мітусіцца вакол шалапутнага сваяка, не ведаючы, што рабіць, чым памагчы.

Сідар падняўся сам. Пераламаная мёртвая рука вісіць, як пустое рукаво. Па няголеных шчоках коцяцца слёзы. Ад болю ён цверазее на вачах. Для яго свята скончана.

Ды і нам пара ўжо, уласна кажучы, па хатах... Да новай зімы, да новага снегу, да новага Міколы!

## 13. Настаўнік

Мы ўвесь час будзем паўтараць — нам, у прынцыпе, цікава («а хоць цікава?», як пытае адна рэдактарка ў аўтараў) — нам цікава, як маленькі дзікун, з такім эмацыйным, неўраўнаважаным характарам, з такой схільнасцю да авантур, без такога цара ў галаве, без малейшага разумення таго, што жыццё — гэта не вясёлая пагулянка, а латарэя, што яно небяспечнае, гэта хаджэнне па лязу, балансаванне, і ў любую секунду, у кожны міг можна сарвацца ўніз, у нікуды — як ён умудрыўся проста фізічна выжыць, не кажучы пра тое, каб данесці да 45-гадовай мяжы яшчэ нейкую Божую іскру-жарынку?!.

Трэба была моцная процівага, каб выправіць гэты крэн у галаве. Трэба быў неардынарны чалавек, постаць, філосаф, бацька, дзядзька, брат, сват — карацей, настаўнік.

І такі з'явіўся. Новы герой уступае на старонкі рамана — настаўнік беларускай мовы і літаратуры.

Вучыў ён не так, як іншыя, вучыў не столькі свайму прадмету (не зубрыць «пан сахі і касы» — касавокі), колькі ўменню выжываць, жыццю ўвогуле, уганяючы ў нас прапісныя ісціны ледзь не сілком, так і кажучы — «дубінаю трэба ўбіваць у вас веды!»

І як жа гэта прыемна, заблукаўшы ў лабірынтах формы і зместу, дайшоўшы ледзь не да абсурду, вяртацца да старых, добрых, вечных сентэнцый і проста лішні раз паўтарыць іх: дуб — дрэва, Андрэй — імя, лета — пара года, Беларусь — наша Радзіма...

«Слова — срэбра, маўчанне — золата».

«Дзве бочкі ехалі, поўная маўчыць, парожняя — бу-бу-бу...»

«Пакорнае цяля двух матак ссе».

«Пішыце так, каб свой почырк маглі разбіраць толькі вы».

Мы помнім («Кнігі»), як ашчаджалі нашы мазгі ад перагрузкі кнігамі; гэты ж наадварот: «Толькі чытанне зробіць вас людзьмі. Чытайце хоць праз сілу, упітвайце, утоптвайце, пакуль мазгі маладыя!»

І, бедны, намучыўшыся з намі, і такое:

«Часала сякера сукаватае бервяно і сама стала тупой!» Сякера — ён, бярвенні — мы...

Усё гэта на цяперашні розум, а тады яго навука здавалася нам непатрэбшчынай, дзівацтвам.

## 14. «Міхаіл Іванавіч»

Увесь клас ведае, што яна кахае яго, і гэтага не могуць ёй дараваць.

Яна, сямікласніца Таня, — стройная, цемнавокая, выдатніца, на якую заглядаюцца хлопцы са старэйшых класаў, калі выпадае сумесны ўрок фізкультуры і яна паказваецца перад усімі ў сваім трыко і ў белай з зялёным маечцы; яна, якую яшчэ гэтым летам увечары на лаўцы можна было пацалаваць, «пажмакаць» і якая нікога цяпер да сябе не падпускае... Яна — і Міхаіл Іванавіч!

Ды проста «Міхаіл», з якога трэба смяяцца, кпіць, які, калі не ў гуморы, можа цэлы ўрок прамаўчаць, або можа, наадварот, цэлы ўрок расказваць анекдоцікі; якому ўжо за пяцьдзясят, у якога свой дом у блізкім горадзе, сварлівая жонка і трое дарослых незамужніх дачок; добры, вахлакаваты, падобны не на настаўніка, а на вясковага гультаяватага дзядзьку. Ды ён і гаварыць толкам не ўмее, гаворыць па-мясцоваму — ні па-руску, ні па-беларуску, а выкладае род-

ную мову і літаратуру. Ён — усіхні, легенда школы, ён вучыў іхніх бацькоў, старэйшых братоў і сясцёр, гэта пра яго, смеючыся, расказваюць меншым: «Пачакайце, дойдзеце да шостага класа, да Міхаіла, — ён вам мазгі ўставіць!»

Вось што такое «Міхаіл». І яго кахаць? Такой дзяўчынцы?

Ён заходзіць у клас хвілін праз пяць пасля званка, няўклюдны, бокам пралазіць у дзверы, абавязкова стукнецца плячом ці локцем аб вушак, са стосам сшыткаў, кніг пад пахаю, пачынае «раскладацца» (яго слоўка) на стале. Кнігі з году ў год, з класа ў клас адны і тыя ж, зацяганыя, зашморганыя, зачытаныя: Колас «Новая зямля», Багдановіч, Купала, чамусьці Пушкін, «Слоўнік беларускай мовы» Крапівы... «Расклаўшыся», Міхаіл Іванавіч прычэсваецца — далоняю закідвае з ілба на патыліцу доўгую пядзю валасоў, загладжвае за вушы, тады дастае з кішэні шырокіх, заношаных і непрасаваных штаноў скамечаную насоўку і гучна трубіць-сморкаецца. Сёння ён добры.

— Учора дастаю платок, у шостым класе, толькі высмаркаўся і назад класці, у карман, а Вася: «Э-э, Міхаіл Іванавіч, пакладзіце на месца нашу трапачку!»

Рогат.

— У іх з дошкі анучка прапала, дык ён, паразіт малы, думаў, я забраў і смаркаюся ў яе.

Ён праходзіць між радоў, правярае, як зрабілі хатняе заданне. Каля таго, у каго пуста ў сшытку, пастаіць, памаўчыць.

— Ручка зламалася, Міхаіл Іванавіч, — заўсёднае апраўданне.

— Дык пісаў бы ножкаю.

Тані не глядзіць нават у сшытак, адразу выводзіць ёй у дзённіку прыгожы, з закручаным хвосцікам «пятак».

— Вось на каго раўняйцеся, чарты дзікія, — лагодна, задаволена кажа і ідзе далей.

Ах, лепш бы ён маўчаў!

Перад Таняю на парту падае запіска, у ёй малюнак — людзі з тонкімі штрышкамі, што азначаюць рукі-ногі, зліліся ў палавым акце. Да верхняга чалавека вядзе стрэлачка і падпісана «Міхаіл», да ніжняга такая ж стрэлачка і ўказана: «Т. Мяцельская». Таня, прыжмурыўшы вочы, азіраецца, пасміхаецца і камечыць паперку.

Рэдка, але бывае, што Міхаіл не ў гуморы. Калі не вывучылі на памяць верш ці не перапісалі практыкаванне па мове. Тады пачынаецца самае цікавае. Настаўнік моўчкі сядае за стол, разгортвае адну са сваіх кніг, чытае. У класе страшэнны гармідар. Пачытаўшы, Міхаіл Іванавіч знянацку падхопліваецца і ляпае кнігай аб стол, — пачынаецца.

— Ну, скацінушкі! Ну, гаспада Галаўлёвы! Малайцы, выкідайце кату пад хвост маладыя агні, маладыя жаданні! Пераводзьце кроў на воду! Вы ж прападзеце, як мышы, у вялікім свеце! Без навукі! Без чытання! Каму вы трэба цяперашнім часам?! Не даў Бог бацькам грошай, палат каменных — дык не чухайцеся, чэрці, на печы, а чытайце! Цярплівасцю бярыце, пакуль галовы маладыя, сілком напаўняйце сябе ведамі!

Пачынае настаўнік без запалу, нават абыякава, быццам ведае, што тут кажы ні кажы, усё адляціць, як гарох ад сцяны. Але паступова натхняецца, дзябёлы твар яго чырванее, голас робіцца пагрозлівым, быццам перад ім не падлеткі — учарашнія дзеці, а крэўныя ворагі. Ён пачынае глядзець паверх галоў і цадзіць праз зубы, адсякаючы доўгім тоўстым пальцам кожнае слова:

Маленькие, серые людишки
Бродят по земле моей Отчизны,
Ищут все дешевенького счастья,
Гэткія трусы і ілгунішкі!

— Дык вось, не бывае таннага шчасця, папомніце мяне! Шчасце трэба заслужыць, крывёю заплаціць за яго!..

Усе нагнуліся над партамі і хіхікаюць, а Тані ў такія хвіліны страшэнна сорамна за яго; яна думае, што і з яе гэтыя хіхікі; такім настаўнік перастае падабацца ёй, і яна ўжо не адчувае пяшчоты, гледзячы на яго штаны, на пінжак, пацёрты на локцях, на прышытыя рознымі ніткамі гузікі кашулі... «Што ён кажа? Навошта, каму?» — думае яна і таксама, як і ўсе, схіляе галаву над партай.

Аднойчы пасля выхадных ніхто з класа не зрабіў хатняга задання. І Таня таксама. На выхадныя прыязджала з горада Надзя, старэйшая сяброўка, якая вучылася ў тэхнікуме, Таня пайшла з ёю ўвечары ў клуб, на танцы, потым за клубам Надзя курыла, Таня папрасіла і яе навучыць... Словам, загулялася, і не да ўрокаў было.

— Малайцы! — сказаў Міхаіл Іванавіч, прайшоўшы між радоў і глянуўшы сшыткі. — Усё правільна — гуляй, Ванька, Бога нет!

І сеў сабе моўчкі за стол і чытаў, ні на што не зважаючы. У канцы ўрока падняўся, сказаў гнеўна, ківаючы тоўстым пальцам:

А вы в земле проживете,
Как черви слепые живут.

(Узмах рукою.)

Ни сказок про вас не расскажут,
Ни песен про вас не споют!

— Усіх пакідаю пасля ўрокаў. (Урок беларускай мовы апошні.) Перапісвайце, спісвайце адзін у аднаго, што хочаце рабіце, хоць на галовах стойце, — але кожны падыдзе да стала, пакажа практыкаванне, тады свабодны.

Потым, пакашляўшы, але ўсё так жа строга:

— Ты, Таня, можаш ісці. Я цябе адпускаю.

— Я не зрабіла, Міхаіл Іванавіч.

— Значыць, у цябе была важная прычына, — спакойна адказвае настаўнік. — Ідзі.

Дзяўчынка не кранаецца з месца. Праз момант ёй зноў ззаду кідаюць на парту запіску — тою ж рукою зноў намаляваныя людзі, сукупленыя ў палавым акце.

Перапісваюць практыкаванне хутка, каб паспець яшчэ да званка, падносяць адзін за адным да стала. Міхаіл, нават не правяраючы, ставіць каму пяцёрку, каму чацвёрку, і адпускае. Таня, нізка схіліўшыся над сшыткам, марудна выводзіць кожную літарку.

Урэшце яны застаюцца адны ў класе, настаўнік і вучаніца.

— Таня, давай дзённік, — кажа Міхаіл Іванавіч, устае і пачынае збірацца. — Я табе даўно ў журнал пяцёрку паставіў.

Дзяўчынка бярэ партфель, сшытак, падыходзіць да стала:

— Вось... — і замест сшытка падае настаўніку запіску, дзе людзі ў палавым акце.

Той няўцямна, блізарука ўзіраецца; потым яго вялікая далонь разам з паперкаю пачынаюць дрыжэць.

— Ну, чарты дзікія... Што выдумаць... На гэта розуму хапае... На, парві хутчэй, каб ніхто не бачыў! Ты, Таня, я табе вось што скажу... Прысядзь.

Вучаніца паслухмяна сядае за першую парту, настаўнік цяжка апускаецца ў крэсла.

— Ты, Таня, менш іх слухай. Ты ім не роўня, у цябе галава светлая, табе трэба вырывацца адсюль у вялікае жыццё, бацькі ў цябе няма, памагчы ніхто не паможа, а будуць толькі...

Дзяўчынка глядзіць яму проста ў вочы, і ён ад пагляду гэтых цёмных, вільготных, нібы сонных, вачэй бянтэжыцца, кашляе і нават чырванее.

— Куды вырывацца, Міхаіл Іванавіч?

— Як куды — у горад! Можа, нават у Мінск. Ты выдатніца, цягні на медаль...

— І што ў тым горадзе? З мужыкамі, па абшчагах? — спакойна, сваім зусім яшчэ дзіцячым голасам пытае яна.

Міхаіл Іванавіч аж закрывае сабе далоняю рот, быццам у яго вырвалася гэтае слова.

— Таццяна... — шэпча ён і азіраецца на дзверы. — Цішэй, ты ж мяне падводзіш!

— Надзя вунь расказвала. Ведаеце, што яны там вытвараюць? П'юць, кураць і трахаюцца. Шчасце такое, горад...

— Надзя цябе навучыць! Ты вельмі разумная дзяўчынка, будзеш сама сябе глядзець, і... і...

Зноў яе вочы не даюць яму сабраць слоў.

Раптам ён нібы разумее нешта, замаўкае, і твар яго робіцца зусім ужо чырвоным.

— Таня, — мармыча ён, не падымаючы галавы, — Таня, у мяне ўжо ўнучка магла б быць такой, як ты... У мяне трое дачок...

— А гузікі рознымі ніткамі прышытыя. І латачка вунь на локці.

Настаўнік спалохана ўскідвае руку і глядзіць на латачку. Тані смешна гэта, і шкада яго, нейкая пяшчота да яго, як да бацькі, якога ў яе няма; хочацца ўзяць яго вялікую далонь у сваю і прыціснуцца да яго пляча... Але яна — дзяўчына, жанчына, і векавы інстынкт прымушае яе гаварыць не тое, пра што яна думае, і рабіць не так, як ёй хочацца.

— Вы не бойцеся, Міхаіл Іванавіч, — яна стараецца надаць голасу абыякавасць. — Больш такіх запісак не будзе. Я ведаю, хто іх прысылае.

Настаўнік маўчыць, яна пстрыкае замкамі партфеля, апранае плашчык, які не здавала сёння ў гардэроб, бо ў класе халаднавата, ідзе да дзвярэй.

— Да пабачэння, Міхаіл Іванавіч.

— Таня, — ціха кажа настаўнік. — Таня!..

Але дзяўчынка, мабыць, не чуе. Зачыняюцца за ёй дзверы.

Настаўнік збірае свае кнігі і, задуменны, прыгорблены, тэпае ў настаўніцкую. Там сядзіць толькі завучыха, Паліна Пракопаўна, якую і вучні, і настаўнікі за вочы завуць проста Полька.

— Вам жонка толькі што званіла з горада, — кажа Полька, абмацваючы яго з галавы да ног насмешлівым, нячыстым позіркам. — Прасіла пазваць вас, я сказала, ён сядзіць з вучаніцай пасля ўрокаў. Тады яна наказала перадаць, каб вы не адразу дамоў ехалі, а каля вакзала зайшлі ў магазін і купілі... Вось, я запісала.

— Я помню, — суха адказвае Міхаіл Іванавіч і адводзіць яе руку з вырваным каляндарным лістком.

Ён хутчэй нацягвае сваю чорную куртку, адвярнуўшыся, каб завучыха не бачыла, што ў ёй зламаны замок-«маланка» і знізу яго

трэба прымацоўваць шпількаю, урэшце спраўляецца, зашморгвае, бярэ свой пусты саквояж і, буркнуўшы «ўсяго добрага», выходзіць на восеньскі непрыветны двор. Імжыць дождж; Міхаіл Іванавіч насоўвае на галаву капюшон, памалу ідзе да прыпынку. Па дарозе шнырыць па кішэнях курткі, знаходзіць два скамечаныя прабітыя талончыкі. Адзін, абгледзеўшы, выкідвае, другі разгладжвае, каб не было відно дзірачак — спатрэбіцца яшчэ. (Да горада ў яго праязны, а ад вакзала тры прыпынкі ехаць гарадскім аўтобусам, з вечнымі кантралёрамі.)

«Таня... Таня...» — думае Міхаіл Іванавіч і ніяк не можа дадумаць, пакуль не разумее — гэта ж ён гукае, кліча яе!..

Холадна на прыпынку, імжа, пуста — няма пасажыраў. Настаўнік ставіць саквояж на мокрую лаўку і глыбока хавае рукі ў кішэні.

Якая тут Таня, куды ўжо табе, Міхаіл Іванавіч, зваць Таню!..

## 15. Здзірай з «Вожыка»

І якое ж было маё расчараванне, калі, ужо студэнтам, я сустрэўся аднойчы з былым настаўнікам, і я памкнуўся пахваліцца (усё ж плён яго навукі, прамая сувязь з прадметам):

— Вось, Міхаіл Іванавіч, дзве кніжкі напісаў...

— І годзе, — быў абыякавы адказ. — Вунь які худы. Цяпер пара і пра сябе падумаць. А калі ўжо так захочацца друкавацца, бяры старыя часопісы, памяняй трошкі прозвішчы, абстаноўку... Прыроду адзін к аднаму пакінь, яе ўсё адно ніхто не чытае. А то са старых «Вожыкаў» здзірай, я спрабаваў, друкуюць, ніхто не заўважае...

Якое расчараванне! Хоць у гэтым плане я і перарос свайго настаўніка.

Мы не развітваемся з ім, з гэтым, несумненна, арыгіналам, які адыграў у маім жыцці каласальную ролю, калі не ўсяму, што ёсць ва мне добрага, дык вельмі многаму я гэтаму чалавеку абавязаны.

Ён яшчэ паявіцца, і неаднойчы, толькі ў розных іпастасях, у нашым дзіўнаватым рамане-выбраным, рамане-біяграфіі, рамане-эсэ.

## 16. Палітэх

Спатрэбілася «пройти чуть не полмира», каб зразумець, якое ў цябе дома ўсё ўнікальнае, багатае, рэдкае, непаўторнае...

Мой падлеткавы перыяд быў шчаслівы, адназначна. Маці... Сябры... Гумар, назіральнасць... Арэхі, ягады, грыбы, рыбалка —

прырода... Усяго хапала, усё пад бокам. Мне шэнціла. Я не проста хадзіў па жыццёвым лязе — я па ім бегаў, без страхоўкі, не балансуючы, і не звальваўся.

І навошта ж, навошта трэба быў добраахвотны зыход з таго рая?!

Чаму не адцягваў, як мог, дакуль можна, хаця б 9-м, 10-м класамі? На халеры ён мне здаўся, той палітэхнікум?

Медкамісія. «Як ты вучышся?» — «На пяць». Доктарка ўсплясквае ў ладкі: «Куды ж ты лезеш? Ты ж сабе лёс ламаеш!» Не лёс яна, канечне, сказала, судьбу, але сэнс ад гэтага не мяняецца.

Блат быў? Так, блат. Не хацелася ўпускаць выпадку. Экзамены... Паперка аб залічэнні, больш падобная на міліцэйскую павестку. «...Вам необходимо явиться для отработки 2-х недель по упорядочению общежития. При себе иметь...»

Да, б..., приехал и попал,
Как Чацкий — с корабля на бал.

Помню, стаю каля інтэрнацкага ганка, размаўляю з прыбіральшчыцай. Ба-бах!!! — з пятага паверха аб асфальт трохлітровы слоік з фарбаю! «Свінні! — лаецца прыбіральшчыца. — Гэта ж каб крыху бліжэй, усё адзенне аблілі б». — «Каб бліжэй, — кажу, — дало б па галаве і адзенне не спатрэбілася б». — «Ну правільна — каб бліжэй, так бы абпырскала, што пасля не адмыць».

Адарванасць ад прыроды, вырванасць з яе, як дрэва з коранем, выбачайце за банальнае параўнанне. Не інтэрнат — менавіта абшчага, абшчак, брыдкая, з доўгімі калідорамі, за дзвярыма клеткі з чатырма койкамі. Усё. Абавязкова мець пры сабе тапкі і дыванок на сцяну (кот у капелюшы ідзе з вудамі і з вядром, з якога тырчаць рыбіныя хвасты). Скразнякі, смурод, агульныя туалеты, адсутнасць — поўная — гарачай вады. Раз на тыдзень кіно. Голад, холад, па выхадных прыезды-наезды ў вёску. Праўда, канікулы, але і яны атручаныя тым, што неўзабаве скончацца і зноў трэба будзе вяртацца ў ненавіснае пекла...

Пераглядаючы сваё напісанае, я са здзіўленнем бачу, што нічога — ніц — (за выключэннем ніжэй прыведзенага ўрывачка) няма ў мяне пра перыяд ад 15 да 18 гадоў. А гэта ж, здавалася б, такія залатыя гады! Няўжо нічога? Чаму час і памяць не падфарбоўваюць тыя гады ў ружовае?

Не. Не хочуць. І ўжо бачу, і ведаю, што ніколі, ніколі —

не покорюсь, не примирюсь
со всею мерзостью,

жестокостью и скукой
тех лет…
Увольте — я ещё поэт!

## 17. «Сачыненне»

Учарашні васьмікласнік, а цяпер навучэнец палітэхнікума Валодзя Вяргейчык сядзеў за партай і, для выгляду наморшчыўшы лоб, глядзеў на доўгія рады лічбаў, іксоў, ігрэкаў, якія, старанна стукаючы крэйдай, выпісваў на дошцы выкладчык матэматыкі. (Оп, вось яны, пайшлі — анты-Міхал-Іванычы.)

«І як гэта людзі могуць так разумець — ды што там разумець — захапляцца сухімі бяздушнымі лічбамі? — здзіўляўся Вяргейчык. — Я разумею тры яблыкі ці, скажам, дваццаць пяць кароў, — яму на міг стала весела, — бо гэта можна ўявіць. Але квадратны корань з трох? Лагарыфм з дваццаці пяці? Канечне, лічбы патрэбны, але ж зноў-такі толькі тым, каму падабаецца з імі важдацца...»

Увесь амаль урок у Вяргейчыка было адчуванне, што выкладчык проста знарок, жартам стараецца даказаць ім, быццам умець абыходзіцца з лічбамі так і гэтак — найвялікшая асалода. Ён нават неяк падспудна чакаў, калі таму надакучыць вадзіць іх за нос і што хутка, засмяяўшыся, выкладчык скажа: «А што, паверылі, што цікава? Вось паверылі ж?» — пасля чаго вытра дошку і пачне на ёй нешта маляваць ці хоць бы пісаць словы, якія так лёгка ўяўляюцца. Вось хоць слова «сіні», напрыклад...

Вяргейчык крадком пачаў паглядваць у акно, і ўсмешка раз-пораз прабягала па яго твары. «Сіняе неба, сінія вочы — такое лагоднае, такое... пяшчотнае слова, — з замілаваннем думаў ён. — Але нуль цэлых тры дзясятых? Хоць забі, галава мая пустая, і ні пяшчоты, ні лагоды гэтыя нулі не выклікаюць, бо нуль — ён і ёсць нуль...»

Так Вяргейчык прасядзеў да канца ўрока, разам са званком сарваўся з месца і першы выскачыў на калідор. Ён спусціўся ўніз (іх група займалася на трэцім паверсе) і выйшаў на двор, жмурачыся ад ранішняга вераснёўскага сонца.

Ад тэхнікума да шашы, дзе быў аўтобусны прыпынак, цягнулася доўгая, яшчэ па-летняму густая алея таполяў. Мокрае пасля начной расы лісце пад яркімі промнямі сонца ззяла цёмна-чырвоным золатам. Нібы сагрэтыя цяплом, старыя, з маршчыністай, патрэсканай карой дрэвы ледзь чутна шумелі — здавалася, гэта яны, таполі, і наганяюць лёгкі ветрык. Сярод круглай бетоннай клумбы перад самым

уваходам, над дробнымі сінімі кветкамі ўзвышаліся два маленькія, познія сланечнікі, у якіх ніколі не бывае зярнят. Яны ўсё ж важна паварочвалі свае мала жоўтыя галовы да сонца, нібы сапраўдныя вясковыя таўстуны-сланечнікі, якіх абвязваюць марлямі, каб не падзяўблі вераб'і...

Цёплая залатая восень! Вяргейчык засмяяўся і заплюшчыў вочы — на міг здалося, што ён не ў тэхнікуме, а зноў у сваёй старой драўлянай школе, выйшаў на ганак і дыхае, не можа надыхацца роднымі, блізкімі з дзяцінства пахамі восені... Поўнасцю забыцца перашкаджаў хіба што роўны гул машын з шашы...

— Здароў! — нехта крануў Вяргейчыка за рукаво.

Гэта быў невысокі белабрысы юнак, які вучыўся ў другой групе, а родам быў з суседняй Вяргейчыку вёскі. Прозвішча яго было Жменька. (Яшчэ ў школе хлопец вельмі не любіў, калі з ягонага прозвішча смяяліся, і даказваў, што такое ж меў адзін з герояў аповесці Шамякіна.)

Вяргейчык моцна пацiснуў руку земляка і ўздыхнуў.

— Фізіка ў вас?

Жменька таксама ўздыхнуў і кіўнуў галавой. **(Адна крытык пазней напіша: «Героі Федарэнкі ўвесь час ківаюць і з галавой нешта робяць.)** Прыжмурыўшы вочы, ён паглядзеў перш на таполі, а потым прыслухаўся да гулу на шашы.

— Грыбоў зараз поўны лес, га? — ажывіўся ён раптам. — Я іх так спрытна бяру — каб хто толькі ведаў...

Вяргейчык не паспеў адказаць, бо празвінеў званок, трэба было спяшацца. У тэхнікуме вялі своеасаблівую барацьбу супраць спазненняў: за першае — выклікалі да класнай, за другое — да завуча, а за трэцяе — пасылалі дамоў адзін са спецыяльных бланкаў, якія друкаваліся ў бухгалтэрыі пра запас і былі такога зместу: «Ставим Вас в известность, что Ваш(а) сын — дочь (падкрэслівалася) систематически опаздывает на занятия...» і г. д. Мелася на ўвазе, каб бацькі кідалі ўсе справы і, схапіўшыся за галаву, ляцелі за блізкі свет прымаць меры.

Канечне, гэтыя выклікі і пісьмы не зменшылі лік спазненняў, наадварот: тыя, што спазняліся на хвіліну, не ішлі на цэлы ўрок — усё адно давядзецца адказваць, дык лепш за ўсё разам.

...Калі задыханы Вяргейчык прыбег у аўдыторыю, яго чакала прыемная навіна: другі ўрок матэматыкі адмяняецца, будзе літаратура! Ужо прыходзіла Клара Іванаўна і сказала, што раз ніхто не браў ні канспектаў, ні падручнікаў, будуць разбіраць сачыненне, якое пісалі на пазатым уроку.

— Здорава як! — ляпнуў узрадаваны Вяргейчык па плячы свайго суседа па парце Смолера.

— Будзе яшчэ больш здорава, калі Клара двойку мне ўпякла, — як заўсёды, марудна адказаў той.

— Ты ж спісваў, здаецца?

— А хіба за спісаныя сачыненні пяцёркі ставяць? Яна хітрая...

— Нічога не хітрая, — запярэчыў Вяргейчык.

Смолер прамаўчаў і праз момант загаварыў пра другое:

— Ты, я гляджу, не баішся, — заўважыў ён.

— Яшчэ чаго, — абыякава махнуў рукой Вяргейчык. — Я ў школе ведаеш як сачыненні гэтыя пісаў? Ніколі тройкі нават не было.

— Дык то ў школе.

— А тут што? Мяне нават наш дырэктар, ну, з нашай школы, адгаворваў, каб не паступаў сюды, каб перш дзесяць класаў скончыў. Ты ж літаратар, кажа, — пахваліўся Вяргейчык.

— Ого, — здзівіўся Смоляр. — Чаго ж ты паступаў?

— Папытай у мяне, — кісла ўсміхнуўся Вяргейчык. — Дзядзька мой, нават не дзядзька, а я і сам толкам не ведаю, хто ён нам, дык вось гэты родзіч паспрыяў, у двукоссі. Ідзі, кажа, паступай. Кватэра потым, кажа, у першую чаргу, грошы добрыя...

**(Пры ўсім наіве, нецікавасці, слабасці — які дакумент часу. Хаця б тыя ж самыя бланкі. Калі б я іх яшчэ згадаў?..)**

— А свая галава нашто?

— Каб на тую галаву ды цяперашні розум, — разважліва адказаў Вяргейчык, чым вельмі развесяліў свайго таварыша.

— Як жа ты вучыцца будзеш, галава? — смеючыся, запытаў Смоляр. — Я ж заўважаю, ты дуб у матэматыцы.

— А я і не буду. Я ўжо вырашыў...

Ён не дагаварыў, бо ў аўдыторыю хуткім энергічным крокам увайшла выкладчыца літаратуры Клара Іванаўна.

Гэта была высокая, дзябёлая жанчына, якая вельмі глядзела за сабой: падмалёўвала губы, павекі, пудрылася. Апраналася яна вельмі па-сучаснаму, што зусім ёй не ішло, бо Клара Іванаўна была ў гадах.

**(А ўсё ж партрэты і апісанні прыроды цярпімыя, як для самага першага ў жыцці апавядання.)**

Яна спынілася пасярод аўдыторыі, цярпліва чакаючы, пакуль сціхне шум і ўсе падымуцца.

— Добры дзень, сядайце, — павіталася ціхім, стомленым голасам. Прайшла да стала, але не села, толькі абаперлася аб яго рукой, другой асцярожна паправіла валасы і, застыўшы, пачала доўга,

задуменна глядзець у акно. Яна стаяла так кожны раз — нібы настройваючыся перад урокам, і заўсёды гэтая задумёная постаць так падабалася Вяргейчыку.

«Як правільна! — усхвалявана думаў ён. — Толькі так павінен пачынаць урок сапраўдны выкладчык...»

Пастаяўшы крыху, Клара Іванаўна села за стол.

— Дзяжурны, раздайце, калі ласка.

Яна падсунула на край стала стос сшыткаў, разгарнула журнал і схілілася над ім.

Дзяжурны быў якраз Смолер. Калі ён разнёс сачыненні па партах і разгарнуў сваё, твар яго спахмурнеў. Ён штурхнуў Вяргейчыка локцем у бок — глядзі! Сапраўды, як Смолер і баяўся, стаяла двойка і ўнізе — «Спісана!»

— Усё, праляцела стыпендыя, — шэптам падвёў ён вынік. — А-а, хай старыя прысылаюць — я што, грошы зарабляць сюды прыехаў?.. Давай лепш тваё паглядзім, — прашаптаў ён ужо зусім спакойна.

Але Вяргейчык не спяшаўся і толькі пагладжваў пальцамі па вокладцы сшытка, адчуваючы незразумела чаму хваляванне.

— Давай, не бойся, літаратар, — падбадзёрыў Смолер.

— Была не была...

Вяргейчык хутка разгарнуў сшытак і спачатку нават не вельмі здзівіўся, калі ўбачыў пад роўнымі радкамі свайго сачынення якраз такі, як у Смолера, подпіс і адзнаку — адзінку.

Смолер шчоўкнуў языком, хацеў нешта сказаць, але стрымаўся.

— Але чаму не двойка? — прашаптаў Вяргейчык. — Дай...

Ён схапіў сшытак Смолера і пачаў параўноўваць са сваім.

— Тут «спісана» і ў мяне «спісана», але чаму не двойка? — зноў разгублена паўтарыў ён.

— Якая розніца? — заўважыў Смоляр.

Тут Вяргейчык і сам зразумеў, што вярзе глупства. Хіба галоўнае, якая адзнака?

У галаве яго за адзін момант пранеслася: твар хлопца-земляка, «літаратар», «грошы добрыя...», «стыпендыя праляцела...» Вяргейчык адчуў, як стала горача вушам ад сораму, і чамусьці пацёр іх далонямі. Смолер са спачуваннем глядзеў на яго.

— А ты не маўчы, — нахіліўшыся бліжэй, параіў ён Вяргейчыку. — Падыдзі, скажы — так і так. Я спісаў — дык сяджу не рыпаюся, а табе што...

Вяргейчык хутка павярнуўся да сябра, і ў вачах яго засвяцілася ўдзячнасць.

— Ты мне верыш?

— Канечне. Хочаш, я зараз сам скажу? Хочаш?

У Смолера была нейкая пастаянная гатоўнасць рабіць для другіх тое, на што яны самі не адважваюцца. Адпіхнуўшы руку Вяргейчыка, які цягнуў яго за крысо пінжака, ён хутка падняўся і на гэты раз не марудна, а залпам выпаліў:

— Клара Іванаўна, Вяргейчык сам напісаў, а вы напісалі, што спісаў!

Нехта хіхікнуў. Клара Іванаўна адарвалася ад журнала і паглядзела на Смолера пранізлівым позіркам, ад якога хлопец сумеўся і сеў на месца.

— Пісаў — спісаў, нічога не разумею, — прамовіла нарэшце выкладчыца. — Вяргейчык, што ў вас?

Вяргейчык падняўся, скоса зірнуў на збянтэжанага Смолера і пацiснуў плячыма:

— Ды вось, я, Клара Іванаўна, чэснае слова, не спісваў...

Ён адкрыта глядзеў проста ў вочы выкладчыцы, усім сваім выглядам паказваючы, што ніколькі не крыўдуе на яе за гэтую маленькую недарэчнасць.

— А хто вам сказаў, што вы не спісвалі?

— Як гэта? — разгубіўся Вяргейчык. — Ну, думкі мае сказалі, — паспрабаваў ён пажартаваць і ўсміхнуўся з надзеяй на ўсмешку ў адказ, але твар Клары Іванаўны застаўся такім жа строга-абыякавым.

Вяргейчыка раптам асяніла — проста яна трапіла ў няёмкае становішча і не ведае, як з яго выйсці!

— Вы толькі не падумайце, — горача сказаў ён, прыціскаючы правую руку да грудзей. — Я маю на ўвазе... — Вяргейчык ніяк не мог знайсці патрэбнага слова.

— Сядайце! Вы надта доўга «маеце на ўвазе», — сказала Клара Іванаўна і спакойна, нібы нічога не адбылося, схілілася над журналам.

Вяргейчык сеў. Ён зрабіўся ўвесь чырвоны і баяўся падняць галаву — здавалася, уся група глядзіць на яго і думае толькі пра яго. Але калі ён спадылба акінуў аўдыторыю хуткім позіркам, то ўбачыў, што нікому да яго няма справы: хто цішком падчытваў наступны ўрок, хто наогул драмаў, а дзве дзяўчаткі-блізняты, што сядзелі збоку ад Вяргейчыка, глядзелі адна на адну і шапталі скарагаворкай песеньку. Яны даволі-такі захапіліся, нават Клара Іванаўна вымушана была адарвацца ад сваёй работы і пастукала алоўкам па стале:

— Таварышы, ціха! Праверце яшчэ раз сачыненні — шмат было памылак! — яна крыху памаўчала і дадала: — Я двоек ставіла мала,

бо для мяне было важна, каб чалавек сам, — на гэтым слове яна зрабіла націск, — вучыўся пісаць.

Вяргейчык ужо не слухаў выкладчыцу. Калі да гэтай размовы ў яго была цвёрдая ўпэўненасць, што гісторыя з сачыненнем — яўная памылка, якая рана ці позна вырашыцца, то цяпер усё станавілася рэальньм. У ім варухнулася невыразнае адчуванне, што не толькі стыпендыю ён можа страціць (гэта ён бы перажыў), але што так і не зможа — ніколі і нікому даказаць, што пісаў ён сам. Але як жа так? Няўжо дарослая, разумная жанчына, выкладчыца, не разумее гэтага? Ці не хоча разумець? Дапусцім, яна не захацела пры ўсіх разбірацца, бо збаялася, што сама магла памыліцца. Але ад таго, што яна падумала пра сваю рэпутацыю, яму ж не лягчэй... Павінна ж быць справядлівасць у чалавека...

— Давайце я пры вас напішу! — нечакана для сябе сказаў гучна Вяргейчык.

Падняліся заспаныя галовы з задніх парт, дружна павярнуліся да Вяргейчыка прыціхлыя дзяўчаты-блізняты. Клара Іванаўна ўздрыгнула і ўстала.

— Ну, хопіць! Вяргейчык, пакіньце аўдыторыю! — ад прыкрасці яна нават перасмыкнула сваімі ярка-чырвонымі вуснамі.

— На прынцып пайшла, — спачувальна прашаптаў Смолер, калі Вяргейчык збіраў падручнікі.

«Прынцып, — зларадна думаў Вяргейчык, сноўдаючыся па калідоры ў чаканні званка. — Гэта добры прынцып — людзям не верыць!»

Пасля ўрока ён намерыўся ісці скардзіцца класнай кіраўніцы, таму цяпер адчуваў у сабе сілу — нават думаў пра сябе ў множным ліку — «мы». «Мы пакажам, мы дакажам...»

«Я, канечне, моўчкі выслухаю яе прабачэнні, слова не скажу... Скажу толькі: «Эх, вы...» Не, лепш ні слова!»

Тут Вяргейчык успомніў, як хваляваўся ад лірычнасці, калі глядзеў на задуменную постаць выкладчыцы. Яму стала сорамна за сябе.

Прагучаў званок. Загрукалі дзверы, і праз хвіліну калідор запоўніўся шумам, тупатам ног, смехам і галасамі. Вяргейчык глядзеў на гэтую мітусню і не верылася яму, што не так даўно мог ён гэтак жа бестурботна, з лёгкай душой смяяцца, жартаваць і ні аб чым благім не думаць. Але нават проста так стаяць і перажываць, як цяпер, было ўсё-такі лепш, чым некуды ісці і нечага дабівацца...

Ён уздыхнуў і памалу, з заміраннем сэрца падышоў да кабінета класнай, узяўся за ручку дзвярэй і зараз жа адхапіў руку і нават засунуў

яе ў кішэню, нібы баючыся, што яна неяк паміма яго волі адчыніць дзверы. Пераўжыўшы ўжо ў думках сцэну свайго апраўдання, яму толькі цяпер прыйшло ў галаву, што ўсё можа адбыцца і не па яго сцэнарыі. Але і не пайсці было нельга, бо гэтая невядомасць гняла больш за ўсё. «Хвіліна, — падумаў Вяргейчык, — і ўсё зноў будзе па-ранейшаму».

**(Не, воля ваша, ёсць у гэтым дэбюце нешта — як рэдактар кажу.)**

Сабраўшыся з духам, ён пастукаў, не чакаючы дазволу, пацягнуў на сябе дзверы і ўвайшоў у кабінет.

— ...Між намі, толькі між намі, дзевачкамі, — пачуў ён нечы вельмі знаёмы голас, але не адразу скеміў, што гаварыла Клара Іванаўна, настолькі гуллівыя ноткі былі ў яе голасе. Сама яна стаяла ля акна спінай да дзвярэй і, прыўзняўшыся на дыбачках, палівала кветкі ў мініяцюрных гаршчочках, якія ў радок ляпіліся на кніжнай шафе.

«Папаў! — падумаў Вяргейчык. **(Нічога сабе. Памятаеце Чацкага?)** Ён зусім не чакаў убачыць тут Клару Іванаўну. — Але нават лепш — хай упэўніцца...»

За сталом сядзела класная — круглатварая, прыемная на выгляд жанчына, хоць і залішне поўная. Яна ўсміхалася і нібы з ухвалай глядзела на Вяргейчыка.

— Клара! — сказала яна, па інерцыі працягваючы ўсміхацца.

Клара Іванаўна хутка азірнулася і, здалося, ніколькі не здзівілася, убачыўшы Вяргейчыка.

— Ха, з'явіўся! — сказала яна звычайным, строгім голасам. — Уяўляеце, Тамара Міхайлаўна, сарваў мне ўрок. Прыйшоў вось, стаіць — палюбуйцеся на яго!

— Хто, Вяргейчык? — спытала класная. — Ён харошы хлопец.

— Я не зрываў урок, — узбадзёрыўся падтрымкай Вяргейчык. — Я — вось... — ён працягнуў класнай скручаны ў трубачку сшытак.

— Ну-ну, дайце мне, — падышла Клара Іванаўна. Яна ўзяла сшытак і разгарнула. Тыцнула пальцам і іранічна-ўрачыста, адхінуўшы крыху назад галаву, прачытала: /.../

Загарнула сшытак і паклала на стол.

— Добра? Добра. Але за свой дзесяцігадовы выкладчыцкі стаж я магу, мне здаецца, адрозніць чужыя думкі ад думак свайго вучня. Вы скажаце, — яна махнула рукой, заўважыўшы, што Вяргейчык збіраецца перабіць, — скажаце, я магу пісаць пры вас, на вашых вачах. Калі ласка. За свой, як вы ўжо ўпэўніліся, немалы стаж я сустра-

кала вучняў з добрай памяццю, не больш, якія лёгка маглі ўзнаўляць на паперы нават адзін раз прачытаны тэкст.

Вяргейчык пахаладзеў. Яму ўжо не хацелася ні спрачацца, ні даказваць, ды ён бы ўжо і не змог, таму што ўсе думкі блыталіся, акрамя хіба адной — нашто ён сюды ішоў?

— Можа, ён сам напісаў? — спытала класная і паглядзела на Вяргейчыка.

Клара Іванаўна ўсміхнулася.

— Мяккае сэрца ў цябе, Тамара Міхайлаўна. А пасля здзіўляемся, адкуль бяруцца спецыялісты, якія не могуць правільна напісаць слова «інтэлігент»...

Вяргейчык ступіў да стала і толькі працягнуў руку, каб забраць сшытак, як у гэты момант ля яго ног нешта звонка дзынкнула. Ён уздрыгнуў, толькі цяпер успомніўшы пра дзірачку ў кішэні, якую збіраўся зашыць ужо трэці дзень, але то не было іголкі, то забываўся... «Малайчына! — з нейкім вясёлым адчаем пахваліў сябе Вяргейчык. — Скажы дзякуй, што больш нічога няма ў кішэні!»

Тры пары вачэй правялі позіркамі двухкапеечную манету, якая, падскокваючы на швах паркета, апісала роўны паўкруг і доўга яшчэ звінела недзе пад шафай. Выкладчыцы пераглянуліся.

— Мне можна ісці? — спытаў Вяргейчык. Яму хацелася спытаць з выклікам, незалежна, а выйшла нечакана вінаватым і злёгку дрыготкім голасам.

— Не, пачакайце, — сказала Клара Іванаўна мякка, і ад гэтага Вяргейчыку чамусьці стала трывожна.

Ён апусціў галаву і пачаў глядзець на свае чаравікі. Клара Іванаўна падышла бліжэй і, стараючыся зазірнуць яму ў вочы, лагодна сказала:

— Ну, нічога страшнага — спісаў дык спісаў... Як цябе завуць?

— Ён у нас Валодзя, — адказала за яго класная.

— Слухай, Валодзя, — Клара Іванаўна трохі памарудзіла. — Чаму ты так дрэнна апранаешся? Раскажы, не бойся, можа, дома што? Можа, бацька п'е? Не бойся, тут жа чужых няма, — павяла яна рукой вакол сябе.

— У яго няма бацькі, — зноў адказала класная, — адна маці. Вядома, цяжка. А заўтра стыпендыяльная камісія... Ага! — тут здагадалася яна. — Хлопчык, напэўна, таму і прыйшоў.

Вяргейчык падняў галаву. Тамара Міхайлаўна глядзела на яго з жалем. Клара Іванаўна прыязна ўсміхалася.

— Ну што ж. Калі так... — сказала яна і, падцяўшы вусны, нейкі момант глядзела ў адну кропку, абдумваючы нешта. — Ай, Тома, давай зробім выключэнне!

Клара Іванаўна зноў разгарнула сшытак і агледзелася па баках. Тамара Міхайлаўна падала ёй ручку з чырвоным чарнілам. Клара Іванаўна прымерылася да адзінкі, чыркнула палоску ўверх так, што атрымалася чацвёрка, і закрэсліла слова «спісана».

— Уся праблема! — засмяялася класная.

— На, — працягнула Клара Іванаўна сшытак Вяргейчыку. — Ну, я думаю, залішне напамінаць, што мы пайшлі табе насустрач... Вучыся, не крыўдзі маці, — яна падумала, што б яшчэ сказаць. — Цябе папракаю, — звярнулася да класнай, — што сэрца мяккае, а сама...

І Клара Іванаўна ўсміхнулася ўсмешкай чалавека, які не прывык выстаўляць напаказ сваю велікадушнасць...

## 18. «Рэцэнзія-водгук»

Ні ў воднай крытыцы свету не прынята чапаць дэбютантаў. Толькі не ў нашай. Наша, падобна, адных дэбютантаў і чапае. І поруч з тым — якое рабалепства перад г. зв. імёнамі, імёнамі, якія, на добры лад і калі ты добры крытык, варта было б размазаць, як кашу па талерцы. Ды Бог з ім. «Крытыкуйце» і далей. Толькі не плачцеся, што ў нас няма твораў-узораў, вартых вашага пяра — сапраўдны крытык разгорнецца і на прыкладзе антыўзораў.

Усе водгукі, якія з'явіліся на маё першае ў жыцці «Сачыненне», былі адмоўныя. Захаваўся адзін. Анатоль Сідарэвіч. «Творы двух дэбютантаў — 23-гадовага студэнта Андрэя Федарэнкі і старэйшага за яго на дваццаць гадоў Г. Станкевіча — надрукаваны ў студзені і ў лютым. Што запомнілася? Фабула **(о-о, як вам? Пачатак рамана. Не, далібог, пачынаю верыць, што свет напоўнены знакамі, намёкамі, супадзеннямі...)** Федарэнкавага апавядання пра сачыненне. Вучань напісаў самастойнае, арыгінальнае сачыненне. Выкладчыца падумала, што ён яго спісаў, і паставіла вучню «адзінку». Хацеў бы і я, чытаючы Федарэнкаву публікацыю, не паверыць і спытаць: «Няўжо аўтару ўсяго дваццаць тры гады?» І ўжо напэўна я не паўтарыў бы памылку тае настаўніцы...»

«Іслач». Нарада маладых пісьменнікаў, 86 год. Яўгені Лецка (пра мяне): «Я думаў, гэта дарослы мужчына, за 50... Вось такія і губяць нашу літаратуру. Яму 23, а піша так, нібыта 83».

Уладзімір Дамашэвіч (дамашняя, добрая душа) — «Федарэнка як музыкант, які не ведае нотаў, бярэ на слых, правярае да таго часу, пакуль не перастане фальшывіць...»

Аднак нам цікава пакуль што іншая музыка — палітэх, туды, туды!

## 19. Тупы

Выхавацель у інтэрнаце. Мянушка Тупы, прозвішча Шэлепень. Рэдкая сволач. Хворы на эпілепсію. Як усё ж Бог шэляпеняў меціць! Гэткі Шарыкаў, ніколі ён не скажа «добры дзень», «да пабачэння», «дзякую», усё яму хочацца, каб «па-прастому», без кніжнаінтэлігентных цырымоніяў.

Хлопец, на думку выхавацеля Тупога, павінен пакурваць, крыху «бухаць», крыху (не ўсур'ёз) з дзеўкамі, рыхтавацца да арміі, брынькаць на гітары, менш думаць, менш чытаць — ізноў у нас «усе беды ад філалогіі»! У размове быць у меру коснаязыкім, калі і ўжываць газетна-тэлевізійна-вучоныя словы, дык іранічна...

Вядома, каго ён хоча з нас зляпіць — такіх, як сам.

Апантаны выканаўца тайнай (а мо і яўнай) дактрыны палітэха: шэрасць, ураўнілаўка, умеранае хамства.

Дысцыпліна сярэдняя паміж армейскай і турэмнай.

Мне страшна не пашэнціла — ён мяне не любіць.

## 20. Лагун і Алёшкіна

2-гі курс. Іван Лагун — хлопец з маёй групы, Алёшкіна — першакурсніца (15 гадоў). На заняткі не ходзіць, бадзяецца па горадзе, а ноччу спіць з гэтым самым Лагуном.

Упершыню ў жыцці ўбачыў голую дзяўчыну ў ложку, якая не саромелася гэтага.

Тэхнікум, перапынак. Курым у туалеце, акно расчыненае. Хтосьці заўважае на вуліцы Алёшкіну.

— Лагун, пакліч!..

Лагун звешваецца з акна, закладвае два пальцы ў рот, свішча.

— Ідзе! — рагочам мы. — А яна ідзе!

— Алёшкіна, Паганкіна ты!

Яна стаіць, глядзіць знізу ўверх на акно мужчынскага туалета і пасміхаецца. Прыгожая, тоненькая, стройная... Вось бы мне такую!

Як бы я яе любіў, абараняў, колькі ўсяго б нарасказваў, мы б хадзілі ў кіно, марожанае, тыры-пыры, ёй не было б са мною сумна, я б называў яе багіняй і феяй, а не Паганкінай...

Ну чаму яна не адчувае, хто мог бы яе па-сапраўднаму ацаніць?

## 21. Пераблыталі?

Дзяўчаты папрасілі вынесці вядро са смеццем. Самі баяцца, слабенькі ліхтар гарыць толькі над ганкам інтэрната, а сметніца — у чорнай цемры.

Восень, вечар, вецер, цёмна... Як пахне гэтая восень! І вось з гэтай восені, з гэтай цемры — чалавек пяць, як толькі пераступіў са светлага ў цёмнае... Па крэктанні — дарослыя. Б'юць моўчкі, проста на ўбой — каб забіць, не даюць упасці, я пералятаю ад аднаго да другога, як мячык. І ўсё ж нарэшце хтосьці — у любой хеўры знойдзецца хоць адзін такі: «Хопіць!»

Скіўіцы ў мяне не проста зламаныя — раструшчаныя ў шкло.

«Хуткая». Прыёмная бальніцы. Кроў на ўсім, і лужына яе на падлозе, і квохканне санітаркі, якая лазіць з анучаю каля маіх ног, і раздражненне мента, які не можа разабраць, што я гавару. А калі б і мог, што я скажу? Быў бы толк ад яго запісак. Можна падумаць, знойдуць. А калі знойдуць? Скажуць, памылка. Пераблыталі — і маю хату з чужою, і маю морду з чужою...

## 22. Іна

Сшыты рот. Да зубоў верхніх і ніжніх прывязваюцца пласціны, сцягваюцца гумкамі... Да атупення балюча. І кроў, кроў... Ляжаць месяц, нават больш. Голад. З ежы — таматны сок, сырыя яйкі і распушчанае ў гарбаце масла.

Маці прыезды. Дзядзькі Сцяпана, які заплакаў; вось табе, дзядзька, і адзін летні дзень.

І аднойчы прыйшла самая прыгожая дзяўчына з нашай групы, Іна. Адна. Крыху брыдка і сорамна было, што я ў такім стане. «Папраўляйся, выходзь, ты мне трэба...»

Марыў пра Алёшкіну-Паганкіну, а тут — у 100 разоў лепшая! Дзівосы, як і боль і кроў, будуць суправаджаць мяне ўсё жыццё.

## 23. Навушнікі

Зноў вучуся. Усё добра. Выходжу неяк з аўдыторыі — рука на плячо. Чалавек у міліцэйскай форме. Маленькі ростам, з вусікамі. Твар добры, разумны, стомлены. Я ўжо прывык да людзей у форме, ведаю, што ім трэба — яшчэ якія-небудзь дэталі па той справе, як мяне змясілі. Можа, знайшлі іх. Можа, штосьці так удакладніць. Але я нічагуткі не ведаю. Ноч, удары, боль і кроў. Нічога не магу дадаць новага.

— Заява на цябе. Загадчыца аддзялення бальніцы напісала. Навушнікі ад тэлевізара ў іх прапалі... Ты не браў?

Ну, што за глупства. Я не ведаў, што ў тым аддзяленні ўвогуле ёсць тэлевізар, як і першы раз чую, што да тэлевізараў ёсць нейкія навушнікі.

— «Рэкорд» стары, зламаны, у кабінеце загадчыцы стаіць.

Якая ахінея. Навошта мне ад зламанага тэлевізара навушнікі, ад мёртвага асла вушы...

— Андрэй, я табе нават падпісваць нічога не дам. Вучыся спакойна. Павар'яцелі яны там. Зараза загадчыца: чалавек і так адмучыўся ні за што, дык яшчэ трэба жыццё яму ламаць... Упэўнены — капнуць: бяруць яны хабар, на хворых нажываюцца...

Які мілы, разумны чалавек! Вось такія і павінны працаваць у міліцыі.

Праз тыдзень павестка. «Явиться… В случае неявки…»

З'яўляюся. Кабінет. Мой следчы.

— Прысаджвайся. Што ж гэта ты, га? Паверыў табе...

І раптам ззаду па нырках удар складзенымі ў замок рукамі. Грымаюся з крэсла, ашарашаны, напалоханы, адурэлы не столькі ад несправядлівасці, колькі ад незразумелай перамены, якая за тыдзень адбылася з такім мілым чалавекам, не сумняваючыся, што зараз будзе гасіць мяне нагамі. Зноў усё паблыталі: і злодзеяў, і ныркі мае з чужымі...

— Ты падпішаш, маць-перамаць, валэндацца яшчэ тут з табой! Навушнікі купі ў любым магазіне электратэхнікі, рубель дваццаць!

Падпісваю. Еду. Купляю. Малюсенькія дзве такія фіцюлькі, ніколі ў жыцці да гэтага не бачыў і ў руках не трымаў. Вязу ў міліцыю.

— Ну вось. Справа закрытая. Можа, ты іх і не браў.

— Вы... нікому не скажаце ў тэхнікуме? Стыпендыя... выганяць...

— Навошта? Як ты са мной, так я з табой. Жалезна. Замётана.

Выходжу з кабінета. Пара ўжо зразумець, дзе, з кім, у якім свеце я жыву і збіраюся жыць далей. Кім мне стаць у гэтым свеце? Пра-

рабам? Доктарам, загадчыкам аддзялення? Следчым? Ці далучыцца да кампаніі і «мачыць» каго-небудзь групаю?..

Без жартаў. Трэба ведаць, кім хочаш стаць, і тады толькі можна выжыць.

## 24. Рэктар

Актавая зала на 300 чалавек. Я сяджу побач з Інаю, яна трымае мяне за руку.

Даклад рэктара, нудны, узроўню правінцыйнага тэхнікума, але мне ён здаецца цікавей за цяперашняга Задорнава. Як я люблю гэтага рэктара, яго акуляры, голас, лічбы...

Але вось прагучала-мільганула ў дакладзе маё прозвішча. Раз, другі...

— Находясь на излечении в больнице... уворовал (гэтак) дорогостоящие наушники...

Божа, што гэта, не трэба, адкруціце назад, гэта ўсяго толькі сон, зараз я зраблю намаганне і прачнуся...

Рука Іны патроху вызваляецца з маёй.

## 25. Камандзір морга

Люблю Таню. Ну як люблю? Усміхаюся, калі бачу яе, і кажу: «Добры дзень, Танечка». Усё. Мне гэтага дастаткова. Яна фыркае, пырхае, чмыхае, не адказвае... Харошая вучаніца Тупога.

Падыходзіць першакурснік, і яшчэ кампанія, не тэхнікумаўскіх, чалавек шэсць, з ухмылачкамі.

— Ты афігенны камандзір тут? (Чаму, над кім я камандзір?) Даўно з бальніцы выпісаўся? Зноў хочаш туды? Дык вось, калі не перастанеш чапаць (?) маю сястру, будзеш камандзірам морга.

## 26. Сіні канверт

Калі іду праз прахадную інтэрната, часта сядзіць там выхавацель Тупы. Ніколі не праміне прычапіцца:

— Не ндравішся ты мне, ох, не ндравішся... Не п’еш, па бабах не ходзіш... Г..но, а не хлопец.

Можна было ў поўным сэнсе з'ехаць з глуздоў, калі што-небудзь тэрмінова не прыдумаць. Трэба была хоць павуцінка ў той рай, з якога самахоць апынуўся ў гэтым пекле.

Так узнікла пісанне.

Паслаў у «Чырвоную змену» абразок. Цяпер бы яго надрукавалі. Восень... Яблыня шкрабе галінаю ў шыбу... Успамін пра лета і нейкае каханне, якое адляцела разам з летам... Сум, туга, настальгія... Мапасан (якога тады не чытаў) — «прощай, молодость!»...

Чакаю адказу, лепш сказаць, нічога не чакаю. Апошні курс, робім дыпломныя, потым размеркаванне, у дзяўчат наперадзе замужжа, у нас — армія. Армія ўсё спіша. Пасля яе можна перакрэсліць ранейшае жыццё і паспрабаваць жыць новым.

З новага года я не жыву ў інтэрнаце, выгнаны за парушэнне рэжыму. Хлопцы ў пакоі пілі, я нават не начаваў тады, у вёску ездзіў, але выклікаюць у дэканат аднаго мяне: «По заявлению воспитателя Шелепня… За организацию пьянки...» Апраўдвацца і не думаў, ужо разумею, што лёс яшчэ не аднойчы будзе выкідваць са мной такія штукі. Не апраўдваюся, не надта здзіўляюся, але і не пакараюся, — не, лёс, у мяне дужа многа ёсць чаго табе супрацьпаставіць... У мяне ёсць пах снегу, лотаць, бліскі вады ў веснавых ручаях, жоўты лісток на шляпцы грыба... І яшчэ шмат, шмат чаго, з чым табе давядзецца лічыцца.

Жыву ў дзядзькі, чарчу — раблю дыпломную работу — днямі ў вольных аўдыторыях. Нават два дыпломы раблю — сабе і сябру. За гэта ён падараваў мне кнігу «Чехов о литературе и искусстве».

І вось — сіні вялікі канверт са штэмпелем «Чырвонай змены». Пісьмо на афіцыйным бланку. Мой абразок быў на старонку, а адказ — на тры машынапісу праз адзін інтэрвал. «Талент... разуменне прыроды... пранікненне ў псіхалогію... пішыце»... Падпісана Вольгай Іпатавай. Дзе б ні быў, Воля Міхайлаўна, кім бы ні стаў, ніколі не забуду Вам гэтага, светлая мая...

Абаранілі дыпломы, адбылося размеркаванне, іду ў інтэрнат — п'яны, з цыгарэтаю ў зубах, з дзеўкаю (вольных паводзін) пад руку...

Тупы прыемна здзіўлены. Ён нават мармыча штосьці, якіясь прабачэнні...

— Шэлепень, — хістаючыся (дзяўчына падтрымлівае мяне, Тупы глядзіць на гэта з разуменнем, з павагаю), выцягваю з кішэні ўжо зашмальцаваны канверт, — вы вось мяне выгналі, а мяне хваляць, у Мінску ведаюць...

Тупы тупа глядзіць на канверт.

— Гэта нічога не значыць, — кажа ён не зусім упэўнена, нават крышку трусліва. — І Героя Савецкага Саюза можна выселіць з абшчагі...

Якая дурасць, шэрасць, душната! Я шчаслівы. Я не ваш. Я знайшоў сябе. Я цяпер ведаю, кім буду. Як мне жыць. Хто будзе мяне акружаць.

У гэтым сінім канверце — мой новы, бясконца сіні свет.

## 27. Эпілог першай часткі

І так, падаб'ем бабкі, падвядзем рахункі. Што атрымалася ў нашым паўмастацкім творы?

У меру сіл мы хацелі прасачыць на адной канкрэтна ўзятай біяграфіі, на гэтых зведзеных у адно выпадках, гісторыях, сітуацыях зародак творчасці. Як у народзе кажуць — адкуль што бярэцца?

Чалавек дзякуючы такой біяграфіі абавязкова рана ці позна павінен быў бы пісаць, ці ён ужо нарадзіўся «дзвінутым»?..

Папутна мы паспрабавалі разгледзець яшчэ некалькі рэчаў.

— Даўгалецце. Чаму адны творцы могуць жыць адносна доўга, а другія, зусім не пакрыўджаныя ні здароўем, ні талентам — мала?

— Творчасць і жанчына. Яны заўсёды поруч. Жанчына выклікае творчасць, спараджае яе, яна — лагода, пацалункі, сэкс, ежа, пахвальба; яна ж — небяспека, кроў, страх, боль...

— Загадка ўвогуле творчасці. Гэта дабро ці зло? Гэта п'яўка, якая смокча з цябе ўсе сокі, гэта Молах, на алтар якому трэба класці лепшыя сілы душы, а падчас і само жыццё, ці гэта (калі ўмерыць эмоцыі) такая штука, якая пры бліжэйшым разглядзе можа памагчы творцу?

# ЧАСТКА ДРУГАЯ

## 1. Трыццаць дзве літары

Чалавек чытае мастацкую, ды і не толькі мастацкую, літаратуру, нават не важна якой якасці, — і сам ва ўяўленні дабудоўвае малюнак!

Гэта, калі разабрацца, проста фантастыка: ты бачыш дробныя чорныя значкі на белай паперы, а ў галаве ў цябе ўзнікаюць вобразы, характары, ідэі...

Аднак яшчэ большая фантастыка, яшчэ дзівейшае дзіва: 32 літары, 32 бочачкі лато, і іх трэба ўсяго толькі перамешваць у галаве, складаючы з іх розныя словы, думкі, сітуацыі, а ў выніку — ствараючы свой уласны Сусвет.

Усім аднолькава дадзены гэтыя 32 літары, яны, груба кажучы, закладзены ў кожную галаву, як у мясарубку, і хто б растлумачыў, чаму далёка не з кожнай мясарубкі выходзіць якасны фарш?..

## 2. Мікашы

На размеркаванні пасля тэхнікума спыталі: «Куды хочаш?» — «Застацца ў Мазыры». — «Не, едзь у Пінск». І якая ім была розніца. Каб сказаў, хачу ў Пінск — пакінулі б у Мазыры.

У Пінску, як у фільме «Каралева бензакалонкі», няўцямна паглядзелі на мае паперы, паціснулі плячыма, пераглянуліся і вынеслі вердыкт:

— У Мікашэвічы! Там табе самае месца. Будзеш бетон цягаць і цэглу класці. Усё роўна ў армію хутка. (Па дыпломе мне павінны былі даць пасаду майстра, нават прараба.)

Сёе-тое пра гэты пасёлачак я ведаў. Напрыклад, што гэта пагранічча — па рацэ Случ праходзіла мяжа паміж палескімі Заходняй і Усходняй Беларуссю. Ведаў пра славуты на ўсю Еўропу мікашэвіцкі граніт. І нарэшце вершык:

Микаши, Микаши,
Голубые дали!
Мы такие Микаши
На... видали.

Ну і дарэмна. Вельмі сімпатычнае, асабліва для мяне, прывыклага да савецка-ўсходняй архітэктуры, кампактнае мястэчка, гарадок, дзе мірна і гарманічна суіснуюць сучасныя мікраараёны і старыя паселішчы — фрагменты еўрапейшчыны. Мала пасля ў жыцці я сустракаў больш добрых людзей, чым мікашэўцы. Мяне адразу палюбілі. І гэта пры тым, што я прыйшоў ніадкуль і хутка пайду ў нікуды, часовы чалавек. Будаўнічая брыгада. Абеды — пароўну, выпіўка — мне першаму. Вазілі матацыклами на Прыпяць, лавіць у карчах рукамі сонных жнівеньскіх акунёў і лінёў... Паказвалі грыбныя мясціны.

Самы яркі, шчымлівы ўспамін. Трэцяя змена, з 10 вечара да 3 ночы. Вібратар, бетон, апалубкі, святло пражэктараў... Пад раніцу вяртаемся з гранітнага кар'ера ў пасёлак спецыяльным аўтобусам. У аўтобусе цёмна. І такая еднасць (у «Адным дні Івана Дзянісавіча» геніяльна схопленая; цяжка дараваць В. Быкаву, які абазваў гэты шэдэўр «каляднай казачкай»), такая да слёз заміранасць, замілаванасць, што вось скажы — аддай за кожнага жыццё — аддаў бы, а яны — упэўнены, за мяне аддалі б.

## 3. «У выхадныя дні»

У пятніцу вечарам, дачакаўшыся, калі з'ехаў дамоў у вёску сусед па пакоі, Хальчэня сядзеў на ложку і складаў верш. За паўгадзіны ён адолеў адно чатырохрадкоўе, праўда, ніштаватае:

Цяплынь жнівеньскай ночы...
Было ў вас такое, скажыце?
Я глядзеў ёй у вочы —
Васількі ў спалавелым жыце.

Перачытаўшы разоў пяць запар, што аж паблыталіся ў галаве рыфмы, Хальчэня закурыў цыгарэту і пачаў хадзіць па пакоі, паплёўваючы і збіваючы на падлогу попел. «І ў каго я, цікава, пытаю: «Было ў вас такое, скажыце? — падумаў ён. — А ў каго не было? Рытарычнае пытанне. А параўнанне вачэй з васількамі? Як пошла... Ці я ўжо сам да сябе прыдзіраюся?»

Каля шафы ён спыніўся, адчыніў левую і правую палавіны і агледзеў суседавы штаны клёшы на вешалцы, брызентавую рабо-

чую куртку і новыя кеды з беленькімі шнуркамі; гэтак жа нетаропка агледзеў трое сваіх штаноў: ваўняныя ў клеткі джынсы, вараныя ў белыя плямы, і штаны з мяккае шэрае матэрыі, якая звалася «палавіком»... Раптам ён пачырванеў, асцярожна прычыніў дзверцы і вярнуўся да ложка. «Цікава, ён хіба не бачыць, што носяць другія... — падумаў ён ужо пра суседа. — Ходзіць такім вахлаком... Незразумела».

**(Знарок пакідаю гэты кавалак, як прыклад нявопытнасці, недальнабачнасці: як жа асцярожна трэба абыходзіцца ў літаратуры з гэтымі часовымі аксесуарамі, гэтымі клёшамі, белымі шнуркамі і варанымі джынсамі... Як жа яно ўсё хутка старэе і як трэба пазбягаць розных прывязаных да часу тэрмінаў, слоў, якія праз 5–6 гадоў могуць зусім знікнуць і потым гучаць у апавяданнях дзіўна і дзіка, і як жа тады сорамна павінна быць за гэта пісьменніку!)**

За шэсць дзён, якія яны пражылі разам, Хальчэня так і не змог звыкнуцца з гэтым чалавекам. Увечары сусед звычайна ляжаў упоперак ложка — ногі на табурэт — і моўчкі гартаў часопісы ці чытаў газеты, а ўночы, калі тушылі святло і клаліся, доўгімі і зануднымі аповедамі не даваў Хальчэню спаць. Тут былі і вёска, і фільмы, і кнігі, і войска, і, зразумела, былое няўдалае каханне — нейкая Наташа, якая выйшла замуж, не дачакаўшыся яго з войска. Ён называў яе цяпер «дурніцай» і «шкурай барабаннай» і казаў, што яна растаптала ў ім веру «ў людзей і чэсных жэншчын».

Хальчэня быў рады, што хоць працаваў гэты дурань у брыгадзе бетоншчыкаў, а не з ім разам, мулярам: хоць удзень ён яму не назаляў.

«Добрая асацыяцыя — васількі ў спалавелым жыце і шкура барабанная!» — Хальчэня ўявіў, як бы ягоны верш чытаў сусед, пачырванеў, схапіў ручку і так крамзануў наўскасяк па лістку, што падралася папера.

Яму захацелася напісаць празаічны твор, але добры, абсалютна праўдзівы, які ніхто яшчэ ніколі не пісаў. Ён узяў са стала два суседавыя часопісы, лёг упоперак ложка, паклаў ногі на табурэт, адзначыўшы, што ляжаць так усё ж няблага, і пачаў чытаць, каб павучыцца, як пішуць і думаюць сапраўдныя пісьменнікі.

Хальчэня, хоць і нарадзіўся і гадаваўся ў вялікім горадзе, быў гарадскім толькі ў першым пакаленні. Бацькі яго былі тыповымі ўрбанізаванымі вяскоўцамі. Пражыўшы доўга ў Гомелі, займаючы пасаду начальніка аддзела кадраў будупраўлення, бацька ці то не хацеў,

ці то папраўдзе так і не навучыўся гаварыць чыста па-гарадскому. Калі яшчэ дзе ў людзях ці на рабоце ён і стараўся ламацца па-руску, то ўжо дома, у сям'і, даваў сабе поўную волю. Бы смакуючы, з задавальненнем, ён гаварыў «дзёўка, дзядзько, муло, забуўся, знушчаўся, хай яму гор, здарову як бук» і г. д. Ён быў з'едлівы да ўсяго, чаго не разумеў: да музыкі, акрамя народных песень, да фільмаў, акрамя як пра дзяцей, да кніжак пра вайну, у якіх, як ён казаў, «восе пара вайна скончылася, а яны ўсё цягнікі пад адхон пускаюць» ... Не любіў газет на беларускай мове, лічачы гэтую мову не сапраўднай беларускай, а «скалечанаю»... У сям'і ён трымаўся свайго вясковага парадку, які заключаўся, па-першае, у дыялектна-беларускай мове, і, па-другое, у выхаванні сына. Хальчэню дазвалялася рабіць усё тое, што сам бацька ў свае маладыя гады зрабіць альбо не паспеў, альбо рабіў не так, не ў поўнай меры, як хацелася. Кожныя паўгода сын апранаўся ў новае, і не абы-якое, — з галавы да пят. Акрамя таго, ён заўсёды меў грошы «на дробныя расходы». Ён мог прыходзіць позна ўночы ці начаваць у сяброў, не баючыся, што яму будуць чытаць маралі. Патрабавалася ад яго не шмат: не піць, не лаяцца і не пярэчыць бацьку.

Волю, што яму давалася, Хальчэня скарыстаў перш за ўсё ў вучобе. Не дужа налягаючы на кніжкі, скончыў дзесяць класаў, падаў дакументы, як і параіў бацька, у будаўнічы тэхнікум, — і толькі пасля яго заканчэння, атрымаўшы ўжо дыплом і накіраванне ў адно з мястэчкаў Брэсцкай вобласці, Хальчэня зразумеў, што волі ён практычна не толькі не мае, але што яе ў яго і не было.

Тады бацька ўпершыню адкрыўся яму. Хальчэня ўбачыў у ім не таго чалавека, да якога прывык. І здарылася гэта акурат у дзень атрымання дыплома...

**(Апускаем цягамотны дыялог, пераказваем інфармацыйна. Бацька прадумаў за сына яго будучыню. Ён марыў бачыць сына афіцэрам і хацеў, каб той паступаў у ваеннае вучылішча. Сыну захацелася паказаць сваю самастойнасць.)**

— ...Добра, — сказаў бацька, — не хочаш, не трэба. Едзь па сваім размеркаванні. Але ведай, што ты ні на што не здатны. Пакатайся. Усё адно вернешся. І тады я табе памагу.

Ён выйшаў, і Хальчэня крыкнуў яму ўслед у пустыя ўжо дзверы:

— Трэба мне твая помач!

Ён схапіў куртку і выскачыў за дзверы.

...Месяц адпачынку, што даваўся пасля тэхнікума, Хальчэня амаль не бываў дома. Бацька яго больш не чапаў, быццам і не было паміж імі ніякіх размоў, а маці вельмі любіла сына і таму адчувала сябе

ў нечым вінаватаю перад ім, давала кожную раніцу грошы і шаптала: «Не слухай яго, рабі як хочаш...» Сяброў аднаго за другім бралі ў войска, ён праводзіў іх; сам перад ад'ездам зняўся з вайсковага ўліку і выпісаўся ў пашпартным аддзеле. Пасля вясёлых праводзінаў яму звычайна рабілася сумна, ён адзін блукаў тады па Гомелі, заходзіў часта ў парк, глядзеў на Сож, на драўляныя, амаль што вясковыя хаткі па той бок ракі. Смутак мацнеў, рабіўся соладка-шчымлівы, і Хальчэню хацелася зрабіць тады нешта вялікае, незвычайнае, каб не толькі бацькі, а і шмат-шмат людзей пабачылі, які ён таленавіты, не падобны на іншых — убачылі і здзівіліся, і ўзрадаваліся ад гэтага.

З такімі думкамі ён ад'язджаў з Гомеля.

«Можа, напісаць, як я пасварыўся з бацькам, як прынцыпова не захацеў паступаць па блаце?» — падумаў Хальчэня, седзячы за сталом над сшыткам, у якім намаляваў ужо некалькі красачак. Але гэта было б вялікай хлуснёй, і ён выдатна адчуваў гэта. Спрачацца з бацькам прымушаў яго не прынцып, а тое, што ён не любіў вайскоўцаў, наслухаўшыся розных гісторый пра «дзядоў» і «маладых». Можа, каб бацька замест вайсковага вучылішча прапанаваў інстытут, ён бы яшчэ падумаў, спрачацца ці не. Можна, вядома, выдумаць, напісаць пра абавязак перад дзяржавай, якая яго вучыла, але Хальчэня толькі кісла скрывіўся. Словы гэтыя так часта паўтараліся ў школе, у тэхнікуме, на розных камсамольскіх сходах, пісаліся ў газетах і зноў паўтараліся па тэлебачанні, што абсалютна, беззваротна страцілі ўсялякі сэнс. Не хацелася пісаць Хальчэню аб спрэчцы з бацькам яшчэ і таму, што ён за гэты тыдзень на свае вочы пабачыў, што такое будоўля, што такое жыць у інтэрнаце і што такое чужы, маленькі горад з чатырма крамамі і з клубам у былым касцёле. У ягонай брыгадзе самаму маладзейшаму было сорак гадоў: людзі працавалі, каб атрымаць кватэры, і, атрымаўшы, адразу пераходзілі на іншую, лягчэйшую работу. Нязменны быў хіба што адзін брыгадзір, які незалюбіў Хальчэню, калі даведаўся, што той — начальніцкі сын. Відаць, ён лічыў, што добрага сына ніякі начальнік на будоўлю не зашле.

Хальчэня зірнуў на гадзіннік і не паверыў: ён сядзеў ужо гадзіну, а здавалася — хвілін пятнаццаць, ад сілы. За акном сцямнела. Нехта хадзіў па калідоры, пасля спыніўся, пастукаў у дзверы і ляпнуў разы з два ручкаю. Хальчэня нават не зварухнуўся. Нешта ціха дзынкнула ў шыбіну, Хальчэня ўскочыў і, пакуль адчыняў фортку, убачыў, як ад знадворнага падаконніка зляцеў верабей. У фортку дзьмухнуў вецер,

але такі цёплы, такі прыемны, які бывае толькі на пачатку вясны, перад першымі навальніцамі. Неба было цёмнае, і дрэва перад акном цёмнае, страшнаватае, яшчэ без лісця, толькі цьмяна свяціўся ліхтар за гэтым дрэвам, а далей нічога ўжо нідзе не свяцілася — інтэрнат стаяў каля самага лесу і Хальчэнева акно выходзіла якраз на гэты лес. «Калі не развіваць сябе, не займацца чым-небудзь — я тут да восені здзічэю», — падумаў ён, пацепнуў плячыма, зачыніў фортку і сеў за стол. Адзінота і нейкая вусцішнасць надалі яму смеласці.

Ён успомніў апавяданні, якія толькі што прачытаў у часопісах, і пачаў пісаць. Адразу з сярэдзіны, бо канцоўка была ўжо ім прыдумана, і адкуль бы ён ні пачаў, усё роўна скончыў бы так, як прыдумаў. Пісалася з непрывычкі марудна, але Хальчэня быў у настроі, курыў цыгарэтку і раз-пораз пасміхаўся са сваёй выдумкі. Ён пісаў пра вёску, а сам быў з горада, пісаў, як у вёску прыехалі дзяўчаткі сельгасатрадам, а сам ніколі не ездзіў ні сельгас-, ні якім іншым атрадам: практыка ў іхнім тэхнікуме была ў горадзе; пісаў, як герой пайшоў на поплаў касіць, а сам не трымаў за ўсё жыццё касы ў руках. На поплаве ён нібыта сустрэў дзяўчыну, якая збірала там кветкі і якая папрасіла навучыць яе касіць; пасля прызначыла яму спатканне, а калі ён вечарам прыбег пад бярозу, сельгасатрад паехаў у горад. Дзеля мастацкасці і таму, што нешта падобнае было ў часопісах, якія ён чытаў, Хальчэня падпусціў у апавяданне хмары, якія збіраліся цэлы дзень і абрынуліся навальніцай у той самы час, калі герой плакаў пад бярозай. Хмары і навальніца павінны былі перадаваць псіхалагічны стан героя.

Цалкам твор быў скончаны ў дванаццаць гадзін ночы. У беднага аўтара балела галава, у роце было суха і горка ад курэння. Спаў ён зусім кепска. Некалькі разоў прачынаўся сярод ночы, быццам хто штурхаў яго, расплюшчваў вочы і глядзеў у цёмную столь, успамінаючы да драбніц, што было ўдзень.

Раніцай скрозь сон яму падалося, што зноўку нехта стукае ў дзверы і тузае ручку, але пакуль Хальчэня адышоў ад сну, пакуль падняўся, расчыніў акно, папрысядаў і ўрэшце адчыніў дзверы, нікога там ужо не было. Ён сеў за стол пачытаць на свежую галаву апавяданне.

Ужо хвілін праз пяць яму стала зразумела, што перад ім набор сказаў. Само сабой прыйшло ў галаву параўнанне з музыкам, які не можа чытаць ноты, а бярэцца за інструмент, каб зайграць нешта сур'ёзнае ці пяшчотнае. Галоўнае, здавалася, ён добра ведае і бачыць свае памылкі, але выправіць іх — не можа, не ўмее. Рабіць больш не было чаго, ісці ў гэтым мястэчку не было куды, наперадзе былі два дні... Сорак восем гадзін...

«Што, паваяваў з бацькам?» На душы было пуста і абыякава. Ён выцягнуў з шафы сумку і абы-як пачаў складвацца: на дно — брудныя чаравікі, на іх — тры чыстыя кашулі, куртку, штаны... Апусціў рукі і сеў на ложак. У гэты момант адчыніліся дзверы — ужо без стуку, і ў пакой увайшла вахцёрка з тэлеграмай у руцэ.

— Чаму не адчыняў? — сярдзіта сказала яна. — Тэлеграма прыйшла, а ён не адчыняе.

Хальчэня схапіў тэлеграму і прачытаў: «Толик с отцом плохо».

— Бяжы на вакзал, пакуль не позна, — спагадна сказала жанчына, і ён чамусьці зразумеў яе «пакуль не позна» як «пакуль не памёр».

У Гомель ён дабраўся толькі ўвечары, стомлены, напаўсонны, знерваваны таўхатнёй каля кас і дарогаю. Ехаў з вакзала на тралейбусе, пасля — пехам, па бруднай вуліцы з калюгамі ў выбоінах асфальту, — і ўсё стараўся забыцца прыкрага здарэння на местачковым вакзале. Прамыя аўтобусы адтуль на Гомель не хадзілі, на прахадныя было толькі па два-тры месцы. Прапусціўшы два аўтобусы, Хальчэня, калі падышоў трэці, махаючы тэлеграмай, праштурхаўся да касы і закрычаў: «Мой бацька памірае!» Тады толькі прачыталі тэлеграму і далі білет без чаргі. Цяпер было сорамна свайго крыку і адначасна яшчэ больш сорамна, што ён думае пра такую драбязу, калі, можа, бацька і сапраўды памірае.

Ён узбег па сходках, адамкнуў сваім ключом дзверы і стаў здымаць брудныя спартоўкі і мокрую куртку. Здзівіўся, што ў зале ішоў тэлевізар, чуліся адтуль глухія стрэлы і каманды на нямецкай і рускай мовах. З залы выбегла маці, абняла яго.

— Што з бацькам? — ён адвёў шчаку ад пацалунку.

— Быў прыступ, — прашаптала яна, — я так спалохалася...

— У бальніцы?

— Не захацеў... Спіць. Ты чым ехаў?

Хальчэня адвёў яе руку, увайшоў у спальню, стараючыся, каб як цішэй. Бацька ляжаў каля акна на канапе, перанесенай з Хальчэневага пакоя. Ён не спаў і нават усміхаўся.

— Ведаеш, не мог убіцца ў аўтобус... Каб не тэлеграма...

Хальчэня, сам не ведаючы чаму, казаў зусім не тое, што думаў, яму хацелася сказаць, што ён зробіць усё, як хоча бацька: кіне працу, будзе паступаць у ваеннае ці ў любое іншае вучылішча, што ён не ўмее, зусім не ўмее жыць сам... Ён паглядзеў бацьку ў вочы.

«Мне страшна, я сам нічога не ведаю», — прачытаў ён у бацькавых вачах.

Маці падаткнула бацьку пад ногі коўдру, і, зірнуўшы на гадзіннік, узяла са стала шклянку з нечым жоўтым.

У зале ўсё стралялі і ўсё крычалі па-руску і па-нямецку.

## 4. Люда

Два чалавекі ў Мікашэвічах найбольш паўплывалі на мяне: маладая незамужняя полька Люда В...ская і Міша, бетоншчык з нашай брыгады.

Люда. Мне 18, ёй 25, а выглядае таксама на 18. Рослая, бялявая, красуня... У яе невядома ад каго маленькае дзіця. Заляцанні да яе ўсёй мужчынскай палавіны Мікашэвічаў. І раптам — я. Хто я і хто яна? Яна ў бухгалтэрыі, здаецца, нават галоўным бухгалтарам, я — цягаю бетон, у бруднай робе, у казённых чаравіках...

Тым не менш у нас сяброўства. Я ўжо ўмею чытаць па вачах. Яны ў яе так мякка, па-добраму свецяцца, калі яна на мяне глядзіць, яна ведае, што я закаханы, і ёй падабаецца, яна ўхваляе гэта.

Мясцовыя хлопцы нічога не разумеюць. Толькі я разумею: я — не вы, я асаблівы, яна адчувае гэта, бо таксама не такая, як усе. Вось і выбрала свая свайго.

Нічога паміж намі няма: ні кветак, ні пацалункаў, ні провадаў. Сустракаемся толькі ў абедзенны перапынак. Гаворым пра музыку, прыроду-пагоду, трохі пра літаратуру. Ніколі не згадваем пра яе дзіця: адкуль яно, хто бацька, дзе ён? Яна так сябе паводзіць, і такія падбірае словы, і такую ўкладвае ў іх інтанацыю, што я забываю розніцу ва ўзросце. Наадварот, усё часцей адчуваю сябе старэйшым за яе. І, можа, усё склалася б інакш, калі б мяне ў хуткім часе не падстрыглі ў войска.

«Ну вось, так заўсёды: толькі добры чалавек сустрэнецца ў жыцці, так расстанне...» І далей: «Хочаш, я буду пісаць табе і чакаць з арміі?»

У Шукшына ёсць апавяданне, як маладога салдата, што вяртаўся з вайны, заманіла да сябе жанчына, падаравала яму начное каханне, а калі салдацік заснуў, абрабавала і знікла. Але салдату напляваць аказалася на шмоткі і нават на такі жорсткі падман, ён бы і сам ёй усё аддаў, для яго гэта было першае каханне, і ён запомніў яе на ўсё жыццё, як штосьці яркае, светлае і чыстае.

І калі добразычліўцы нашэптвалі мне яшчэ ў Мікашэвічах, а потым і пісалі ў войска, што мая прыгожая, мілая, не ад гэтага свету Люда — звычайная мясцовая баба, мне, як таму шукшынскаму салдаціку, глыбока пляваць было...

## 5. Пяцьдзясят грамаў для паху

П'яніца з анекдота казаў: «Дайце мне пяцьдзясят грамаў для паху, а дурасці і сваёй хопіць», — так і мне тады: любая асоба жаночага полу, што звяртала на мяне ўвагу, рабілася 50 грамамі, а «дурасці» — уяўленняў, фантазіі, летуценняў хапала сваіх — цераз край ліліся!

Нічога кепскага, брыдкага, непрыгожага я не проста не заўважаў — не мог адшукаць пры ўсім жаданні, у кожнай апошняй б... і ўмудраўся бачыць толькі тое, што хацеў бачыць: самае лепшае, узвышанае, боскае, а калі яго не хапала ў рэальнасці — умеў дадумваць, дамалёўваць; урэшце, усе ж яны былі некалі маленькімі дзяўчынкамі, з каснікамі на галоўках, у белых школьных фартушках — як сімвал чысціні і цноты, усе выводзілі ў сшытку «мама мыла раму» і марылі пра штосьці, ды і цяпер марыць, усе ж яны ўрэшце — ***жывыя***! (Думаў некалі.)

## 6. Юля

Праз дваццаць гадоў давялося зноў пабываць у Мікашэвічах. І то праездам.

Падсядае да мяне ў аўтобусе на вольнае месца дзяўчынка гадоў 16. Не быў бы я паддаты — прадрамаў бы спакойна да Мінска, тым больш меў ужо вопыт у падобных сітуацыях. Аднойчы ў цягніку выйшаў пакурыць у тамбур, пазнаёміўся з дзяўчынаю, і цікава нам стала разам, і стаялі, гаварылі мы, пакуль яна не спытала: «А кім ты працуеш?» — «Рэдактарам на «Беларусьфільме». І тут мая знаёмка нечакана спахмурнела, павярнулася і пайшла, я, мала што разумеючы — паплёўся следам. Праходзячы каля купэ, пачуў, як яна расказвае сяброўцы: «...Сказал бы честно, в каком-нибудь трамвайном депо, или где он там работает, так нет — редактор, киностудия! Трепло...»

Але цяпер, п'янаваты, я на той выпадак забываюся. Рызыкуючы двойчы наступіць на адны граблі, пачынаю трындзець: успаміны, Мікашэвічы, мая маладосць і часопіс «Маладосць»... Як я некалі працаваў тут, потым напісаў аповесць і сцэнарый фільма па ёй («Не глядзела?»), і там многае, асабліва прырода, узята з гэтых мясцін... Ёй цікава. Я спахапіўся:

— Андрэй. Пісьменнік.

— Юля. Наркаманка, — працягнула яна ручку, прыязна ўсміхнуўшыся, гэтае амаль дзіця, з ямачкамі на шчочках, з мяккім бляскам вачэй. І было відаць, што яна не ламаецца, не какетнічае,

з такою ж інтанацыяй яна магла б сказаць: «Юля, студэнтка». Нават падалося, можа, яна і не ведае, што гэта кепска, і не лічыць сваю прывычку нечым заганным — як і далёкая яе зямлячка, полька Люда, не лічыла заганаю свае вольныя паводзіны.

## 7. Міша

Другі пасля Люды мой мікашэвіцкі сябар Міша меў увогуле 37 гадоў — неверагодная лічба для мяне тадышняга, менавіта з той оперы, дзе «столькі не жывуць».

Пачаць з таго, што ён быў з вышэйшай адукацыяй — скончыў Мінскі інжынерна-будаўнічы інстытут. У Мікашэвічах пакуль не было яму дзе працаваць па спецыяльнасці, і ён цягаў разам з намі бетон, закладваючы такім чынам падмурак свайго будучага інжынерскага кабінета.

Сышліся мы на Мінску. Любая яго згадка пра сталіцу выклікала ва мне захапленне. Тэатр оперы і балета? — хадзіў, і неаднойчы, у «ёперны»... Мінскае мора? — купаўся сто разоў... Мінскія дзеўкі? — была нават адна школьніца, «заколебала меня своим мороженым, да кино, да цветами...»

Усё савецкае ён шчыра ненавідзеў, усе было дрэнь, «калхознае» і «крестовое». Усё заходняе было «супер». Усе вакол былі мудакі, хамы і быдла, і толькі той меў права ўзвысіцца над імі, хто разумеў гэта.

Як проста, ясна і здорава! Гэтыя словы падалі на ўдзячную васямнаццацігадовую глебу.

З хамамі трэба быць хамам, — вучыў Міша, — але памятаць, што сярод быдла выжывае не мацнейшы, а разумнейшы, таму пажадана ўмець прыкідвацца дурнем і ціхай сапай гнуць сваё. «Цёлку» ў першы ж вечар трэба весці ў ложак і толькі там разбірацца, кахаеш яе ці не, не забываючы пры тым, што ўсе яны — тупыя і жорсткія, і розняцца толькі тым, што бываюць худыя, а бываюць тоўстыя. Піць трэба культурна, і толькі гарэлку. Кнігі чытаць падпольныя, забароненыя. Слухаць толькі радыё «Свабода», класічную музыку і рок. Сачыць за сабою, берагчы здароўе як найвышэйшую каштоўнасць (яшчэ б, у 37 гадоў). Ахайна і пажадана модна апранацца, не шкадуючы на гэта ні грошай, ні часу…

Нават Мінск ён недалюбліваў — відаць, за тое, што не знайшлося там яму месца.

Цяпер я разумею, што мой Міша быў звычайны савецкі мешчанін, псеўда- ці паўдысідэнт, у вялікай ступені ламака, які проста напароўся

на ўдзячнага слухача. Да таго ж ён быў нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі, карацей, педзік, а можа, бісексуал, некаторы час ён карміў мяне літаратуркай, дзе даказвалася, што аднаполае каханне — вышэйшая, «не азмрочаная нічым» сфера. Помню цытату адной з кніг, пра тое, як на Захадзе жонка збірае ўвечары мужу бутэрброды, і ён, «расцеловав на прощание её и детишек, отправляется на всю ночь в притон гомосексуалистов».

Слухаць то я Мішу слухаў, але высновы рабіў свае.

Ён мне пра гомікаў, пра «чыстую мужчынскую дружбу» — а мне ўсё больш хочацца да Люды В...скай!

Ён пра Мінск — «лепш быць першым у правінцыі, чым другім у Рыме», — а мне да салодкай мукі хочацца ў той Мінск, і ў «ёперны», і школьніцы з марожаным!

Ён, ведаючы, што я люблю літаратуру, — «нават думаць забудзь! На што ты ў гэтай краіне разлічваеш, ніколі яны не пасунуцца і не прымуць цябе, і не трэба табе гэта — пісаць пра калгасы і будоўлі!» А ў мяне аж дрыжыкі па скуры: а раптам пасунуцца, і нават возьмуць ды надрукуюць якую-небудзь аповесць пра старшыню калгаса ці брыгадзіра брыгады бетоншчыкаў, я б напісаў такую!..

Ён мне пра армію — «вырваныя гады», «каб там было добра, там бы адны яўрэі служылі», — а мяне і туды, як вяроўкаю, цягнула!

## 8. Армія

І вось — павестка. Ці, як мяне правяць, позва.

У прынцыпе, увесь той — даармейскі — перыяд жыцця быў чаканнем гэтай павесткі-позвы, арміі: гэта павінна было стаць нейкім пераломам, пробным каменем, можа, самым галоўным у жыцці іспытам. Усё, што да арміі, было як бы несапраўдным. І, як ні дзіўна, адчуванне гэтай часовасці надавала сэнс жыццю. Туды, у войска, ідзеш адзін — адтуль вяртаешся іншы, усе іншымі вяртаюцца, нават гаварыць інакш пачынаюць.

Пра тое, што адтуль можна зусім не вярнуцца, што «армія добрая школа, але лепш скончыць яе завочна», — не думалася ды і не верылася.

Някепска было б патрапіць у будбат. Там, расказвалі, можна за два гады падзарабіць сякія-такія грошы. На поўным сур'ёзе, з алоўкам у руцэ я вылічваў (калі пашэнціць патрапіць у будбат), колькі ў канцы службы я атрымаю «чыстымі» на рукі, каб потым, калі паступлю ў ВНУ і не дадуць стыпендыі, мець нейкі матэрыяльны запас.

Армія да таго ж давала магчымасць бясплатна пабачыць свет. Яго я нямнога пабачыў: вячэрні цягнік з Брэста, начны Мінск, ранішняя Масква, упершыню ў жыцці — метро, ізноў цягнік — Іванава, Яраслаўль, Мурам… Цэнтральная Расія, у выніку МВА — Маскоўская ваенныя акруга, сувязь («кто е... в дождь и в грязь? — наша доблестная связь»)... А запомніўся з усяго гэтага «вялікага свету» толькі Мінск, якога і выгледзеў — начныя агні, кавалачак вакзала ды запляваную, у акурках, платформу.

Самае брыдкае ў арміі — хранічнае невысыпанне. Малады арганізм хацеў расці, і гэтае насілле над ім, ранішнія пад'ёмы даводзілі да нейкага трансу, да фізічнага адчування, што табе вялізнымі нажніцамі адразаюць макаўку галавы разам з валасамі, скураю і кавалачкам чэрапа — роўна столькі, наколькі за ноч падрос. Другое — голад (хоць да яго хутка прывыкаеш) і адсутнасць спіртнога (да чаго прывыкнуць немагчыма). Трэцяе — падаўленне волі. Я раней думаў, што гэта так, выдумкі, перабольшванне. Калі чалавек дастаткова моцны духоўна, паспрабуйце ў яго ўлезці. Нічога падобнага — абсалютна свядома, паступова, няўхільна цябе пазбаўляюць індывідуальнасці, «замбіруюць», і недзе праз паўгода дабіваюцца свайго: твайго атупення, ператварэння з індывідуума ў амаль бяздумную часцінку цэлага. Ідыёцкі, неверагодны «на волі» пастулат: «Приказы не обсуждают, их исполняют» набывае ў войску цалкам рэальнае ўвасабленне. «Приказываю закрыть своим телом амбразуру!» — папаўзеш і закрыеш. Ты са сваімі думкамі, сэрцам, душою — асобна, цела тваё — асобна, яно табе ўжо не належыць.

Разгружаем аднойчы на станцыі шчэбень са спецыяльнай ваганеткі, у якой ніжнія бункеры трэба адчыняць здаравенным малатком на двухметровым дзержаку. Некалькі ўдараў гэтага молата, адкінуліся дзверцы, свіснулі вузкай засаўкай прама па шыі нейкаму чурку, не з нашай часці, які здуру ці з цікавасці стаяў, нагнуўшыся, блізка і не паспеў адскочыць, — толькі адсечаная галава, як у Берліоза, пакацілася з насыпу... Каб на «волі», звар'яцеў бы, мабыць, а тут — ты асобна, цела тваё асобна... «Воз костей и море крови», — толькі і сказаў нехта. Загарнулі ў шынель тулава, побач паклалі галаву, так і ляжала ўсё, пакуль камандзіры некуды бегалі, некуды званілі, а мы памаленьку разгружалі ваганетку.

А тут яшчэ пачалі паміраць генсекі: Чарненка, Андропаў... І кожны раз сярод ночы — трывога, пад'ём, і тырчым, пастроеныя, на плацы да пасінення, чакаючы чорт ведае чаго. Камандзіры казалі: «Вось памрэ (чарговы) генсек — адразу будзе вайна альбо Афганістан».

## 9. Хахлы

Працэнтаў 70 ва ўзводзе займалі ўкраінцы, астатнія — рускія, беларусы і 4 венгры (закарпацкія).

Чучмекаў не было ніводнага. Замянялі іх, як ні сорамна прызнацца, беларусы. З сямі чалавек два былі поўныя «тормазы», і адзін, Васіль Аксёнаў з Віцебшчыны, непісьменны. Канечне, нейкія крыжыкі пад дакументамі ён ставіў, але чытаць і пісаць не ўмеў. Каравульны статут яму начытвалі ўголас (не за бясплатна), ён запамінаў.

Не скажу, бо не ведаю, як ён патрапіў у МВА. Ведаю толькі, што то быў час Афганістана, у армію пачалі брыць усіх падрад ад 18 да 25 гадоў, з ВНУ, з турмаў, з фізічнымі недахопамі, упершыню пасля вайны — у акулярах... Дарэчы, тады ж, у Маскве, я блізка ўбачыў сапраўднага замежнага шпіёна. Ехалі з хлопцам з нашай роты ў электрычцы, і тут адзін з фотаапаратам цераз плячо зырыцца на майго хлопца.

«***<u>Они</u>*** уже что, в очках начали брать?! — са страшэнным акцэнтам і не менш страшэнным зларадствам. — Скоро до женщин доберутся?!»

Украінцы амаль усе патрапілі сюды з універсітэцкіх і інстытуцкіх аўдыторый. Служылі яны не два гады, як мы, смяротныя, а паўтара. Разумныя, спакойныя, упэўненыя ў сваёй «абранасці» хлопцы з вялікіх гарадоў — Кіева, Львова, Харкава, Данецка... Трымаліся ўсе разам. Гэта была каста, эліта, ніякія «дзяды» не падыходзілі да іх блізка. Уладкоўваліся хто пры штабе, хто на кухні, хто на складзе — капцёрам, хто пісарам, хлебарэзам, паштальёнам, хто рэдактарам «Баявога лістка». У нарады і ў каравулы амаль не хадзілі — хапала хадзіць за іх такім, як Аксёнаў.

Пасябраваць з імі было няпроста. Гэта давала вялікія прывілеі: цябе ніхто не чапаў, пасылкі твае не трыбушылі, пісьмы ты атрымліваў цэлымі, непрачытанымі (а не як звычайна — ускрытымі і заклеенымі па-новаму), на кухні табе даставаўся не кавалак сала з сінім штэмпелем, а мяса, раніцай, калі не паспяваў, тры чалавекі за пару секунд памагалі заслаць табе ложак...

Аднойчы ў курылцы цытую нешта з Чэхава (памятаеце першую частку, кнігу «Чехов о литературе и искусстве»?) — ды не нешта, а:

— Хлусіць можна ў каханні і ў медыцыне, але не ў літаратуры, — вось што я ляпнуў у армейскай курылцы.

Гэтага аказалася дастаткова, каб адзін з хахлоў, Міхалюк, імгненна, як выжал на дзічыну, адрэагаваў:

— Нічога сабе! Адкуль ты ведаеш Чэхава?

— А адкуль ты ведаеш, што гэта Чэхаў?

— Ды мая дзяўчына на ім памешана! І што вы ў ім знаходзіце?

Ну, Чэхаў, падумаеш... Ну, цар, ну, Іаан... На самой справе якога я там ведаў Чэхава? «Хамелеон», «Смерць чыноўніка», вечнага студэнта Трафімава з «Вішнёвага саду» ды прымаўку «х…та по Чехову», якая абазначала штось звышнуднае, нецікавае і незразумелае.

Вось так — праз тое, што цяпер, калі Міхалюк бачыў мяне, я кожны раз звязваўся ў ім з ягонай дзяўчынаю, я быў прыняты ў іхнюю блат-каманду. Тусуючыся між іх, у давесак да Мішавай навукі я даведаўся, што ёсць такая рэч, як культура паводзінаў (іншая справа, як я гэтай навукаю карыстаўся і карыстаюся), што ў размове і ўвогуле ў жыцці можна спакойна абыходзіцца без мацюкоў — ад гэтага нічога не мяняецца, наадварот, ветлівы, ціхі, спакойны і выхаваны чалавек больш сімпатычны за насмешлівага цыніка і хама; што ва ўсе часы найвышэйшай каштоўнасцю ў чалавеку будзе культура, начытанасць, мастацкі густ, а не зухаватае кулянне ў рот чаркі, цыгарэта ў зубах і дэбільныя хіханькі-хаханькі. Усё гэта было для мяне адкрыццём жыццёвай Амерыкі.

Самае ж галоўнае, дзякуючы ўкраінцам я раз і назаўсёды зняў пытанне аб мовах — на якой гаварыць, на якой думаць... Гэта ўзнікла само сабой, ніякай логікі ў тым не было, проста як чалавек устае адной раніцаю і са здзіўленнем заўважае, што яму не хочацца больш курыць, і лёгка кідае сваю кепскую звычку, не разумеючы, чаму не здагадаўся зрабіць гэтага раней, — так і я ў адно імгненне, без усялякай «сілы волі» пачаў думаць па-беларуску. Крыху пазней (але яшчэ да перабудовы) гэтак жа натуральна я прыйду да Бога, і яшчэ пазней (пасля перабудовы) — да творчасці. Так складзецца няхітры трохкутнік: уверсе Бог, па краях — мова і творчасць. Усё астатняе альбо ўсярэдзіне гэтага трохкутніка — мае лепшае, або па-за яго межамі — горшае.

Напачатку ўкраінцы памаленьку спрабавалі падцягваць мяне да свайго берага. «З такім прозвішчам... Шаўчэнку цытуеш... з такой памяццю... ну, што ў вас, у беларусаў, за мова? Жнівень — гэта ж дзіка, штучна!» — «А як трэба?» — «Серпень, нават август».

О-о, ребята, гэ, хлопцы, не ў каня корм. Жнівень то прыгажэй! — і калі вы гэтага не адчуваеце...

## 10. Капсула

Аднойчы глядзім абавязковую праграму «Час». Дзіўнаватае, калі не сказаць дзікаватае, відовішча. Усе ў споднім, палавіна голых да пояса — падшываюцца каўнерыкі. А ў тэлевізары тым часам рэпартаж-сюжэт: старшакласнікі-выпускнікі (не намнога маладзейшыя за нас) закладваюць у падмурак нейкай стэлы капсулу з пажаданнямі самім сабе, што б яны хацелі выканаць праз 30, здаецца, гадоў. Тады яны збяруцца тут, капсулу адкапаюць і даведаюцца, хто сябе спраўдзіў. Журналісты, канечне, лезуць са сваімі мікрафонамі, гэткі exit-poll — «што вы там панапісвалі?»

І вось адна дзяўчынка, самая лепшая, самая модная, самая разумная, самая... — адказвае: «Напісала — мару прачытаць за гэты час усяго Льва Талстога».

Цікава, што жадаюць сабе цяперашнія выпускнікі? Ды і ці засталася цяпер гэтая традыцыя з капсуламі?

...Які ж я ўдзячны Богу і лёсу, што не да канца мяне скалечыла ў той арміі, і жыццё маё не пайшло па іншай каляіне, і не стаў я ні трактарыстам, ні будаўніком, ні палітыкам, ні алігархам, а знайшоўся ў мяне і час, і жаданне, і магчымасць прачытаць і ўсяго Талстога, і нават (запознена апраўдваючыся перад Міхалюком) — усяго Чэхава, з прадмовамі і дробным шрыфтам набранымі каментарамі.

## 11. Песні і пісьмы

Знаходзіліся і такія, каму падабался ў арміі, прывыкалі — так прывыкаюць да турмы і да торбы. Морды ў такіх таўсцелі, фігуры, наадварот, спраўнелі, стрaйнелі ад рэжыму і фізічных практыкаванняў. Ды і самі казалі:

— А мне наравіцца тут!

Непісьменны Вася Аксёнаў часта круціўся перад люстэркам, стараючыся зірнуць сабе на спіну, і казаў: «Вось каб бацька мяне пабачыў!»

Астатнія, у каго былі галовы на плячах, ратаваліся тым, што вынеслі з папярэдняга жыцця. Дзіравілі іголкаю лічбы-даты ў каляндарыках. «Масла з’елі — дзень прайшоў»... «Дембель стал на день короче»... «Только сон приблизит нас к увольнению в запас»... Жылі ўспамінамі, пасылкамі, пісьмамі. Песнямі. Днём гарлапанілі, маршыруючы па плацы:

Стоим мы на посту
Повзводно и поротно,
Велики, как скала,
Надёжны, как гранит,
Мы — армия страны,
Мы — армия народа,
Великий подвиг наш
История хранит!

А ўвечары ў «Чырвоным кутку» пад гітару:

Только вечер настаёт —
Кент в кустах чувиху жмёт,
А я жму свой автомат,
Потому что я солдат.
День и ночь, ночь и день
На плече моём ремень...

Або «Дзедаўскую калыханку»: «Пусть приснится дом родной, баба с пышною...»

Але самае галоўнае, канечне, — гэта пісьмы. Матэрыяльны знак, доказ, што цябе не забылі, пацвярджэнне, што ёсць недзе іншае жыццё, і яно чакае цябе. Пісьмо можна трымаць у тумбачцы (дзённікі весці не давалі), насіць з сабою, перачытваць. Калі салдат трапляе «на губу», у першую чаргу ў яго адбіраюць лісты. «Десять лет без права переписки» — так некалі называлі расстрэл.

М. Таніч па-лесапавальнаму проста заклікаў: «Всего лишь: только две, только две зимы, только две, только две весны ты в кино, ты в кино с другими не ходи...» Калі ты ў турме ці на лесапавале, там хоць нейкае, хоць фіктыўнае абвінавачванне, і суд, і прысуд… А тут? За што пакутуюць сілком разлучаныя хлопец з дзяўчынаю? Уяўляеце, што такое для іх дзве зімы плюс дзве вясны? Не ведаю статыстыкі, але думаю, працэнтаў 90 дзяўчат не дачэкваюцца з войска каханых, і язык не паварочваецца іх вінаваціць, што не вытрымалі гэты дужа жорсткі, незаслужаны, незразумелы эксперымент, гэты бясконцы, як для 17–19-гадовых дзявочых галоў, тэрмін.

Тыя ж, хто дачэкваўся, дык гэта выключна дзякуючы пісьмам. У таго ж Таніча, дарэчы: «Письма нежные очень мне нужны, я их выучу наизусть...»

А «наизусть» іх мог вывучыць не толькі адрасат.

«У нашай Савецкай Арміі поўная воля, сапраўдная дэмакратыя, — казаў нам старлей — камандзір узвода, родам з Гомеля (а беларусаў не любіў, зямляк хрэнаў). — Гэта вам не войскі краін

НАТА, дзе афіцыйна дазволены алкаголь і наркотыкі (і так захочацца на міг у тыя войскі НАТА!), потым заступаюць у дзяжурства і ў любы час здуру-сп'яну могуць націснуць кнопку, і ў нас паляцяць ядзерныя ракеты. Таму вы павінны быць заўсёды напагатове. А тыя, хто вас чакаюць, павінны ведаць, што ўсё ў вас добра».

...Ціха ў вучэбным класе. Палітычная карта свету на дошцы, у розныя колеры пафарбаваны краіны сацыялізму і капіталізму. Узводны пахаджвае, мякка паскрыпваючы ботамі, між радоў. Як настаўнік, зазірае каму-небудзь праз плячо... Пішам лісты дадому.

— Усе напісалі? А цяпер не заклейвайце канверты, а мне на стол. Та-ак, украінскую ведаю, беларускую ведаю... Вось венгерскую... Кіш! (Гэта прозвішча, цалкам Карл Карлавіч Кіш, частаваў нас свойскім шпікам — ружовым ад перцу, духмяным салам з пасылак.) Ідзі сюды!

Аказалася, што і самы талковы з венграў Карл Кіш не настолькі валодае рускай, каб перакладаць.

## 12. «Іслач»

Пасля арміі (неаднойчы пісаў ужо), у 1986 годзе, мне пашэнціць патрапіць на семінар маладых пісьменнікаў у Дом творчасці «Іслач». Неўзабаве гэтая «Іслач» стане не менш вядомай за Каралішчавічы, пра яе нават складуць ананімную паэму — варыянт «Лысай Гары», толькі пра нашае пакаленне. Шкада, што яна недзе знікла — «канула ў Лету», і засталіся толькі «бурбалкі» — асобныя фрагменцікі кшталту гэтага:

О Іслач, край зусім нядрэнны!
Там Сыс пад хвойкамі гуляў,
І вечна п'яны Федарэнка
Свае законы ўстанаўляў...

Лухта, канечне. Хапала там каму ўстанаўляць законы без мяне. Васіль Быкаў з трыбуны тлумачыў, што ў аснову камуністычнага кодэкса пакладзены хрысціянскія, евангелісцкія пастулаты — крытыкі ў той час грызлі яго раман «Кар'ер», упікаючы аўтара ў богашукальніцтве. Іван Чыгрынаў агарошыў усіх заявою: «У нас адна з найлепшых, адна з найбольш развітых літаратур у свеце, і гэта пры амаль поўнай адсутнасці размоўнай, бытавой мовы. Можа, у гэтым справа? Літаратура акумулюе, назапашвае, зберагае ўсё беларускакультурнае, духоўнае — як фальклор некалі — да лепшых часоў».

Думайце!..

На семінар я прыехаў з двума апавяданнямі, адно пра армію. У «Іслачы» якраз адпачываў Янка Скрыган. Папрасіў узяць на ноч пачытаць «маладую прозу». Параілі мяне.

Назаўтра раніцаю ў сталоўцы Ян Аляксеевіч аддаў мне апавяданне. Акрамя рукапісу ў папцы яшчэ ляжаў ліст.

— Насупраць аднаго слова я нават паставіў плюсік, — сказаў Скрыган. — Вось гэтае — «выдаўжыўшы» ногі. Ніколі раней такога не чуў.

Апавяданне ўсё было скрэслена алоўкам — які халодны душ пасля «маладосцеўскай» пахвальбы! І нічога ўжо нельга папраўіць — вось-вось павінен выйсці часопіс менавіта з гэтым «Пісьмом».

Скрыган доўга гаварыў пра расцягнутасць, слабы дынамізм, рыхлую кампазіцыю, невыразнасць галоўнага героя...

— І потым: няма такой думкі, такой з'явы, такога эпізоду, якіх нельга было б раскрыць на 6–7 старонках. Тады навошта вам для таго ж самага спатрэбілася ў тры разы болей?

Усё гэта паўторыць у скупой рэцэнзіі гродзенскі крытык Ігар Жук (мой сябар): «Пакуль цяжка гаварыць што-небудзь пэўнае пра зусім маладога А. Федарэнку... Літаратурная нявопытнасць выявіла свой знак найперш у празмерным жаданні ўціснуць у апавяданне як мага больш матэрыялу, праз што і сам твор кампазіцыйна аслаб»...

## 13. «Пісьмо»

Перад тым як выйсці на шырокую галоўную вуліцу, што вяла за горад, узводу быў дадзены загад спыніцца.

Малады высокі лейтэнант у перацягнутым рамянямі, акуратным шынялі, з сумкай на баку адступіў амаль да сярэдзіны вулачкі, на якой спыніўся ўзвод, і пільным позіркам акінуў сваіх падначаленых, нібы збіраючыся палічыць іх. Гэта былі зусім маладыя салдаты — усе з аднаго прызыву, якія праслужылі толькі чатыры месяцы.

Стаяла мяккая, адліжная раніца, бадай, першая больш-менш цёплая раніца за ўвесь люты. Гурбы снегу паўз дарогу за адну ноч пацямнелі, зрабіліся рыхлымі; снег раставаў, і пахла вясной. У тым канцы вулачкі, адкуль толькі што ішлі салдаты, вісеў рэдкі туман — пэўна, ад таго, што раставаў снег. На гэтай жа вулачцы, зусім блізка адсюль, размяшчалася і вайсковая часць, толькі цяпер варотаў з зоркамі не было відаць за туманам.

Сягоння ўжо, як ніколі, адчувалася, што нарэшце надыходзіць канец доўгай завейнай зіме. Праўда, тут, у цэнтры Расіі, такія зімы — звычайная з'ява.

У чаканні новай каманды салдаты стрымана перагаворваліся, нецярпліва паглядваючы на лейтэнанта і не разумеючы, чаго іх спынілі. Толькі ж што строіліся ў казарме і гэты самы лейтэнант — іх узводны — правяраў усё, што трэба, і ўсё, што (як ім здавалася) не трэба: правяраў рэчмяшкі, каб нічога, акрамя кацялка, лыжкі і кружкі, там не было; правяраў аўтаматы, падсумкі, супрацьгазы; прымусіў зняць боты і глядзеў, ці правільна накручаныя анучы... Узвод павінен быў прайсці нейкіх пятнаццаць кіламетраў за горад, у лес, дзе знаходзіліся склады іхняй часці, і хоць прайсці трэба было дзе пяхотой, дзе бягом, пры поўнай выкладцы, лічылі, што не такое ўжо гэта важнае заданне, каб марнаваць час на розныя дробязі.

Зараз салдаты думалі прыкладна адно і тое ж: маладому ўзводнаму хочацца лішні раз пакамандаваць імі.

— Узв-о-од, інтэрвал адзін метр, у ногу, шагам а-а-арш!

Праз хвіліну былі ўжо на галоўнай вуліцы. Ішлі ахвотна, з задавальненнем грукаючы ботамі па асфальце. Амаль увесь час, абдаючы салдат мокрым пылам (**некаторыя, у асноўным, на жаль, графаманы, хвалілі мяне, што адстаяў гэты «мокры пыл» — «сухую ваду». А з іншага боку, кажуць жа «апякло холадам»?..**), калону абганялі машыны, аўтобусы; раз-пораз ззаду пад'язджаў тралейбус, і тады сцяжковыя, папярэджваючы, узмахвалі сцяжкамі, і салдаты вымушаны былі трымацца паўз самы тратуар.

Ракіцкі ішоў у апошняй шарэнзе, крайнім да цэнтра дарогі. Ва ўнутранай кішэні бушлата ён локцем стараўся намацаць пісьмо. Аддалі яго ўчора вечарам перад самым адбоем, таму яно было непрачытаным і нават нераспячатаным. Хацеў пачытаць уночы, у туалеце, але, ледзь крануўшыся галавой падушкі, заснуў і праспаў амаль да раніцы, калі іх паднялі па вучэбнай трывозе на гэты марш-кідок.

Ракіцкі паправіў шапку і моцна сціснуў рэмень аўтамата з намерам не кранаць больш гэтага пісьма і не думаць пра яго. Тым больш, ён цвёрда быў упэўнены, што нічога добрага для яго там не магло быць. Гэта было пісьмо ад дзяўчыны, якой ён перад арміяй прызнаваўся ў каханні і якая пасмяялася з яго.

*

Салдаты мінулі апошні квартал і выйшлі за горад. Ісці стала крыху вальней — і таму, што цяпер менш траплялася машын, і таму, што

вочы не натыкаліся больш на шматпавярховыя дамы горада. Вакол дарогі ляжала белае поле. Ракіцкі трошкі высунуўся і глянуў уперад: дарога, хоць і не вельмі крута, падымалася ўгору, і толькі далёка-далёка на гэтай гары віднелася нешта цёмнае — не то лес, не то проста туман.

«Горы нейкія, горы... І здаецца ж, не так і далёка адсюль Беларусь, а ўсё нейкае другое... Ну, дзе ў нас, у Беларусі, горы?..»

**(У тыя часы ўжываць у апавяданнях слова Беларусь лічылася ледзь не подзвігам, і яго піхалі ва ўсе дзіркі.)**

І зусім нечакана перад вачыма Ракіцкага да таго ярка паўстаў малюнак вясковай цёплай летняй ночы, што ён шырока раскрыў вочы, нібы жадаючы ўпэўніцца, што перад ім усё тая ж дарога, якая падымаецца пад гару, і абапал яе — брудныя гурбы снегу.

Слаба верылася, што яна была некалі, тая ноч, глыбокая і ціхая... Калі Ракіцкі сядзеў на лаўцы каля сваёй хаты, калі яму (дурному!) зусім не хацелася спаць, калі пахла яблыкамі, свежай, мокрай травой, свяціў месяц, і ад плота цераз вуліцу цягнуліся доўгія чорныя цені... Нікуды не хацелася ісці — ды і куды ісці? У сваёй невялічкай вёсцы Ракіцкі застаўся самым старэйшым з хлопцаў. Астатнія — хто ў арміі, хто ў горадзе. Было, праўда, некалькі школьнікаў, але ў іх яшчэ, на думку Ракіцкага, быў дзіцячы розум.

Ён проста сядзеў, выдаўжыўшы **(слова, якога ніколі не чуў мовавед Ян Скрыган)** ногі, глыбока дыхаў і думаў аб тым, аб чым думае большасць хлопцаў перад войскам. Яму марылася пра нейкую дзяўчыну, пра тое, як яна праводзіць яго на цягнік, як падымаецца на пальчыках і, абхапіўшы рукамі за шыю, цалуе... Што гэта будзе за дзяўчына, якая яна будзе з твару, як яе зваць, адкуль яна ўвогуле возьмецца — гэтага Ракіцкі не ведаў і не хацеў ведаць. Калі б яму ўдалося ўявіць на месцы гэтай прыдуманай феі якую-небудзь сваю знаёмую дзяўчыну, то, напэўна, адразу знікла б і слодыч ягонай мары. Выдуманая дзяўчына ў ягонай мары гаварыла толькі тое, што яму і хацелася ад яе чуць; знаёмая ж дзяўчына нават у марах магла гаварыць толькі аб нечым сваім, зямным, незразумелым і зусім непатрэбным яму ў час развітання...

Так Ракіцкі трохі памарыў і падняўся, каб ісці спаць. У гэты момант ля суседняй хаты — па гэты бок вуліцы, дзе і хата Ракіцкага, — пачуліся ціхія галасы. Ён і здзівіўся, і нават узрадаваўся, што яшчэ некаму не спіцца акрамя яго. Углядаючыся ў цемру і разважаючы, хто б гэта мог быць, ён сабраўся ўжо быў падысці і паглядзець, як раптам адтуль пачуўся стрыманы дзявочы смех. Ракіцкі спыніўся як укопаны. Так магла смяяцца толькі ягоная суседка, дзевяцікласніца

Ірына, але ж яна раней ні на якія гулі не хадзіла. Яна ж малая раней была!

Ракіцкі адступіў да сваіх варот і, прыціскаючыся да шула, пачаў прыслухоўвацца. І хоць яму не ўдавалася разабраць ніводнага слова, ужо адно тое, што Іру, гэтае дзіцё, якое ён ніколі не лічыў за дзяўчыну, нехта праводзіць, размаўляе з ёй, цалуе, можа, — адно гэта прымушала яго трымцець ад нейкага незразумелага хвалявання.

З-за шула не было відаць ні самой лаўкі, ні тых, хто на ёй сядзеў. Але Ірына стаяла зараз у вачах Ракіцкага так, быццам ён глядзеў на яе ў сонечны дзень. Невысокая, круглатварая, з белай касой... Прыжмураныя вочы глядзяць неяк сумна і строга... Заўсёды сур'ёзная, задуменная, Ірына жыла нейкім сваім дзявочым, незразумелым для Ракіцкага жыццём і звычайна звяртала на свайго маладога суседа ўвагі столькі ж мала, колькі і ён на яе.

Гэта была звычайная вясковая дзяўчынка, але цяпер, пасля таго, як Ракіцкі ўбачыў, што яе ўжо нехта праводзіць, Ірына здалася яму такой красуняй, якой ён яшчэ ніколі і нідзе не сустракаў. Яму зрабілася сумна і прыкра, што не ён, а нехта другі змог першы разгледзець у гэтай дзяўчынцы дзяўчыну. Зараз Ракіцкаму нічога не заставалася, як стаяць пад шулам і лаяць сябе за слепату. «Хлопец называецца! У армію сабраўся ісці!» Можа, каб Ірына якую гадзіну назад прайшла каля яго адна, то Ракіцкі не павёў бы і брывом. Павітаўся б, як заўсёды, — і ўсё. А цяпер у яго з кожнай хвілінай усё больш і больш з'яўлялася жаданне нешта змяніць, не выпусціць тое, што зводзяць з-пад носа.

Ціснучыся да плота, баючыся неяк выдаць сябе, Ракіцкі дабраўся да канца агароджы і шмыгнуў за сваю хату. Пасля прыгнуўся, нібы кот, прабег цераз агарод, пралез паміж жэрдкамі і апынуўся ў Ірыным двары. Ён пабаяўся праходзіць цераз двор бліжэй да лаўкі, на якой сядзела Ірына, — чамусьці здалося, што яго могуць заўважыць у акно з хаты, — і застаўся стаяць пад густым клёнам, ля самых дзвярэй у калідор. Сэрца ў яго калацілася, як у злодзея, але ён паспрабаваў супакоіць сябе думкай, што нічога дрэннага ён не робіць — проста кахае дзяўчыну і зараз скажа ёй аб гэтым.

Цягнуўся час, а тыя, на лаўцы, усё не збіраліся разыходзіцца...

**(Як і ў «Выхадных днях», апускаем к чорту дыялог. Герой, запінаючыся, сказаў гераіні, што закахаўся ў яе і хоча, каб яна чакала яго і пісала яму, — тады ў іх будзе тое, «што ва ўсіх»: яна зможа хваліцца сяброўкам, што ў яе хлопец служыць, а ён недзе ў далёкай казарме будзе хлусіць, як перад арміяй гульнуў.**

**«Не, я кахаю другога», — адрэзала гераіня і горда пайшла спаць.)**

Праз момант дзверы ў калідор ляснулі і зачыніліся з сярэдзіны на кручок.

*

...Тую ноч Ракіцкі цяпер лічыў для сябе самым дарагім успамінам. Іншай, лепшай ночы ў яго проста не было. І не за свае словы, і не за словы Ірыны было яму горка і сорамна, а ад таго, што не вытрымаў адзіноты першых дзён службы і напісаў ёй ліст. І што гэта было за пісьмо! Штампаваныя словы, просьба прабачыць (за што?), просьба застацца сябрамі... Тады, у першыя дні, пісьмо гэтае здавалася не толькі патрэбным, а нават неабходным. Нібыта не ўсё было сказана ў тую ноч! Але ў тыя першыя дні, калі вакол чужыя людзі і незразумелае жыццё, калі здаецца, каб мог, дык абняў бы таго, з кім да арміі вітацца не хацеў, — хіба ў тыя дні Ракіцкаму ўспамінаўся сэнс слоў, якія яна казала яму?

Яму ўспаміналася не само недарэчнае прызнанне, а тыя абставіны, пры якіх гэтае прызнанне адбывалася. Успамінаўся двор, заліты месячным святлом, нейкі чужы хлопец і нейкая цудоўная дзяўчына, якія нешта гавораць адно аднаму.

Ракіцкі ведаў, што гэты хлопец быў ён сам, што дзяўчынай была Іра, але колькі сабе ні ўяўляў — так і не ўспамінаў інакш, чым позірк на сябе збоку.

Гэта потым, калі з цягам часу Ракіцкі прывык і да людзей, і да салдацкага жыцця, ён пачаў глядзець больш цвяроза і на сваё мінулае. Іру ён па-ранейшаму ўспамінаў кожны дзень, але той ружовы туман, які акутваў ягоныя ўспаміны, патроху пачынаў асядаць.

І вось гэтае пісьмо — спознены на тры месяцы адказ на свой ліст. Калі ўчора яму аддалі яго, Ракіцкі не ўзрадаваўся і не засмуціўся, а падрыхтаваўся перанесці нешта куды больш непрыемнае для сябе, чым тое, што было некалі ў двары. Штосьці — «не пішы больш, я даўно замужам»...

... — Узво-о-д, левае плячо ўпяро-о-од!

Салдаты спусціліся з шашы, паўз якую даўно ўжо цягнуліся абсыпаныя цяжкім снегам елкі, і пайшлі па лясной дарозе, разбітай ваеннымі грузавікамі. Да складаў заставалася не больш двух кіламетраў, але, як назло, і гэтая дарога забірала ўверх. Да таго ж, ісці стала слізка.

Стомленаму Ракіцкаму здавалася, што дарозе гэтай не будзе канца і што прайшлі яны не дзесяць-дванаццаць, а ўсе трыццаць

кіламетраў. Ногі яго так прызвычаіліся да таго тэмпу, якім ішоў узвод, што здавалася, каб ён і захацеў, то не змог бы прымусіць сябе ісці ні большымі, ні меншымі крокамі... Яму стала сорамна і разам з тым з'явілася злосць на сябе, на тое, што, мусіць, у аднаго яго гудуць, гарадзь ногі і мокрая спіна пад бушлатам.

На павароце ўзводны спыніўся і, прапускаючы калону, пачаў углядацца ў твары салдат.

— Узв-о-од, бягом — марш!

«Якое бягом! — ледзь не вырвалася ў Ракіцкага. — Тут ісці няможна, а не бягом!» Але пярэднія пабеглі ўжо, чвякаючы ботамі па нарэзаным выпуклымі шынамі грузавікоў мокрым снезе. І ён пабег, сабраўшы ўсе сілы і жадаючы толькі аднаго: не адстаць больш чым на два крокі ад таго, хто бег наперадзе.

...Спыніліся так жа нечакана, як і пабеглі. Ледзь не выцяўшыся тварам аб аўтамат пярэдняга, Ракіцкі, цяжка сапучы, узняў галаву і нават калі ўбачыў сярод елак высокую цагляную агароджу, чорнабелы шлагбаум і салдата без шыняля каля яго, то не паверыў — няўжо ўсё, прыйшлі? Можа, гэта нейкая выпадковая перашкода, і праз хвіліну зноў некуды пабягуць, і будуць бегчы, бегчы, аж пакуль зусім не зваляцца з ног.

— Паўгадзіны — на перакур, — коратка кінуў лейтэнант, вярнуўшыся з КПП. — Там прыбудзе машына, і паедзем у часць.

Узвод рассыпаўся. Лейтэнант, сяржанты пайшлі ў каравулку — невялікі цагляны будынак побач з КПП.

У невялікім закутку паміж каравулкай, яшчэ адным будынкам і агароджай, да якой была прымацавана шыльда «Месца для курэння», было ўкопана чатыры лаўкі. Ракіцкі першы апусціўся на адну з іх. Ад стомы не хацелася нават курыць. Ён заплюшчыў вочы і адразу ж перад ім паўстала спіна ў шэрым шынялі, паўз дарогу паплылі елкі... І яму здалося, што ў хадзе па гэтай дарозе і заключаецца служба, што ўсе два гады ён так і праходзіць па гэтай дарозе. «І каб жа ведаць, што гэта некаму трэба — яшчэ не столькі прайшоў бы! Знайшліся б сілы... Ды я дакаціўся, дапоўз бы... А-а, і казаць няма чаго! Назад павязуць — і то добра...»

— Во каб зараз — назад такім жа тэмпам!

— Людзі бегаюць больш, чым мы ішлі.

Павольным, леным рухам Ракіцкі расшпіліў бушлат і выцягнуў вільготны ад поту канверт. Нейкі момант абыякава глядзеў на блакітную марку, на хвалістыя чорныя лініі штэмпеля. Пасля адарваў ад ражка вузкую палоску і выцягнуў невялікі ліст. Вочы адразу выхапілі некалькі слоў з сярэдзіны. Пісьмо было напісана па-бела-

руску, роўным дзявочым почыркам, у якім літары стаялі асобна адна ад другой...

**(Адразу папярэджваю — гэта не пісьмо Таццяны да Анегіна. «Но строк постыдных не смываю...»)**

«Добры дзень, Юра! Адразу прызнаюся, што не чакала ад цябе такога пісьма. Ты пісаў, што калі я па-сапраўднаму некага кахаю, то не трэба табе пісаць. Кажу табе, Юра, адразу, што нікога я па-сапраўднаму не кахала, і ты, калі ласка, пра гэта не думай. Тады мяне праводзіў Яновіч з нашага класа. Ён, праўда, мне крыху падабаўся, але цяпер, калі пачаў хадзіць з... (не буду пісаць з кім), то зрабіўся мне зусім абыякавы. Толькі не таму, што памяняў мяне на другую! Калі б у нас было што сур'ёзнае, дык я павінна была б перажываць, а я — ніколечкі! Значыць, нічога сур'ёзнага і не было. А што тады, ноччу, я так гаварыла — тое забудзь, тое няпраўда! Мы ж — дзеўкі — такія... Калі ўжо раз нехта правядзе, то здаецца, што ўсе хлопцы кругом у цябе закаханыя і толькі таго і чакаюць, каб у гэтым прызнацца. Юра, я пасля твайго пісьма многа перадумала і багата чаго зразумела. Ты, канечне, не змог усяго напісаць, але я сваім жаночым сэрцам адчуваю, што табе, як і другім хлопцам, нялёгка і, мусіць, усяго бывае. І ў нарады ходзіце, і ў каравулы, і не спіце начамі, бо сцеражэце наш сон. Вас нельга крыўдзіць, а трэба берагчы, любіць і цаніць... Пішы... Вышлі фотакартку...»

Ад хвалявання лісток дрыжэў у руках Ракіцкага. Наколькі моцна ён убіў сабе ў галаву, што пісьмо будзе дрэнным, настолькі нечаканай і ад таго вялікай была зараз яго радасць.

Ён падняўся і, патаптаўшыся на месцы, падышоў да салдат. Яму цяпер хацелася кампаніі.

*

Ракіцкі, усміхаючыся, пазіраў на сяржанта, сам не ведаючы, чаго падышоў і што збіраецца казаць.

Сяржант пасунуўся.

— Ракіцкі, сядай, — загадаў ён. — Чаго быў адзін? У арміі аднаму быць не паложана.

— Пісьмо чытаў, таварыш малодшы сяржант, — стоячы, ахвотна адказаў Ракіцкі.

Сяржант крыху падумаў і сказаў:

— Калі салдату ісці ў каравул, пісьмы перад гэтым яму аддаваць не паложана. Таму што пісьмы ўсякія бываюць, ясна? Ёсць людзі, каторыя не разумеюць і пішуць абы-што. Прачытаеш — і жыць не

хочацца, не тое што служыць. Адсюль самастрэлы, дзезерцірства і іншыя, як гаворыцца, дурныя выхадкі.

Але нават сумная, нудная сяржантава лекцыя не змагла сапсаваць Ракіцкаму настрой.

Паўгадзіны адпачынку праляцелі мігам. Неўзабаве салдаты пастроіліся каля КПП. Чакалі лейтэнанта і машыну. Нарэшце лейтэнант паказаўся, з заклапочаным выглядам абцягваючы пальцамі рукавы шыняля, нібы хацеў схаваць у іх рукі.

— Так, таварышы байцы! Званілі з часці — машыны не будзе. Лепш сказаць, будзе, але яна павязе катушкі з кабелем. Мы пойдзем пешкі. Трыццаць кіламетраў — не так многа, мы ў вучылішчы больш хадзілі, і без перакураў... Вам, канечне, цяжэй з непрывычкі... У машыне памесцяцца два-тры чалавекі. Каму сёння ў нарад?

У нарад было акурат Ракіцкаму. Меў поўнае права ехаць. Але ён змоўчаў. І калі ззаду штурхнулі яго ў спіну — выходзь, маўляў, нават не азірнуўся, толькі крутнуў плячом: адчапіцеся! Яму было так радасна і здорава.

...Хутка перад вачыма Ракіцкага зноў калыхалася спіна з аўтаматам, а ногі яго мясілі рыхлы снег. На хаду ён яшчэ раз сунуў руку за борт бушлата і, патрымаўшыся за пісьмо, лёгка ўздыхнуў і зашпіліў гузік.

## 14. Прамое дзеянне

Калі аснову першай часткі складалі творы, якія друкаваліся (праўда, без аніякай надзеі ўбачыць іх калі-небудзь асобным выданнем), дык аснову другой павінна было скласці самае ранняе, «напісанае ў стол», тое, што чытач убачыць упершыню. Дзве аповесці, куча апавяданняў...

Але з сумам, з расчараваннем, з жалем мушу ўключыць у эсэ толькі невялічкія ўрыўкі.

Не з-за адной іх мастацкай слабасці. Падпраўленыя рэдактарскай рукою, пайшлі б яны роўным ходам.

Не — сорамна мне па іншай прычыне. Амаль усё, што там напісана, «было на самой справе». Гэты сказ гучаў, і гэты эпізод быў падгледжаны ў жыцці. А значыць, думалася 23-гадоваму «пісьменніку», яно як мінімум мае права на існаванне.

Колькі такіх аўтараў, і «увы», і «отнюдь», і ох, і ах — не толькі 23-гадовых. Якія не проста не разумеюць, а хваляцца, ганарацца і даводзяць рэдактару, што «мая Рэч, мой Твор не можа быць слабы,

бо ўсё гэта так і было», чым самі сабе падпісваюць суровы прысуд.

Тое, як хутка могуць старэць, выходзіць з ужытку дэталі — розныя рублі-капеечкі, порткі-джынсікі, прычоскі-фрызурыкі, пэйджэрыкі-мабільнічкі, прывязаная да свайго недаўгавечнага часу лексіка, аднадзённыя слоўкі-тэрміны — яшчэ паўбяды. Нічога так не старэе, як прамыя словы, прамыя думкі, прамое дзеянне. Г. зн., калі герой хоча выклікаць шкадаванне, дык аўтар так і піша — ён быў такі няшчасны, што не перадаць, слёзы проста ліліся з яго вачэй, акрапляючы пыл пад нагамі... А калі трэба паказаць радасць, дык так і пішацца: радасць яго залівала ўвесь сусвет, так і перла з яго, ён быў вельмі, вельмі, бясконца, несказана рад...

Прыблізна так я і пісаў.

Не трэба забываць тую літаратурную і грамадска-палітычную атмасферу. А таксама мой узрост і духоўны багаж. Я слаба ўяўляў, што хачу сказаць. Чалавек ідзе, правільна, ён можа ісці і ў рэальным жыцці. Але чаго ён ідзе, куды? Не было падтэксту. Між тым як кожнае, літаральна кожнае дзеянне, дэталь, думка павінны быць матываваны. Калі герой глядзіць на яблыню, дык трэба, каб не аўтар накіроўваў яго вочы на яе, а каб гэтае сузіранне з чагосьці вынікала, а наступнае дзеянне чаплялася ўжо за эпізод аглядвання яблыні.

## 15. «Вясковы сшытак»[4]
## (Урыўкі з аповесці, 1986 г.)

ВАКЗАЛ

З раённага цэнтра дадому можна было дабірацца электрычкай, дызелем або аўтобусам. Дызелем нават лепш — ехаць... язды 15 хвілін, а потым ад станцыі да вёскі кіламетры паўтара пехам па лясной цяністай дарозе, якая пасля душнага горада... прайсціся па якой пасля душнага горада ўяўлялася цяпер Маховічу проста марай. Але дызеля трэба было яшчэ чакаць. І Маховіч, глянуўшы на гадзіннік, падумаў трохі і накіраваўся да аўтавакзала.

У яго балела галава — хутчэй за ўсё ад спёкі, але на душы было спакойна, як і ва ўсякага чалавека, зрабіўшага хоць і нявялікую, але патрэбную для сябе справу. Ён спецыяльна прыязджаў у горад на паштампт, каб адтуль паслаць заказным пісьмом дакументы ў сталічную ВНУ. Зараз яму прыемна было ўспамінаць, як на пошце

---

[4] Захавана стылістыка арыгіналу. — **А. Ф.**

ён укладваў у канверт атэстат, медыцынскую даведку, характарыстыку воінскай часці, акуратна падпісваў адрас і як падаваў канверт... пісьмо... пакет дзяўчыне ў акенца, які абыякавы выгляд ён зрабіў, калі тая паглядзела на яго з павагай.

Заняты сваімі думкамі, Маховіч нават не спыніўся, каб цікавіцца знешнім выглядам вакзала (яго дабудоўвалі, калі Маховіч служыў), а адразу прайшоў праз шкляныя круцёлкі-дзверы і апынуўся ў памяшканні... зале чакання. Ля акенца з надпісам «Продаж прыгарадных білетаў» стаяла доўгая чарга. Сёння была якраз пятніца, дзень, калі на «гараджан» найбольш находзяць любоўныя пачуцці да роднага дому і да старых бацькоў.

Маховіч пашукаў вачыма знаёмых і, упэўніўшыся, што чаргу гэтую, як ні круці, давядзецца выстаяць, уздыхнуў і прыстроіўся самым апошнім — за дзяўчынай.

Чарга рухалася марудна. Ля самага акенца тоўпіліся тыя, у каго «вось-вось» аўтобус. Маховіч глянуў на гадзіннік (як часта!), яшчэ раз уздыхнуў і прамармытаў даволі гучна:

— Іх паслухаць, дык у гэтую хвіліну адпраўляюцца ўсе аўтобусы вакзала.

Дзяўчына азірнулася на яго і засмяялася (ацаніла).

— Ой, а я вас ведаю! Вас завуць, здаецца, — яна хітра прыжмурылася, — так, Сяргей, і вы едзеце да Сасновага, а я крыху далей — у Бокаў. А мяне завуць Ліка. Нам адным аўтобусам ехаць, па дарозе.

— Так? — узрадваўся Маховіч. — Дык купі мне, калі ласка, білет, каб не стаяць...

І, быццам не заўважыўшы на яе твары лёгкай збянтэжанасці, Маховіч уклаў капейкі ў машынальна падстаўленую руку дзяўчыны і пайшоў да выхаду...

*

Лагічней было б, канечне, каб Маховіч застаўся ў чарзе і купіў білет і сабе, і дзяўчыне. «Комплексы»! Добра памятаю тую Ліку — Анжаліку з Полацка. «Давай, браток, поедем в Полоцк, свою тоску гони ты прочь, мы заберём с собой Анжелу, мы будзем пить, гулять всю ночь! Чего-то нет, чего-то жаль, куда-то сердце мчится вдаль!..» Прыгожая была дзеўка. Ведаю, ведаю — калі палічыць (а ўважлівы чытач налічыў ужо 2 Анжэлы), усе да адной у мяне прыгожыя; што ж рабіць, калі сапраўды толькі да такіх цягнула — па прынцыпе палярнасці — і ўсе такімі здаваліся (гл. раздзел 5).

Іншае цікава. Акрамя сапраўднай літаратуры, якую я ў тыя 80-я пачынаў толькі адкрываць, мая галава была набітая Вернам, Стывенсанам, Дэфо, Гюго, Драгунскім, Куперам, Конан-Дойлам, Грынам, Рыдам, Гайдарам, Лонданам, Скотам, Янкам Маўрам... Дзе мае дэбютныя падводныя лодкі, шукальнікі скарбаў з рыдлёўкамі на плячах, мяхі з пушнінай (як у дэбюце А. Наварыча), дзе мае двое калі не на экзатычным, закінутым у часе і ў прасторы востраве, дык хоць бы заблукалыя ў мясцовым балоце ці ў бліжэйшым Піліпавым лесе?..

Чаму такое рэалістычнае нудноцце і шэрасць?

Ды з прычыны, указанай у 14 раздзеле. Пры ўсім захапленні вышэй пералічанымі аўтарамі, чытаючы іх, не перастаеш адчуваць, што гэта гульня, умоўнасць, што такога не было і, па вялікім рахунку, быць не можа.

«...Мала таго. Калі напружыцца і паставіць сабе за мэту, можна стварыць копію капітана Нэмо, і Бюг Жаргаля, і выпаленую амерыканскім сонцам прэрыю, па якой нясецца конь з безгаловым вершнікам (варыянт — «кароль Стах»), і пірата Сільвера з яго кашмарным папугаем на плячы (які крычаў: «Піястры!», мы б замянілі на «Рублікі!»)...

А вось хай Гюго з Майн Рыдам і з Джэкам Лонданам паспрабуюць напісаць, як вясковы хлопец купляе на вакзале білет, едзе ў аўтобусе, сядзіць пад квітнеючай ліпаю, сварыцца з маткаю на тэму — ехаць у вялікі свет і хутчэй за ўсё прападаць там, ці заставацца ў вёсцы (і таксама прападаць)...

Сільвер на сваёй драўлянай назе і з папугаем на плячы — умоўнасць, яблыня белага наліву пад месячным сяйвом — рэальнасць, даступная ўсім, у т. л. і Стывенсану...»

**(Цытата з дзённіка за 1986 г.)**

АЎТОБУС

Канечне ж, у аўтобусе сядзелі яны побач, і канечне ж, Маховіч закахаўся.

ВУЛІЦА

Маховіч звярнуў у вулачку, якая найкарацей вяла дадому. Тут ён запаволіў крок.

Ён стараўся... ён знарок адганяў думкі... аб размове ў аўтобусе, каб потым, пры іншых абставінах, успомніць яе да драбнюткіх драбніц. Усмешка раз-пораз кранала яго вусны. Ён запускаў далонь у валасы, ускудлачваў іх і нават спыняўся, са здзіўленнем азіраючыся, быццам стаіць... апынуўся не на сваёй роднай вуліцы, а ў чужым месцы.

Па дарозе сям-там ляжалі шматкі сухога сівага сена, якое звезлі трактарамі з поплава і растрэслі; пахла сенам і трохі ліпавым цветам.

І толькі каля высокай тоўстай ліпы, што расла недалёка ад яго хаты, Маховічу ўдалося перавесці думкі (і вочы) на другое — на ліпу.

Ісці дамоў расхацелася. А чаго хацелася, Маховіч і сам не ведаў. І ў гэты момант памяць нечакана ярка...

Пад дрэвам быў цень. Ліпа пахла так густа, соладка, прыемна, пчолы гулі ў яе кроне, лістоце і поўзалі па ствале... па кары; вакол дрэва быў такі густы прыемны цень, што Маховіч не змог утрымацца, каб не апусціцца на лаўку і не пасядзець.

Ён прысеў на лаўку. Вакол дрэва быў цёмны круг святла і стаяў такі густы, прыемны, салодкі пах... Было чуваць, як пчолы поўзалі па ствале і гулі недзе ўверсе, у кроне...

Колькі разоў у арміі Маховіч згадваў гэтаю ліпу, колькі разоў думаў, як будзе сядзець вось так, як цяпер, і ўспамінаць, як ён некалі ў арміі думаў тут сядзець... І вось сядзіць — і што?

Але ж яму прыемна... Чаго? Не толькі ад таго, што сядзіць адзін пад ліпаю. А ад чаго яшчэ?

(Карацей, каханне. О, хто нас у гэты свет паслаў! Якая мілата, які цуд гэта незямны! Ты быў адзін, а цяпер — двое. Ты стаў вачыма, і вушамі, і носам іншага чалавека, і ўвесь свет успрымаеш цяпер так, як каханы чалавек, а ён — так, як ты. Для гэтага нават не абавязкова быць побач і гаварыць услых; няважна, у якой кропцы зямнога шара і на якой адлегласці адзін ад аднаго знаходзяцца каханыя — усё роўна бачаць яны адно і тое ж і адчуваюць аднолькава... Вось дрэва, і сёння раніцаю ты бачыў яго (калі ўвогуле бачыў) — а цяпер! Узоры лісця, гульня святла-ценю, і ўсё гэта складваецца ў галаве ў сказы... ды якія разбэрсаныя і разам з тым стройныя... фізіялагічна-юрлівыя і адначасова ўзнёслыя... А калі яшчэ ёсць каму слухаць! Мала таго — можна ж яшчэ прыціснуцца, пацалавацца... Не, гэты свет не сам па сабе, ён дакладна Кімсьці кіруецца!)

Толькі Маховіч пачаў падманваць сам сябе, што не было ніякай дзяўчыны, ніякай размовы, што прыемнасць гэтая проста так — ні ад чога, як у гэты момант памяць ярка... у вушах прагучаў яе голас, а перад вачыма паўстаў яе твар — да таго выразна, што Маховіч зажмурыўся.

«Як дзіўна. Я не ве-да-ла, — па складах паўтарыў ён слова, якое міг назад так выразна пачулася яму. — Я ка-за-ла. Як дзіўна, што яна — дзяўчына, і так прывычна для яе «казала» замест «казаў»... тое самае для яе «ведала», як для мяне — «ведаў»...

І хоць недзе ў самым куточку душы заварушылася трывога (?), нібы папярэджваючы, што дабром такія думкі і захапленні не канчаюцца, Маховіч адагнаў яе і радасна, шчасліва засмяяўся.

НАЧНАЯ ЯБЛЫНЯ

...Ён спусціўся з ганка і паціху пакрочыў па белай, светлай ад месяца вуліцы. (Чорныя, доўгія, паласатыя ад платоў, дрэў цені...)

Завулак. Яблыня. Галіны звесіліся на вуліцу. Маховіч выглядзеў яблык, вялікі, нават бачна было, які ён наліўны, жоўта-белы, і толькі хацеў падскочыць і сарваць яго, як ад нечаканасці ўздрыгнуў. Зусім побач... праз шчыліну плота... у цёмным кутку, на цёмнай лаўцы... крокаў за пяць, спінай да яго сядзела парачка, прытуліўшыся. Ён хацеў нячутна... адразу пайсці, але ўсім вядомая цікаўнасць утрымала — саромная, усемагутная... Стойваючы дыханне, ён пастаяў, нічога не пачуў, нічога не ўбачыў і ўжо асцярожна павярнуўся, як на лаўцы завалтузіліся.

— Ай-йдзі, дурны, — сказала гучна дзяўчына.

Зноў зацішша, зноў валтузня, і зноў:

— Ай-йдзі... Дурное, куды ты лезеш...

У адказ мужчына (не хлопец!) зарагатаў басам.

Маховіч падскочыў і сарваў яблык, знарок не тоячыся, рэзка шморгнуўшы галіну. Яблык, праўда, аказаўся добры, і пах летам.

— ...Што там такое?

N. наблізіўся. Ледзь не нос у нос пачаў разглядваць Маховіча, але так і не пазнаўшы, дабрадушна сказаў:

— Што, хлопча, адзін? Ідзі ў клуб, гуляй! (Дазваляю. Калі што — скажы, звяртайся да мяне.) Хапай любую, гуляй... А хочаш — маю бяры? — кіўнуў галавою на лаўку.

— Дурное якое, — пачулася адтуль.

(N. зарагатаў. Ён быў добры чалавек, адразу відаць. Калі б Маховіч згадзіўся, N. так бы і зрабіў — аддаў бы, саступіў бы сваю дзяўчыну.)

КРАМА

У краме — маленькай, на два акны, старэнькай хатцы было цемнавата.

Некалькі жанчын куплялі хлеб. Разаслаўшы на падлозе хусткі, клалі на іх свежыя пахкія боханы. Калі Маховіч зайшоў і павітаўся, твары жанчын павесялелі, яны ўхапіліся хутчэй увязваць свае клункі, каб паспець павучыць Маховіча жыццю.

Тое, што яго трэба вучыць, само сабой разумелася: ён жа піў і курыў, а значыць, быў дурнейшы за іх...

## 16. Крама

Ці, як у нас казалі, магАзін.

Быў ён адначасова і клуб, і кавярня, і медпункт, і «тэлеграф» — адзіны на ўсю вёску тэлефон, і «банкетная зала», і месца адпачынку. Нязменная бочка з селядцамі-івасямі — для людзей, і бочка з камсою — для свіней... Здавалася б, гэты селядцовы пах павінен быў перабіваць усё на свеце і пахнуць павінна было б толькі гэтымі бочкамі — не, усё, што тут было, пахла па-свойму, нават закаркаваныя пляшкі алею пахлі халвой і сланечнікамі. Пахлі скрынкі з мукою, крупамі, цукрам; у кожнай скрынцы тырчаў савок (менавіта так — савок без двукосся, у мяне ўвогуле мара вярнуць некаторым словам іх сапраўднае, нармальнае гучанне і значэнне, напрыклад, прыгожаму і абсалютна невінаватаму слову «блакітны»)... Вагі. Набор круглых гір і маленькіх гірак, якія нават даросламу такая спакуса стырыць — проста незаўважна пакласці ў кішэню, асабліва вось гэтыя, маленькія, па 50 і па 100 грамаў, на грузілы для донак. Два шкляныя, звужаныя ўніз цыліндрыкі з кранікамі, у адной ёмістасці бярозавы сок — 8 капеек, у другой таматны — 10 капеек, побач — бясплатная соль у чарачцы і лыжачка, аблепленая соллю (пра гэты таматны сок хто б з пісьменнікаў не пісаў, ніхто не праміне згадаць, што лыжачкай нехта ўжо карыстаўся).

Харошы магАзін быў, жывы, свой, цёплы. Не толькі тэмператураю ў слотныя і зімовыя дні — душой сваёй цёплы. Чаго і каго ты толькі не набачыўся, не наслухаўся за свой век, колькі гісторый ведаеш і нікому не скажаш?

Напрыклад, мой лёс. Усялякага ты мяне помніў, любога бачыў. І малога з цукеркамі, і большага з цыгарэтамі, і яшчэ большага — калі ўпершыню паспрабаваў «чарніла»-гадасці... І калі мне было 20, пасля арміі, і стаяў я на раздарожжы, ці, лепш сказаць, сядзеў на кукішках перад грубкаю. Зіма траскучая. Пляшка «чарніла» ў адной руцэ, «астрына» ў другой… Патлаты, няголены, расхлістаны — у прамым і ў пераносным сэнсе, фізічна і духоўна. І канечне ж, вакол бабы-кватухі са сваім увязаным у клункі хлебам, вочы радыя-радыя, а галасы сумныя-сумныя.

— ...Як і п’е, то ён шкоды не робіць, не б’ецца, не сварыцца...

— І не сварыцца, маладзіца, а што п’е, дык ён не ўкраў, а за свае... Жаніцца яму трэба!

— Хто за мяне пойдзе? — я. (Трэба ўмець, ведаць, чым ім дагадзіць.)

— А мо дасць Бог. Цяпер жа і дзеўкі ўсякія бываюць...

Ах, якім алеем па грудзях было ім гэта слухаць, а мне — такое казаць! Усё, жыццё скончана ў 20 год. Ну што ж, прападу, сап'юся — «это многих славный путь!» Яшчэ парачку!.. Як прыемна разыгрываць з сябе спітага, «кончанага», да чаго ж салодкае гэта пачуццё — усіхняй забытасці, адрынутасці, адзіноты... Як тады людзі пачынаюць мякчэць, раскрывацца, шкадаваць цябе, памагаць табе...

На самой справе падсвядома ішло назапашванне матэрыялу, усё капілася невядома для чаго — ці, якраз такі, вельмі добра вядома, для чаго: адбывалася своеасаблівае «зацяжарванне», якое не магло не скончыцца родамі; як скажа пазней у рэдакцыі «Маладосці» першы ўбачаны мною жывы пісьменнік, Уладзімір Саламаха: «Нарыў, які будзе прарываць, хочаш ты таго, ці не».

## 17. Вёска

Канечне ж, неўзабаве гэтая гульня перайшла б у проста жыццё, і тады сам не заўважыў бы, як зрабіўся б тым, у каго гуляеш.

Усё да таго ішло. Не бачылася магчымасці нікуды вырывання.

Можна спытаць — а куды вырывацца? Навошта? Пасля аповесці «Вёска», у якой я, хочучы праклясці сялянскае жыццё, міжволі благаславіў яго, крытыкі пісалі: «Нашто герой некуды імкнуўся? Яму ж рай там быў».

Вось толькі з гэтага рая, як у прымаўцы, «не выйдзе ні...», словам, анічога. Рай там быў да 14 гадоў, а пасля для таго, хто не паспеў і спазніўся, пачыналася пекла. І вырыванне з тагачаснай вясковай рамантыкі было сінонімам слову «жыць».

Аднак неаднойчы яшчэ я пачую ад самых розных людзей карысныя парады.

Сяргей Дубавец: «Ну, скончыш інстытут, застанешся ў Мінску і ці прападзеш, ці яшчэ горш — станеш такім жа пісьменнікам, як ***усе яны.*** Трэба жыць у вёсцы, сярод народа...»

Алесь Рыбак: «Эх, мне б вашы гады... Пераехаў бы ў вёску, пісаў бы там на прасторы...»

Іван Пташнікаў: «Каб мне ваша маладосць!.. Я б пешкі пайшоў па Беларусі, потым асеў бы ў вёсцы...»

Анатоль Сыс, доўга не могучы мне дараваць працу ў «Полымі» (ён лічыў, што я займаю яго месца): «У Бярозаўку, (...)!» (Бярозаўка — гэта мая вёска.)

Калі Булгакаву аднойчы пачалі даказваць, што ён «павінен змагацца за чысціню тэатральных прынцыпаў» і т. п., і прыводзілі аргумент:

— Вы ж прывыклі галадаць, чаго вам баяцца! Булгакаў адказваў:

— Я, канечне, прывык галадаць, але не вельмі люблю гэта. Так што вы ўжо самі змагайцеся.

«Менавіта таму, дарагія, што я дастаткова там пажыў і ведаю, што гэта за мёд, я туды не вельмі імкнуся — вы ўжо самі там жывіце».

## 18. Субяседаванне

Лёгка сказаць — вырвацца.

Трэба не проста з'ехаць упрочкі. Трэба была абавязкова вышэйшая навучальная ўстанова, і абавязкова звязаная з літаратураю, бо залежнасць ад яе была ўжо куды мацнейшай, чым ад таго ж спіртнога.

Як гэта зрабіць? Без грошай, без блату, без «чырвонага дыплома», без накіравання? У кожнае ВНУ каля дзесяці чалавек на месца. Плюс гуманітарныя ВНУ патрабуюць, каб меў нейкае дачыненне да творчасці (а ўся мая «творчасць» — сіні канверт ды два вершыкі ў раёнцы, і тыя згубіліся). І тут, як не раз яшчэ здарыцца ў жыцці, памагла армія, радок з характарыстыкі: «активно сотрудничал с «Боевым листком», некоторое время являлся редактором его…»

З гэтым радком узнікаў адзін з сотні шанс быць — не, не дапушчаным да экзаменаў, не стаць абітурыентам, а ўсяго толькі слухачом на падрыхтоўчым аддзяленні. І нават ім зрабіцца няпроста, трэба прайсці «субяседаванне». Тры прадметы: гісторыя? нямецкая? — не памятаю. Апошняя — літаратура. «Паднятая цаліна». Пашэнціла. «Всерьёз собрались Рваные шчупать Советскую власть…» Выдатна, пяць. Тры пяцёркі. (Як Бунін ніколі не змог прывыкнуць да савецкага правапісу, так я ніколі не прывыкну да цяперашняй дэбільнай дзесяцібалкі.)

Выйшаў на вуліцу. Іншымі вачыма агледзеў гэты горад, іншымі вушамі яго пачуў, іншымі ноздрамі ўдыхнуў яго паветра…

Вечар, цягнік, купэ, толькі я і нейкая жанчына. Дастаю пляшку «чарніла», набулькваю поўную, 250 грамаў шклянку, спакойна выпіваю да дна. І раптам жахлівы стогн:

— О-ох, Божа мой мілы, Божа літасцівы! Што ж гэта робіцца на белым свеце?!

## 19. Мінск

Як заўсёды ў такіх выпадках, доўга, месяцы два (дзелім на дні і гадзіны), цягнулася маўчанне. Мёртвае. І, як заўсёды, калі герой праходзіць усе неабходныя фазы: адчаю, злосці і абыякавасці — менавіта ў той момант з'яўляецца паведамленне з казённым штэмпелем.

Вось ён перада мной, гэты жоўта-шэры аркушык таннай (самай дарагой у свеце!) паперы, які правёў чарговую рэзкую ***мяжу*** паміж маім папярэднім жыццём і будучым.

«Прыёмная камісія паведамляе, што Вы залічаны…»

Мінску я ўжо дастаткова праспяваў дыфірамбаў. «Гэта мой горад». Ён зрабіў амаль немагчымае — залячыў боль адразання пупавіны; больш таго — ён прызнаў мяне, прыняў маю любоў і адказаў мне ўзаемнасцю. І дзе б мяне потым ні насіла, толькі калі апынаўся тут, супакойваліся душа і думкі…

Трэба ведаць, што ў той час кожны малады чалавек, які трапляў у Мінск, неўзабаве пачынаў гаварыць сабе: «Я беларус, і ганаруся гэтым»… Мінск здаваўся яму найвялікшым у свеце горадам, душа яго свабодна аддалася на тое, каб у ёй старанная рука напісала веру ў Бацькаўшчыну…

…Хвілінку, выбачаюся — тут выпадкова ўплішчылася чужое, а я забыў узяць у двукоссе. Але чые гэта два апошнія сказы?

Гэта піша ў 1944 годзе, за год да смерці, Кузьма Чорны ў сваім аўтабіяграфічным рамане.

Тады яшчэ крыху, ужо з двукоссем:

«…Адчуваў сябе на мяжы двух светаў: мінулага і будучыні, Заходняй Еўропы і Расіі, каталіцтва і праваслаўя…»

## 20. Вечарына

У мяне, як у Плюшкіна, нічога не прападае, усё пад рукою — бібліятэчна-бібліяграфічная адукацыя плюс сялянская натура.

Вось сімпатычны вузенькі запрашальнік:

«Паважаны таварыш!<br>ЗАПРАШАЕМ ВАС<br>на літаратурны вечар-сустрэчу<br>з Таварыствам маладых літаратараў<br>пры Саюзе пісьменнікаў БССР.<br>Чакаем Вас 10 снежня 1987 года».

Дыхнула трохі залатымі часамі? «Таварыш», «БССР»... Дом літаратара, паўнюткая зала. У першым радзе Законнікаў, Быкаў, Гілевіч, Брыль, Сачанка... Анатоль Сыс — вядучы. Дабіраюцца да майго ўрыўка «Заява» з аповесці «***Мяжа***», чытае прафесійны дыктар з радыё, светлай памяці Алесь Свістуновіч, чытае з такім уздымам, пафасам — як сапраўдную класіку, і як жа страшэнна сорамна слухаць гэта, і думаецца: ды каб ведаў, што яно будзе гучаць са сцэны, хіба так напісаў бы — стараўся б лепш у сто разоў!..

Тым не менш, дзякуючы Свістуновічу, гэтая амаль школьная слабізна праходзіць на «ўра». Мне перадаюць словы Барыса Іванавіча Сачанкі: «Не, у такім ключы, на такім узроўні аповесці ён не выцягне...» (Як у ваду глядзеў, аповесць з такой назваю я не напісаў.) Анатоль Сыс — Сяргею Законнікаву: «Ну што, возьмеце ў «Полымя»? — «Калі ўся аповесць такая — возьмем». Запабягаючы наперад, у «Полымя» ўзялі не аповесць, а мяне самога, літаральна са студэнцкай парты, я вучыўся, здаваў экзамены і адначасова працаваў на поўную стаўку ў часопісе.

Міхась Тычына: «А ўсё так добра пачыналася — з’явілася апавяданне Андрэя Федарэнкі «Заява», і пра яго дружна загаварылі. І «левыя», і «правыя», і «цэнтрысты». Кожны знайшоў у творы нешта сваё: традыцыяналісты-бытапісальнікі — вернасць паказу жыцця «ў формах самога жыцця», адкрывальнікі «новай літаратуры» — смеласць у пастаноўцы «рабром» вострых нацыянальных праблем. Над аб’ектыўным сэнсам намаляванай карціны, як водзіцца, мала хто задумаўся...»

## 21. «Заява»

Узбегшы на шосты паверх, Міцура счакаў трохі, супакойваючы дыханне, зверыўся па лістку з нумарам кватэры і ціснуў чорную кнопку. «Ну, адчыніць жанчына — стане па-мойму», — загадаў ён не без хвалявання, покуль за дзвярыма чуўся заўсёдны прыцішаны шоргат, яшчэ нейкія гукі і, урэшце, шчоўкат замка.

У дзвярах стаяў дзябёлы, здаровы на выгляд мужчына ў трыко і ў майцы, падобны нечым на цыркавога барца — тым больш што, разглядаючы Міцуру, мужчына ад нечага склаў на грудзях рукі і выставіў трохі наперад бараду.

— Дзяньдобры, — пачціва павітаўся Міцура, зазіраючы зноў у паперку. — Тут жыве Ласніцкая Іра?

— Гэта мая ўнучка, — адказаў мужчына басам, прасунуў руку пад майку і пачухаў грудзі. — А што вам трэба? І хто вы такі?

З размоў у другіх кватэрах Міцура меў ужо сякі-такі вопыт: ён заўважыў, што, пачуўшы толькі беларускую мову, не ведаючы нават, чаго ён прыйшоў, людзі насцярожваліся і пачыналі глядзець на яго падазрона.

Міцура зірнуў мужчыну ў вочы і роўным (як яму падалося) голасам назваў сваё прозвішча, імя і інстытут, дзе вучыўся. Мужчына апусціў галаву, перастаў чухаць грудзі і сказаў:

— Дык нашто табе мая Іра?

— Бачыце, яна сёлета пойдзе ў школу... У рускую школу, так? Можа, вы дасце згоду, каб яна вучылася ў беларускім класе, дзе ўсе прадметы будуць на роднай мове?

— Ну, праходзь, — нечакана сказаў мужчына, адступіўшы ўбок. — Прайдзі, прайдзі — пагаворым.

Ён зачыніў дзверы і, не даўшы Міцуру разуцца, правёў яго на кухню.

— Тут бардачок, але нічога...

Мужчына прыняў са стала парожнія пляшкі з-пад піва, з серванта дастаў дзве поўныя. На стале стаяла талерка з ружовымі застылымі галубцамі, слоік з лыжкамі ды відэльцамі, ляжаў слюдзяны мяшэчак з магазіннай вэнджанай рыбаю. Мужчына пераставіў галубцы на сервант і, палічыўшы, відаць, што гэта ўжо наведзены парадак, апусціўся на стульчык каля акна.

Міцура прысеў насупраць.

— Калі вы даяце згоду, — асцярожна пачаў ён, гледзячы, як мужчына канцом відэльца адкаркоўвае пляшку, — ну... згоду на беларускі клас, то трэба, каб Ірыніны бацька ці матка напісалі заяву. Я пакажу зараз...

— Ну — ужо табе заява... Ты ж пераконвай мяне, пераконвай! Пераканаеш — адразу пішу заяву і выдаю на рукі, — мужчына пляснуў далонню па стале. — П’еш піва?

— П’ю, але не цяпер. А ў чым вас пераканаць?

— Ты ў мяне пытаеш? Табе ж трэба заява, а не мне.

Міцура паўтарыў, што заяву пісаць маюць права толькі бацькі, успомніўшы чамусьці менавіта ў гэты момант, як ён загадваў перад дзвярыма. «Адчыніў мужчына — значыць, будзе ўсё добра, — падумаў ён. — Ці то я на жанчыну загадваў?»

— Ты лепш мне вось што скажы: тое, што ты хочаш, не зусім супадае з дзяржаўным, так?

— Усё з усім супадае, — паспяшаўся запэўніць Міцура. — Усё супадае, толькі для таго, каб вучыцца па-руску, ніякіх заяваў чамусьці не трэба, а на роднай мове...

— Э-э, лектар! — перабіў мужчына і зморшчыўся — ці то ад піва, ці то ад Міцуравых слоў. — Ты пераконвай мяне, пераконвай, а не чытай лекцыі. Узяўся за гуж, не кажы, што не дуж, — важна сказаў ён. — Мне цікава, што будзе мець мая ўнучка з беларускае мовы? Якія ёй будуць перспектывы?

— Па-першае, яна будзе ведаць родную мову, — сказаў Міцура не зусім упэўнена, адчуваючы, невядома чаму, няшчырасць, — ну, і вырасце сумленным чалавекам.

Мужчына ўсміхнуўся, каўтануў піва і пасыпаў соллю край рыльца.

— Ты хочаш сказаць, што кожны, хто ведае родную мову, сумленны чалавек? Не пераканаў.

Міцура выцягнуў з кішэні цыгарэты. Мужчына, не ўстаючы, адчыніў фортку і працягнуў яму чыстую попелку.

— Дзякую. Пры вашых разважаннях... — Міцура прыкурыў, — вы добра ведаеце... павінны, ва ўсялякім разе, ведаць, што практычных перспектыў няшмат. Можна, канечне...

— То чаго ты ідзеш агітаваць? Няўжо ты думаеш, што перад табой дурні сядзяць? Чакай, чакай, — памякчэў ён, пабачыўшы, што Міцура падняўся. — Я ж сказаў, што падумаю — можа, і напішу.

— У мяне мала часу, — Міцура, аднак, сеў. Яму дужа хацелася прынесці хлопцам хоць адну заяву, і гэтае хаценне прымушала яго не зважаць на грубасць. — Вы ўжо дзед, а яшчэ так добра выглядаеце, — насмеліўся ён на камплімент.

— Я працаваў настаўнікам фізкультуры, таму такі здаровы. Цяпер ужо... даўно не тое. Што ўспамінаць, — мужчына памаўчаў. — Але слухай: чаму ты запнуўся, называючы сябе, га? — спытаў ён раптам. — І чаму, калі твая справа дзяржаўная, яе праводзіць не дзяржава, а... немавед хто?

«Мая справа», — з прыкрасцю зазначыў сабе Міцура.

— Дзяржава ж не нейкі абстракт, — сказаў ён, адганяючы рукою цыгарэтны дым, — нейкім чынам я ж таксама часцінка дзяржавы, малекула яе — так скажам — і маю права нешта рабіць ад яе імя. Тым больш калі гэтае «нешта» — на карысць самой дзяржаве.

— Падай там збоку адчынялку, — бразнуўшы аб стол відэльцам, папрасіў мужчына.

Міцура падаў. Мужчына адчыніў другую пляшку.

— Абрыдла мне ўжо і гэтае піва, — каўтануўшы, скрывіўся ён. — А ты ведаеш, якіх дроў наламалі такія, як ты, ад імя дзяржавы?

— Пры чым тут я і беларуская мова?

— А пры тым! — Мужчына хоць і сказаў больш-менш спакойна, відаць, ужо ап'янеў, вочы парабіліся чырвоныя, а на руках панапіналіся сінія жылы. — Што вы хочаце ад людзей з гэтымі школамі і з гэтымі мовамі? Якая ў вас мэта? Чаго б вы навыраблялі, дай вам волю? Кідай курыць! — ён адкінуўся спінаю да падаконніка, зачыніў фортку і закашляўся. — Дык вось: я ўжо чуў пра такіх, як ты, — адкашляўся ён і строга паглядзеў на Міцуру. — Вы ходзіце па кватэрах і збіраеце заявы на беларускія класы, гаворыце заўсёды пасвойму. Ці не так?

— Ну, так.

— Што вы хочаце? Калі нават вярнуць гэтыя школы і гэтую мову — вам жа захочацца большага! Якога чорта вы марочыце галовы сабе і людзям? Вы што, сляпыя? Ці не ведаеце, чым такое канчаецца? Кажу, як старэйшы за цябе ў тры разы, — кідай!

Міцура крыху разгубіўся. Магчыма, іншым часам, калі б ён не быў такі стомлены, калі б мужчына гаварыў трохі спакайней, ён і знайшоў бы нейкія аргументы: цяпер жа толькі ціха, быццам просячы мужчыну не сердаваць, выціснуў:

— Але што каму з таго, што я люблю мову? Я ж размаўляю ёй, я проста адчуваю... што... што нашая мова — цудоўная... Дык хай бы і другія адчулі гэтае! Што ў тым благога?

— Вось! — мужчына аж пляснуў у ладкі, быццам злавіў Міцуру на нечым недазволеным, быццам толькі і чакаў моманту, калі Міцура скажа гэтыя словы. — Любіш — любі, гаворыш — гавары, а іншых прымушаць — не смейце! Бо так прымусяць, што дзясятаму закажаш...

Мужчына выдаваў зусім ужо п'яным.

— Хто вас прымушае? — падымаючыся, сказаў Міцура. Столькі часу было загублена, а ўсё гэта можна было прадбачыць з самага пачатку.

— Вы!.. Такія, як ты!..

Мужчына прыслухаўся.

З вітальні пачуўся звонкі дзіцячы голас. Мужчына натапырыўся, сплюнуў і скоса паглядзеў на парожнія пляшкі.

На кухню забегла спрытнае чарнавокае дзяўчо з вялікімі белымі каснічкамі на русай галаве.

— Мама! — ускрыкнула яна і паказала пальцам на стол. — Дед опять натрескался!

— Хадзі, мая ластачка малая, — працягнуў да яе дзед свае голыя рукі з жыламі, — хадзі, мая ластачка залатая...

Ён нахіліўся наперад, стульчык пад ім упаў, унучка адскочыла, але дзеду ўдалося злавіць яе за руку.

Адбіваючыся, унучка плюнула дзеду на грудзі.

Прыбегла высокая жанчына ў расшпіленай кофце і стукнула дзеда па руцэ, вырвала малую. Дзед, насмех хукаючы на пабітую руку, быццам яму балела, падняў стульчык і падсунуў жанчыне.

— Вось, Марыя, — вінавата пасміхваючыся, сказаў ён, — не было цябе тут, а то б паслухала... Не хочаш сядаць? Дык я сяду.

— Ах, божа мой мілы, нашто вы тут накурылі! — прастагнала Марыя і ўзялася за галаву. — Нашто вы тут напілі, накурылі...

— Агітавалі нашую ўнучку! — абвясціў урачыста мужчына, быццам гэтая абвестка павінна была зняць з яго віну за парожнія пляшкі і за цыгарэтны дым. — Скажы, Ірачка, сама — хочаш вучыцца па-беларуску?

— А вы мо настаўнік? — жанчына паглядзела на Міцуру.

— Я... ведаеце... Не, не настаўнік. Можа, вы напішаце такую заяву, каб Ірына вучылася на роднай мове, у беларускім класе? — сказаўшы ўжо, Міцура зразумеў, што зрабіў памылку. Трэба было ісці не адразу ў лоб, а зноў растлумачыць хоць збольшага. — Падумайце, прашу вас...

— Не, вось пісаць я нічога не буду, — пакруціла галавой Марыя, — як усе — так і я.

Дзяўчынка тым часам спадылба агледзела Міцуру і падышла да дзеда. Здаволены, ён схапіў яе, пасадзіў на калена і пачаў прытупваць нагою.

— Мая-лас-тач-ка-малая, — нараспеў у такт казаў ён.

Міцура зразумеў, што яму трэба ісці.

На пыльнай вечаровай вуліцы ён, лена перастаўляючы ногі, пайшоў у канец двара, да месца збору. Каля аднаго з пад'ездаў, на лаўцы, ён убачыў Вяргейчыка, свайго сябра з педагагічнага інстытута. Паўгода назад Вяргейчык пачаў вучыць Міцуру мове, а сёння ўпершыню прывёў на збор заяваў.

— Што, як улоў? — падымаючыся, спытаў Вяргейчык. — Нашыя ўсе паразыходзіліся. Напісаў хоць хто?

— У мяне — ніхто.

Яны пайшлі ў бок прыпынку.

— Чуе мая душа, што заявы гэтыя няшчасныя мала што дадуць. Звычайна яны ці «губляюцца», ці «назад забіраюцца»... Крыўдна, Міцура, вось што — мы б'ёмся-б'ёмся, а толку мала, — Вяргейчык засмяяўся, зірнуў на Міцуру і змоўк. — Прыйдзеш заўтра?

— Прыйду, — адказаў Міцура рашуча. — Дзе і калі збіраемся?

## 22. Буклет і рэкорд

«Маладыя галасы», 1990 г.

САЧЫНЕННЕ. Аповесць, апавяданні. 6 арк. Цана 40 кап.

*Зборнік уключае аповесць **«Мяжа»** і апавяданні. Яны аб'яднаны агульнай тэматычнай накіраванасцю. Героі твораў — прадстаўнікі сучаснай моладзі з іх няспынным пошукам ісціны, праўды, справядлівасці, свайго месца ў жыцці... Без перабольшання можна сказаць, што героі кнігі — людзі актыўныя, поўныя высокай духоўнасці і веры ў светлую будучыню».*

З аднаго боку яно добра, што мне ў чарговы раз пашэнціла і гэтая «вера ў светлую будучыню» так і не пабачыла свет — застаўся адзін анонс.

А з іншага — што за сумны рэкорд, каму ён трэба: 15 гадоў не выходзілі «дарослыя» кнігі! І якіх гадоў для пісьменніка: ад 30 да 45!

## 23. «Гарадскі сшытак»[5]
## (Урыўкі з аповесці «Мяжа», 1986 г.)

ДВОР

Восень. «...Па асфальце вецер гоне ліст чырвоны, ліст зялёны...», — думаў Міцура. (Ну што, ёсць у спалучэнні гэтых колераў нешта?)

Міцура ішоў на кватэру да Аленкі ў другі раз.

Ён не любіў двор, дзе жыла цяпер Аленка, як не любіў усе новыя мікраараёны. Палескага мястэчковага жыхара, яго проста палохалі чатырохкутныя даўжэзныя гмахі, страшэнная неўладкаванасць, ён рабіўся неспакойны і то задзіраў галаву, баючыся, каб што не ўпала зверху, то апускаў вочы, каб не ўваліцца ў яму ці ў траншэю, якімі быў перакапаны ўвесь двор...

Двор, дзе жыла цяпер Алена, размяшчаўся ў новым мікраараёне. Міцура ішоў сюды ўжо ў другі раз. Палескі мястэчковы жыхар, ён не любіў, цярпець не мог новых сталічных мікраараёнаў...

Мікраараён здаваўся Міцуру страшэнна неўладкаваным і не падабаўся яму. Ад вуліцы наўскасяк двара вяла доўгая, шырокая і глыбокая траншэя, праз якую былі перакінуты шчыты; сярод двара ляжалі ў беспарадку, прысыпаныя снегам... з зямлі тырчала палавіна

---

[5] Захавана стылістыка арыгіналу. — **А. Ф.**

абабітай да арматуры пліты — нічога не змянілася, усё засталося, як і месяц назад, калі ён прыходзіў... Хіба што пасярод двара чарнелі... накапалі новых вялікіх і малых ямак... дабавілася новых ямак і траншэй.

Як і ў першы раз, так і цяпер, пераходзячы па хісткім шчыце траншэю, Міцура перш за ўсё падумаў аб сваёй прафесіі — інжынер-будаўнік.

Даўжэзныя шэрыя шматпавярховікі, што з чатырох бакоў глядзелі вокнамі на гэтую траншэю, на ямы і пліты, — на ўвесь гэты бруд-бардак, які Аленка важна называла «наш двор», у другі раз выклікалі ў Міцуры адны і тыя ж пачуцці. Па-першае, усё ў ім бунтавала супраць слова «двор» у гарадскім разуменні. Палескі местачковы жыхар, ён уяўляў сабе двор як нешта зялёнае, з мурагом, плотам, на калках якога гладышы, па якім ходзяць куры і клююць мурог, з хатаю і хлявамі.

Па-другое, ён успомніў, пачынаў думаць, што вучыцца на інжынера-будаўніка, і ўсё будучае жыццё ўяўлялася яму тады звязаным з такімі вось недабудовамі, плітамі, будаўнічымі каскамі накшталт той, што валялася на дне траншэі, калі ён пераходзіў па шчытах...

І па-трэцяе, у галаве сама сабой аднекуль узнікала хуткая адэская мелодыя: «Небоскрёб, небоскрёб, а я маленький такой: то мне страшно, то мне грустно, то теряю свой покой».

«Але ці будзе ЯНА дома?» — сам у сябе спытаў Міцура, каб перабіць дакучны матыў, і, спыніўшыся, задраў галаву. Цямнела, і некаторыя вокны ўжо свяціліся. Ён нічога не ўбачыў, таму што не ведаў нават Аленінай кватэры, дзе яе акно. Але на міг яму зрабілася і радасна, і сумна адначасова.

«Любая, хутка мы расстанемся», — падумаў ён (пра Алену); так як на словах стараўся пазбягаць сентыментальнасці, так у думках не баяўся яе. — Я цябе пакіну, і што са мной станецца! Сап'юся, а ты жыві, выходзь замуж, нарадзі дзяцей... Можа, калі і ўспомніш, гартаючы альбом і спатыкнуўшыся вачыма на фота...»

ЛЕНА

Адносіны да Алены, дзяўчыны са сваёй групы, з якой адвучыўся тры гады, Міцура лічыў асаблівымі, не такімі, як у іншых.

На першым курсе ён не заўважаў яе таму, што навокал шмат было дзяўчат лепшых, на другім — пабачыўшы, наслухаўшыся выдумак і праўды аб любоўных гісторыях, ён зрабіўся ледзь не першым цынікам (АНЕКДОТ: першы курс — «нікому», другі — «яму

аднаму», трэці — «каму хачу», чацвёрты — «каму?! каму?!») — і яго проста баяліся, і толькі на палове трэцяга ён адкрыў: дзяліць трэба не на хлопцаў і не на дзяўчат, а на добрых і кепскіх людзей. (**Вось, толькі гэты сказ і гучыць.)**

...Пачаў прыглядацца да Алены. Яны ні аб чым не гаварылі. Мала-памалу ён звыкся глядзець на яе чысты, свежы, прыемны твар, успамінаў пасля самыя простыя яе словы, і яму здавалася, што сказаны яны былі якраз... толькі для яго.

Кахання не было. Ён баяўся гэтага слова, бо каханне асацыіравалася з нейкім рашучым учынкам і подзвігам, і гэты подзвіг уяўляўся Міцуру чамусьці — скочыць з шостага паверха ў агонь. Ён бы не змог гэтага зрабіць, таму не лічыў сябе закаханым. Ён глядзеў на яе на лекцыях, калі быў дома на канікулах, то думаў аб ёй...

Пасля канікулаў ён пачаў горш вучыцца, а больш чытаць мастацкіх твораў, хочучы там адшукаць нешта падобнае, і чытаў без ладу, прапускаючы старонкі...

Пад уплывам таго ці іншага сюжэта ён уяўляў сябе і сваю будучыню. І яшчэ дзіўна, што чытаючы рэалістаў (...). Чытаючы аб'ектыўных, «халодных» рэалістаў, ён сам загараўся, усё ў ім пачынала бунтаваць, некуды клікаць, з'яўлялася прага дзейнасці, і часта, адклаўшы кнігу, ён пачынаў хадзіць па пакоі, збіраючыся з думкамі, настолькі правільна, яму здавалася, адгадалі пісьменнікі, супадала (...). Калі ён чытаў, што ў закаханых усё добра, тады спакайнеў. Калі герой ехаў да гераіні, тады і ён пачынаў хвалявацца і думаў, а ці не схадзіць і яму ў госці? Калі гераіня здраджвала альбо нешта ў герояў разладжвалася — пачыналіся ягоныя пакуты. СУПЕРАЖЫВАННЕ. Уяўленне, узбуджанае да хваравітасці (...).

## 24. «Трыолет»

Складальнік буклета меў рацыю «з высокай духоўнасцю і няспынным пошукам ісціны». Канечне, цяпер такія людзі — атавізмы, выкапні, і мне самому ўжо слаба верыцца, што яны некалі — не так даўно! — існавалі.

Фіналам да «Гарадскога сшытка».

Дзяўчына, якую ўсе звалі «пана», альбо «паненка» (можа, і прататып Лены), узяла ў мяне магнітафон і не аддае каторы дзень. І дзверы не адчыняе. Бяру блакноцік, аловак, каб пакінуць запіску, стукаю — звыклае маўчанне. І тады замест запіскі складваецца наступнае:

Вельмішаноўная паненка!
Як шкода, што няма Вас дома.
Да Вас заходзіў Федарэнка:
Як шкода, што няма Вас дома!
За трыолет прабачце дрэнны —
Мне кепска без магнітафона...
Вельмішаноўная паненка,
Як шкода, што няма Вас дома!

Алесь Бяляцкі доўга рагатаў: «Прыдумаць жа такое!» Асабліва яго смяшыла рыфма: паненка — Федарэнка.

## 25. Адступленне

У 1988 годзе нарэшце я напісаў першую сваю людскую рэч, аповесць «Гісторыя хваробы» (любімае слова ў дачыненні да мяне некаторых творчых братоў).

Але і яна, тая аповесць, як пачыналася! «Газеты пісалі пра... ялцінскіх прастытутак, што ў дваццаць гадоў маглі лёгка набыць машыну апошняй мадэлі, нідзе не працуючы»...

Нічога сабе «нідзе не працуючы»! — наадварот, яшчэ як працуючы. А па-другое, бедныя ялцінскія прастытуткі. Вось спісак самых багатых людзей свету. Многа такіх, каму ўсяго крыху за 40. Мільярдэры. Мультымільярдэры. Беразоўскі і Гусінскі («два вясёлых гуся»). Абрамовіч, Дзерыпаска — у апошнім ёсць штосьці ад «драць паскі» — лазу на лапці, і кароў «пасвіць»...

Грузінскі мільярдэр Бадры Патрыкацішвілі ўзяў ды і памёр у 53 гады ў Лондане. Ну што, сынку, пытаў у Андрэя Тарас Бульба, памаглі табе твае ляхі? Памаглі мільярды? Не злараднічаю — шкадую і спачуваю. Багатыя жывуць добра, але нядоўга? Справа не ў даўжыні жыцця. Парадокс, але жыццё іх прама прапарцыянальнае матэрыяльнаму накапленню: чым больш грошай, тым бядней, больш убогім яно робіцца незалежна ад іх. Нават у знешніх формах, калі глянуць збоку, нешта несур'ёзнае; ну што такое, на самой справе, што за палёт фантазіі: дзіця захацела цацку — яму купляюць які-небудзь цацачны караблік, багатыр-мільярдэр — набывае ўжо вялікую, «дарослую» яхту, дзіця гуляе «ў футбол» пластмасавымі ці алавянымі футбалісцікамі, алігарх — забаўляецца сапраўднымі жывымі дзецюкамі ў форме якога-небудзь «Арсенала»...

І шкода іх усіх, і смешна.

## 26. Эпілог другой часткі

Палкоўнікі, як правіла, лепшыя ваякі за генералаў, а генералы — за маршалаў.

«Адзін далёкі родзіч прыехаў на кватэру з бутэлькай і, як яна была выпіта, папрасіў пазычыць адзін мільён рублёў. Быў дужа здзіўлены, калі я сказаў, што такіх грошай у вочы не бачыў. «Які ж ты тады пісьменнік?» — папракнуў ён. «Сапраўды, жахлівая рэч — ***страта*** ***невядомасці***, як пісаў разумны амерыканец Джон Стэйнбек» (В. Быкаў).

У «сярэдняга» пісьменніка заўсёды ёсць фора перад «славутым». Многае яшчэ наперадзе — і сам не ведаеш, і іншыя не ведаюць, чаго ад цябе чакаць, — у адрозненне ад пісьменніка «славутага», які сваю вышыню ўзяў, у якога ўжо ўсё адбылося і застаецца толькі або спачываць на лаўрах, або спускацца ўніз: паўтарацца, выпісвацца, гнаць вал, без надзеі кагосьці чымсьці здзівіць...

# ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

## 1. Пашэнціла

2000 год. Францыя, Парыж. Гатэль «Алезі» (Манпарнас).

Ззаду — Партугалія, Іспанія, наперадзе — Бельгія, Германія, Польшча...

Я ў літаратурнай, азнаямляльнай вандроўцы. Ад мяне нічога не патрабуецца — глядзі на чужыя краіны, на іншае жыццё, еж, пі, адпачывай, гуляй, пашырай кругагляд, набірайся новых уражанняў.

Гэта вельмі здорава нехта прыдумаў (ды немцы і прыдумалі — вечныя немцы!) — даць шанс пісьменнікам паездзіць па ўсёй Еўропе. Бясплатна. Наадварот, яшчэ табе плацяць.

Пяці-, шасцізоркавыя гатэлі, розныя музеі, помнікі архітэктуры, банкеты, знаёмствы з мясцовымі літаратарамі, прыёмы ў мэрыях, у міністэрствах, у некаторых краінах — на ўзроўні прэзідэнтаў. Выступленні-прадстаўленні, на якіх чуецца і маё прозвішча, ды яшчэ ў якой інтэрпрэтацыі! — «белорашэ Мопассан энд Тшэхофф»...

У Парыжы мы тыдзень. Сёння развітальная п'янка ў нейкім кабарэ.

Але я зачыніўся ў сваім пакоі і нікуды не хачу. Мне стукаюць у дзверы — я не адгукаюся. Звоніць тэлефон — не бяру трубку. Нават піць не п'ю, хаця тут, у нумары, цэлы бар: віскі, ром, каньяк, чырвоныя і белыя віны, гарэлка... Не параўнаць з маім вясковым магАзінам. На століку тоўсты глянцавы каталог з фотаздымкамі голых парыжскіх баб і нумарамі тэлефонаў. Можна схадзіць у «Мулен-Руж» — блізка, і грошай хапае. Не хапае настрою. Ахвоты няма ні да чога. Я ўжо ўдосталь наглядзеўся на «ажурную вежу», два дні аддаў Луўру, пабадзяўся па Шан-Зэлізэ, падрапаў манетай тынк Трыумфальнай аркі, злазіў на аглядальную пляцоўку Нотр-Дама, знайшоў у недалёкім ад гатэля скверыку бюст паэту-земляку Апалінэру, у Булонскім лесе ўспомніў Якуба Коласа, з'ездзіў — два прыпынкі метро — на Манпарнаскія могілкі і пастаяў каля магілы Мапасана...

Лепш бы я гэтага не рабіў. Якое гнятлівае ўражанне! Якая маленькая, нібы дзіцячая магілка, дзірваном парослая, запушчаная, недагледжаная, з кусцікам чэзлых ружаў... Які ўбоганькі помнічак, як ён губляецца сярод розных радавых склепаў і шыкоўных магіл больш знатных парыжан! Вось ён, твой кумір. Што толку, што ён валодаў сотнямі жанчын, мільённымі багаццямі, меў непаўторны талент і вычварных памераў славу?.. І якое кашчунства, нібы нейкая зларадная пасмяротная помста яму — сотні яго кніг па-ранейшаму актыўна прадаюцца ў шапіках уздоўж набярэжнай Сены, — ды яму ўжо што да гэтага?

...Выходжу з цыгарэткаю на балкон. Вечар. У галаве круціцца то «летний воздух неподвижен, ходим, ходим, по Парижу, по Парижу», то вадзім-спрынчанаўскае:

Любіш ямб, паважаеш харэй
І кахаеш Аліну,
Дык чаго ж ты сумуеш, Андрэй,
Шчэ жыцця не пражыў й палавіну?

Я не проста сумую, я адчуваю, што гэта — мяжа.

Узята ўсё, што можна. Вось ён, ганарар і аванс адначасова. Будзе што лепшае, большае? А трэба ўжо яно? Вось дай мне дзве з паловай Нобелеўскія прэміі, прызнач самым галоўным літаратурным камандзірам усяе планеты Зямля — я буду такім самым, як і цяпер, на парыжскім балконе.

Дык што, сапраўды, справа ў тым, каб дагрэбціся да ўсяго гэтага фізічна? Той няхітры закон, адкрыты мною ў раёне 23–25 гадоў, пакуль спрацоўваў адносна мяне. Проста пражыві — і ўсё будзе. Цярпенне і час.

Але якраз-такі дзейнасць гэтага закона не надта радуе. Дужа вялікае месца адводзіцца выпадковасці, ды гэта і не закон нават, а так, штосьці аморфна-пасіўнае: жыві, як жывецца, а там як Бог дасць.

Ну і хай! Чаму мяне гэта павінна бянтэжыць? Пераможцаў не судзяць. Пашэнціла — скарыстайся. Вунь шведка настойліва раіць перабірацца на Захад — «у нас пісьменнік такога ўзроўню ў грашах купаўся б. Вучы мову!» (Усё жыццё толькі і чуем: вучы мову ды вучы мову.)

Гэта для цябе, Інга-Ліна, я пісьменнік нейкага «такога ўзроўню». На маёй Айчыне лічаць інакш. «Ніхто з тых, — пісала беларуская газета, — хто вызначае аблічча цяперашняй беларускай літаратуры ў яе разнастайнасці (ідзе пералік імён, падобны на пісталетную абойму, — мяне няма ў гэтай абойме), у склад беларускай дэлегацыі з нейкіх прычын не патрапіў».

Я і сам гэта ведаю. Любы мог апынуцца на маім месцы. Наўрад ці я вызначаю аблічча цяперашняй беларускай літаратуры — я нават не ведаю, як гэта і што гэта такое — «вызначаць аблічча».

Ведаю толькі, што мне проста пашэнціла.

## 2. Не пашэнціла

Праз два гады. Мінская бальніца. Разарваная напалам пячонка, тры літры крыві ў брушной поласці. Перад аперацыяй знялі і аддалі жонцы нацельны крыжык. 4 гадзіны аперацыі і 2 — вываду з наркозу.

Рэанімацыя. Стан «стабільна цяжкі». Кожны дзень прасветка рэнтгенам, доза апраменьвання ад 50 да 100 флюараграфій за раз. Дактары пацiскаюць плячыма і тлумачаць, што, у прынцыпе, пасля такіх аперацый не жывуць: абавязкова пачынаюцца абвастрэнні, запаленні, «адтаржэнні»...

У жонкі ад гора пачалі адстрэльвацца валасы. Правядзе па галаве — у руцэ пасма. «Адзінае, што можаце вы, — кажуць ёй дактары, — гэта ставіць у царкве свечкі, а адзінае, што можам мы — падтрымаць яго (змякчыць пераход у іншы свет) наркотыкамі. Але ж яны дарагія, усё кусаецца цяпер...»

За хабар пачынаюць усё ж мне іх выпісваць і калоць. У плячо, адзін раз у суткі, увечары пасля адбою, чамусьці ў цемры. Маладыя медсёстры. Калі добрая — уколе наркотык, калі злая — замяніць вітамінамі, а наркотык прыберажэ для сваіх хахаляў. І тады «белорашэ Мопассан энд Тшэхофф», падыхаючы ад болю і жаху, ледзь не выючы, не разумеў аднаго: чаму Бог адшкадаваў такога маленькага шчасця, як памерці на аперацыйным стале? У каго, у якога бухгалтара вымаліць сабе апошні ганарар — НЕ «дажыць да світання»?..

Каля двух месяцаў такіх дзён і такіх начэй. Людзі ў палаце мяняюцца. Я не магу слухаць, як яны з несур'ёзнымі драпінамі маладушнічаюць, ныюць, плачуць, звоняць жонкам, чапляюцца да дактароў: «Ах, мілы доктар, ратуйце!»

Лаюся на іх, крычу бруднымі мацюкамі на ўсю палату. Да мяне падыходзяць:

— Андрэй, ну хто вінаваты, што яны лёгкія, а ты цяжкі? Не ўсе ж такія цярплівыя. Проста табе не пашэнціла!

## 3. ?

Значыць, выпадак? Усё залежыць ад выпадку?

Добра. Але ж нават у межах амплітуды гайдання гэтага маятніка: пашэнціла — не пашэнціла, варта і трэба жыць. А як на войнах, а колькі людзей пераносяць яшчэ не такое гора — і жывуць!

Не важна, колькі разоў ты ўпаў, важна, колькі падняўся.

Парадуйся Парыжу, перацярпі бальніцу і займайся тым, чым і да гэтага займаўся: пішы. Рабі тое, да чаго ляжыць душа, што ў цябе, як ты лічыш, лепш за іншае атрымліваецца, у чым ты бачыш сваё прызванне — а там як карта ляжа, там аддацца на волю закону: пашэнціла — не пашэнціла.

Тым больш мне тады было пад сорак, некаторыя празаікі толькі пачынаюць у такім узросце. У мяне ўсё ж быў вопыт, вера ў літаратуру як у доктара, веданне, як яна можа лячыць, даючы гэтае чароўнае забыццё — любы выпадак, любую падзею: смерць, нараджэнне, жаніцьбу, развод, радасць, гора, хваробу, старасць, беднасць і занядбанасць, славу і багацце — усё можна раскласці па палічках, растлумачыць, пераплавіць у мастацкія вобразы і супакоіцца.

Аднак нешта зламалася ва мне. Па інерцыі я яшчэ дацягваў пачатае старое, але ўжо неахвотна, без энтузіязму. Літаратура раптам згубіла ранейшыя фарбы і гукі. Я не бачыў стымулу пісаць далей. Не ведаў, пра што, для каго і навошта?

Але як жа так?

На літаратуру было пастаўлена ўсё. Яна была чымсьці вечным, непарушным, адзіным, што мела сэнс у жыцці, больш таго — яна была вышэй за жыццё, бо была самадастатковай, значыць, не магла быць пераможана нічым, і ў сваю чаргу, з'яўляючыся своеасаблівым «страхавым полісам», павінна была аберагаць ад любога выпадку, любой нечаканасці.

І вось гэтая страхоўшчыца, ратавальшчыца, самадастаткоўшчыца адыходзіць з першага плану на невядома які. Перастае памагаць. І да яе з'яўляюцца апатыя і агіда.

Трэба было тэрмінова разабрацца з гэтым. Інакш усё губляла сэнс. Інакш я проста не змагу пісаць далей, адпаведна, і жыць.

Пра тое, каб знайсці літаратуры замену, я не дапускаў і думкі. Я адчуваў, што нічога ў свеце больш не паможа — толькі магчымасць выбіцца зноў на знаёмыя каляіны.

І я ліхаманкава пачаў ўспамінаць, дзеля чаго я рабіў гэта раней. Чаму мне так падабалася выдумляць мастацкія творы? Што вадзіла рукою столькі гадоў? Пісаў ад няма чаго рабіць? Для стварэння

«галерэі нацыянальных тыпаў»? Шукаў «становчага героя»? Ці хацеў стаць «прарокам», якімсьці «народным», ці нейкім лаўрэатам?

А можа, гэта быў звычайны пісьменніцкі стандартны набор? Чытачы? Слава? Грошы?

## 4. Грошы

Я не ханжа. І часам вельмі шкадую, што Бог не даў мне такога «нумізматычнага» таленту, і зайздрошчу беражлівым людзям.

Мэта капіць грошы — далёка не самая горшая ў жыцці. Капіць не ў алігархавым значэнні (тым усё само плыве ў рукі, сыплецца зверху), а ў мяшчанскім, у сялянскім — капіць і не траціць, піхаць у панчоху, класці ў банк, ператварыць гэта ў рэфлекс, у самамэту: кожны вечар паперка да паперкі, вось і дзень прайшоў, і заўтрашні бачыцца не пустым...

Канечне, у адносінах да беларускага пісьменніка гэта гучыць смешна і не рэальна. Ды і для любога пісьменніка. Бяру смеласць сцвярджаць, што ніводзін, ні адзін чалавек не ўступае ў літаратуру з мэтай разбагацець. Калі ж такія ілюзіі па слабасці розуму ці па наіўнасці прысутнічаюць, дык вельмі хутка яны развейваюцца. І чалавек настаўляе нос па ветры, арыентуецца і для абагачэння выбірае іншую прафесію, магчыма, і звязаную з літаратурай, толькі не маючую з ёю нічога агульнага.

Праўда, я яшчэ застаў пакаленне пісьменнікаў, якім адносна няблага аплачвалася іх праца. Яны шчыра верылі, што гэтае выпадковае супадзенне — творчасць і нармальныя грошы за яе — вечнае, справядлівае і ў матэматычным плане бяспройгрышнае: чым больш я буду друкавацца, тым больш будзе расці мой дабрабыт. Час жорстка пасмяяўся з іх. Старасць іх была змрочная. Цяжка чытаць іхнія дзённікі і мемуары, напоўненыя стогнамі і енкамі: «Усё, усё, што нажыў непасільнай працай!.. пальцы ад машынкі пухлі, так пісаў!.. усё на зберкніжках згарэла, прапала!..» — не разумеючы, што гэта не адны грошы — гэта творчасць прапала, абясцэнілася, з’елася інфляцыяй.

У нашых цяперашніх варунках, зрэшты, ёсць яшчэ варыянт: зрабіцца пісьменнікам рускамоўным, які пад сваім ці пад чужым імем гоніць вал; ён не піша — яго ванітуе штодзень словамі, сказамі, абзацамі. Маю на ўвазе гаротнікаў, якія пастаўляюць бульваршчыну і «мыла» для расійскіх або галівудскіх серыялаў («нашыя» ўжо і там). Маю права казаць так, бо нейкі час сам быў у іх скуры. Калі перасталі плаціць зарплату і трэба было выжываць, я штампаваў кож-

ную раніцу па 8–10 старонак («Токарев резко обернулся и, вздрогнув, сжал в кармане рукоятку пистолета»), мне плацілі па 5–6 даляраў за старонку; за паўдня атрымоўвалася ў сярэднім 50 даляраў. Але як толькі на працы пачалі плаціць 50 даляраў у месяц, я ўмомант гэтую сарамоту скончыў і забыўся на яе — як і не было яе ў жыцці.

Самае ж галоўнае, што нават калі ператварыць сябе ў пісьмовы аўтамат, у машыну, якая «адрыгвае» тэкст, адшукаць і гарантаваць сабе месца ў гэтым вар'яцкім канвееры — ўсё роўна і тады грошай будзе пастаянна мала, іх ледзь хопіць, каб акупаць расходы, а ў пісьменніцкім выпадку ўсё гэта будзе элементарна і, у прынцыпе, бесталкова з'ядаць, адбіраць такі каштоўны, хуткаплынны час. Бо ніколі ж не ўгадаеш мяжы, калі трэба спыніцца і сказаць сабе: усё, сёння з дванаццаці трыццаці кідаю глупства і пачынаю тварыць для душы.

Літаратурная дзейнасць таму і лічылася (можа, і цяпер кімсьці лічыцца) самай лепшай у свеце, што для яе функцыянавання дастатковы мінімум: стол, папера, камп'ютар, кава, цыгарэты... Дык усё гэта магчыма і без асаблівых выдаткаў-накапленняў.

## 5. Чытачы

Я не ведаю свайго чытача, не надта веру, што ён — сапраўдны — існуе, а калі існуе, дык прызнаюся, што пазбягаю і пабойваюся яго. Найперш за непастаянства і ўсяеднасць. Як пісаў мне некалі сябар у час свайго мядовага месяца: «Бачу, адчуваю, што рана ці позна яна мне абавязкова здрадзіць...» Так і мой чытач — абавязкова ж на якім-небудзь 58-м апавяданні адвернецца і плюне: «18-е было лепшае! Выпісаўся!»

І таму, калі ідуць у тэксце, асабліва ў першай частцы, патэтычныя заклікі-звароты «да чытача», вядзецца нейкі «даверлівы ўяўны дыялог з ім», дык гэта хутчэй даніна архаічнаму стылю, для звязкі слоў, інакш — для адчэпу; прымітыўная, няўмелая спроба пусціць пыл у вочы і тым нямногім добрым людзям, хто па службовым абавязку гэта яшчэ вымушаны чытаць, — каб пад шумок, пакуль вочы праціраюцца, кантрабандаю правезці свой, аднаму мне вядомы груз. Тое самае, дарэчы, і з дыдактычнымі разборкамі: «адкуль што бярэцца», ды «чым канчаецца», «ды што ёсць мастацтва»... Я не настолькі наіўны, каб прымяняць законы логікі да законаў творчасці, разумеючы, што апошняя хутчэй прывілея медыцыны. І не так важна, канечне, дасталося гэта табе ў спадчыну, ці было «падчэплена» на якім-небудзь зігзагу біяграфіі.

Яшчэ ў дэбюце я прайшоў такую загартоўку чытацкай увагай, якая надоўга, калі не назаўсёды, адвучыла мяне ўспрымаць гэтую катэгорыю — «чытач» — усур'ёз, адбіла ахвоту аперыраваць ёю, як нечым вартым увагі.

Аднойчы я быў у вёсцы на летніх канікулах. І не ведаў, пра што пісаць. І, успомніўшы Дастаеўскага, звярнуўся да газетнай крымінальнай хронікі. А так як газета была адна, раённая брахалаўка, адтуль я і выўудзіў сваё «злачынства і пакаранне».

Нататка, падпісаная інспектарам камісіі па справах непаўналетніх, называлася «Забавы падлеткаў». Гарадскія хлопцы ўкралі (цяпер пішуць — скралі, «во ўжо дзе ненавіджу!» — Сыс бы сказаў) са стайні калгаснага каня, каталіся, мучылі яго ўсю ноч, а раніцай адпусцілі. «Бацькі павінны больш пільна сачыць за тым, чым забаўляюцца ў вольны час іх дзеці», — мякка заключае ў канцы інспектар. Я ж так жыва ўявіў таго каня, як ён цэлы дзень працаваў, уночы марыў паесці, адпачыць...

І напісалася апавяданне. Такое прыкранька-сентыментальнае. Як і ўсе яны, калі нароўні з людзьмі дзейнічаюць жывёлы.

Адзінокая, ды яшчэ і кульгавая жанчына Алена, малаказборшчыца (ездзілі калісь такія па хатах з раніцы, з бідонамі ў возе, збіралі малако — як казалі, «для арміі»), мела старога каня Трутня. Ён жыў у яе дома. Але моцна цяглавую сілу тады забаранялася. Час ад часу, калі наязджалі з горада правяральшчыкі, старшыня загадваў ёй адводзіць Трутня на стайню.

Ад конюха яна даведваецца, што з блізкага горада амаль кожную ноч сюды прыходзяць падлеткі. Забіраюць коней, а пад раніцу адпускаюць. Ніякай рады ім даць не можна: конюх стары, мясцовыя мужчыны з гарадской шпаною звязвацца баяцца, міліцыя адмахваецца, бо, у прынцыпе, крымінальнага парушэння тут няма — фармальна падлеткі коней не крадуць, а толькі «бяруць у карыстанне», як бы цяпер, напрыклад, чужую машыну — узяў, пакатаўся, паставіў назад, і калі нічога з машыны не прапала, крымінальнай адказнасці за гэта не прадугледжана — хіба што калі зловіць гаспадар, дык начысціць морду.

Алена слухае конюха, прыгадвае, што сапраўды чула начамі на вуліцы гіканнне і конскі тупат. Яна баіцца, каб і яе каня не забралі. Конюх суцяшае яе, што такі заморашы шкілет нікому не трэба.

Аднак начныя гулякі выбіраюць менавіта гэтага Трутня (інакш не было б апавядання).

## 6. «Труцень»

...Алег прыслухаўся, азірнуўся і ўбачыў у тумане пляміну святла, якая досыць хутка набліжалася і большала.

— Матрос! — пазваў ён ціха.

— Чую.

Матрос з'ехаў з асфальту на край насыпнога вала, прытрымаў каня, Алег — таксама.

— Што за чорт! — углядаючыся, устрывожыўся раптам Матрос. І калі машына, асляпіўшы іх фарамі, параўнялася, ускрыкнуў: — А-а!

Машына затармазіла так рэзка, што кінуліся ўбок коні, і ў Алегаў твар паляцелі дробныя каменьчыкі.

— Мянты! — звонка крыкнуў Матрос.— У лес!

Ён мог бы і не крычаць. Напужаны святлом, віскам тармазоў конь пад Алегам ляцеў, не выбіраючы дарогі. Пад капытамі нешта трашчала, чаўкала і гэтаксама трашчала і чаўкала ззаду. Матрос? Ці гоняцца? Алег ляжаў грудзямі на мокрай кастлявай шыі, якая хадзіла пад ім і муляла, і з жахам чакаў, што вось-вось зляціць у гэтую цемру, у гразь, пад ногі свайму ці Матросаваму каню. Адной далонню ён закрываў вочы, а ў другой намёртва заціснуў пук грывы. Пра аброць ён даўно забыўся, і павады целяпаліся недзе каля конскіх каленяў.

— ...Аве-ей! — данеслася да яго, але ён нават не паварушыўся. «Зараз, я, заб'юся... Зараз, я, заб'юся...» — скакала ў ягонай галаве, акрэслівалася нават у нейкую мелодыю, як у чалавека, што едзе цягніком.

Матрос скакаў увесь час ззаду за Алегам і ў думках хваліў яго за кемлівасць. Алег быццам чытаў ягоныя думкі: нацянькі, праз лес, выскачыць на паплоўчык, там перачакаць і, можа, нават лесам ужо і дабірацца да горада. Але нечакана Алег рэзка ўзяў управа, а Матрос ведаў: там балота, і вельмі проста можа здарыцца, што конь, даўшы паўз балота круг, вынесе зноў праменька да міліцэйскай машыны. «Правей!» — крыкнуў ён, і ў той жа момант пачуў, як нешта цяжка бухнула на зямлю, і прыглушаны Алегаў ускрык.

Алег стаяў, прываліўшыся бокам да алешыны і заціскаў рукою плячо. З-пад парванае кашулі свяцілася голае цела.

— Во, чорт! — выдыхнуў узрадаваны Матрос. — Я думаў, ты ўжо халодны.

— Ай-яй, плячо!..— прастагнаў Алег, падымаючы і апускаючы руку.

— Стукнуўся моцна? — Матрос саскочыў на мяккую балотную зямлю. — А дзе конь?

— Я яго, мабыць, загнаў... Вунь! — паказаў рукою Алег.

Матрос глянуў туды і ўбачыў, што тое маўклівае і чорнае, што ён спачатку палічыў за тоўстае бервяно, і было канём.

— Загнаў... Каня не загоніш праз кіламетр. — Ён падышоў да маўклівага і чорнага і, намацаўшы аброць, ірвануў на сябе: — Но!

Конь тузануўся наперад, але не зрабіў нават намагання падняцца. Матрос шморгнуў яшчэ і здагадаўся, што тут нешта не тое. Чыркнуў запалкаю, закрываючы яе далонню, схіліўся бліжэй, сунуў другую руку каню пад жывот і ўсё зразумеў: пярэдняя нага ў каня моцна сядзела паміж тоўстымі каранямі магутнай балотнай вольхі. Карані адыходзілі ад ствала ва ўсе бакі і, як адросткі спрута, здавалася, прыпадымалі алешыну над зямлёю. Падышоў Алег і таксама нагнуўся, каб глянуць, але запалка патухла. Матрос падзьмухаў на пальцы.

— Што? — прашаптаў Алег.

— Нагу ў карані ўпёр... Сам не вылезе. А пакінем — здохне на... Тады ўжо іменна — чысты крадзеж! Я ж табе крычаў «управа».

— Здохне? І... што? — Алег нават забыўся на боль у плячы. «Турма? Ці калонія?» —халадзеючы, падумаў ён.

— Штраф! — Матрос плюнуў.— Упякуць рублёў па дзвесце. Ён жывы рубля не варты, а здохлага ацэняць як залатога. Выламай галузіну і аперажы добра! — распарадзіўся ён. — Ці бізун там недзе пад лазою...

Алег вобмацкам, хапаючыся, выламаў маладую алешыну і, пакуль церабіў, ліхаманкава перабіраў у думках: «Штаны — сто дваццаць рублёў, куртка — сто, красоўкі, туфлі, магнітафон чатырыста рублёў...» За тыя рэчы, якія ён насіў на сабе і якімі была завалена кватэра, яго пакой, бацькі, калі верыць Матросу, што за каня запатрабуюць чатырыста рублёў, заплацілі як за табун коней. Алегу стала лягчэй — ён не сумняваўся, што, як прыпячэ, яны заплоцяць не толькі чатырыста, але й яшчэ шмат-шмат грошай... Толькі няўжо прыпячэ, няўжо такое будзе?

Алег нерашуча падступіўся да каня. Матрос узяў за аброць.

— Бі!

Алег заплюшчыў вочы і ўдарыў па чорнай спіне. Ён ледзь паспеў адскочыць, бо конь з нечаканаю прыткасцю падкінуў зад, адначасна брыкнуўшы паветра. Вызваліцца яму не ўдалося.

— Бі тоўстым канцом! — шморгаючы за аброць, закрычаў Матрос.

Але конь стаяў цяпер з паднятым задам, брыкаўся і пагрозліва пырхаў.

— Ідзі па бізун! Бегаеш з гэтай палкай, як...

— Віця, кідай яго! — узмаліўся раптам Алег. — Ну, заўтра скажам, дзе гэты конь, пісьмо напішам і прышлем!

Моўчкі Матрос выпусціў павады і пабег да лазіны, намацаў у мокрай траве бізун і, вярнуўшыся, схапіў Алега загрудкі.

— Пайшоў... адсюль, — прашыпеў ён, — пакуль я добры. Бягом! — ён адштурхнуў Алега, размахнуўся і са свістам секанyў каня па галаве.

Конь, як пасля ўспамінаў Алег, падскочыў на паўметра ўгору — Алегу здалося, што, перабіраючы ў паветры капытамі, конь ляціць проста на яго. Алег упаў на спіну ў твань, закрыўшы твар рукамі, але ўжо ў наступную хвіліну перакуліўся на карачкі і што было сілы кінуўся ў лес.

Напалоханы сам, Матрос стаяў у лазовым кусце і глядзеў, што робіцца з канём. Пасля ўдару той, мабыць, вырваў з пасткі нагу, але з зямлі не падымаўся. Матрос паслухаў трохі, як конь цяжка соп, ці то ён так стагнаў, паслухаў і ўжо смялей вылез з куста. Калі адвязваў свайго каня, той хрыпеў і не даваўся ў рукі.

А Алег тым часам, залезшы ў нейкі ажыннік, увесь абдзёрты, мокры, як мыш, выбраўся на шашу.

Ішоў не шашою, а паўз саменькі лес, спыняўся, прыслухоўваўся і быў гатовы кожную хвіліну кінуцца ў гэты мокры страшны лес. Было ціха. Калі з высокага месца замільгалі агні горада, ён аж трошкі ўсхліпнуў. «Я тут блукаю, мокры, галодны, а Алачка... Ты недзе спіш пад цёплай пушыстаю коўдраю — самая лепшая, самая прыгожая мая дзяўчынка! Спі сабе,— гаварыў ён, выціраючы слёзы замілавання,— спі, не чакай мяне, не думай пра мяне! Я чалавек канчаны!»

Ён шаптаў і добра ведаў, што ніякі ён не канчаны, і ніхто, акрамя бацькоў, яго не чакае. Але думаць так было прыемна — тым больш прыемна, што ўсё скончылася. «А магло ж і не скончыцца... Ой-ой! Маглі б забраць у міліцыю, мог бы скалечыць конь, я мог бы павыбіваць сабе вочы... Мяне маглі, урэшце, судзіць! Судзіць! У дзясятым класе, выдатніка!.. І нічога гэтага не здарылася, можна жыць як і жыў».

«Шчасце... я шчаслівы! — шаптаў ён, але думаў, што цяпер ён будзе ведаць тое, чаго не ведае Алачка, і калі ёй аб гэтым расказаць, дык ён у яе вачах... Алег палохаўся, быццам нехта мог пачытаць гэтыя думкі і зрабіць не так, і шаптаў: — Добра, што ўсё абышлося! Больш мне нічога не трэба — толькі быць другі раз разумнейшым...»

Рана, не было яшчэ і пяці, Алена прачнулася і ўспомніла, што па каня трэба ісці на стайню, што трэба ўжо ўставаць. Трэба было яшчэ выграбці з печы попел. Яна паднялася, накінула на плечы хустку

і пайшла на двор, па вядро з венікам. На вуліцы заіржаў конь. Алена адчыніла весніцы.

Труцень стаяў з паднятай пярэдняй нагой, якая ад капыта да самага калена была тоўстая, як калода. Дрыготкімі рукамі Алена стала здымаць аброць і раптам войкнула і адхіснулася. З чорнай дзіркі пад рассечаным брывом, адтуль, дзе раней было вока, звісала доўгая крывяністая плеўка.

Жанчына заплакала, абдымаючы каня за шыю. Яна не ведала, нашто такое зрабілі з канём. Ён быў для яе як родны чалавек.

## 7. «Хорошэ»

Гэта цяпер пісьменніку рай: пішы што хочаш, пра што хочаш. А тады яшчэ па інерцыі чыталі, даволі многа і адносна сістэмна, прычым менавіта беларускіх, беларускамоўных пісьменнікаў.

Прасачылася ў маю вёску і ў вакольныя апавяданне «Труцень».

— А, гэта той пісьменнік, што коні краў!

Маці пасля інсульту загаворвалася, фрагменты жыцця блыталіся ў яе няшчасным розуме (то ёй здавалася, што я малы, то што яна маладая).

— Усё ночанькі не спала, як тыя коні кралі...

Я нічога не разумеў, прымаючы гэта за звычайнае трызненне. Пра што яна, аб чым? У нас на 20 кіламетраў па акружнасці не было ніякіх стайняў-канюшняў. Да таго часу я забыў свае раннія апавяданні намёртва. Прапускалася міма вушэй, і толькі калі маці не стала, памяць пачала вяртаць сёе-тое, і да мяне дайшло, што яна так і памерла, упэўненая, што ўсё, што мной напісана — мною здзейснена.

Пра аповесць «Гісторыя хваробы» сябры — старэйшыя хлопцы — казалі:

— Ты вар'ят — пісаць пра сваю судзьбу?! Каму трэба твая судзьба?! З цябе ж смяюцца ўсе! І ў Мінску будуць смяяцца! А нам шкода цябе! Ты пра лес напішы, пра рэчку, пра перадавіка праізвоЙства, пра вайну...

Мая ўпартасць, што я не надта слухаю мудрых парад і раблю пасвойму — нешта не тое, як у іншых беларускіх пісьменнікаў, маіх аднавяскоўцаў-чытачоў проста заганяла ў тупік. Бянтэжыла.

— Колькі табе плОцяць? Дзе твая машына з шОферам? Дзе значок дэпутацкі? Дзе чэрава, як у Чыгрынава, на якое можна было б той значок пачапіць? Пісьменніка павінны вазіць па фермах, па палях. Потым банкет, дзе п'юць і адзін аднаго хваляць. Потым ён пра

ўсё гэта расказвае на тэлевізіі, па радыё. Але ж ты заікаешся! Што ж тады рабіць з табою?!

Ледзь не ўсёй вёскай ламалі галовы, каб знайсці майму занятку якое практычнае прымяненне, каб не лічыўся ён чымсьці не проста несур'ёзным, а хоць бы не саромным — як коней красці.

Ім хацелася, каб я пісаў зразумела, «проста» — як Мележ, Быкаў, асабліва як Шамякін, і адзінае тлумачэнне, чаму я так не раблю, знаходзілі ў тым, што я не ведаю жыцця, мала выкарыстоўваю розных «праўдзівых» гісторый.

— Мележ — вунь цераз Прыпяць жыў, хадзіў па хатах, распытваў і пісаў усё, як було! А ты «чарніла» глушыш з намі...

І, шчыра хочучы мне памагчы, сустрэўшы дзе, заўсёды лічылі сваім абавязкам падараваць чарговую «праўдзівую» гісторыю. Старэйшыя людзі прыносілі ў хату гатовыя ўспаміны, мемуары, жыццяпісы. У мяне і цяпер захоўваюцца гэтыя мілыя тоўста-агульныя і тонкія сшыткі з пажоўклай, выцвілай папераю, спісаныя фіялетавым атрамантам (асадка з пяром, якую трэба мачаць у чарнільніцу) або хімічным алоўкам.

— Калі не будзе грошай ці не будзе пра што пісаць — пускай пад сваёй фаміліяй, — проста раілі мне.

«На урэмья начала вайны з нем.-ф. захватчыками мне едва исполнилось... но я прымау самае дзейсцьвицельнае учасцие»...

«Я происходила из бедной многадзетнай хрысциянскай сямьи. Акрэснасци нашаго сяла весьма жываписны, рэчка петляет между вербами...»

На вокладцы аднаго з такіх сшыткаў рукой аўтаркі цвёрдая прыпіска-аўтаацэнка: «Хорошэ!»

## 8. Слава

Гляньце, як тэмы пераплятаюцца, адна на адну накладваюцца, нанізваюцца, як пацеркі на нітку...

Вось хоць бы і гэтая «конская» тэма. Быў у мяне блізкі сябар. Мы разам вучыліся, разам пачыналі пісаць, друкавацца. Ён загінуў ад дзікага, непраўдападобнага ў наш век выпадку: конь скочыў яму на грудзі, праламаў пярэднімі капытамі грудную клетку, змяў лёгкія, парвалася пячонка, кровазліццё ў брушную поласць... (Знаёмы дыягназ.) У Мінску ўратавалі б, ён быў дужы, трывушчы, але то было ў Дуброўне на Віцебшчыне... Застаўся пасля яго маленькі шасцімесячны сын, маладая жонка. Яна перадала мне папку яго чарнавых апавяданняў. Два былі надрукаваны ў «Першацвеце», з маёй прадмоўкаю.

«...Вядома, як пасля смерці блізкага чалавека адразу стараешся ўспомніць яго апошнія словы, адшукваеш зусім іншы сэнс, успрымаеш іх бы нейкі наказ, папярэджанне... Падчас апошняй нашай сустрэчы Алесь прыехаў да мяне ў рэдакцыю. Мы прайшліся да кінатэатра «Піянер». Мне трэба было сустрэцца з адным чалавекам. Стаяў халодны веснавы вечар. Я прысеў на лаўку. Алесь, развітаўшыся, пайшоў, раптам вярнуўся і папрасіў: «Не сядзі доўга, бо прастудзішся! Пачакай хвілін пяць і едзь дамоў!» Я засмяяўся, а ён быў сур'ёзны. Потым завярнуў за вугал Купалаўскага тэатра — і знік. Назаўсёды. Бывай, Алесь!»

Чалавек ідзе ў нікуды, на смерць, а клапоціцца, каб «цёпленькі» Андрэй, не дай Бог, не застудзіўся! Неверагодна.

Калі прачыталі ў вёсцы і гэта, да мяне прыйшла сапраўдная слава. І як раней спачувалі мне, так цяпер шчыра радаваліся майму поспеху. Нарэшце! Вось якое практычнае прымяненне можна даць яго занятку! Мой былы аднакласнік, які жыў у Кіеве, зваліўся па п'яні з 9-га паверха, паламаў рукі, ногі, хрыбетнік і цяпер поўным паралізаваным калекам ляжаў у матчынай хаце.

— Хай бы мо Андрэй прапісаў...

Да маткі пачалі прыходзіць. Хто з курачкаю пад пахаю, хто са слоікам малака, хто з пакункам свежыны. «Мо Андрэй, як памру, што напіша...»

— А божачкі, што пра цябе можна напісаць?!

— Ну, як яно пішацца... як у газетах... што вот буў такі й такі... мог бы жыць ды жыць...

Маці пахарашэла, памаладзела. Магла ўжо не апускаць вачэй пры сустрэчах, не чырванець пры пытаннях — кім твой сын працуе?

— ...Хутка дзевер памрэ, дык хай Андрэй што на помніку чыркне...

— Хутчэй вам! Чыркне... А мацерыял? Яму ж мацерыял трэба сабраць! — з веданнем справы, важна тлумачыла «пісьменніцкая» маці.

## 9. Спачуванне

А тут ужо гэтая — «некраложная» — тэма пачынае патрабаваць самастойнасці, ці хаця б нейкага (у нашым выпадку даволі жорсткага, трагічна-камічнага) завяршэння.

Адзін вясковы грамацей, ідыёціна першай гільдыі, пасля падзей на Нямізе ў 1999 годзе прачытаў газету, згарнуў, паклаў у кішэню і пайшоў да маёй маці. Прыйшоў:

— Прымі, Іосіфаўна, самые іскранніе сабалезнаванія ў связі з трагіческой гібеллю тваіх сына і нявесткі на раке Няміга ў цэнтры сталіцы нашай Родзіны, — і зняў шапку.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што апрыёры ўсё, што адбывалася ў Мінску, звязвалася са мною — ад падпісання важнага міжнароднага пагаднення да інфармацыі пра дробныя дарожна-транспартныя здарэнні. А тут яшчэ гэтая ўскосная сувязь з некралогамі, помнікамі, смерцямі...

Маці паўдня — пакуль бегала пехам у горад на паштампт і дазванівалася да мяне, пражыла з адчуваннем, што трэба рабіць двайное пахаванне. Пазычала грошы... (З грошай пачалі гэты блок, імі і заканчваем.)

## 10. «Я на гару, а чорт за нагу»

Канечне! Канечне! Не трэба ламацца. Былі ў зародку, у першапачатковым праекце мары і пра грошы, і пра славу, і пра чытачоў, і каб пры спрыяльнай нагодзе — каб неяк так само сабой склалася — не адмовіўся б ад усяго гэтага.

Але раз не склалася — туды яму і дарога. Ліса хадзіла пад вінаграднікам, аблізвалася — высока, не дастаць, махнула хвастом — «усё адно зялёны».

Можна спытаць: навошта тады друкавацца? Не цікавяць грошы, чытачы, слава — дык пішы і складвай у шуфляду, не займай чыйгосьці месца ў часопісах.

Адказваю. Друкаваўся і друкуюся... дзеля Рэдактара. Ён, і толькі ён — гэты сціплы, незаўважны руплівец на ніве роднай літаратуры, ён адначасова і чытач, і крытык, і дарадца, і Бог, і цар, і літаратурны воінскі начальнік. Груба кажучы, я друкуюся, бо мяне друкуюць. Пачнуць вяртаць рукапісы — друкавацца перастану. Ці звярнуся да іншага рэдактара. Тут ясней яснага.

Але ж трэба, каб было што вяртаць. Трэба матэрыяльная рэч — рукапіс. Адкуль ён браўся? Адкуль узнікала, чым жывілася тая нечалавечая апантанасць, сатанінская ўпартасць, тое вечнае трымценне рукі і ручкі, па 17 разоў (падлічана) перапісванне, чаму і навошта ўсё грэбся і грэбся, як жаба на корч?

Я на гару, а чорт за нагу,
Цягне назад з гары.
Кажа сурова: «Займі чаргу,
Адпачні, пакуры».

Я паслухмяна займаю чаргу,
Дысцыплінавана куру.
Зноў да гары — а чорт за нагу:
«Канец, зачыняем гару».

Тады я ціхенька гавару:
«Вазьмі на смалу тры рублі».
І чорт прапускае мяне на гару,
Кажа лагодна: «Валі!»

Можа, нешта прасцей? Можа, не завоблачная слава, не аморфныя грошы, не зменлівыя, ненадзейныя чытачы — можа, была не глабальная, а маленькая мэта, звычайныя пошукі якіхсьці выключна зямных, меркантыльных выгод?

Напрыклад, уступленне ў Саюз пісьменнікаў?

Цалкам магчыма. Такі стымул мог быць. Тым больш у тыя часы членства ў СП давала нямала прывілеяў. Вольны дыплом, а гэта магчымасць працаваць дзе і кім хочаш, або ўвогуле не працаваць, гэта аўтаматычна — Мінск (мала ж сюды патрапіць, трэба яшчэ тут застацца)... Прапіска і жыллё. Паліклініка персанальная пісьменніцкая, пуцёўкі розныя на курорты і ў Дамы творчасці...

«Ты ведаеш, колькі такіх, як ты, з'язджалі з Мінска і знікалі без следу?! — нашэптвалі мне старэйшыя калегі. — Табе трэба толькі Мінск, і толькі праца, звязаная з літаратураю! Потым будзеш думаць пра духоўнае, калі сцены і стол з'явяцца! Маці прапішаш, перавязеш, падлечыш...» (Ведалі, чым браць.)

Вось кавалачак тагачаснага апавядання.

## 11. «Сіндром»

Чалавек можа выстаяць перад вялікімі бурамі, перанесці розныя трагедыі і неймаверныя страты — і зламацца ад нязначнай драбязы, смешнай пстрычкі, якую і ўлічыць было немагчыма.

Як і наш Зміцер. Жыў ён, пакуль не выслізнуў са свайго дабрабыту, як семка з гарбуза, не толькі не горш за людзей, а мо нават і лепш.

У 25 гадоў у яго была ўжо выгодная дзяржаўная служба, уласная аднапакаёвая кватэра і красуня жонка. Часта ён так і казаў свайму суседу з трэцяга паверха, пенсіянеру Міраславу Раманавічу, з якім цёплымі вечаркамі любіў пасядзець каля пад'езда на лаўцы:

— Я, дзядзька Міраслаў, шчаслівы ў параўнанні з іншымі ведаеце чым? Не знешнімі абставінамі, не, хоць і гэтае знешняе для мяне мно-

га значыць. Але найперш тым, што вось без блату, без багатай цешчы, без хітрай жаніцьбы і без падлізвання да начальства сам, толькі ўласным розумам заслужыў і гэтую кватэрку, і сваю Галю, і сямейную ўтульнасць, пра якую некалі так марыў на прагнутым студэнцкім ложку. Маё шчасце ў тым, што я не жадаю сабе нічога ні горшага, ні лепшага. Яно, разумееце, як бы ў канкрэтным моманце. Я ўгадаў гэты момант, я сказаў сабе: стой! Будзь хітрэйшы за іншых. Вось як гэта на прыкладах: будуць даваць новую, большую кватэру — адмоўлюся, будуць павышаць на службе — выкручуся, каб застацца на сваім цяперашнім месцы. П'яніцу, канечне, цяжка пераканаць, што найвышэйшая асалода толькі ад першай чаркі... Я хачу, Міраслаў Раманавіч, захаваць слодыч першай чаркі — разумееце мяне?

Пенсіяінер, схіліўшы набок лысую, з рэдкім сівым вяночкам галаву, цікаўна, але трохі і скептычна слухаў і заціснутым між каленяў драўляным кіёчкам круціў у пяску дзіркі. Адзінокі, хворы чалавек, Міраслаў Раманавіч належаў да не такога ўжо і рэдкага сярод пенсіянераў тыпу: ён не ведаў настальгіі па ранейшым, не трымаўся старога, а падтрымліваў усё новае і перадавое; сам сябе ён называў леварадыкалам. Ён зусім нядаўна выйшаў з партыі, якой служыў ад юначых гадоў і да пенсіі, у знак пратэсту супраць парушэння правоў асобы пачаў насіць вузкія джынсы і з'яўляўся нязменным аўтарам шматлікіх выданняў дэмакратычнага кірунку. Словам, чалавек ён быў неардынарны, цікавы, па-маладому няўрымслівы — а інакш чаму б і спавядаўся яму наш Зміцер?

Выслухаўшы, Міраслаў Раманавіч клаў свой кіёчак на калені і, звонка шапялявячы, казаў:

— Студэнцкі халодны ложак! Уяўляю яго сабе. Пасля такога любая, груба зляпаная, цвёрдая савецкая канапа падасца райскім пухам. У тым і справа, што сапраўднага ложка мы не ведаем усё жыццё. Хіба мы спалі як людзі? Можа, мы елі людскую ежу, культурна сервіраваную? Можа, ведаем сапраўдную культуру, літаратуру, кіно? А мы ж пушчаны ў свет для поўнага шчасця, гэтага ж нельга не прызнаваць. І тваё цяперашняе шчасце — убогае, смешнае. Любы нармальны чалавек адтуль, з Захаду, паслухаўшы цябе, захацеў бы падаць табе міласціну.

— Калі ў мяне спакойна на душы, — адказваў Зміцер, прыкурваючы цыгарэту, — калі мне нічога не хочацца, я магу спаць на падлозе, есці, што Бог пашле, без усялякай сервіроўкі, і абыходзіцца без, як вы кажаце, сапраўднай літаратуры і культуры. І ўсё роўна быць больш шчаслівым за ўсіх вашых еўрапейцаў, разам узятых.

— О не, Дзіма, — уздыхаў пенсіянер, адганяючы цыгарэтны дым, які кепска пераносіў. — Ты шчаслівы толькі адным — няведаннем.

«Мы з калхоза, нам не трэба». Каб ты хоць дзень пажыў у сапраўднай цывілізаванай краіне — ты б іхняму сабаку пазайздросціў бы. Хаця! — мы ўжо нават зайздросціць развучыліся. Нас можна прабіць чым-небудзь?..

Пагаварыўшы так, яны развітваліся і разыходзіліся: адзін — прымаць ванну, піць чай з мятаю, у мяккім крэсле глядзець па тэлевізары пра стыхійныя бедствы і крымінальную хроніку, а пасля ў цёплым ложку абдымаць прыгожую маладую пакорную жанчыну; другі — у свае халодныя чатыры сцяны, дзе стол, ды лямпа, ды нікому непатрэбныя паперы, ды шклянка кефіру на тумбачцы перад сном — па модзе старых людзей... Ды што тут шмат распісваць, і так вядома — Бог няроўна дзеліць!..

## 12. Гарантыйны ліст

Калі адкінуць тагачасную сацыяльную лухту, палітычную атмасферу, якія — толькі фон, у гэтым урывачку як на далоні, як у люстэрку ўсе бліжнія і дальнія планы. Во калі і куды яно сягалася! А яшчэ ж не было ў паміне ні красуні (Г)Алі, ні аднапакаёўкі, ні службы, ні тэорый-прыкідак, як тое гіпатэтычнае, будучае «шчасце» ўтрымаць і зафіксаваць!

Самае дзіўнае, што часткова гэта спрацавала. У Саюзе пісьменнікаў мяне заўважылі, выдалі паперу, у якой на імя рэктара пісалася, што ў выпадку вольнага размеркавання мне гарантуецца праца і жыллё ў сталіцы.

Размахваючы гэтым магічным, усемагутным дакументам (які для блатной інстытуцкай кодлы быў «фількінай граматай»), я — малады, ранні, перспектыўны, удачлівы і шчаслівы — залятаю ў кабінет да дэканшы.

— Вы хочаце вольны дыплом? — будзённа спытала Р. А. — А дзе вы будзеце жыць і працаваць? Трэба хоць маленькая, ілюзорная гарантыя...

— Вось! Не маленькая і не ілюзорная. Ліст з самога Саюза пісьменнікаў.

— А! Тады — усё. Няма праблем. Жалезна. Я падрыхтую рэктара, усіх, усіх... Вы толькі прыдзеце на папярэдняе размеркаванне і распішацеся. І ўсё ў вас будзе цудоўна, у тэатры хадзіць будзеце, на машынах катацца, можа нават кніжку напішаце... Пашэнціла вам!

## 13. Папярэдняе размеркаванне

Перад размеркаваннем дэканша, заходзячы са стосам папак у актавую залу, кінула на хаду: «Андрей, свободный диплом не получится, мы просто распределим вас в Минск. В те библиотеки, которые будут».

Нейкі адзін працэнт дыскамфорту ўзнік.

На крэслах, у чаканні сваёй чаргі. Размова з выкладчыкамі. «А вы куды, Андрэй?» — «Як Астап Бэндэр — вольная прафесія. Мінск, папера з СП». — «Вось малайчына. Пашэнціла!»

Мая чарга. Заходжу. Вельмі многа людзей.

**Дэканша.** Андрей Федаренко, холост, из Мозыря.

**Рэктар**. Вы где прописаны?

**Я**. Часова ў Мінску, а так у Мазыры.

**Рэктар**. Есть Мозырь?

**Голас**. Есть!

**Я** *(думкі ўжо ясныя)*. Я хацеў бы застацца ў Мінску ці ўзяць вольны дыплом. У паперы, якую я падаваў, напісана, што хутка я ўступлю ў СП, а ён забяспечыць мяне жыллём.

**Галасы** *(злева)*. СП! СП — Союз писателей.

**Дэканша** *(спахопліваецца)*. Ах, да, вот он приносил...

**Рэктар** (*чытае праз тры словы*). Здесь напечатано плохо... Прозаик... Секция... Ну и что? Без прописки в Минск направить мы вас не можем.

**Галасы** *(справа)*. Мележ в Хойниках жил... Гомель есть! Это ж, наоборот, нужно в деревне прожить — напишешь больше. Как это его родина и он не хочет туда ехать?

**Рэктар**. Не тяните время. Есть Гомель и Мозырь. Ваша бумага не имеет юридического обоснования.

**Я.** Калі яна пісалася, яна і не прэтэндавала на юрыдычны дакумент, а была як асабістая просьба.

**Голас**. Никто тебе квартиру не даст, никакой СП! Он не распределяет квартиры! *(Вось і памыляліся.)*

**Галасы**. Если ты вступишь в СП, тебя СП вытащит в Минск в любое время! Ты получишь в провинции жильё, все удобства!

Я ўстаю, падыходжу:

— Дайце паперу.

Забіраю і іду да дзвярэй.

**Галасы**. Стойте! Стойте! Андрей, вернитесь!

Вяртаюся.

**Галасы**. Всё равно нужно подписать, даже когда и не едешь.

**Парторг**. А вы да чэрвеня зможаце дастаць прапіску?

**Я.** Змагу.

**Галасы**. Где он сможет? Да что вы говорите вообще?! (*На парторга.*) Сыс и Глобус в деревнях живут! Да что он написал? Коллективное письмо в Союз писателей подать, чтобы не принимали за такое поведение!

**Голас**. Вот что, чтобы не тянуть время, пишем — Гомель, а ты напротив своей фамилии пиши — нет.

**Я** (*дэканшы*). Чаму мне гэтага не сказалі, калі я да вас заходзіў?

**Дэканша**. Я сказала, что доложу комиссии.

**Я**. Доложили?

*(Маўчанне.)*

**Рэктар**. Мы не видим причин давать вам свободный диплом. Он даётся или… или у кого родители инвалиды. Ни под одну категорию вы не подходите.

## 14. Булгакаўшчына
## (Васілю Гігевічу)

Здорава. Пяць гадоў вучыцца. Прывыкнуць да Мінска, палюбіць яго. Дабіцца сяго-таго ў літаратуры (выйшла першая кніжка на той час). Паверыць у свой лёс, у сваю зорку. І раптам — крах, поўны, вяртанне ў вёску, да «чарнільца», ці ў якісь раённы цэнтр, адарванасць ад літаратурнага асяродку... Ды не ў тым справа! Я не баяўся Калымы, не тое, што вёскі, — проста было абсалютнае адчуванне несправядлівасці, няшчырасці, нейкай кепскай, бесталковай гульні, ад якой ніхто не атрымоўваў карысці.

Цяпер смешна ўспамінаць, але тады злосці і адчаю майму не было межаў.

Хто з-за мяне захоча ў СП падстаўляцца? Ды і што ён, саюз, можа зрабіць пры ўсім жаданні? У сітуацыі, калі сама абрэвіятура — СП — бяссільная, а значыла яна ў тыя часы не менш, чым ЦК ці КДБ.

У пераходзе метро сутыкаюся з пісьменнікам-фантастам (!) Васілём Гігевічам. Расказваю вяла.

— Ты зарэгістраваў тую паперу ў прыёмнай? — энергічна бярэцца за справу Васіль Сымонавіч.

— Не.

— Малайчына. У сэнсе, дурань. Калі папера рэгіструецца, яны вымушаны даць пісьмовы адказ. А што яны напішуць? Што нам СП

не ўказ? Хто ім тады ўказ? І што — яны ўсіх па прапісцы накіроўваюць? Нехта ж застаецца ў Мінску і без прапіскі.

— Ды яны проста выганяць без выдачы дыплома.

— Зараз! Пяць гадоў вучылі. Тым больш не сёння-заўтра прэзідыум, уступіш у СП і пашлеш іх разам з іхнімі дыпломамі і размеркаваннямі.

— А калі не ўступлю?

— Ну й чорт з ім. Прапішу цябе ў сябе. Жэнішся на мінчанцы, у мяне сваячка ёсць, харошая дзеўка, замуж хоча, будзеш жыць і пісаць спакойна без усялякіх дыпломаў і СП. Дарэчы, наконт працы. У «Полымі» вызвалілася месца загадчыка аддзела культуры і гісторыі. Хочаш загадчыкам аддзела?

— Вы жартуеце... Хто мяне возьме, які загадчык — без прапіскі, без дыплома, без вышэйшай адукацыі, без жылля, без членства ў СП, беспартыйны?![6]

— Я перагавару з хлопцамі, праз пару дзён табе пазвоняць у інтэрнат і прымуць у «Полымя».[6]

— Васіль... навошта я вам, чужы чалавек?!

— А ты адзін з нямногіх, хто будзе пісаць. Не важна, добра ці кепска, проста фізічна будзеш пісаць.

— Дык што, гэта галоўнае? Літаратура важней за ўсё? Проста пішы — а астатняе прыкладзецца?

— Абсалютна правільна.

Хвіліну назад я адчуваў сябе няшчасным жабраком, а цяпер на мяне раптоўна звалілася багацце...

Наўзабаве ўсё ў адзін дзень і адбылося. Да абеду напісаў заяву ў «Полымя» (пішу, а ззаду Янка Брыль стаіць, дыхае ў патыліцу), пасля абеду — прынялі ў СП, а ўвечары тэрмінова выклікалі да рэктара.

— Дык табе трэба вольны дыплом? Калі ласка! А хочаш — любую, на выбар, бібліятэку ў Мінску? Ва Урадавую — хочаш?

А мне ўжо не і трэба нічога, дарагая лыжка ў абед.

Недзе праз паўгода пасля апісаных падзей, у Маскве на вакзале падыходзіць бомжык, тыпічны, нячолены. «Слушай, парень — слухай, хлопец, я загуляў... І грошай няма, і выпіць няма з кім. Пазыч пяцёрку. Я вышлю».

Зайшлі ў нейкую смярдзючую пяльменную. «А что ты делаешь в Москве?» Лянота была хлусіць, нешта выдумляць, і я адказаў: «Ды вось, прыязджаў у вашу Акадэмію навук атрымліваць прэмію за лепшае апавяданне сярод маладых пісьменнікаў Савецкага Саюза».

---

[6] На такія пасады ў часопісы прымалі тады толькі членаў КПСС.

Заняты адкаркоўваннем пляшкі, бомжык не тое што не здзівіўся, а нават вачэй не падняў. «Так? А я таксама ў СП, у камісіі па міжнародных сувязях аціраюся... Хочаш, арганізую табе паездку ў Італію?»

Я падзівіўся — у нас у Беларусі такіх бамжоў не бывае, выпіў з гэтым смешным абяцальшчыкам, даў на развітанне пяцёрку, пакінуў адрас і паехаў у Мінск. Праз тыдзень прыходзіць перавод на 25 рублёў, з прыпіскай з другога боку: «Андрюша, извини, что не повезло с Италией!», а яшчэ праз тыдзень тэлеграма: «Главному редактору ПОЛЫМЯ просьба направить творческую командировку Монголию расходы счет комиссии международным связям...»

## 15. СП

Усё гэта, канечне, добра, але ўсё гэта не тое.

Нельга пісаць і мець у планах: вось напішу і за гэта ўступлю ў СП, потым у метро буду натыкацца на дабрадзеяў-фантастаў, а на вакзалах — на ўсемагутных бомжыкаў.

Хай іншыя паспрабуюць. Гэта не заканамернасць. Гэта латарэя. Гэта зусім не гарантыя, не аксіёма, не жалезнае правіла, якое пры кожным павароце лёсу можа быць успомнена і прыцягнута на дапамогу, якое, як лінейку (Ян Скрыган казаў — «прымернік»), можна прыкладваць-прымерваць да любога выпадку.

І СП, і Гігевіч, і бомж (ні імя, ні прозвішча якога і цяпер не ведаю), і Расійская Акадэмія навук, і Парыж, і бальніца — усё гэта выпадковасці, з серыі «пашэнціла — не пашэнціла».

Сёння ты ў Парыжы, а заўтра ў Богам забытай мінскай бальнічцы, трымаешся на адных наркотыках і няма каму з-пад цябе нават вынесці; сёння ты ў Саюзе пісьменнікаў, а заўтра і Саюз невядома дзе і чый...

Да таго ж такі стымул, як уступленне ў СП — дужа недаўгавечны; ён, калі і існаваў, мог быць дзейсным толькі на пэўны, кароткі перыяд. Ну, уступіў, а далей? Хіба мала ў нас творцаў, якія, дабіўшыся членства ў СП, адразу ж пераставалі пісаць? Значыць, толькі такая — часовая, максімальна-мінімальная задача стаяла, і калі яна была дасягнута, патрэба тварыць знікала.

Шчыра кажу — не. Не Саюз пісьменнікаў. Не ўступіў бы ў яго — спрацаваў бы варыянт Гігевіча, ці нейкі любы іншы варыянт.

## 16. Дзённікі

Госпадзі! Мне ўжо самому цікава, для чаго ж тады, якой трасцы я так люта, так утрапёна пісаў?

Якога ражна ўвогуле піша пісьменнік, якому не патрэбны ні чытачы, ні грошы, ні слава, ні практычныя, прыземленыя выгоды: якісь СП, якія-небудзь лакальныя прэміі і вынікаючыя з іх прывілеі?!

Я вырашыў звярнуцца да дзённікаў. Харошая рэч. Я даволі рэгулярна вяду іх з 1986 года. Можа, там, у тым жа славутым узроставым раёне 23–25 гадоў адшукаюцца чыстыя дэбютныя мары?.. Паўгалодны, малады, амбіцыёзны, самалюбівы... Піша начамі, рыхтуецца да прэмій у Расійскай або сваёй Акадэміі навук, да будучага Парыжа, ставіць перад сабой высокія мэты...

Жудасць navалілася на мяне, як толькі вочы пачалі выхопліваць словы і радкі пад датамі 87, 88, 89.

Мне проста стала кепска. Гэта быў кашмар. Гэта былі штохвілінныя фіксацыі стану, такое самакалупанне, такое страхоцце, такія замарочкі, такая гадасная дрэнь, якой маглі б пазайздросціць нашы прафесійныя «чарнушнікі». Каб не знаёмы почырк (ён у мяне не мяняўся ад школы да цяпер), я б не паверыў, што гэта маё.

З 88 па 89 большая частка выдрана, спалена, знішчана — як чорная метка, як нядобрая, начараваная, намоўленая рэч; ужо тады адчуваў, што нельга такое трымаць у кватэры. Па той жа прычыне, відаць, і не карыстаўся тымі дзённікамі, баяўся перачытваць нават тое, што засталося...

Нічога я з іх не ўзяў і цяпер. Аднак сёе-тое ўспомніў.

## 17. Душ

У інтэрнаце блочная сістэма: на два пакоі — прыбіральня і душ. Душ з двух аддзяленняў, кожнае метр квадратны. Душна, затое «ўласны кабінет». Тут я даволі някепска атабарыўся: скрынка замест століка, на якой пішучая машынка, стос кніг замест крэсла.

Ноч. Пішу ў пакойчыку душа.

Свой свет. Ілюзія адасобленасці, адзіноты. Пад машынку падкладваю кавалак тоўстага паралону. Усё адно ляпае, здаецца, на ўвесь квартал. Ажно звон у вушах. Калі спыняюся пісаць, з пакоя чуецца енк, крык, стогн... Сусед прывёў на ноч дзяўчыну.

Каб не слухаць, яшчэ мацней луплю па клавішах. Што пішацца — не ўяўляю (хаця што там уяўляць?)...

Стук у дзверы, ад якога падскокваю.

— Письменник! — радасна-знясілены дзявочы голас. — Подмыцца пусти!

## 18. Смірнова

Зіма. Ноч. Пішу. Перыядычна выходжу на калідор перакурыць. Скразнякі — а тут цёплая батарэя ў кутку калідора. Да яе можна прытуліцца спінай. Прыкладна ў гадзіну ночы чутно, як ляпаюць унізе ўваходныя дзверы. Крокі па лесвіцы. І вось ідзе, рослая такая кабыла з крутым, круглым задам.

Больш не дам нікому веры,  
Лепш пачну ўсё па-нову,  
І патрачу шмат паперы  
На цудоўную Смірнову!

Во-во. Менавіта гэтае, выпадкова выскачанае акравершнае слова. Лепш бы што іншае на яе патраціў.

Падыходзіць, прысаджваецца на кукішкі. Калені разведзеныя. Сінякі пад вачыма. Прыкурвае, пальцы трымцяць.

І ў канцы доўгага, вузкага, шэрага, з абшарпаным лінолеумам калідора цьмяная лямпачка выхоплівала малюнак: пачынаючы пісьменнік і блудніца, «странно сошедшиеся за...» (прыплялося з іншага Міхайлавіча).

— Што, Смірнова? Цяжка?

— Вазьмі ты мяне замуж... Гэта ж няма ўжо ні сіл, ні душы!..

## 19. Ліліт

Вясна. Май. Глыбокая ноч. Я адзін. Пакой на другім паверсе. Калі выйсці на балкон, побач цвіце груша. Хрушчы шапочуць у лісці. Груша старая, тоўстая, крывая. Можна працягнуць руку і гладзіць лісце і кранаць квецень...

Стук у дзверы — начны, гучны, чужы! Аж дыханне перахоплівае ад злосці і нерваў. На парозе — Кернажыцкая. Ліля Кернажыцкая, беленькая шляхцяначка, цнота хадзячая.

(«И вот в том самом черном фраке, в котором был вчера убит, с улыбкой томною гуляки я подошел к моей Лилит»...)

Абдымае мяне і горача шэпча:

— Як добра, што ты яшчэ не спіш. Усё пішаш? Я жадаю табе... не, я проста ўпэўнена, што ты станеш... незвычайным пісьменнікам! Ты такі... такі...

Потым цалуе мяне.

— Можна, хлопцы залезуць па грушы на твой балкон?

Можна. Адчыняю балкон. Трое. Праходзячы праз пакой, адзін азіраецца і аглядвае мой ложак.

— А дзе баба? Слухай, першы раз бачу, каб хлопец адзін спаў, без бабы...

## 20. Наташа

Атрымаў ганарар. Нешта каласальнае па тых часах.

«Замочка». Прастаўляю чамусьці не хлопцам, а дзеўкам. П'ем гарэлку і шампанскае. Я адзін, першакурснік, іх штук шэсць дзевак, усе з пятага курса. Зрэшты, мяняюцца пастаянна, адна выходзіць, другая заходзіць, у вачах ужо калейдаскоп ад іх. Нехта мыецца ў душы, цурчыць вада. Кагосьь ванітуе ў туалеце.

Я не паспяваю выпіць, як дзявочыя рукі цягнуцца да мяне і ўвесь час падліваюць. Потым тыя ж рукі абвіваюцца вакол маёй шыі. Магнітафон, дыскета з нейкім арабскім дзікім акцэнтам. «Натаська... лублу... спамінаю...»

Наташка раве на маіх грудзях.

— Магла б нарадзіць яму, а зрабіла аборт! Цяпер была б пра яго памяць! А так — адна дыскета! Хоць ты ў ... гэтую дыскету засунь!

У мяне грудзі мокрыя ад слёз, шчокі — ад слюняў, пацалункаў... Вільгаць, булькание спіртнога, шум вады, вады...

— Давай пажэнімся? Ты будзеш пісаць, я хадзіць вакол цябе на дыбках...

— /.../

— Прыдурак! Я ж, прайшоўшы такое, не гляну больш ні на кога! Я ж на цябе маліцца буду! Дзяцей табе нараджаю, казёл!..

## 21. Аксана

«Ты ўмееш кахацца?» — спытала Аксана.

Я ніколі не думаў, што гэта трэба ўмець, і толькі пазней зразумеў, што яна мела рацыю і вельмі талкова, правільна і практычна спытала. Умець кахаць, умець кахацца — талент, не кожнаму дадзены, гэта

не проста кляпанне дзяцей (выдатны афарызм: «Калі Бог стварыў чалавека, ён не запатэнтаваў сваё вынаходніцтва і цяпер кожны дурань можа рабіць тое самае»).

«Ты... дзяўчынка?» — у сваю чаргу спытаў я... Ды не! — хлушу, надакучыла гэтае сюсюканне ўжо.

— Ты дзяўчына ці ўжо жанчына? — перапытаў я.

Плач... Я дастаю насоўку. Яна сморкаецца. Слёзы, смаркачы... Колькі многа ад дзяўчат вільгаці!

Ці варта лішні раз паўтараць, што ўсё скончылася просьбаю ўзяць яе замуж.

— Аксана! А проста пагуляць? Як іншыя робяць... Прыгледзецца адно да аднога, прыцерціся... Атрымаецца — не атрымаецца...

— Ну не! — аж слёзы высахлі. — Хопіць! Нагулялася. Час толькі траціць.

## 21(а). Дыялог

З кім гэта было? Дзе? Калі?

— «Ведаеш маю мару? У чым для мяне сэнс жыцця, да чаго я імкнуся? Знайсці сабе дзеўку-нацыяналістку».

— «А меня?»

— «Ты не ведаеш мовы».

— «Я выучу».

— «Гэта намнога сур'ёзней, чым табе здаецца».

— «Я стану серьёзной».

Не ведаю, і ніколі ў жыцці не ўведаю, чаго ўсе, як адна, дзеўкі, з якімі зводзіў мяне лёс, усе пагалоўна! — ад 15 да 35, замужнія і вольныя, марылі выйсці за мяне замуж і ні адна не згаджалася «проста пагуляць», як з іншымі хлопцамі, ці хаця б сябраваць.

## 22. Псіхааналіз

Дык, можа, вось для чаго я пісаў?

Можа, тут наадварот — не прасцей, а крыху глыбей? Можа, не на паверхні, не ў матэрыяльна-вонкавым (слава, чытачы, грошы, СП і інш.), а ў прыхаваным, ірацыянальным справа?

Дзявочы інстытут, дзявочы факультэт... Абшчага дзявочая... Які магутны раздражняльнік! Якое моцнае, увесьчаснае трэба было яму супраціўленне!

Дык, можа, прычыны пісання былі зусім не зямныя, не шаблонныя, а — лячэбна-прафілактычныя, так сказаць — псіхатэрапеўтычныя? Можа, я проста ратаваўся літаратураю? Можа, гэта была самаабарона арганізма? Своеасаблівая разгрузка, крык болю і тупат ножкамі дзіцяці, якое стукнулася і якому баліць?

Жаданне ўцячы ў душ, у пакой, у літаратуру, замкнуцца, зачыніць усе дзверы і вокны, каб нічога не чуць, не бачыць, акрамя выдуманага свету, акрамя штучна створанага жыцця, дзе ўсё не так, усё інакш...

Якое раздолле для псіхааналізу! Вось дзе размахніся, каса, разгарніся, плячо! Якая спакуса ва ўсім гэтым пакалупацца, зашыцца ў яго, нырнуць з галавой! Памацаць і паспрабаваць на зуб розныя псіхааналітычныя тэорыі!..

## 23. Тэорыя Фрэйда

Яна простая, як дышла (паводле Фрэйда — фалас): у кожным сучку на дрэве бачыць мужчынскае, а ў кожнай трэшчынцы на кары — жаночае.

У аснове любога ўчынку, тым больш маніі (а пісьменніцтва такой і з'яўляецца), ляжыць альбо эдыпаў комплекс, альбо сексуальная траўма, атрыманая ў дасвядомым, падсвядомым перыядзе жыцця.

Выключна ўсё, ад насмарку да шызафрэніі, вырастае з таго, што вышэйшыя ўчасткі мозгу, сфармаваныя цывілізацыяй, ваююць з ніжэйшымі — першабытнымі, інстынктыўнымі, жывёльнымі.

Адсюль выснова, яна ж лекі: прызнайся самому сабе, што табе хочацца ў гэтым плане, развяжы свае комплексы, аддайся жывёльным інстынктам — і табе адразу палягчае.

Сутнасць ачышчанага, «голага» фрэйдызму і метадаў лячэння па ім можна перадаць пахабным анекдотам: «Калі цябе гвалтуюць, расслабся і атрымоўвай задавальненне», а калі цябе некалі гвалтавалі, пастарайся забыць пра гэта кепскае, а ўспамінай адно харошае.

Нягледзячы на ўвесь цынізм, было б гэта, мабыць, няблага. Калі б чалавек жыў не ў соцыуме, а ў малпоўніку. Але справа ў тым, што барацьба — увесьчасная і бязлітасная — вышэйшага з ніжэйшым, маралі з інстынктамі — гэта не паталогія, а ***норма***.

Атрымоўваецца абсурд: вучэнне Фрэйда ў тым, як нармальнаму, здароваму чалавеку ўбіць у галаву, што ён хворы.

Не трэба гэта чалавеку. Проста не трэба. Пражыве і так, прыпяваючы.

## 24. Тэорыя Паўлава

Куды больш цікавая за вучэнне Фрэйда.

Іван Паўлаў, акадэмік, сусветна вядомы фізіёлаг (прататып усіх булгакаўскіх прафесараў-геніяў), першы рускі лаўрэат Нобелеўскай прэміі, які застаўся пасля рэвалюцыі жыць у Савецкай Расіі, славуты быў рознымі дзівацтвамі, напр., з'яўляўся на савецкія афіцыйныя прыёмы з поўным «іканастасам» царскіх узнагарод і ордэнаў, а ў святочныя дні царкоўнага календара на дзвярах лабараторыі красавалася запіска: «Зачынена, з нагоды Святой Пасхі» (іншаму ЧК за такое рукі б адсекла); адзіны ва ўсім Савецкім Саюзе адкрыта не прызнаваў савецкай улады і не баяўся гаварыць аб гэтым з кафедры.

У адрозненне ад Фрэйда, які здаровых спрабуе пераканаць, што яны хворыя, Паўлаў зрабіў крок наперад (лепш сказаць, «назад», у падсвядомасць) — ён даказаў, што чалавек і сімвалы прадметаў у ім фармуюцца задоўга да ўзнікнення лібіда.

Усе комплексы дзіця набывае яшчэ ў той страшэнна цёмны, дасюль не вывучаны (і які, хутчэй за ўсё, ніколі не будзе вывучаны) перыяд, калі яно практычна бясполае.

Усё пабудавана на рэфлексах. Рэфлексы закладваюцца, а потым робяцца ўмоўнымі, з вельмі абмежаванай колькасці прадметаў. Што можа бачыць, чуць, успрымаць немаўля? Белую столь. Які-небудзь узор на шпалерах. Матчыну цыцку, руку. Чуць крокі, галасы, шум вады... Вось, бадай, і ўсё. Вось тыя няхітрыя рэчы, якія фармуюць нашую будучую дарослую псіхіку.

Гэтыя рэчы могуць быць здаровымі — калі дзіця радавалася вадзе, крокам, матчыным грудзям — ежы, а могуць быць «хворымі» — калі гэта суправаджалася якімі-небудзь адхіленнямі, анамаліямі.

Калі ж у дзіцяці да ўсяго вострая, тонкая, асаблівая псіхіка, «не такая, як ва ўсіх», калі яно, дапусцім, цягнулася да цыцкі, а яе яму не давалі, адштурхоўвалі, у яго можа стварыцца ўмоўны рэфлекс, узнікнуць ілжывая сувязь, што «цыцка — ежа», «маці — жанчына» (пазней гэта, канечне, трансфармуецца яшчэ і ў секс) — забарона, сорам, і ў жанчыне і ў ежы ён будзе бачыць адначасова і неабходнасць, і небяспеку.

## 25. Тэорыя Зошчанкі

Токар-фрэзероўшчык можа паехаць у адпачынак на курорт, у вёску, на рыбалку, на паляванне, у грыбы — і не думаць пра станкі, і хоць часова разгрузіцца.

Творчы чалавек, у прыватнасці, пісьменнік, не адпачывае ніколі і нідзе — ні ў адпачынку, ні на прыродзе, ні ў час выпіўкі, ні нават у сне. Гэта асаблівасць псіхікі.

Выдатны пісьменнік-псіхолаг Міхаіл Зошчанка ўслед за Лабразо і пры дапамозе метада Паўлава паспрабаваў зірнуць на феномен творчасці не з лірычна-рамантычна-туманных вышынь, а з пункту погляду медыцыны.

Тое, што называецца ўзвышаным і прыгожым словам — «натхненне», Зошчанка пачаў разглядаць як усяго толькі фізічны, фізіялагічны працэс, стан крайняга ўзбуджэння нервовай сістэмы, калі мозг працуе на мяжы магчымага і за кошт іншых органаў.

«Натхненне... гэта асаблівая, але не зусім правільная праца ўсяго арганізма. Лепш сказаць, зусім няправільная. Гэта т. зв. сублімацыя».

«Узнёслую скруху, пашанотную хандру, прывабны смутак, чароўную маркоту, ганарлівую пагарду да людзей, высакароднае самагубства і раннюю паэтычную смерць навука, на жаль, разглядвае крыху іначай, чым літаратура».

«І ведаць усё гэта пісьменніку проста неабходна, як неабходна мастаку ведаць анатомію. Канечне, мастак можа маляваць і без ведання анатоміі. Можна маляваць, як пячорныя жыхары — профіль з двума вачыма. Што, дарэчы, нярэдка назіраецца і ў літаратуры».

І так, творчасць, «натхненне» — усяго толькі разнавіднасць неўрозу. Гучыць не зусім прыгожа, але калі прыцісне, яшчэ не тое прыдумаеш.

Разумеючы, наколькі гэты творчы неўроз небяспечны, наколькі хісткае балансаванне на мяжы паміж рэальнасцю і вар'яцтвам, Зошчанка прыдумаў сістэму кантролю пісьменніка над сабой, над сваім мозгам і сваімі пачуццямі. Калі ўжо гэты неўроз нельга вылечыць, дык як мінімум трэба яго не запускаць, бо наступствы могуць быць вельмі і вельмі сумнымі (гл. пачатак рамана). Яшчэ лепш — паспрабаваць паставіць яго на службу сабе («любімаму»); з паршывай авечкі хоць поўсці касмыль.

Мэта простая: як бы найдаўжэй пражыць фізічна, каб пры тым пісаць выдатныя рэчы і адначасова не звар'яцець ад перагрузкі? «Я не ацэньваю чалавека па даўжыні яго жыцця, — разам з тым вельмі слушна заўважае пісьменнік. — Іншае кароткае жыццё больш каштоўнае, чым стагоддзе. Але лічу, што калі падоўжыць цудоўнае кароткае жыццё, дык якасць яго не пагоршыцца».

*

...Тут і далей, паўторымся, маюцца на ўвазе творчыя людзі — пісьменнікі, для якіх не існуе ні дня ні ночы, ні выхадных ні праходных, якія, як праклятыя, носяць паўсюль сябе саміх, якім аднолькава, што ў Дзвінску, што ў Мінску, што на французскім востраве Іф (Іў), што ў беларускім мястэчку Іўі, якія не маюць забыцця ні ў ложку з каханай жанчынай, ні на сяброўскіх пагулянках, ні на самотнай прыродзе, ні каля акна раддома, з якога паказваюць несімпатычны камячок са зморшчана-спечанай мордачкай — іх першынца, ні каля труны бацькі ці маці перад пахнучай сырой зямлёю магілай...

Нідзе і ніколі.

Пісьменнікі, для якіх літаратура — хобі, якія пачынаюць «тварыць» пасля выхаду на пенсію, якія ўмеюць пісаць у працоўны час у працоўных кабінетах, якія атрымліваюць задавальненне ад самога працэсу пісання і «балдзеюць» ад уласных тэкстаў, якія хоць раз у жыцці ўжылі словы: «Я б напісаў, ды цяпер няма часу», — такія могуць адпачываць; іх я адпускаю. Гэтае эсэ не пра іх і не для іх.

## 26. «Хворыя прадметы»

Вандруючы ў памяці ад сёння да пачатку, усё далей і глыбей, Зошчанка дагробся да наступнага выпадку ў сваёй біяграфіі.

Аднойчы маці карміла яго, зусім маленькага, цыцкай. У гэты момант бліснула маланка, улупіла ў двор дачы. Забіла карову. Загарэўся хлеў. Жахлівы гром супаў з працэсам кармлення. На хвіліну маці страціла прытомнасць і выпусціла немаўля з рук. Яно ўпала на край ложка, скацілася ў балею з вадою, пашкодзіла руку...

Маленькі мозг няправільна злучыў гэтыя факты, паблытаў прычыны з вынікамі. Такія страшныя катаклізмы — зафіксавалася ў маленькім мозгу — маглі адбыцца ад таго, што вусны дакрануліся да цыцкі. І вось пакаранне: за ежу, за цыцку, за жанчыну — пякельны ўдар грому, падзенне, вада, зламаная рука, нерухомае цела маці!..

Удар, грукат, цыцка-ежа, вада, рука сталі першымі раздражняльнікамі, якія па ходу жыцця ўсё ўскладняліся, атрымоўвалі ўсё новыя пацвярджэнні сваёй небяспекі (напр., у час вайны Міхась лёг у ложак з жанчынаю, побач разарваўся снарад — і дзіцячыя жахі ажылі, і яму стала блага, і нават забалела тая самая рука: зноў жанчына, цыцкі, гром, небяспека... І з таго часу калі ён толькі бачыў жынчыну, быў з ёю побач, а снарад не рваўся, яму ўжо рабілася не па сабе — па

прынцыпе ілжывай сувязі, умоўнага рэфлексу — як выдзяленне сліны пры выглядзе або паху ежы).

Пазычыўшы ў швейцарскага неўрапатолага Дзюбуа тэрмін, Зошчанка вылучыў ужо згаданыя «хворыя прадметы». Гэта:

— рука,

— вада,

— крык, выбух, стрэл, стук,

— ежа (па эвалюцыйным ланцужку: цыцка — жанчына — секс).

Вось 4 асноўныя рэчы, якія з'яўляюцца ў тых ці іншых варыянтах для кожнага (па перакананні Зошчанкі) небяспечнымі. Паміж імі існуюць сувязі. З дзяцінства гэтыя сувязі маглі няправільна зафіксавацца ў псіхіцы, а потым, у далейшым жыцці, умацавацца грунтоўна. І менавіта яны, «хворыя прадметы», могуць выклікаць самыя сур'ёзныя хваробы — ад душэўных да фізіялагічных: страўніка, сэрца, лёгкіх, нырак і інш., і інш.

Трэба ўсяго толькі адшукаць ілжывыя, умоўныя сувязі і разарваць іх.

Самому Зошчанку гэта ўдалося. Лепшая частка яго жыцця (да 30 гадоў) была атручана цяжкай немаччу — у яго «было нядобра з нервамі», а адсюль — нядобра і з усім астатнім. Аб'ездзіўшы лепшыя савецкія курорты, абхадзіўшы ўсіх славутых дактароў, пераспрабаваўшы ўсё, што можна — ад гіпнозу да, як ён піша, «тон парашкоў і пілюляў», упарты пісьменнік расчараваўся ў медыцыне, узяўся за лячэнне сам... І здзейсніў цуд! — цалкам вылечыўся. Яму ўдалося зазірнуць у найпатаемныя куточкі ўласнай псіхікі, святлом розуму выхапіць іх і ўбачыць, што тое, што атручвала яму жыццё — усяго толькі дзіцячыя, смешныя, несур'ёзныя сімвалы. І яны зніклі, як знікаюць прывіды ў пакоі, калі ўключыць святло.

Бяда Зошчанкі ў агульнай бядзе многіх філосафаў, вучоных, псіхолагаў і г. д.; менавіта тое, што памагло ім, яны пачынаюць пераносіць на ўсіх агулам. Заганарыўшыся сваім адкрыццём, пісьменнік вырашыў даказаць, што яго індывідуальны выпадак — гэта агульнае, універсальнае правіла, што яго вучэнне, яго тэорыя — гэта частка цэлай праграмы па духоўным аздараўленні кожнага, што яна можа ашчаслівіць усіх без выключэння — у першую чаргу савецкага чалавека, а затым і кожнага чалавека на Зямлі. Адзін з варыянтаў назвы яго кнігі на гэтую тэму — ні многа ні мала «Ключы шчасця». (Хто толькі не вынаходзіў гэты перпетум-мобіле ашчасліўлення чалавецтва!)

«Законы ўмоўных сувязяў адносяцца да ўсіх людзей. Не ў аднолькавай меры, але ў той ці іншай ступені яны небяспечныя нават і тым людзям, якія не маюць вострай псіхікі».

Калі ж справа пачала даходзіць да практыкі — нам застаецца толькі развесці рукамі.

Яго ключы адкрывалі замкі такога «шчасця», пры якім жыццё свядома зводзілася да адных умоўных рэфлексаў, да голай фізіялогіі, без веры ў Бога, без жаданняў, спадзяванняў, кахання і цуда, — словам, да існавання сабакі Паўлава. Нам для нашага ж шчасця прапаноўвалася ператварыцца ў аднаго з тых бадзёрых савецкіх дэбілаў, якіх сам Зошчанка, жартуючы, знішчаў дзвюма пстрычкамі-радкамі любога са сваіх геніяльных апавяданняў.

Вось два класічныя прыклады «лячэння» па Зошчанку. Да яго прыходзіць малады чалавек і, страшэнна саромеючыся, скардзіцца, што ў яго праблемы са страўнікам. Ваніты, млоснасць, спазмы кішэчніка... Малады чалавек у адчаі. Пазбягае людзей. Страціў усе радасці жыцця. «Вашыя прыпадкі ўзмацняюцца калі? — не так пытае ў яго, колькі канстатуе Зошчанка. — Калі вы чакаеце жанчыну?» Малады чалавек моўчкі ківае галавой. І, чырванеючы, расказвае гісторыю (занадта знаёмую нам гісторыю!), як некалі маці заснула, калі ён смактаў яе цыцку. Яна ачомалася ад дрымоты, калі ён быў амаль сіні.

«Адказ арганізма відавочны, — заключае Зошчанка. — Страх і жаданне пазбегнуць гібелі ляжалі ў гэтым». (Страх падаваў сігнал: жанчына — небяспека.)

Другая гісторыя. Маладая жанчына цяжарная трэці раз, і ўсё не можа нарадзіць. І зноў дактары настойваюць на аборце. Зошчанка пытае ў жанчыны, ці была звязана яе першая цяжарнасць з чымсьці непрыемным. «Не, — адказвае жанчына спакойна. А затым, збянтэжыўшыся, перапытвае: — Ах, першая? Самая першая?» (Якія мапасанаўскія інтанацыі! Памятаеце апавяданне «Шафа»?) Аказваецца, першы раз яна была цяжарная ў 17 гадоў, вучаніцай, хавала гэта ад бацькоў, ад школы, потым паехала да сяброўкі за горад і нарадзіла там мёртвае дзіця.

«Цяжарнасць і гора звязаліся ў адно, — робіць выснову Зошчанка. — Умоўны рэфлекс застаўся. Сувязі не былі разарваныя нават тады, калі змяніліся абставіны. Мозг не адзначыў перамены...»

І гэтак далей, і таму падобнае. Усе гэтыя гісторыі пакідаюць непрыемны асадак чагосьці несур'ёзнага, наіўнага і таксама, як і фрэйдызм, патыхаюць шарлатанствам. Я думаю, было б і лепш, і разумней, каб Зошчанка параіў маладому чалавеку звярнуцца да спецыяліста па страўніку, а жанчыне — да талковага гінеколага.

Савецкая цэнзура расправілася з бедным аўтарам-вынаходнікам імгнення. Яму прыпісалі два грахі: 1) у грамадстве сацыяльнай роўнасці не можа быць ніякіх выключных прафесій: і псіхіка пастуха, генсека і пісьменніка аднолькавая; 2) у савецкіх людзей увогуле

не можа існаваць ніякіх псіханеўратычных праблем, любыя размовы на гэты конт — ерась, іншадумства, дысідэнцтва.

Праца Зошчанкі была аб'яўлена шкоднай «галиматьей, нужной лишь врагам нашей Родины», сам ён — «падонкам у літаратуры», яго выкінулі з Саюза пісьменнікаў (а гэта значыла немагчымасць друкавацца і пазбаўленне прадуктовых картак), адпаведна, і з жыцця. Старасць яго і смерць — асобная гісторыя...

Мы ж падзякуем гэтаму мудраму і мужнаму пісьменніку і чалавеку хоць бы за сам метад, які ён на сабе выпрабаваў і з намі падзяліўся.

## 27. Фантазіі на тэму

Давайце ўявім, што я са сваімі праблемамі прыйшоў у кабінет да, скажам, зошчанкаўца.

— Вось, так і так... Да 40, 42 гадоў пісаў, і атрымоўваў задавальненне, і бачыў ва ўсім сэнс, і быў адносна шчаслівы... Потым гэта перастала памагаць. Чаму?

— Прасцей простага, — прагучаў бы адказ. — Тваё пісанне было ўцёкамі ад «хворых» прадметаў. Яны цябе палохалі. І ты ў літаратуры хацеў наблізіцца да іх, разгледзець, абмацаць і абясшкодзіць. Пра рукі пісаў?

О-о! Яшчэ як пісаў! Рука... Адрывае ад цыцкі, карае — і плескачом па задніцы, і папругай, і аплявухай... Жабрак з працягнутай рукою — каго ў дзяцінстве не палохалі: «прыдуць старцы і забяруць»?..

Рука настаўніцкая можа вывесці ў школьным журнале «двойку», пасля якой столькі непрыемнасцяў... Рука доктара абмацвае цябе... Рука дзяўчыны піша пісьмо, ад зместу якога залежыць, служыць табе і радавацца ці застрэліцца або дэзерціраваць... Рука разбівае, трушчыць сківіцы... Рука падпісвае чарговае размеркаванне, якое вызначае твой лёс... Рука ваенкама, якая адным указальным пальцам можа паслаць у Афганістан... Рука адбівае на ваганетцы засаўку, ад якой можа знесці галаву...

Дзявочая рука вылузваецца з тваёй далоні («Рэктар», І частка).

Рука са скальпелем крамсае тваё голае цела. Рука са шпрыцам — можа або даць выратавальны наркотык, а можа пакінуць пакутліва здыхаць.

Начальніцкая рука, якая грукае кулаком па стале, якая можа падпісаць ці не падпісаць кантракт, у апошнім выпадку пазбавіўшы цябе ежы...

І шмат, шмат яшчэ ў якіх іпастасях выступае і якія сімвалы набывае гэтая ўсемагутная рука, ад якой ніколі не ведаеш, чаго чакаць: ці ласкі, ці пакарання! Нездарма ж пры вітанні, знаёмстве першым чынам працягваюць руку.

— Пра ваду, вадкасць, вільгаць пісаў?

Пісаў, адказваю вінавата-пакорліва. Толькі ў маім выпадку вада была хутчэй пераносам на спіртное, кроў і слёзы. І тут жа побач — зноў рука. Калі кепска пасля п'янкі, успамінаеш — хто наліваў? — рука ў таго, значыць, цяжкая... Там, дзе спіртное — вадкасць, там і рукі, і крыкі, і жанчыны, і мацюкі, і кроў («Адзін зімні дзень»)...

— Ты сказаў — крыкі? Стук, шум? Значыць, і яны цябе непакоілі?

«Непакоілі»... Не тое слова. Рэзкія гукі самі па сабе агідныя (кожны, мусіць, заўважаў, як пры нечаканым гуку — напрыклад, сігнале аўтамабіля або асабліва цягніка ў метро, канвульсуе-дрыгаецца, як у жабкі, мышца нагі).

Крык, плач, мацюк, каманды «пад'ём!», «строицца!», «сюда подошел!»...

Канечне, з часам проста бязвінны стук у дзверы мог перарасці, трасфармавацца ў сігнал небяспекі. Тым больш стукаюць заўсёды, як правіла, рукой («Душ», «Ліліт»). Вось паказальны ўрывак з маёй даўняй паэмы «На Каляды ў інтэрнаце».

Раз пачуў я ў дзверы стук,
І падумаў: то Клімчук.
Я схаваў свае паперы,
Расчыніў шырока дзверы,
Паглядзеў туды-сюды,
І ўбачыў: дзве...
Ля маіх дзвярэй таўкуцца,
Матам лаюцца, смяюцца,
Ззаду іх стаіць Клімчук,
П'яны, тоўсты, як вяпрук...

Самае цікавае тут нават не стук, а — «схаваў паперы». Стук — гэта рука, рука заўсёды штосьці просіць, адбірае, патрабуе — як правіла, самае каштоўнае, а што ў мяне было больш каштоўнага за паперы?

— Ежа, яна ж жанчына, яна ж секс, прысутнічалі?

Адказаў бы я вам, дарагі зошчанкавец... Вечны страх, жах, што не дадуць стыпендыі і настане голад!.. Жанчына — якая аб'ядноўвае ўсе 4 раздражняльнікі і ўзмацняе іх у сотні разоў! Жанчына — носьбіт, крыніца, фантан небяспекі, «заражаная бомба» (як у Талстога ў «Крэйцэравай санаце»)... Жанчына — з яе цыцкамі, слязьмі-вільгаццю, наліваннем спіртнога; гэтая ж рука налівае, яна ж абдымае, яна ж адштурхоўвае, можа даць і не даць...

Плач, стук у дзверы, споведзі-аборты, высмоктванне энергіі, навязванне сябе ў жонкі, г. зн., добраахвотна быць, жыць, знаходзіцца ў цеснай сувязі з аб'ектам павышанай небяспекі 24 гадзіны ў суткі, пастаянна! Тут сапраўды ўцячы! зачыніцца! ратавацца пісьменніцтвам, адзінотай, паперай, толькі б не бачыць, не чуць!..

Вось за што б яшчэ абавязкова ўхапіўся зошчанкавец.

Калі я прыязджаў у вёску на канікулы, я заўсёды выдатна адчуваў сябе і, самае галоўнае! — не пісаў, не мог, ды і патрэбы не было. Але чым бліжэй да восені, тым больш разыгрываліся ва мне нейкія неверагодныя немачы. Адзін раз, перад першым вераснем, проста абязножаў. Не змог устаць з ложка. Страшны артрыт абедзвюх ног. А як толькі мінула першае верасня, устаў, як ні ў чым не бывала, і, як у той біблейскай прытчы, не проста пайшоў — пабег. Я ўвязваў гэта то з абвастрэннем армейскіх балячак, то з Чарнобылем («і цяпер наш мірны атам уся Еўропа крые матам»)... Але калі ўлічыць, куды мне трэба было вяртацца (паводле зошчанкаўца) — у набіты дзявочымі целамі гарэм, у месца, якое страшней за перадавую лінію фронту, дык цалкам магчыма, што арганізм наіўна, як мог і ўмеў, не пытаючы дазволу ў дарослага мозгу, прыдумваў свае прычыны, каб адцягнуць тую паездку.

— Усё з табой ясна, — пасміхнуўшыся, сказаў бы зошчанкавец. — Да 40–42 гадоў ты разбіраўся з «хворымі» прадметамі пры дапамозе мастацкіх твораў. І ўрэшце разабраўся. Гэтыя прадметы перасталі цябе палохаць. Яны сталі табе нецікавымі. Літаратура аказалася больш непатрэбнай. Тэма вычарпала сябе.

## 28. Абвяржэнне

Занадта проста, каб быць праўдай. Крыху наіўна, каб цягнуць на «тэорыю шчасця».

Атрымоўваецца, што любы дыскамфорт, любая хвароба па большасці сваёй надуманыя, несапраўдныя, уяўныя, і яны імгненна знікаюць, калі ты толькі падумаеш і прааналізуеш, да каго ідзеш, каго чакаеш. А так як куды б мы ні йшлі, каго б ні чакалі і што б у нас ні балела — сустрэчы з жанчынаю не пазбегнуць; вось вам і разгадка...

Я хацеў з іроніяй (і прашу прабачэння, што гэтага не атрымалася) перадаць вышэйсказанае.

Вялікіх, паталагічных, ці што, комплексаў у сувязі з г. зв. «усіхнымі хворымі» прадметамі я ніколі не адчуваў. Плаваю, як паплавок, — рыбацтва абавязвае быць з вадою на «ты», са спіртным абыходзіцца навучыўся, крыві і слёз набачыўся больш, чым іншыя вады, шум, гул,

стук у вялікім горадзе да таго непазбежны, да таго прытупляе, што хутчэй забаішся цішыні дзе ў лесе, на прыродзе, у адзіноце.

Рука? — трэба проста ведаць, што той, хто «цвёрдую» руку прымяняе, робіць стаўку на кулак — сам няўпэўнены, непаўнацэнны, слабейшы за цябе, і адказаць яму можна або тым самым (калі вы аднолькавых вагавых катэгорый), або смелым позіркам у вочы. І тады кулак абавязкова расціскаецца і ўладальнік «цвёрдай» рукі пачынае больш смяшыць, чым палохаць.

«Не боюсь я обид, ни крутых кулаков, ни воды, ни огня — а при ней словно вдруг подменяют меня...»

Што ж тычыцца жанчыны з яе нагамі і цыцкамі, дык на яе зусім не абавязкова зырыцца, можна ціхенька, апусціўшы вочы, прашмыгнуць міма і за вуглом тройчы сплюнуць.

У перыяд адной са сваіх кантрасных межаў (пра іх мы яшчэ пагаворым), менавіта — у 30 гадоў, я напісаў адну самаабарончую, самаахоўную аповесць «Банальнае дарожнае знаёмства». Дарослыя мае кнігі тады чамусьці мёртва застопарыліся, не выходзілі, і я вымушаны быў адаптаваць яе да дзіцяча-падлеткавага чытва, і вось яна, усечаная, абрэзаная, кастрыраваная, да гэтага часу гуляе па калектыўных зборніках і кнігах «для сярэдняга школьнага ўзросту». Хачу прывесці ўрывачак з яе арыгінальнай.

## 29. «Банальнае дарожнае знаёмства»

...N. падумалася, колькі заходніх фільмаў ён перагледзеў за апошнія гады. Як там усё лёгка і проста! Знайшоў праблему — пазнаёміўся ў цягніку з дзяўчынаю, якая не пакінула свой нумар тэлефона! Ды выйдзі з цягніка, заходзь у любую кавярню — і знойдзеш дванаццаць яшчэ лепшых, якія дадуць не толькі тэлефон!..

«Чаму ж я калупаюся ў гэтым?

Таму, што веру адзіна сваёй інтуіцыі.

Таму, што мяне палохае гэта, мне гэта найбольш цікава; а каму не цікава і каго не палохае гэта — тым горш (ці лепш) для яго...»

І так, паехалі. Секс-матывы калі і ёсць, дык не галоўныя. Вырашэнне супярэчнасцей — важнае, але недастатковае; мала што можа абяцаць жанчына, а потым не выконваць! Не трэба спадзявацца, тады не будзе і расчаравання.

Адкінем яе абяцанні, словы і магчымыя думкі. Возьмем канкрэтнае дзеянне. Учора раніцаю што зрабіла дзяўчына? Яна пайшла. І сёння пайшла. Узнік страх. І ўчора, і сёння.

Значыць, яму не хочацца, каб яго кідалі? Хочацца быць побач? Што ён хацеў узяць ад яе? Выгаварыцца? З такім жа поспехам можна было выгаварыцца і сябрам, і маці, і жонцы...

N. здавалася, што ён круціцца недзе блізка-блізка ад разгадкі. Нешта казала яму, падавала сігналы — «цяплей, цяплей!», калі ён пачынаў шукаць гэтай разгадкі не ў сваім жыцці, а ў сваіх ранейшых творах. Ён зноў пазваў на дапамогу памяць, і ўсплылі перад вачыма старонкі, раздзелы... Што хацелі яго героі ад жанчын? Ад адной — сексу, ад другой — пакаяння, ад трэцяй — усяго толькі тэлефоннага нумара... І побач з гэтым хаценнем заўсёды ішоў страх. Што кепскага рабілі ці маглі зрабіць яго героям тыя жанчыны? Маглі сысці, кінуць іх.

«І тады я пайшоў да Тані, — успамінаў N. свае цытаты, — і бажуся, як толькі пастукаў у дзверы, зайшоў, сеў, павітаўся — уся мая трывога некуды знікла».

«Страшна і незразумела, калі думаеш, што яна бавіць час са мною і цалуе на развітанне...»

«Галоўнае, я падышоў, сеў насупраць — і ўсе страхі мінулі без следу. Як гіпноз. Як п'яніцу з пахмелля трэба гарэлка, так мне трэба яе бачыць увесь час».

«Ён заўсёды панічна баяўся расстанняў...»

Разгадка аж закружыла галаву.

А любімыя песні, якія ён заўсёды мурлыкае пра сябе, едучы на працу ці з працы, або напявае ўголас, калі застаецца адзін?

«Не говорите мне прощай — я это слово ненавижу...»

«Не уходи, побудь со мною...»

«Бывай, абуджаная сэрцам дарагая, чаму так горка? — не магу я зразумець...»

«Я так устала с тобой расставаться, что ненавидеть стала дороги...»

«Давай пожмем друг другу руки — и в дальний путь на долгие года...»

«Самая нелепая ошибка — то, что ты уходишь от меня...»

Яшчэ раней N. усё распытваў маці, які ён быў малы. «Ціхі быў, спаў усё, — адказвала маці неахвотна. — Я з раніцы пайду ў калгас, а ты ляжыш у калысцы, спіш, чакаеш, пакуль прыйду і пакармлю». — «Я заставаўся цэлы дзень галодны?» — «Ну, бацька карміў трохі... Нажуе якога хлеба ў суслу... А то раз баршчом цябе накарміў, у паўгода, ледзь адратавалі. Цэлы месяц у бальніцы з табою ляжала. Уколы табе ў галаву давалі». —«А я плакаў, калі ты раніцаю сыходзіла?» — «Гм, яшчэ як! Як і ўсе дзеці».

Адзін з нямногіх яркіх успамінаў да двух гадоў: калыска, з якой трэба выбрацца. Трэба знайсці чалавека, які ўратуе ад голаду, ад адзіноты. Палачкі з аднаго боку калыскі, аказваецца, можна рассунуць. Можна пралезці ў гэтую дзірку, вываліцца неяк. Удар аб падлогу. Боль, кроў. Прыбягаюць нейкія людзі (бацька?), сварацца, выціраюць кроў, кладуць назад у калыску. На гэты раз палачкі папраўленыя, сядзяць моцна, не рассунеш...

Ежу, ласку, супакой — усё можа даць адзін чалавек. Жанчына. І раптам яна сыходзіць. І дзіця не ведае, на колькі — на гадзіну, на дзень ці назаўсёды?

Дык што: кожнае расстанне з любой жанчынаю — закамплексаваны ў падсвядомасці тых гадоў страх? Не, не кожнае і не з любою. Гэта зусім проста. Страх ад развітання з жанчынамі такога тыпу, якія нагадваюць N. маці. Якія словамі ці дзеяннямі пачынаюць клапаціцца пра яго, выказваць сваю прыхільнасць, любоў да яго.

Ён патрапляе ў залежнасць ад іх. Пакуль яны побач, яму спакойна. Пакуль яны побач, ад іх можна ўзяць штосьці...

## 30. Сыход

Возьмем штосьці ад гэтага і мы.

Вылучым адзін «хворы» прадмет, які нават не столькі назоўнік, а хутчэй дзеяслоў — УХОД, гэтае дзіўнаватае, страшнаватае слова, якому нават вартага адпаведніка няма ў беларускай мове, у нас яно набывае нейкае двухсэнсоўнае, біблейскае, містычна-міфалагічнае, ледзь не злавеснае значэнне — адыход, пакіданне, уцёкі, знікненне... Карацей, СЫХОД.

Вось гэта ўжо сур'ёзная Тэма. Хаця б таму, што сутыкнуцца з ёю давядзецца кожнаму і яе не пазбегне ніхто.

Пайсці, развітацца, кінуць... Пастаянныя сыходы, палоханне імі, пагроза іх, непазбежнасць іх — маглі ў маленькім жывёльным мозгу стварыць ілжывыя сувязі, стаць умоўным рэфлексам, які частым паўтарэннем, перыядычнасцю замацаваўся ў дарослай псіхіцы і пачаў выклікаць неўсвядомлены страх, памножаны яшчэ веданнем таго агульнага, непазбежнага, канчатковага Сыходу, што таксама пачынаецца на літару «с».

Цяпер нам крыху больш зразумелыя паводзіны героя «Аднаго летняга дня», яго ўцёкі ад дзяўчыны — тая ж самабарона ад будучай роспачы расстання: усё адно лета скончыцца, Анжэла паедзе, СЫЙДЗЕ — дык лепш не даводзіць да такога, уцячы, уратавацца, не прывязвацца да яе!

## 31. Прымакі і жарцікі

Мне два гады. Хата. Зімні вечар. Грубка гарыць, ціха патрэсквае, скача ад яе жоўтае святло па падлозе. Так цёпла, здорава, такая ўтульнасць, я яе так люблю!..

І трэба ж — чужы чалавек сядзіць на ўслончыку перад грубкаю. Толькі глядзіць не на агонь, а ў маленькае кішэннае люстэрка. У другой руцэ — грабеньчык. Гэты чужы чалавек усё глядзіць на сябе ў люстэрка, то адным бокам паварочвае галаву, то другім, расчэсвае вусікі, бакі, папраўляе чупрынку. Маці стаіць каля парога і закрывае рот краем хусткі.

— Не знаю, не знаю, усе гавораць, што карасівы, — кажа чалавек, любуючыся на сябе ў люстэрка.

— Вой, нашто мне твая красата! Я вас, мужчын, баюся! Ты п'еш, курыш... Можа, біцца будзеш. Свайго такога пахавала, дык хоць свет убачыла!

— Не магу паняць, чым я вам не карасівы, — гне сваё прымак.

Божа, які дурны. Нават я, малы, разумею, — справа ж не ў тваіх вусіках.

— І нашто я табе з двума дзецьмі?! От пажывеш, пакуль сала скончыцца, перазімуеш ды пойдзеш, а мне яшчэ дзіця зробіш!

— Не знаю, не знаю, чым я вам не нараўлюся...

На мяне ён ні разу за паўгадзіны нават не зірнуў, не спытаў, як завуць — як і няма мяне ў хаце!

Гадоў пяць яшчэ, аж пакуль я не пайшоў у школу, над нашай хатай вісела дамоклавым мечам гэтая прымакоўская тэма.

«А мо ўзяць каго? — уголас разважала маці. — Калі я прымака вазьму, не будзеш яго баяцца?»

«Удавец нейкі сватаецца, з трыма дзеўкамі, чорт яго хваробу знае... Гэта ж ісці ў чужую хату, ды варыць ім, ды абмываць, а ў яго свае дзецi, ён жа захоча ім смачнейшы кусок... ды адзець прыгажэй...»

У дзяцінстве білі мяне мала, пакаранне было іншым:

«Вось пайду замуж, будзеш ведаць, як маткі не слухацца! Кіну цябе, тады пабачыш!» — і накіроўвалася да дзвярэй, і збіралася нібыта выходзіць.

Альбо такая гульня: «Калі я памру — будзеш мяне шкадаваць? А як ты будзеш плакаць, калі мяне закопваць будуць?»

Гэта былі звычайныя, усіхныя жартачкі маладых вясковых матак са сваіх дзетак — гэткая своеасаблівая праверка на любоў. Прынамсі, у нашай вёсцы ў кожнай сям'і, у кожнай хаце перыядычна чулася:

«А вось кіну! а вось пайду! будзеш тады ведаць — застанешся сам!» Але ў тых сем'ях былі бацькі — як ураўнавага; бацька мог цыкнуць на такую «зарвавшуюся маман» і супакоіць дзіця, што нікуды яна не пойдзе, бо іначай ён выцягне папружку і пакажа ёй такі паход...

Гэта па-першае. А па-другое, калі б не гуляла, не забаўлялася мая маці (як бы ні хіхікалі ў Інтэрнеце і за маёй спінай пра маё самалюбаванне) з будучым творцам, з ненармальна-ўражлівым дзіцём, схільным з аднаго боку ўсё перабольшваць, а з другога — усяму верыць, у самы ранні перыяд фармавання яго псіхікі.

Маленькае сэрца аблівалася крывёю. Кожны стук у дзверы, чужыя крокі ў двары, рып веснічак, гаўканне сабакі на чужога адбівалася, адкладвалася ў галаве, замацоўвала ўмоўны рэфлекс: ідуць па маці, забіраць яе, а разам з ёю — ежу, ці самі хочуць уварвацца сюды, пасяліцца, заняць месца, нашкодзіць, адабраць, не даць, пакараць...

Гэтая карціна — што маці або пойдзе сама, або яе забяруць, або з'явяцца тут іншыя, чужыя людзі, і я буду забыты — так урэзалася ў свядомасць, так успрыняў я гэта сур'ёзна, без усялякіх жарцікаў, так з гэтым зміры́ўся, што міжволі вымушаны быў шукаць выйсце, каб выжыць, калі застануся сам.

Даведзены да крайнасці пастаянным страхам, нічога не разумеючы, маленькі дзікун кіраваўся жывёльным інстынктам самазахавання: раз так стаіць пытанне, калі ўжо сыход непазбежны, дык, можа, варта мець некалькі матак? На той выпадак, што хоць нехта застанецца, калі іншыя кінуць?

Адзін мой сябар (дарэчы, псіхолаг па спецыяльнасці) са здзіўленнем заўважыў: «Слухай, для сваёй камплекцыі, пры тваіх фізічных дадзеных у цябе проста нейкая неверагодная колькасць любоўных гісторый!»

Яшчэ б. Гэта былі падсвядомыя пошукі дублёршы, запасной, статысткі... Ды і на самой справе — усё далейшае жыццё, нібы знарок, падсоўвала мне факты пацвярджэння маёй праваты, і яны яшчэ больш замацоўвалі ўмоўны рэфлекс, ператвараючы яго ўжо ў поўны комплекс. 99 % маіх знаёмых дзяўчат ці жанчын праробліялі са мной наступнае:

«Ты будзеш мяне згадваць, калі мы расстанемся?»

«Ты дастаткова моцны, калі я табе аб'яўлю, што кахаю другога?»

«А што ты будзеш рабіць, калі я, напрыклад, разаб'юся ў аварыі?»

«Калі я выйду замуж, ты... нічога з сабой не зробіш?»

«Ты мужны, праўда ж? — калі я, ну, напрыклад... раптам так складзецца, што я пайду ад цябе?»

«...Будзеш успамінаць мяне?»

«...Будзеш шкадаваць?»

## 32. Апошні сыход
## (Смерць маці)

«Памрэ маці — і мяне не стане», — упарта, са сваёй цвёрдай, рашучай інтанацыяй паўтараў Шукшын, ці то маючы на ўвазе, што ён таксама фізічна памрэ, ці тое, што ён скончыцца як пісьменнік, што знікне крыніца яго творчасці, стымул яе.

Смерць маці сталася амаль маёй смерцю. Нібыта яна, маці, усё ж такі здзейсніўшы свой галоўны сыход, у каторы раз прыняла на сябе тое, што было наканавана мне — памерла замест мяне, каб я невядома для чаго жыў далей.

Вузенькая, маленькая, убога-кранальная магілка (неверагодна падобная на Мапасанаву, як і ўсе бедныя магілы адна на адну падобныя) лягла бяздоннай мяжой паміж маім папярэднім жыццём і будучым існаваннем.

Да 45 гадоў, здавалася б, можна было сябе зацугляць і разабрацца з дзіцячымі комплексамі, прымірыцца з тым, што ўсе, да каго прывязваешся, абавязкова так ці інакш сыходзяць — або з майго жыцця, або з жыцця наогул. Тым больш, што галоўны сыход — маці — адбыўся, і нібыта няма чаго больш баяцца.

Вось тут якраз і памылка: час не лечыць комплексы, не пазбаўляе ад іх, а наадварот, накапліваючы, павялічвае іх і ўзмацняе.

Тэма сыходаў толькі абвастрылася. Яны ўсё большалі, усё множыліся — каскад сыходаў, снежны ком іх, лавіна іх; ужо не смаркатае дзяўчо кідае цябе, а Сыход, як рэальная, канкрэтная непазбежнасць, набывае свой злавесны сапраўдны сэнс — Смерць.

А што такое сыход Быкава, Сыса, Скрыгана, Асташонка, Пісьмянкова, Навуменкі, Брыля, Віткі, Сачанкі, Шамякіна?.. Што такое смерць Варановіча, Дайліды, Адамчыка?.. Многіх, многіх іншых?

Гэта лепшыя мае чытачы. Якія нічога майго друкаванага, а падчас і вуснага не прапускалі, якія не скупіліся на пахвальбу, дзеля якіх варта было адштукоўваць да бясконцасці словы і сказы. З якімі падспудна можна было спаборнічаць, прычым без асаблівай рызыкі прайграць — усё табе даравалася як меншаму, малодшаму.

Гэта лепшыя мае рэдактары. Самыя справядлівыя мае крытыкі. Што ж дзіўнага, што разам з іх сыходам, з іх знікненнем пачаў знікаць і стымул пісання? Нібы не проста жывыя, тленныя людзі пакідаюць цябе, адыходзяць у нябыт, а пакідае цябе твая маладосць і тваё жыццё, і вось ужо адчуваеш, як пакрысе, памаленьку, з кожным днём сам сыходзіш, як тая вёска ў Купалы, «з яснай явы»!..

## 33. Ружовыя акуляры

Вось цяпер нам крыху лягчэй. Цяпер мы можам паспрабаваць падступіцца да адказу на пытанне: чаго чалавек да 42 гадоў пісаў і быў шчаслівы гэтым, а потым узнікла апатыя і нават агіда да літаратуры?

Гэта была няроўная барацьба з Часам. Дзіцячае, наіўнае жаданне такім чынам перастрахавацца, абараніцца ад непазбежных, страшных, пастаянных Сыходаў.

І літаратура — выдумка, фантазіі — бачылася адзінай магчымасцю змагання з Часам і з Сыходамі (у тым ліку і з уласным сыходам). У пісанні, на паперы Час можна было не проста спыніць, зафіксаваць — яго можна было нават павярнуць назад.

Літаратура так трывала і так рана ўвайшла ў жыццё, што стала не проста звычкай, а амаль біялагічнай патрэбай — як есці, спаць, дыхаць.

Непазбежна трэба было прыйсці — і прыйшоў — да казуістыкі, што рэальнае жыццё — гэта пабоі, небяспека, міліцыя, жаночыя здрады, абразы, недавер, хлусня, беднасць, прыніжэнні, выжыванні, боль, кроў, аперацыі, бальніцы; што рэальнае жыццё — «кніга, поўная трывог, падманаў, гора і зла», і рана ці позна аграмадныя, бязлітасныя колы накрыюць, раструшчаць і пацягнуць у жудасную, беззваротную цемру, і будзе прыгаворваць мужычок, працуючы над жалеззем, бязглуздыя словы па-французску...

А таму к д’яблу яго, вашае рэальнае жыццё! — лепш добраахвотнае вар’яцтва, ружовыя ці любога іншага колеру акуляры, лепш жыць ілюзіяй, імітацыяй жыцця, «ценямі ценяў», лепш проста гуляць у яго! Ды яшчэ і вялікае пытанне: можа, акурат г. зв. «рэальнае жыццё» і ёсць міф, абсурд, вар’яцтва (тысячы таму доказаў), а творчасць — самы сапраўдны, нармальны, прадукцыйны і пазітыўны стан?..

## 34. Кантрасныя межы, або «У люстэрка паглядзі»

Ёсць межы асноўныя, усім зразумелыя, шаблонныя: паміж небыццём — маленствам, маленствам — дзяцінствам, дзяцінствам — падлеткавасцю, падлеткавасцю — юнацтвам, юнацтвам — сталасцю, сталасцю — старасцю, старасцю — смерцю (небыццём).

Аднак поўна яшчэ межаў некантрасных, паўтанальных, невыразных. Пра аднаго і таго ж чалавека, якому 40 гадоў, можна сказаць «малады чалавек», «мужчына ў росквіце гадоў», «здаровы бугай», а можна пра яго ж — «дзядзька на пятым дзясятку», «малады дзед», «лепшае сваё ўжо аджыў»...

«Мужчына ўсведамляе гэты працэс (старасці) толькі тады, калі па звычцы пачынае «клеіць» маладую дзеўку, а тая яму: «Ты на сябе ў люстэрка паглядзі, казёл стары!»

Гляне — і праўда, казёл, аб чым і раней здагадваўся, але што стары — нечаканасць»... (А. Аблажэй).

Вось яшчэ ў чым справа. Канечне, і ў гэтым. На мяжы 45 гадоў чалавек проста старэе. І, натуральна, нічога дзіўнага ў тым, што творчасць у якасці псіхатэрапіі перастае памагаць. Яна сутыкаецца з новым, невядомым дасюль перыядам: сталасці, пачатку старасці.

Скончыўся запас уражанняў, вычарпаўся матэрыял, разам са смерцю маці памерла маленства, якое падпітвала душу, разам з лавінай сыходаў старэйшых пісьменнікаў знік стымул, які жывіў розум і фантазію... Узніклі новыя пытанні і запатрабавалі новых адказаў. А я аказаўся не гатовы. На той выпадак хапала іншых — маці, братоў, сватоў, старэйшых калег-пісьменнікаў, увогуле старэйшых за мяне знаёмых і незнаёмых людзей, якія мяне заўсёды акружалі, якіх было так многа! Вось хай яны і думаюць, і ўсё на сваіх плячах нясуць, і «куда идти в лесу» гукаюць.

...І праўда — ішоў сабе лесам, сярод такіх мілых, родных, надзейных, сваіх з маленства бярозаў ды соснаў... Дзе трохі задумваючыся, дзе весела пасвістваючы, дзе нагінаючыся над грыбам, дзе зрываючы кветку, дзе задзіраючы галаву на неба, дзе спатыкаючыся аб корань... Ішоў па жыцці, мала пра што дбаючы, а калі ўзнікалі праблемы, дык адносна лёгка спраўляўся з імі пры дапамозе паперы і ручкі.

А лес усё радзеў, радзеў... І вось разлыпіў вочы — і ўбачыў, што лесу вакол амаль няма, азірнуўся — а ззаду толькі пні ды чэзлыя, хворыя дрэўцы, а наперадзе — цаліна, пустка, парослая быльнягом ды чартапалохам, за якімі, праўда, новы лес, але да яго ўжо не дапасці... А хочаш не хочаш — ісці трэба, а так неахвота, так страшна, бо «мы не хотим шагать — нам хочеться гулять!»

## 35. Эпілог трэцяй часткі

Заўважана, што розныя споведзі, аўтабіяграфічныя раманы, рэвізіі, успаміны, жыццяпісы, мемуары, межы, падвядзенні рысаў, выбраныя месцы з перапіскі з сябрамі і інш., інш. з'яўляюцца тады, калі пісьменнік пачынае выпісвацца як мастак. Інакш кажучы, у яго творчы крызіс.

І даволі часта пісьменнік, сутыкнуўшыся з такой непрыемнай штукай, палохаецца, перастае ў сябе верыць, пачынае згасаць, сла-

бець, хварэць, співацца і ўрэшце знікае як творца яшчэ пры жыцці, а то і памірае ў прамым сэнсе.

А бывае — і нас, канечне, цікавіць менавіта гэты варыянт, што пісьменніку ўдаецца абдурыць прыроду. Мы маем мноства прыкладаў, калі дзякуючы такім споведзям, такому вымятанню сусекаў, падвядзенню нібыта заключнай тлустай рысы пад сваім ранейшым жыццём і творчасцю ў пісьменніка раптам узнікала другое дыханне, з'яўлялася невядома адкуль энергія, і ўжо на іншым, больш высокім узроўні ён пачынаў ствараць новыя мастацкія рэчы.

Нам даспадобы менавіта гэты варыянт.

Праўда, для пачатку трэба абжыцца ў новым месцы. Агледзецца. Паазірацца. Раскласці свае транты. Асвоіцца ў гэтай субстанцыі, у гэтым невядомым дасюль замежным свеце.

І калі новыя творы не выспеюць, не з'явяцца, не папросяцца з душы — што ж, будзем суцяшацца тым, што маем. А маем мы тое, што ведаем праўду, і не баімся ўслых яе назваць, і можам спакойна, без шуму і пылу, без лішняга ныцця, скаргаў і запояў (гэтых памінак па самім сабе), без каляровых акуляраў і розных кантактных лінзаў глянуць рэальнаму Жыццю ў вочы.

Бо і проста жыць — замыкаючы пачатак і канец рамана — фізічна існаваць, выжываць у нашым свеце і ў нашых умовах насуперак усяму — гэта, можа быць, і ёсць найвышэйшы на зямлі талент, самая складаная з усіх магчымых навук, творчасць яшчэ тая, мастацтва ўга якое! — прынамсі, ку-у-ды важнейшае за ўменне закруціць сюжэт, выпісаць характар або малюнак прыроды ці зрыфмаваць «паненка — Федарэнка»...

*2008–2009 гг.*

# Апавяданні



## ГАЛЯ

Ігар Снарскі ажаніўся на апошнім курсе, у канцы мая, — ажаніўся, як сам ён тлумачыў, нібы апраўдваўся, свайму сябру, рэдактару інстытуцкай сценгазеты, — «проста каб ажаніцца, каб неяк інакш пажыць...» Але нашто трэба было тлумачыць, апраўдвацца? Ігару было 25, Галі, яго нявесце, — 22, яны вучыліся разам у політэхнічным інстытуце, у адной групе, жылі ў адным інтэрнаце, а быў самы разгар спякотнага мая, калі дні стаялі млявыя і здаваліся нейкімі расплаўленымі, як асфальт пад нагамі, калі вечары пахлі летняй зямлёй, маладой травою, маладым лісцем старой грушы, што расла каля інтэрната і верхнімі галінамі даставала да самага Галінага балкона, з душнымі чорнымі начамі, калі коўдра ліпне да цела, і варочаешся, глядзіш у столь і не можаш заснуць — не памагаюць расчыненыя насцеж балконныя дзверы і акно... што ж тут дзіўнага, што маладыя людзі такім часам пакахаліся і захацелі хутчэй пажаніцца?

Але і цяпер, і асабліва пасля, месяцы праз два, успамінаючы той душны май, Снарскаму кожны раз рабілася сорамна і хацелася ў думках апраўдвацца і спрачацца з кімсьці, хто нібыта казаў: «Ды ты з Галяю за ўсю вучобу не перакінуўся і дзясяткам слоў, вы не кахаліся, не сябравалі, не гулялі; не было і не магло быць паміж вамі нічога таго, што збліжае і пасля чаго жэняцца... Усе ж бачылі, а ты і ведаў, што ты: сімпатычны — табе не раз даводзілася гэта чуць, — спакойны характарам, разумны, начытаны — выкладчыкі пры ўсёй групе гаварылі гэта... А Галя — нудная, непрыгожая, падобная на худога вераб'я, за ўсю вучобу з ёю не гуляў ні адзін хлопец; ты ж сам, Снарскі, сказаў пра яе неяк на першым курсе, на бульбе: «Такой толькі красці добра — украдзе, і не апішаш, вока ні за што не зачэпіцца»... Ты ажаніўся сілком, і значыць, нешта тут не так...»

І хоць гэта была праўда і сам Снарскі добра ведаў, што «тут не так», усё роўна ў думках яму хацелася спрачацца з некім і даказваць,

што ажаніўся ён, як і ўсе людзі жэняцца: каб змяніць жыццё, пажыць у сям'і... У іх з Галяю былі амаль аднолькавыя тэмы дыпломаў, і ён некалькі вечароў прасядзеў у яе пакоі, перачэрчваў генплан — часта добра дапазна, калі ўжо Зоя, Галіна сяброўка, якая пісала вечарамі шпаргалкі па супрамаце, пачынала пазяхаць, пацягвацца, распраналася пры Снарскім і клалася спаць. Тады Галя тушыла вялікае святло, уключала электрачайнік, Снарскі выходзіў на балкон, закурваў, хутка Галя выносіла шклянку гарачай гарбаты, і пакуль Ігар піў і выкурваў цыгарэту, яны трохі гаварылі. Непрыгожая, але ціхмяная, добрая Галя была для яго не дзяўчына, а так, нешта бясполае, чалавек, які памагае яму рабіць дыплом, таму Снарскаму лёгка было з ёю і можна было гаварыць абы-што. У адзін з такіх вечароў, позна, Снарскі, размінаючы ў пальцах цыгарэту, выйшаў на балкон. Стаяла цяплынь і пахла вёскаю. Унізе, пад грушаю на лаўках, свяціліся цыгарэты, смяяліся, а тут, зусім побач, у лісцях грушы, шапацелі хрушчы, лыталі з гудзеннем вакол галін і паўз балкон, і нават чутно было, як яны недзе ўнізе падаюць у мокрую ад расы траву. Выйшла Галя, паставіла на падаконнік каля Снарскага шклянку гарбаты, перавесілася цераз край балкона і пачала махаць рукою, каб злавіць хрушча на ляту. Унізе кінулі ў сцяну пустую пляшку, і яна ляснула, нібы граната.

— Як падумаю, што скора з'язджаць з Мінска, дык страшна, — сказала Галя, — здаецца, лепш бы зусім не паступала... Толькі пажывеш, пабачыш жыцця — на: едзь, прападай...

Снарскі ўсміхнуўся — у цемры не было відаць — «пабачыла жыцця»! Што ты бачыла тут за пяць гадоў? Хіба што гэтае боханне пустых пляшак аб сцяну пад балконам... Але трохі і шкада яе стала.

— Хто ж цябе гоніць? Не едзь, не прападай, — сказаў ён, маючы на ўвазе вольныя дыпломы, якія цяпер пачалі даваць усім, хто хоча. — Шукай работу і аставайся ў Мінску.

— А што, магла б і астацца... Калі б выйшла замуж. У мяне тут у Мінску брат жыве, у трохпакаёўцы, кааператыўнай, і калі б я выйшла замуж, ён размяняўся б. На адну і дзве. І адну перапісаў бы на мяне.

— Як гэта?

— Так. Я ж прыпісаная ў іх з першага курса.

— А чаго ты ў іх не жывеш?

— Так. Тут весялей.

Яна зноў пачала лавіць хрушча, і відаць было, што сказала яна толькі каб сказаць — без нейкае мэты, у мінулым часе, як нешта даўно перадуманае і пражытае.

Вярнуўшыся тым вечарам да сябе, Снарскі сярэдначы палез у душ, доўга плёхаўся ў халодным струмені, потым выходзіў на балкон, курыў, і калі ўжо лягаў спаць, падумаў раптам: «І дурань жа ты будзеш, калі не ажэнішся! Так б'юцца, так чапляюцца за гэты Мінск, а табе само плыве ў рукі; жаніся — і жыві адным днём, а там усё само сабою зробіцца, як і дагэтуль рабілася!..»

* * *

Сапраўды, Ігару Снарскаму заўсёды шэнціла. Да апошняга курса інстытута, да самага праклятага сакавіка, жыццё яго не ішло, а кацілася — як па масле, роўна, гладка, без трагедый і нават без простых непрыемнасцей; адзінае, калі яму перад прызывам у армію няўдала вырвалі зуб, ад чаго загнаілася дзясна і потым яе пад замарозкаю рэзалі і чысцілі, — але не станеш, папраўдзе ж, лічыць гэта за нейкую трагедыю! Аднойчы, ужо на апошнім курсе інстытута, Снарскі афармляў да 8-га сакавіка сценгазету і зацікавіўся вершам, падпісаным ініцыяламі. Ён чамусьці адразу здагадаўся, што аўтар — жанчына. Верш напісаны бойка, з элементамі лёгкай сексуальнасці ў стылі Сашы Чорнага, нешта «ты прыйдзі да мяне» і «к пене бедер за алой подвязкой ты не бойся устами припасть...» Сябра, белабрысы рэдактар сценгазеты, хлопец хоць і малады зусім, але які ўсё пра ўсё і пра ўсіх ведаў, калі Снарскі паказаў яму верш і нагадаў пра Чорнага, засмяяўся.

— Дык у Чорнага — алегорыя, а тут — чаго хочацца, пра тое і пішацца! Пазнаёміць?

— А хто такая?

— Завочніца, з нашага інстытута. Але глядзі, Снарскі, ведай, што, па-першае, яна замужам, за нейкім шафёрам, якога, вядома, «имела в виду» — выскачыла толькі з-за прапіскі, па-другое, гуляе ў адкрытую і, самае галоўнае, яна здаровая, прыгожая, вульгарная самка, якая пляваць хацела на ўсё, што не мужчынскае цела. А такія вершы так і пішуцца — ты абсалютна правільна згадаў Чорнага — радок пазычаецца ў Чорнага, рыфма — у Белага, камбініруецца... — І белабрысы рэдактар расказаў, як пішуцца такія вершы: у літаратуры ён, як і ва ўсім, разбіраўся і любіў і ўмеў пагаварыць пра гэта.

Праз некалькі дзён на вечарыне да 8-га сакавіка сябра паказаў Снарскаму аўтарку, і той уразіўся — яна знешне аказалася акурат такая, як ён сабе і ўяўляў: высокая, чарнявая («з надзвычай развітымі жаночымі формамі», — падумаў Снарскі), у кароткай

сукеначцы, яна была, відаць, п'янаватая, голасна гаварыла і смяялася, танцавала з усімі, хто хацеў. Усім сваім выглядам яна паказвала даступнасць. Калі адышлася да дзвярэй і закурыла, не зважаючы на выкладчыкаў, белабрысы падвёў Снарскага і пазнаёміў; яна паволі, як купец аглядае тавар, агледзела Ігара з галавы да пятаў... У яе быў даволі прыемны тварык. У паўсонных, і ад таго мяккіх, кашэчых вачах Снарскаму прачыталася: «Я такая, як ты і думаеш, і як вы ўсе думаеце — і чорт з вамі! Калі хочаш — тады смялей. І ўсё маё тое, на што так прагна глядзіш, будзе і тваім. Хочаш? Тады смялей!»

І Снарскі стаў смялей. Яны патанцавалі адзін танец, потым яна, апусціўшы вочы, зняўшы яго руку са свайго пляча, сказала ціха: «Хадзем, дасі іголку, у мяне капрон наназе парваўся». Калі ішлі да інтэрната, Снарскі, ступаючы за ёю след у след — ноч была адліжная, сакавіцкая, і снег быў расквашаны, у глыбокіх слядах — круціў у галаве: «Як баран пад абух...» Самае цікавае, што капрон сапраўды аказаўся падраты...

Раніцай ЯНА, напяваючы, выходзіла з душа, сядала за стол, даставала з касметычкі туш, памаду, а ён, не вылазячы з-пад коўдры, шчасліва-раздушаны, глядзеў на ЯЕ з сабачай адданасцю і раптам сказаў неакрэплым са сну голасам: «Калі мы зноў пабачымся?» — на слове «пабачымся» пусціўшы пеўня, і закашляўся. ЯНА засмяялася, сказала строга, не павярнуўшыся: «Ну, а яшчэ што выдумаеш?» «А што?» — «А то, што я замужам». На добры розум, з гэтага ўсяго можна было толькі пасмяяцца, але ў Снарскага ў тыя хвіліны не магло быць добрага розуму. Да яго дайшло раптам, што белабрысы казаў праўду, і ён, Снарскі, звычайны, на час, кліент, якім «числа несть», і, самае жахлівае, кліент не з лепшых.

Перажываў ён страшна: злосць, пяшчота, адчуванне сваёй знявагі, жаданне зняважыць ЯЕ, помста — усё мяшалася... То хацелася забіць ЯЕ, то абагаўляць, то перажыць яшчэ адну такую ноч — а там хоць хай бы забівалі яго самога... Трэба паўтарыцца, што жыццё ў яго ішло вельмі роўна, не лічачы вырванага зуба, таму і не дзіўныя былі гэтыя перажыванні.

«Я больш чым упэўнены, што ЯНА яшчэ прыбяжыць — як міленькая!» — думаў, не могучы заснуць, Снарскі, вярнуўшыся ад Галі пасля таго, як яна сказала пра кватэру. І ён ужо ўяўляў сябе жанатым, тут — званок у дзверы, а жонка недзе там, далёка, недзе на рабоце, — а ЯНА стаіць у дзвярах, апусціўшы вочы, як тады пасля танца... Альбо — нечаканая запіска — «прыходзь, я адна, муж мяне кінуў»...

«Ах, муж цябе кінуў?..» Закалыханы, Снарскі пачаў ужо засынаць, як раптам успыхнула перад вачыма тая ноч, бессаромнасць ЯЕ, словы, пакусаныя вусны, рухі, паднятыя поўныя ногі ў чорным капроне — і ўвесь сон адляцеў, як і не было. І зноў, як і каторую ўжо ноч, крыўда, горыч і нейкая шалёная радасць закруціліся ў клубок, але — упершыню — радасці ў гэтым клубку было болей. Жыць як набяжыць — і ўсё само сабою зробіцца!

* * *

І на другі вечар Снарскі, стоячы на Галіным балконе, папіваючы гарачы чай праз цыгарэтныя зацяжкі, сказаў:

— Хелена... (ён быў з Гродзенскай вобласці, і ў іх так звалі жанчын; праўда, ён ведаў, што Хелена — гэта Алена, але, называючы Галю гэтым мілагучным еўрапейскім імем, ды яшчэ ў цемры, яму пачынала здавацца, што не такая ўжо яна непрыгожая і можа нават падабацца) Хелена... — ён узяў яе за руку і не ведаў, што рабіць.

Яе рука дрыжэла.

— Нашто ты сказала мне ўчора пра кватэру? Цяпер ты падумаеш... Я хацеў табе сказаць... але цяпер я звязаны, разумееш? Не магу сказаць таго, што сказаў бы, не ведаючы пра нейкія кватэры...

Яна маўчала. Памаўчаў і Снарскі, проста як актор, адчуваючы, што ў гэтым месцы патрэбна паўза, — памаўчаў, уздыхнуў і сказаў:

— Ты падабаешся мне, Хелена, і калі...

— Ты хочаш сказаць, што хочаш са мною ажаніцца? — спытала раптам Галя.

— Ну.

Яна засмяялася, вызваліла руку і дакранулася да яго пляча.

— Ігар, дурань ты мой мілы!.. Не трэба гэтага нічога. Я ж усё роўна не паверу ніколі, што ты хочаш ажаніцца на мне, а не на кватэры... Хіба я не ведаю, не бачу, што такое я і што — ты?

— Як знаеш...

— Не, ты кажы! — аж замалілася яна.

У Снарскага патухла цыгарэта, і пакуль ён ляпаў сябе па кішэнях, Галя хутка схапіла з падаконніка запалкі і падала.

— Хелена... дзякую... нашто гэтыя комплексы? Ты харошая, добрая дзяўчына, нічым ні за кога не горшая, і дарэмна думаеш, што калі б мы пажаніліся, табе дастаўся б нейкі падарунак, нейкая вялікая цаца... Я ведаю пра сябе, што я не такі, як усе, але не такі ў горшым

значэнні, Хелена. Вось мне дваццаць пяць гадоў, а часамі такое адчуванне, што сем альбо семдзесят; я ж быццам і жыў, і служыў у арміі, і скончыў вось інстытут, а ў жыцці арыентуюся як дзіця ці стары дзед... Я інфантыльны, гультаяваты, грошы зарабляць не ўмею, нічым не цікаўлюся — ты ж сама ведаеш, што за ўсю вучобу я нікуды не вылазіў, не цягаўся ніколі па гэтых чортавых мітынгах, адзін з усёй групы не выйшаў з камсамола — і не таму, што трэба быў мне нейкі камсамол, а проста лянота была некуды ісці і пісаць некія заявы; усе бегаюць, чытаюць газеты, а мне начхаць, што ў нас тут заўтра будзе: капіталізм, камунізм, немцы, амерыканцы — хоць чорт рагаты; для мяне большая трагедыя спазніцца на тралейбус ці атрымаць тройку на экзамене, чым усе іхнія будучыя грамадзянскія войны і дзяржаўныя перавароты, якія не вылазяць з газет... Можа, таму, што мне ўсё ў жыцці ўдавалася? І парушыўся нейкі жыццёвы імунітэт? Я ж гадаваўся адзін, у сям'і вясковых настаўнікаў — песцілі, вядома, голасу ніколі не павысілі, у школе хвалілі ўсе гады, ніхто са мною не біўся ніколі — сын двух настаўнікаў! — але і гуляць чамусьці не хацелі, сяброў не было... Так і ў войску: я маляваў добра, спадабаўся ротнаму, астаўся пасля вучэбкі ў часці, пры штабе — паштальёнам, потым афарміцелем, у каравулах не мёрз, у нарады не ставілі, два гады праляцелі — і ўспомніць няма чаго, і сяброў блізкіх няма... Зараз скончу інстытут, паеду некуды — і тое ж будзе, не знацьму, каму напісаць, хто мне напіша... Я нейкі нелюбімы, Хелена, і сама бачыш — узяць з мяне можна мала што, а прашу я многа... Хочацца простага спакою, утульнасці, крэсла мяккага перад тэлевізарам, лямпы пад сінім абажурам, добрай, ласкавай жонкі — вось як ты...

Раптам, перш чым Снарскі паспеў нешта зразумець і адхіснуцца, яго шыю абвілі худыя, слабыя рукі, а да шчакі дакрануліся няўмелыя сухія вусны — і раз, і другі... Гэта яго так цалавалі!..

— Дурань ты мой... Ты ж сам не ведаеш, які ты... Стой, стой тут!.. — і яна знікла ў пакоі, потым ляснулі дзверы на калідор.

Снарскі, выцершы шчаку, дакурваў, чуў, як у пакоі, побач, варочаецца пад прасцінаю раздзетая флегматычная гультайка Зоя, слухаў смех унізе на лаўках, глядзеў на ярка-зялёную, падсвечаную знізу ліхтаром лістоту грушы, на інстытут, дзе дасюль яшчэ свяціліся вокны, — і нібы па накаце, не могучы спыніцца, расказваў у думках далей: «...хочацца крэсла, чыжа ў клетцы... хочацца ўсяго эгаістычна-мяшчанскага, супраць якога заўсёды так распіналіся, рабілі рэвалюцыі, вялі войны, — а ўрэшце выяснілася, што толькі ў свеце і ёсць разумнага, што гэтае бяскрыўднае мяшчанства...»

У пакоі запалілася вялікае святло, і Галін голас крыкнуў: «Зоя, пад'ём!»; сама яна, задыханая, выскачыла на балкон і сунула ў рукі Снарскаму цяжкую пляшку.

— Адкаркоўвай шампанскае! — ізноў сухія дотыкі на шчацэ. — Толькі шумна — я хачу, каб усе чулі! Усе! — крыкнула яна ўніз.

І заціснула вушы, калі Снарскі, паклаўшы на падаконнік недакурак, пачаў абдзіраць фольгу і адкручваць дроцік.

* * *

На вяселлі, якое згулялі не лепшае і не горшае, чым у людзей — нанятыя таксоўкі, роспіс, фатаграфаванне каля Вечнага агню, заказаная вечарынка ў рэстаране — асабліва ўсім спадабаўся брат маладой (той самы, які дарыў кватэру). Малады, дужы, ён многа і з ахвотаю выпіваў, крычаў «горка!», гаварыў смешныя тосты, шчодра плаціў музыкам за песні — адну «Галю маладую» сыгралі разоў пяць — словам, паказваў усяляк, што весяліцца, гуляе, як і трэба гуляць на вяселлях. Калі надышоў час адорваць маладых, сказаў проста, ціха: «Галінка, я рады твайму шчасцю, і пакуль жыць буду...» — не дагаварыў, згроб маладых у ахапак, расцалаваў і заплакаў. І ўсе ўбачылі, як ён любіць сястру, і неяк цяплей пасля яго слоў і руху зрабілася ўсім за сталом (а спачатку нацягнутасць паміж Ігаравымі і Галінымі сваякамі была, не ўсе ж маглі падараваць цэлую кватэру).

З рэстарана паехалі ў братавую трохпакаёўку — ужо разменену, але з якой пакуль не выбіраліся, афармлялі ордэры. Госці селі ў залі дагульваць, а маладым паслалі ў дальнім пакоі.

І толькі цяпер, калі яны асталіся адныя, да Снарскага, які ўвесь гэты тлумны, душны дзень толькі і чакаў, калі ж усё скончыцца, пачало даходзіць, што ўсё яшчэ толькі пачынаецца. Ён проста выпусціў неяк з-пад увагі, забыўся на самае важнае — што з гэтага дня ён ужо сам сабе не належыць, што цяпер ім з Галяю давядзецца быць разам не толькі ўдзень, але і ўночы. Галя ляжала на ложку, раздзетая, больш чым калі падобная на дзіця альбо на вераб'я, папраўляла на галаве ўзлахмачаныя пасмачкі, глядзела на яго шчасліва і аддана, а Снарскі стаяў, глядзеў у люстэрка на дзвярах шафы і адчуваў сябе злодзеем, што залез у чужы пакой і якога раптам засталі. Хацелася павярнуцца і ўцячы. Але ён перамог сябе, пазяхнуў і прысеў на край ложка каля жонкі.

— Як я хачу спаць... — і прылёг ніцма, у адзенні, тварам у падушку.

Раптам ён уздрыгнуў і ледзь не махнуў рукою, як адмахваюцца ад камара, — чужыя, сухія вусны пачалі дакранацца да яго вуха, шыі, патыліцы...

— Я хачу спаць! — глуха, у падушку, прастагнаў ён, адчуваючы проста фізічныя пакуты. Але сухія дотыкі не скончыліся — жонка цалавала яго...

Снарскі рэзка прыпадняўся і ўперыўся позіркам у вільготныя ад шчаслівых слёз Галіныя вочы. «Зараз я яе ўдару!» — падумаў ён і да болю прыкусіў губу, адвярнуўся да шафы, да люстэрка. Міжволі глянуў на свой адбітак, і раптам з усёй яснасцю яму ўспомніліся іншыя пакусаныя губы, іншы твар і поўныя, у чорным капроне, паднятыя ногі з белай паскай скуры на левай, дзе падраты капрон... У яго сэрца забарабаніла і пахаладзела спіна; ён усхапіўся, выключыў святло, хутка распрануўся, наступаючы нагамі на калашыны, сцягваючы абы-як кашулю, — і, заплюшчыўшы вочы, сціснуўшы сківіцы, уявіў, што лягае не да жонкі, а да зусім іншай жанчыны — да ТОЙ...

* * *

Снарскі чуў ад сяброў, чытаў у кнігах, газетах, што звычайна пасля жаніцьбы жонкі змяняюцца, выплываюць нейкія такія іхнія капрызы, пра якія і здагадацца было цяжка, — але не верыў, што такое можа быць і з яго жонкаю.

Ён і да вяселля амаль нічога пра Галю не ведаў: ну, непрыгожая, вучылася так сабе, духоўна наўрад ці моцна развітая, але добрая, пакорлівая — што яшчэ?.. Калі ж перабраліся ўрэшце на сваю кватэру і пачалі жыць адныя, асабліва пасля абароны дыпломаў, калі Снарскі пайшоў на працу (Галін брат устроіў яго па блату ў канструктарскае бюро), аказалася, не такая ўжо яна і пакорлівая. Не, так яна заўсёды была радасная — проста ад таго, што ў яе ёсць муж, кватэра і ўсё, як у людзей; яна прыбірала, варыла, абмывала мужа, хадзіла па магазінах, сустракала яго з работы і, увогуле, кідалася рабіць усё, што яму хацелася, але Снарскаму непрыемна было, што яна раптам пачала патрабаваць да сябе ўвагі і, галоўнае, падзякі за ўсё гэта — за тое, што, на яго думку, любая жонка любому мужу павінна была рабіць за проста так.

Пасля вячэры трэба было сказаць «дзякуй», але ён забываўся.

— Ну, вось... Ты нічога не забыў?

— Прабач — дзякую. Галіна (Снарскі даўно, адразу ж пасля вяселля забыўся на рамантычную Хелену і зваў жонку па-простаму),

я магу задумацца? Я дзякую табе сто разоў — і напярод, але ў душы дзякую, што лепш, чым па сто разоў паўтараць бяздумна...

Ён браў талерку і станавіўся да ракавіны — прыбіраць за сабою яго таксама прывучыла жонка.

— А пацалаваць? — уздыхнуўшы, як малое дзіця, прасіла Галя. І ён уздыхаў, паказваючы, што гэта хоць і невялікая, але не патрэбная ні яму, ні ёй ахвяра, кідаў недамытую талерку, выціраў рукі, падыходзіў і прыкладаўся на секунду вуснамі да жончынай шчакі. І Галя расплывалася ў шчаслівай усмешцы, сама абдымала яго і пачынала цалаваць сухімі, як заўсёды, вуснамі... Пасля вячэры ён ішоў у залю, уключаў тэлевізар і глядзеў, што б ні ішло, думаючы пра сваё. Але хутка заходзіла жонка і несла гарачыя яшчэ семкі, ці кубачак кавы, ці шклянку халоднага піва... І Снарскі, не адрываючыся ад тэлевізара, сапраўды з удзячнасцю машынальна казаў:

— Дзякую.

— А пацалаваць?

І ён цалаваў — уставаў, адставіўшы каву ці піва, ці высыпаўшы з далоні семкі, адсоўваў крэсла, выбіраўся з-за століка, каб ямчэй стаць — рабіў дзясяткі непатрэбных рухаў, якія адрывалі яго ад тэлевізара, ад думак — рабіў толькі для бяздумнага, машынальнага прыкладання да жончынай шчакі.

— Што табе яшчэ прынесці? — шчаслівая, пыталася Галя.

— Нічога.

— А што табе прыгатаваць на раніцу?

— Нам, татарам, хоць што, — адказваў Снарскі прымаўкаю, якую пачуў у войску ад сапраўднага татарына, — хоць пойла звары...

— Які ты ўсё ж...

— Проста я тысячу разоў казаў: я ведаю, што ўсё, што ты ні зварыш, будзе смачна і добра.

— А можа, я ў тысяча першы хачу пачуць? Мне ж таксама адзінока цэлы дзень, хочацца пагаварыць...

— Ну, давай, — адрываўся ён ад тэлевізара. — Давай гаварыць. Ну, давай, пытайся — я буду адказваць.

— Такім тонам — не хачу... — яна крыўдзілася, сыходзіла на кухню, але праз міг вярталася, прысядала каля яго на падлогу, абдымала за нагу і, гледзячы знізу ўверх, нібы была ў нечым вінаватая і хацела загладзіць віну, ціха пыталася:

— Праўда ж, мы муж з жонкаю?

— Праўда.

— І ў нас будзе свая сям'я, і сваё дзіцятка? Ведаеш, мне трэба шукаць работу, каб потым пайсці ў дэкрэт...

— Праўда, трэба, — казаў Снарскі, стараючыся патроху вызваліць нагу.

Жонка, радая, кідала яго і бегла на кухню, а яму ўдавалася выгадаць пару гадзін адзіноты перад сном. У тэлевізары стралялі і бегалі адзін за адным, а Снарскі заплюшчваў вочы і бачыў сябе ў нямецкай афіцэрскай форме, у вузкіх хромавых ботах — падцягнуты, гнуткі, з ім два аўтаматчыкі, ідуць у канцлагеры, паўз баракі, а каля баракаў доўгімі шарэнгамі, худыя, у паласатых робах, з «хваравітым бляскам у вачах» стаяць яго знаёмыя, сябры, выкладчыкі; усе, калі ён параўноўваецца, цягнуць да яго рукі і крычаць: «Мяне, мяне!» — а ён павінен выбраць, вызваліць адсюль толькі кагосьці аднога... Шурын крычыць: «Я табе кватэру даў, работу знайшоў, дастаў халадзільнік, тэлевізар!», сябры: «Мы табе грошы пазычалі, спісваць давалі!», белабрысы рэдактар сценгазеты: «Я цябе жыць вучыў!», і толькі ЯНА, схуднелая, «але ад таго не менш прыгожая», маўчыць, апусціўшы вочы, ведаючы, што ЁЙ няма чаго і прасіцца... Тады ён спыняецца, падае руку...

— Ігарок, ідзі мыцца! — звала жонка. — Я ўжо вымыла ванну!

Снарскі ішоў, напускаў вады, залазіў у цёплую чыстую ванну і думаў: «Трэба нешта рабіць, пакуль не позна...»

* * *

Кожную раніцу Ігар прачынаўся з думкаю: «Што мне рабіць?! Ну, нельга так больш, і не гэтага я хацеў і чакаў!», — думаў і рабіў тое ж, што і кожную раніцу: галіўся, снедаў, ехаў на працу, дзе сядаў за кульман і чыста машынальна пераносіў на тыпавікі заўвагі, зробленыя на асобных лістках іншымі людзьмі. А між тым неяк незаўважна праляцеў астатак лета і прыйшла восень — гарадская, бедная, без яркіх сваіх фарбаў, без сівых туманаў па лагчынах, без дымкоў з сотак, дзе паляць сухі картаплянік, без паколатых аб свежую пожню босых ног, без шолаху лісця і верасу і без грыбнога паху... гэтая, гарадская, пазнавалася толькі па тым, што каштаны каля дома пажаўцелі, ды раніцы сталі халаднаватыя — ужо не адзенеш кашулі з кароткімі рукавамі, — ды цямнець раней пачало — вось і ўся восень. Пачаліся заняткі ў інстытуце. Цяпер пасля работы Снарскі ўжо не спяшаўся дамоў, да тэлевізара, а пачаў заходзіць у інтэрнат да сябра, белабрысага рэдактара, — тым больш, што нядаўна шурын знайшоў жонцы працу — у сталовай каля самага дому, мыць посуд, і яна цяпер вярталася позна.

Сябар жыў адзін у пакоі: яму, як чалавеку, што мае справы з паперамі, фарбамі, гуашамі, на якім вісіць уся сценгазета і якому трэба разгарнуцца, зрабілі такую ільготу. У пакоі былі тры сталы, і ўсе тры заваленыя трубкамі ватману, кнігамі, пэндзлямі, застаўленыя слоікамі, таму сядалі на ложак, а піва ці віно, якое звычайна прыносіў Снарскі, ставілі на адзінае, парэзанае нажом і заляпанае фарбамі, крэсла.

Гаварылі пра ўсё на свеце, што на язык.

— У мяне цяпер такі перыяд, — казаў Снарскі, папіваючы віно ці піва, — што хоць ты вешайся. Поўная пустата ў думках і няведанне, што рабіць, для чаго жыць... Нашто? Перавесці тоны мяса, хлеба, цыстэрны піва, каб скончыць усё гадоў праз пяцьдзясят, нейк пад раніцу, у анкалагічным аддзяленні, у палаце на чатырох, дзе зачуханы дзяжурны, нядаўні студэнт, злы і нявыспаны пасля ўчарашняй п'янкі, пазяхаючы, адганяючы ад рота перагар, памацае пульс, ногі, зробіць каравым почыркам, дрыжачымі пальцамі запіс у кніжачку, п'яная баба з беламорынаю — а я бачыў такіх у арміі, вазілі неяк хлопца ў морг, б-р-р! — разрэжа жывот, пакалупаецца ў кішках, попел туды саб'е, зашые абыяк, вывезуць за горад, закапаюць — вось і ўсё, што мы знаем... І для чаго тады жыць? Што такое жыццё? Ніхто не скажа.

Белабрысаму такія тэмы падабаліся страшна — як і літаратурныя тэмы, — ён плаваў у іх як рыба ў вадзе.

— Жыццё — ты сам, — адказваў ён. — Даўно і не мною заўважана: як толькі чалавек пачынае задаваць сабе нейкія глабальныя, касмічныя пытанні, так адказ трэба шукаць у маленькай закавырачцы, у драбязе — туфлі ціснуць, жонка кепска варыць, пломба ў зубе не пастаўлена і гэ дэ. У тваім канкрэтна выпадку трэба пастарацца знайсці гэтую драбязу і выправіць, тады само сабою знікне і анкалагічнае аддзяленне, і зашыванне жывата.

Белабрысы думаў, што Снарскі прыходзіць да яго толькі таму, што хоча вывудзіць нешта пра ТУЮ, а ў перспектыве — збіраецца разводзіцца з Галяю і сыходзіцца з ТОЮ, таму і наводзіў яго на «жонка кепска варыць».

— Ну, якія прычыны?.. Усё ў мяне ёсць, усё добра і ўсё неяк само сабою прыйшло: і кватэра, і праца, і абстаноўку ўсю шурын купіў і прывёз — я пальцам не паварушыў, і жонка варыць... Спакою няма.

— Вось і прычына! А ты як хацеў? Не мною сказана: чым больш ты паклаў бы на ўсё гэта сілы, нерваў, крыві, тым больш і цаніў бы. Нездарма ж раней жонак кралі, рызыкуючы жыццём, альбо плацілі за іх выкупы, альбо заваёўвалі на вайне... Мусіць, і табе трэба была б

жанчына, якая дасталася б табе з цяжкасцю — тады б ты больш цаніў яе і думаў бы не пра анкалогію праз пяцьдзясят гадоў, а пра тое, як яе ўберагчы праз пяць дзён...

— Усе аднолькавыя, — казаў Снарскі і чырванеў.

— Не ўсе. Кажу смела, бо добра ведаю пра тваё восьмага сакавіка і добра ведаю, прабач, Галю, жанчыну, якая не роўня табе ні духоўна, ні, прабач, у фізічным, сексуальным плане...

— Давай вып'ем, хопіць... — Снарскі і сам ведаў, што Галя духоўна бедная і не пара яму, але непрыемна і чамусьці сорамна было чуць гэта ад іншых.

Выпівалі. Сябар, як большасць творчых людзей, п'янеў хутка і ад малых дозаў, яму рабілася ўжо нецікава падыгрываць Снарскаму, і ён гаварыў толькі пра сваё — пра літаратуру і нелады з рэдакцыямі, якія рэгулярна вярталі яму назад творы. Тады голас яго рабіўся нервовы і рэзкі, быццам ён спрачаўся з кімсьці, вочы рабіліся вузкія, а пальцы сціскаліся ў кулак.

— Што такое літаратура? Тое ж, што і жыццё, — гэта мы самі! І ты, і я, і ўсе мы! А хто можа быць суддзёю ўсім нам? Бог, цар, воінскі начальнік ці рэдактар — хто? Вось паслухай... — ён кідаўся да сталоў, корпаўся ў нейкіх лістках і, адшукаўшы, пачынаў зачытваць верш — блытана, не разбіраючы свайго ж почырку. — Ну, як? — прачытаўшы, пытаўся і не зводзіў з Ігара вачэй, а калі той крышку марудзіў, белабрысы бялеў.

— Нармальна... — няпэўна адказваў Снарскі, які любіў толькі школьную хрэстаматыйную класіку і зусім не чытаў літаратуры сучаснай. Зрэшты, адзін радок і з вершаў белабрысага яму падабаўся: «Ты проходишь, власть Советов, словно с белых яблонь дым!» — Па-мойму, добра, — казаў ён.

— Праўда? — радасна перапытваў белабрысы. — А там, — махаў ён некуды рукою, — не нармальна! Прастаты мала! А калі нехта скажа — прастаты многа? Вучыцеся ў класікаў! А што такое класікі? Я Валодзя Навіцкі, а ён Якуб Колас — вось і ўся, у прынцыпе, паміж намі розніца!..

— Так, ты жывеш гэтым, у цябе ёсць нешта наперадзе, і, вядома, даб'ешся свайго, — казаў Снарскі, бачачы, што ўсё выпіта і што ўжо нярана. — А ёсць людзі, якім нічога не трэба, нічога не цікавіць... Ну, пайду.

Снарскі выходзіў, сядаў яшчэ на хвілінку на лаўку пад грушаю — цяпер голаю, з абламанымі галінамі і з высахлымі чорнымі грушкамі на самай вяршаліне, да якіх не дабраліся, — сядзеў, успамінаў... Потым ехаў тралейбусам дамоў і ўяўляў, што едзе ў «мерседэсе»

ў форме нямецкага афіцэра, у акулярах з залатымі дужкамі, пад'язджае да нейкага пад'езда, чакае, чакае; праз міг выходзіць ЯНА, з нейкім клуначкам у руцэ, спалоханая, заплаканая, глядзіць на яго як пабіты сабака, гатовы альбо кінуцца лізацца, калі пагладзіш, альбо ўцякаць, калі замахнешся...

* * *

Неяк увечары, перад выхаднымі, пасля паходу да сябра Снарскі вярнуўся дадому позна, але жонка не сустрэла яго, як заўсёды, калі раней прыходзіла, не выбегла ў пярэднюю, хоць сама была дома: паліто вісела, туфлі стаялі... Снарскі распрануўся, доўга мыў рукі, плёхаўся, прыслухоўваючыся, і не мог зразумець, што гэта з ім, чаго ён баіцца абазвацца, баіцца заходзіць у залу ці на кухню? Яму здалося раптам, што жонка ведае і ведала заўсёды, чым ён жыве, толькі прытваралася пяшчотнай і закаханай, што зараз усё выясніцца, яна выскачыць аднекуль з кухні з мокрай анучай у руках, заплаканая, раз'юшаная, і пачне лупіць яго гэтай анучай па чым папала... Трэба ж — ён, аказваецца, дапускаў і такое!..

Але жонка сядзела ў зале, у крэсле, і проста спала. Снарскі стаў пераапранацца. Яна прачнулася, падхапілася, падбегла да яго, абняла і дакранулася да шчакі сухімі, як заўсёды, вуснамі.

— Ты еў?

— Ты ж бачыш, што я толькі прыйшоў, — і Снарскі вылузнуўся з абдымкаў, паказваючы, што проста нязручна абдымацца, калі кашуля да палавіны знятая.

— А ты не забыўся, што заўтра?..

— Не забыўся.

— Тады можна цябе папрасіць? Будзь заўтра весялейшы, добра? Хай бачаць, як у нас добра ўсё...

Мо цэлы месяц, амаль кожны дзень жонка нагадвала яму пра імяніны пляменніцы, братавай дачкі Аленкі, раілася, што апрануць, які падарунак купіць... Але Снарскі, як толькі даведаўся пра гэтыя імяніны, напярод ведаў, што выдумае любую прычыну, каб не пайсці. Ён не любіў шурына, нават чамусьці пабойваўся яго, ніколі не мог гаварыць з ім як з роўняю (яны былі амаль аднагодкі), а толькі чырванеў, пачынаў глядзець пад ногі і згаджаўся з усім, што б шурын ні казаў.

Раней, да вяселля, Снарскі хлусіў рэдка, і калі даводзілася хлусіць, цярпець сябе за гэта не мог; але цяпер, пажыўшы столькі часу з не-

любімым чалавекам, калі хлусіць малымі порцыямі даводзілася пастаянна, навучыўся рабіць гэта лёгка і свабодна.

— Я не забыў, але, Галіна, — сказаў ён, паклаўшы жонцы рукі на плечы, — ну, ніяк! Чортавая работа, і заўтра апошні дзень, кроў з носа...

— Якая работа?! У выхадны?!

— І ў выхадны, а як жа.

Яна адвярнулася і ўсхліпнула.

— Ну, нічога страшнага, другі раз сходзім... Я, калі прыду раней, буду чакаць цябе... І ты там доўга не сядзі! — сказаў ён строга, са значэннем. — Не забывай, што табе трэба шанавацца, думаць пра таго ці пра тую, хто ў нас скора будзе...

І Галя растала, паверыла, удзячная і за Хелену, і за гэтую няшчырую, няўмелую клапатлівасць — як мала ёй усё ж трэба!..

На другі дзень, у суботу, былі імяніны. Збіраліся проста пасядзець сем'ямі, пайсці ў блізкі лясок, пасмажыць шашлыкоў... Але Галя прыйшла адна, таму нікуды і не выбраліся, сядзелі ў кватэры, а дзянёк цёплы быў, сонечны... Сумнавата было. Брат піў адзін. Толькі Аленка весялілася, бегала, лазіла пад сталом у нагах, чаплялася да цёткі Галі, потым пацягнула яе ў свой пакой — паказваць кніжкі і кубікі.

Брат, пазіраючы на дзверы, ціха гаварыў з жонкаю.

— І чаго той барсук не прыйшоў? Як можна дома сядзець?

Жонка, якая ў душы, вядома, раўнавала мужа да Снарскіх — столькі ім напарабіць дабра! — на словах заўсёды абараняла Ігара:

— Табе ж сказалі, у чалавека работа.

— Ды брэша ён усё! Няма ў іх ніякай работы сёння, я пытаўся ў хлопцаў. І што за чалавек, чорт яго разбярэ! Ды прыйдзі ты, пасядзі з людзьмі, пагавары, выпі... Думае нешта, думае... Што ты думаеш? Хай конь думае, у яго галава здаровая! Жыві, пакуль жывецца! У вочы баіцца глянуць... Каго ты баішся? Чаго? Малады, здаровы, інстытут скончыў — гэта ж чорту рогі можна звярнуць, абы захацець!..

— Абразованы чалавек, — сказала жонка і выпіла чарку лікёру.

— Гультай ён неабразованы! Я ж пытаўся ў хлопцаў, як ён — ходзіць, як муха па кісялі, робіць толькі тое, што трэба, і пальцам больш не варушыць... Хай я невучоны, неабразованы — чорт са мною; я за гэтыя месяцы, пасля размену, на новую кватэру сабраў — вось гэтымі самымі рукамі... А ў іх, думаеш, ёсць рубель лішні?

— Не кожнаму дадзена.

— Ды ён і не варушыцца! Цяпер прыйдзі на Камароўку, купі на адным канцы, занясі на другі, перапрадай — толькі на гэтым за дзень больш чым за месяц заробіш!

— А для яго не ў грашах шчасце.

— А ў чым?

— У духоўным, — пасміхаючыся, сказала жонка, закусіўшы зефірам і зноў пазіраючы на лікёр. — Каб хадзіць і думаць, а нехта каб рабіў на яго і ўсё даставаў.

— Гэтая Галя бедная ўпадзе скора — міскі мые, а ў яе такі ж самы інстытут, як і ў цябе!.. — брат гаварыў быццам Снарскаму. — Ты хоць раз прыбраў? Есці зварыў? Памыў — хоць сваё?..

— Ціха ты... Пры Галі не скажы. Знаеш, як яна яго аберагае? А ў самой ужо — во... — і жонка сагнула рукі перад жыватом.

— Праўда?

Радасны, Галін брат падышоў, абняў ззаду сваю гладкую, падобную на колішніх купчых, жонку, і выпіў з ёю лікёру.

А Снарскі добра выспаўся, паеў, схадзіў у магазін, купіў пару пляшак піва, пачытаў, потым глядзеў тэлевізар, але нешта абы-што круцілі, і ён сядзеў у крэсле і, папіваючы піва, думаў пра камеру-адзіночку, сябе — няголенага, схуднелага, збітага на горкі яблык, які чакае смерці, і дзверы адчыняюцца і заходзіць разам з нямецкім афіцэрам ЯНА, глядзіць на яго, «а вочы мокрыя ад слёз...»

* * *

Ішоў час. Галя ўжо не працавала, сядзела на дэкрэтным, шмат хварэла, неяк яшчэ больш паменела, ссохлася, нібы жывот выцягваў з яе сокі, але старалася быць радаснай і рабіла ўсю работу. Ігар, наадварот, харашэў, паўнеў, сам адчуваў у сабе спакойную мужчынскую сілу, усё больш звыкаўся і ўжо не бачыў вялікага страху ў тым, што наперадзе — і пахі пялёнак, і дзеці, і ўсё тое, што і ва ўсіх... Ён, як па інерцыі, яшчэ круціў у галаве свае канцлагеры і афіцэрскую форму, спрабаваў уяўляць ЯЕ, ногі і пасачку скуры праз падраты капрон, але яснасці ўспаміну, хваляванняў ужо не было. Уяўленні гэтыя размываліся больш практычнымі, на гадзіну, на дзень наперад планамі: пагаліцца раніцаю, паспець на тралейбус на 8.30, на рабоце не забыць сказаць, ці абавязкова на 17-м вузле паказваць 10 міліметраў зазору на раствор паміж балкамі — і час забірае, і не трэба зусім, у інстытуце яны гэтага ўжо не рабілі; не забыць, што футбол сёння не ў сем, а ў шэсць, і трэба раней «зліняць» з работы...

Цяпер, седзячы ўвечары каля тэлевізара ці засынаючы, ён проста сілаю прымушаў сябе фантазіраваць на тэму будучых сустрэч з ЁЮ, бо інакш — што? З чым ён астанецца?..

Аднойчы ўночы жонка раптам разбудзіла яго і папрасіла:

— Абдымі мяне, калі ласка...

— Што такое?

— Ігар, ведаеш, роды будуць цяжкія... Дактары кажуць, можа быць сямімесячны...

— Ну і што?..

— Так, скора ўжо... А помніш, як каля грушы хрушчы лятал? І мы шампанскае пілі?.. Дзякуй табе за ўсё...

Яму раптам зрабілася страшна.

— Скажы, ты будзеш успамінаць мяне, шкадаваць, калі памру?..

Ён маўчаў, а яна гладзіла яго па галаве і, ціха смеючыся, суцяшала:

— Не бойся, дурненькі, — грэх баяцца!.. Калі не баяцца, усё будзе добра!..

Хутка яна заснула — галавой на яго руцэ, а Снарскі доўга яшчэ ляжаў, не зварухнуўшыся, думаў — гэта ж пракляты лёс яму так падводзіць! І вельмі проста можа падвесці, што Галі не стане, ён астанецца адзін і ТАЯ як-небудзь астанецца адна... Калі моцна чаго-небудзь хочаш, рана-позна так і будзе. «Але я ўжо не хачу, я проста... здохну адзін!», — думаў Снарскі, а ў галаву лезла — хачу-не хачу, а ну, як так і будзе...

І ўвесь наступны дзень яму было трывожна, страшна і шкада, але не Галі, а сябе. Пад канец работы пазваніў сябар і папрасіў зайсці сёння. Апошнім часам з белабрысым рэдактарам яны сустракаліся рэдка, той, як і Снарскі год назад, рабіў дыплом, а калі зрэдку сустракаліся, Ігар больш маўчаў, слухаў, ды і слухаць сябравыя разважанні пра жыццё і літаратуру было ўжо нудна; Снарскаму цяпер хацелася, каб сябар не лічыў яго больш няўдачнікам, а зайздросціў яго жыццю, працы... Таму ён адмовіўся, сказаў: «У мяне жонка хворая», — але, паклаўшы ўжо трубку, раптам сабраўся і паехаў у інтэрнат.

— Тут табе пасланне, — пасміхаючыся, сказаў сябар, падаючы Снарскаму канверт, — ад ЯЕ. А ведаеш, ЯНА ўжо не вучыцца, выгналі...

Снарскі надарваў канверт, прысеў на ложак, перачытаў пісьмо і раз, і другі, і нічога не мог зразумець... Аказваецца, Навіцкі (гэты самы белабрысы чорт) расказваў мне, як ты мучаешся, жывеш мною... не любіш жонку-ведзьму... але я «не спитываю ничего»... і не гэтае «спитываю» раптам стала яму саромным і брыдкім, а дух ліста — у прамым сэнсе ліст быў папырсканы духамі... Божа мілы!

Даўно было ўсё прачытана, а ён сядзеў і баяўся адарваць ад ліста вочы, баяўся пра нешта загаварыць... Ды і пра што было гаварыць? Што ўсё — няпраўда? Што не жыў ён ЁЮ?..

Сябар, пакуль Снарскі чытаў, не спускаў з яго вачэй і ўсё пасміхаўся.

— Ну, што? — спытаў ён, і Снарскі раптам зразумеў, што ён чытаў гэтае пісьмо — вунь на канверце жоўтыя палосы ад клею — і калі чытаў, таксама, мабыць, смяяўся.

— Нічога, — адказаў ён, скамечыў ліст і запіхнуў у кішэню.

Потым зноў сядзелі, пілі піва, сябар зноў чытаў па паперцы, чаканячы кожнае слова: «...Ты проходишь, власть Советов, словно с белых яблонь дым!» Хутка Снарскі развітаўся і пайшоў.

Ён знарок пайшоў дамоў пехам — ад Акадэміі навук па праспекце. Быў ужо канец лістапада, і цяпер, увечары, стаяў марозік; гарэлі ліхтары, свяціліся вітрыны, і ўсё вакол — і тратуар, і сцены дамоў, і дрэвы, і машыны на стаянцы — было белае, іскрыстае ад інею, які не раставаў цэлы дзень; белыя, зацягнутыя хрусткім лядком лужыны патрэсквалі пад нагамі, і Снарскаму думалася, што гэта яго жыццё, як гэты лядок, лёгка ламаецца і патрэсквае... Жыццё... Ды ці ведаў ён жыццё? Вырваны зуб? Ноч з прастытуткаю? Нудная, нецікавая работа, хворая, чужая яму жонка, тэлевізар, піва, мары пра канцлагер — у 25 гадоў! — і так прайшло больш чым паўгода, і ўсё тое ж наперадзе!..

«Ты проходишь, власть Советов...» Ды гэта я праходжу, як з яблынь дым! Жыццё без толку праходзіць!..» — думаў ён.

«Пашкадуеш мяне, калі я памру?» — успомнілася раптам тое, пра што не хацелася помніць, — і пацягнула за сабою: «Помніш той вечар, хрушчоў каля грушы?..» — і пачало ўспамінацца адно за адным усё, што ён звычайна гнаў ад сябе: і тое фальшывае, самалюбівае прыніжэнне, з якім ён расказваў улетку на балконе пра сябе, калі пасаромеўся, не сказаў самага галоўнага — «ці пойдзеш ты за мяне?», палічыў гэта для Галі непатрэбным, і тое, што сімвалічна адразу пасля вяселля пачаў зваць яе толькі Галіна (маўляў, ён — магутны ствол, яна — усяго толькі кволае адгалінаванне яго)...

Успомнілася, што нават у марах сваіх для яе ніколі не знаходзілася месца, што ён ні разу проста па-чалавечы не пашкадаваў яе, не звадзіў ні разу ні ў кіно, ні ў тэатр, ні пагуляць — нікуды; успомнілася, як адмахваўся ад яе па начах, як ад надакучлівага камара, як адбрэхваўся, каб не пайсці на імяніны...

«Ды гэта ж я... сухая непатрэбная галіна пры ёй! Мне маліцца на яе трэба! Сілаю прымусіць сябе любіць яе, шкадаваць, памагаць, рабіць усё, што яна хоча, — хоць бы за адно тое, што ў яе ў жыцці не было нічога светлага, акрамя таго вечара, акрамя мяне... Толькі так — зламаць сябе!» — думаў Снарскі, ідучы па заінелым, прыгожым у вячэрніх агнях праспекце, — але ўспаміналіся ні з таго ні з сяго

шурпатыя пацалункі, выцягнуты ўніз, непрыгожы жончын твар, на якім застыла нейкая вечная вінаватая пакора... «Што мне рабіць?» — і яму здавалася, што вось-вось нешта прыдумаецца, — трэба толькі яшчэ трохі прайсці, яшчэ прыпынак, падумаць добра, і ўсё лёгка і проста прыдумаецца.

*1993 г.*

## АДНАКЛАСНІК

Прыехаўшы ў вёску, я пайшоў у госці да былога аднакласніка.

Мы селі на лавачцы ў двары. Быў вечар позняга лета, ціхі, стомлены… Калі б я быў мастаком і захацеў намаляваць гэты вечар, дык пакарыстаўся б толькі трыма фарбамі: сіняй, жоўтай і трохі шэрай. Сіні туман, жоўтая пожня і шэраватае сутонне… Такімі вечарамі чамусьці з асаблівым нецярпеннем чакаеш ночы, цемры, маладых галасоў у канцы вуліцы, дзявочага смеху, лёгкіх крокаў; здаецца, што ты і не жыў яшчэ, што ўсё ў цябе наперадзе, што і цябе нехта ўсё яшчэ помніць і чакае…

— Ты б вось якую гісторыю напісаў, — пачынае аднакласнік, хітравата на мяне зірнуўшы.

«Дык вазьмі і напішы», — хочацца даказаць. Дзіўныя людзі, адкуль гэтая вера, што пісьменнік перш-найперш павінен кідацца на чужыя сюжэты? Яму менш за ўсё гэта цікава. Пісьменніку трэба дэталь, іскрынка: які-небудзь кляновы сухі ліст пры дарозе, зламаная травінка, трэшчына ў асфальце, выпадкова пачутая мелодыя ці нават проста чырканне запалкі аб карабок, — і гэтага дастаткова, каб сюжэт сам сабою «ўспыхнуў», прыдумаўся, і сюжэт гэты можа атрымацца больш рэальным за любую жыццёвую гісторыю, бо сфакусіруе многа падобных гісторый…

Але ніколі я так не адкажу свайму аднакласніку. Я буду слухаць яго. Ён — калека. У руках ён пакручвае кавеньку. У яго ўжо дзесяць гадоў баліць нага. У школе ён быў звычайны, як усе, хлопец, потым паступіў у чыгуначны тэхнікум, давучыўся да апошняга курса і раптам нага забалела і пачала сохнуць. Ні дактары, ні санаторыі не памаглі. Яна і цяпер сохне, зусім кароткая, маленькая.

Аднакласнік разумны, як і звычайна разумныя людзі, на каго бяда навальваецца з маладога веку, — мусіш быць разумным, каб выжыць.

— Ты змог бы помніць чалавека, не бачыўшы яго гадоў, скажам, пяць, дзесяць? — пытае аднакласнік.

— Неа, — легкадумна адказваю я.

— А я вось помню…

І аднакласнік расказаў. Калі ён перайшоў на апошні курс тэхнікума, усё ў яго было цудоўна. Малады, здаровы, добра вучыўся, праз год — у армію. Але вось гэтае, — што хутка ў армію, яго найбольш і мучыла. У яго не было дзяўчыны. Проста неяк не шэнціла з гэтым. Можа, таму, што жыў не ў інтэрнаце, а ў сваякоў на кватэры, у чужым горадзе, ні па дыскатэках не лётаў, ні па танцах, нікуды дужа не высоўваўся, сядзеў дома, «зубрыў». А ў іхняй групе былі амаль усе хлопцы.

І вось на апошнім курсе яму страшэнна захацелася быць як усе, каб потым таксама, як і ўсе, хваліцца, што ведае, як **такое** робіцца.

— Не смейся, калі ласка, і не думай, што гэта было мне лёгка, — зноў зірнуўшы на мяне, сказаў аднакласнік. — Я быў сарамлівы і ганарысты. Мне здавалася, лягчэй праз зямлю праваліцца, чым дзесьці на вуліцы, ці ў аўтобусе, ці ў тэхнікуме падысці да незнаёмай дзяўчыны і пачаць, як іншыя, «клеіцца». А раптам яна не так зірне, не тое скажа або моўчкі пагардліва адвернецца?.. Ды такое да смерці не забудзецца! Калі б я піў, магчыма, лягчэй было б, але я не піў і не курыў тады.

Вядома, можна было паспрабаваць — пацягацца ў інтэрнат, схадзіць з сябрамі на танцы — і я пазнаёміўся б з кімсьці. Але, паўтаруся, мне не хацелася знаёміцца. Знаёмства заўсёды да нечага абавязвае. Пачаліся б тэлефонныя званкі ды сустрэчы, провады дамоў, трэба было б дарыць кветкі ды хадзіць разам у кіно… Урэшце, трэба было б жаніцца. Я тады не ўяўляў, як можна па-сур'ёзнаму гуляць з дзяўчынаю і не мець у планах ажаніцца з ёю. Але пра гэта і думаць смешна, які мой век — сямнаццаць гадоў!

Мне трэба была не чыстая дзяўчына, а жанчына, якую можна купіць, якая не запомніць нават майго імені, а я не пацікаўлюся, як яе завуць. Каб потым, **пасля ўсяго**, мы разышліся і ніколі больш не сустрэліся, і не цікавіліся б адно адным.

І вось аднойчы мы з сябрам, гарадскім хлопцам, на перапынку стаялі на калідоры, і каля нас прайшла дзяўчына. Сябар павітаўся з ёю.

«Шкада малую, — сказаў ён, — загуляла, курсавік не здала, выганяюць».

«На якім яна курсе? — спытаў я, а слова «загуляла» ўжо тахнула ў скронях.

«На другім. Хочаш, вазьміся, зрабі ёй курсавы — яна чым хочаш аддзячыць».

Сябра, хітры і назіральны, яўна чытаў мае думкі. «Што ж, ён дапускае, што яе можна купіць, што яна прадаецца, — значыць, няма ў гэтым нічога саромнага», — думаў я, і, схапіўшы яго за рукаў, пакуль дзяўчына не знікла з вачэй, папрасіў:

«Пакліч».

Сябра паклікаў: «Лена!». Дзяўчына вярнулася, стала перад намі. Яна была непрыгожая, зусім непрыгожая. У доўгай сукенцы, якія тады зноў толькі пачалі ўваходзіць у моду і непрывычна ўспрымаліся. «Гэта нічога, што непрыгожая, — падумаў я і яшчэ больш асмялеў. — Гэта нават лепш: мне трэба яе ногі і ўсё астатняе, а не прыгажосць».

«Вось, Лена, пазнаёмся… Хлопец хоча табе памагчы зрабіць курсавы».

«Праўда?!» — яна засвяцілася і пахарашэла. — Ой, хлопчыкі, памажыце! Я не ведаю, што б для вас зрабіла!..»

«А гэта з ім дамаўляйся», — сказаў сябра і пайшоў.

«Дык што?» — смеючыся, спытала яна.

«Праз колькі дзён табе трэба здаваць?»

«Праз чатыры, апошні тэрмін».

«Добра, я зраблю. За… гэтае самае», — сказаў я.

Яна раптам патухла і зноў зрабілася непрыгожаю. Цэлую хвіліну яна маўчала і глядзела на мяне. Я круціўся, кашляў, чырванеў, падымаў і апускаў вочы, — а сам ужо цвёрда ведаў: яна — мая, яна купляецца. Інакш не маўчала б столькі.

«Ну, рабі, — прамовіла яна ўрэшце. — І ўсё будзе».

«Калі?»

«У той дзень, калі будзе гатова».

Яна завяла мяне ў сваю аўдыторыю і дала тыпавік курсавога.

Два дні я не хадзіў на заняткі, гарбаціўся дома над раскладзенымі на стале лістамі ватману. Якія то былі два дні!.. Як я рыхтаваўся, расцягваў хвіліны і гадзіны тых дзён, нават думкамі не даваў набліжацца да таго моманту, калі… А як цудоўна ўсё складвалася! У суботу курсавік будзе гатовы. Тады ж, у суботу, сваякі — гаспадары кватэры — з раніцы на ўвесь дзень едуць у грыбы. Кватэра будзе пустая.

Так і выйшла. Да суботы я ўправіўся. Прачнуўся рана, адзін, сваякі паехалі ў лес. Я пачаў туляцца па кватэры, думаючы, — хутка гэтыя сцены, шпалеры, мэбля, канапа стануць сведкамі **чагосьці**, і якая перамена хутка са мной адбудзецца, — я ўжо **іншым** буду... Узяў дзядзькаву брытву, памазок, пагаліўся ўпершыню ў жыцці, парэзаўся… Сорамна ўспамінаць!..

І вось тэхнікум, абед; у абед я адшукаў яе ў сталоўцы і аддаў два скручаныя ў рулон лісты ватману. Яна разгарнула і ад радасці аж засмяялася, — і сапраўды, я для сябе ніколі так не рабіў: чысценька, акуратна…

«Дык што, Лена? — сказаў я, пакуль яна любавалася курсавым. — Сёння я адзін у кватэры, да позняга вечара».

«Давай адрас, — спакойна адказала яна. — У шаснаццаць гадзін я ў цябе буду».

Яна не прыехала, вядома. Ні ў шаснаццаць, ні ў сямнаццаць, ні ў дзевяць вечара, калі вярнуліся гаспадары-сваякі з поўнымі сумкамі грыбоў.

Дзіўна, але мне не было крыўдна. Была толькі нейкая пустата ў душы. «Значыць, нельга купіць тое, што табе не належыць, нельга штучна змяніць лёс!» — думаў я.

Праз тыдзень мы выпадкова сустрэліся ў той жа тэхнікумаўскай сталоўцы. Лена мая, смеючыся, сказала:

«Ну ты малайчына! Дзякую, курсавы на пяць прайшоў!»

Я прамаўчаў. Яна спытала ціха:

«Што, у пралёце, як у самалёце? Пакрыўдзіўся?»

Я пацiснуў плячыма.

«Праўда, не пакрыўдзіўся? — і яна раптам зноў, як і той раз, калі мы дамаўляліся, пачала моўчкі, доўга глядзець на мяне. Але цяпер я ўжо не чырванеў і не апускаў вачэй.

«Паехалі да мяне», — прамовіла яна.

«У нас дзве лекцыі яшчэ…»

«Як хочаш», — і павярнулася ісці.

«Пачакай, — я ўзяў яе за руку. — Паехалі. Толькі зараз заскочу забяру сумку…»

Мы моўчкі праехалі аўтобусам амаль праз увесь горад. Яна жыла ў старым раёне, у пяціпавярховай «хрушчоўцы». Мы падняліся на трэці паверх і ўвайшлі ў маленькую двухпакаёўку. У прыхожай я зняў чаравікі і стаяў, як дурань.

Яна правяла мяне ў пакойчык, я прысеў на канапу, дзяўчына — побач. Нечакана мяне праняль дрыжыкі, бы пры тэмпературы. Я баяўся, каб яна не заўважыла гэтага, зірнуў на яе скоса — і вачам не паверыў: такія ж дрыжыкі праймалі і яе! Яна хвалявалася і баялася нечага таксама, як і я.

«А цяпер паслухай, — пачала яна. — У мяне ёсць хлопец у арміі. Ён кахае мяне. Верыць мне. Табе было б прыемна, каб ты служыў, а хтосьці вось так, як ты цяпер, прыйшоў купляць тваю дзяўчыну?»

«Калі кахае па-сапраўднаму — тады ён цябе **ўсялякую** прыме», — адказаў нехта маімі вуснамі. Нехта, бо я ўсё ж ведаў сябе, ведаў, што не мог ляпнуць такой дурноты!

«Усялякую? — перапытала яна. — Вось як вас, хлопцаў, пасля гэтага не ненавідзець… Але хай: не баішся ты, няма ў цябе сумлення, дык паслухай яшчэ. Я — дзяўчынка».

Я пасміхнуўся. Я ўспомніў сябрава «загуляла» і не паверыў ёй, вядома, — ды і хто на маім месцы паверыў бы?

«Распранайся», — дзелавіта, рашуча, суха сказала яна, заўважыўшы маю ўсмешку.

Яна не зманіла.

Гэта было падобнае на кашмарны сон: абое ўпершыню, абое нявопытныя… А самае брыдкае, самае гадкае, што я і ў тыя хвіліны стараўся запамінаць больш розных дэталяў-падрабязнасцяў, каб хваліцца потым сябрам: запамінаў дыханне яе, ускрыкі, абрыўкі слоў, запамінаў, што балконныя дзверы прачыненыя і вецер варушыць гардзіну… А потым мая бедная непрыгожая дзяўчынка, спалоханая, заплаканая, абдымала мяне і зацалоўвала, і ўсё дапытвалася:

«Ты ж рабіў гэта таму, што закахаўся, і цяпер кахаеш? Такое ж нельга рабіць без кахання! Праўда ж?

«Праўда», — адказваў я, жадаючы толькі аднаго: хутчэй вырвацца адтуль.

Я так нікому і не расказваў потым, не змог. Мне здавалася, у мяне гэта было зусім інакш, чым ва ўсіх, — нецікава, саромна, брыдка, непатрэбна… Лену ў тэхнікуме я пачаў пазбягаць. А пры рэдкіх выпадковых сустрэчах на калідоры ці ў сталоўцы лавіў на сабе яе спалоханыя позіркі.

Аднойчы, ужо зімою, калі ў мяне пачала балець нага і гэта мяне больш за ўсё турбавала, Лена сама заглянула ў нашу аўдыторыю, падышла да маёй парты:

«Што ж ты... нават не вітаешся… цяпер?»

Я не ведаў, што адказваць. Я думаў больш пра нагу. Думаў, так, застудзіў, можа, пахаджу на ўколы, падлечаць і ўсё пройдзе.

Больш з Ленаю мы не бачыліся.

І вось столькі гадоў пасля, і цяпер, я часта думаю: каб не гэтае ліха, не нага гэтая, хутчэй за ўсё я забыў бы на сваю першую і апошнюю дзяўчыну. Ды мільёны такіх выпадкаў, калі дзяўчат кідаюць і забываюць іх!.. Але цяпер я ведаю: кожнаму — сваё, і кожны толькі сам за сябе адказвае. Што дазволена многім, тое — вельмі можа быць — зусім не дазволена табе. Увогуле, каханне жанчыны, калі ўдумацца, гэта такая страшная загадка, такая тайна; ёсць у тым, што

жанчына ахвяруе сабою, аддае ўсю сябе чужому чалавеку штосьці такое містычнае, незразумелае і нежартоўнае, што нельга гуляцца з гэтым. А я захацеў менавіта пагуляцца... І дагуляўся.

— Верыш, — ціха сказаў аднакласнік, — усё адно я па-свойму шчаслівы. Было ж у мяне хоць штосьці, і яна, Лена мая, была, і ёсць недзе, яна ж не прыдуманая мною! Няважна, помніць яна мяне, няважна, што ў яе даўно ўжо, відаць, муж, дзеці, — важна, што я яе помню… І больш мне нічога не трэба. Ведаць, што яна жыве цяпер на Зямлі, кожную раніцу глядзець на адно з ёю неба, кожны вечар — на адны зоры…

Аднакласнік замоўк.

І праўда, цёмна ўжо, зоркі над галавою. Мы развітваемся, і я пустой вуліцай іду дамоў, пакінуўшы яго аднаго сядзець на лаўцы, думаць.

*1995 г.*

## СЫЧ

Вуліца яшчэ спіць, захутаная ў белы ранішні туман; спіць сваімі шэрымі, вільготнымі ад багатай расы платамі, мокрымі дрэвамі і травою ў агародах, спіць нязвыклай для вёскі цішынёю хлявоў і хат, нават пеўні яшчэ маўчаць, а Сыч ужо тупае з веласіпедам; сам ідзе сцежкаю паўз плот, дзе цупчэй і не бярэцца да падэшваў мокры пясок, а веласіпед стараецца каціць па траве, каб памыліся расою шыны. Адна рука ляжыць на рулі, другая — прытрымлівае вялікі кашэль[7] на багажніку, абвязаны чыстай марляю. Ад прахалоды каўнер пінжака ў Сыча падняты, клінковая кепка з гузікам зверху насунутая па самыя вочы; правая калашына, каб пры яздзе не ўкручвалася ў цэп, забраная ў шкарпэтку, як робяць дзеці, таму правы чаравік на тонкай каля костачкі назе здаецца большым за левы. З-пад кепкі зыркаюць то на дарогу наперадзе, то на кашэль пільныя строгія вочы, вочы чалавека пажыўшага, які ніколі ні ў чым не засумняваецца, які цвёрда ведае, што ўсё, што робіць ён, адзіна правільнае і ўсё навокал для яго аднаго: сцежка — каб па ёй ступаць, раса — каб памыць ёю колы веласіпеда, сонца, што неўзабаве выбліснє з-за хат — каб абагрэць яго, Сыча, у дарозе.

Вось ужо гадоў дваццаць, з таго часу, як пахаваў жонку, кожны выхадны, у любую пару года, у любое надвор'е Сыч — з ка-

---

[7] Кашэль (*дыял.*) — прамавугольны, сплецены з ліпы кораб; носяць за плячыма, перакінуўшы на грудзі шырокую шлейку.

шалём за плячыма, калі непагадзь і бездарожжа і да горада можна дабрацца толькі папуткамі, ці, калі суха, як цяпер, на веласіпедзе — выпраўляецца адным і тым жа маршрутам у няблізкую дарогу.

Час нібы забыўся на гэтага чалавека (увогуле, няўмольны час чамусьці заўсёды бывае найбольш літасцівы да людзей педантычных, абмежаваных, якім хоць кол на галаве чашы, а не адступяцца ад свайго раз-назаўсёды выбранага рэжыму): за ўсе гэтыя дваццаць гадоў Сыч, здаецца, зусім не змяніўся знешне. Такі ж гладкі, высокі, прамы — нават не сагнецца, калі нясе паўнюткі кашэль за плячыма. Веласіпед яго ніколі не ламаецца, тупаносыя, грубай работы чаравікі не стоптваюцца, выхадны касцюм, цесны яму, бо куплены некалі з эканоміі на памер меншым, ніяк не зносіцца, не падзярэцца, не прашмуляюцца аб сядло веласіпеда штаны. Аднак яшчэ больш, чым сваё дабро, беражэ Сыч самога сябе. Увесь век — і да пенсіі, і ўжо гады два пасля пенсіі — на лёгкай рабоце, вартаўніком у леспрамгасе.

У самога дворык, хата, агарод — хоць на выстаўку, чыстыя, акуратныя, дагледжаныя; хата абшаляваная і перакрытая новым шыферам, у хляве свінчо, у загарадцы (каб двор не загаджвалі) куры, грады на сотках высокія, разоры роўненькія, у канцы сотак, дзе ён звычайна на перамену засявае латку зямлі канюшынай і грэчкай, тры вулеі, пад хатаю — два клёны, з якіх увесну можна браць сок, і ў лес хадзіць не трэба... Калі не на службе, Сыч не прысядзе, з досвітку будзе корпацца то каля вулеяў, то на сотках, тупае па двары, стругае штось пад паветкаю, піліць, грукае, прыбівае, паднаўляе... Але папрасіць памагчы хто чужы — пальцам не зварухне. Прычым выдумляе абы-што, абы-якую прычыну, і не саромеецца, не баіцца сурочыць:

«У мяне кіла!» — гучна, на ўсю вуліцу заяўляе, калі трэба рабіць што цяжэйшае; калі лягчэйшае:

«У мяне рак касці доктар абнаружыў!..»

І ўсе ведаюць, што брэша ў вочы, што ён за ўсё жыццё не знаў, як зуб баліць, што ён кожны год праходзіць медкамісію і з такімі хваробамі, якія сам на сябе выдумляе, ніхто б яго, вядома, на службе не трымаў.

Здаецца, не толькі знешнасць, але і душа яго, успрыманне ім усяго вакольнага раз-назаўсёды некалі ў ім застылі. Чым чалавек жыве, пра што думае?.. Вечна насуплены, да ўсяго недаверлівы, скептычны; адзінае, на што рэагуе, дык гэта на новыя грошы і цэны, да якіх ніяк не прывыкне, усё пераводзіць на «брэжнеўскія». У краме бохан хлеба па тры тысячы, гумавыя боты — па трыццаць тысяч, Сыч паглядзіць, пакрэкча, перавядзе: «Хлеб тры рублі, боты — трыццаць... Балдзёж!» Мужчыны збяруцца, загавораць пра палітыку, радыяцыю, пра «калі было лепш, тады ці цяпер?», — яму нічога не цікава. Ссупіць бро-

вы, слухае маўчком і толькі рэдка, калі ў гуморы ці калі папытаюць: «А ты, Іван, што думаеш?», адкажа ўпэўнена:

— А што тут думаць — балдзёж адзін!

Свой старэнькі, першага выпуску тэлевізар, які, аднак, ні разу не быў у рамонце, ён амаль ніколі не ўключае. «А што я там не бачыў, балдзяжу іхняга?» Увогуле, гэтым універсальным словам ён абазначае ўсё, што не разумее, што яму цяжка ўявіць, усё, што недзе далёка і не з ім, а з іншымі. Калі доўга мочыць дождж, ці стаіць суша, ці асабліва ўвосень і ўвесну, калі надвор'е пераменлівае і снег сыплецца разам з дажджом, задзярэ ўверх галаву:

— Нябесны балдзёж!

...Да горада кіламетраў пятнаццаць. Цяпер ясна, чаму Сыч так рана выпраўляецца: едзе ён не намнога хутчэй, чым іншы малады ішоў бы. Паднялося ранняе сонейка, трава на лузе паўз абодва бакі шашы ззяе-пераліваецца бліскучай расою, туман па нізінах і каля лазовых кустоў ружавее, радзее і проста на вачах знікае; роўны асфальт, усё яшчэ мокры, бы пасля дажджу, таксама пакрысе высыхае, шарэе плямамі. Праносяцца то насустрач, то ззаду, абганяючы маруднага веласіпедзіста, машыны, але Сыч і не зірне на іх, едзе сабе з краю шашы роўненька, як па шнурку, адно яшчэ ніжэй насунуўшы кепку, бо сонца слепіць вочы, адбіваецца ад нікеляванага руля.

Пры самым уездзе ў горад Сыч спешваецца — дужа многа транспарту, небяспечна, — і вядзе веласіпед у руках па тратуары. Ісці недалёка. Цэнтральны гарадскі базар ён не прызнае, яго, Сыча, любімае месца тут, на краіне горада, каля магазіна, дзе таксама заўсёды поўна народу і дзе можна прадаць тавар і хутчэй, і даражэй, чым на асноўным, «галоўным» базары. Гандляроў-канкурэнтаў тут няшмат, заўсёды знойдзецца месца на шырокім, зручным, бы прылавак, парапеце ўздоўж універсама. Сыч стараецца выбраць месца ў адзіноце, няважна, што далей ад уваходу ва ўніверсам, хай нават вось тут, з задняга двара, дзе каля дзвярэй з надпісам «Прыём шклатары» гара парожніх скрынак; галоўнае, з гэтага боку цянёк — і самому здаравей, і для тавару лепш, і шыны ў веласіпедзе не напячэ сонцам... Выбраўшы месца, Сыч рассцілае на парапеце марлю ў дзве столкі, з кашаля выкладае вялікія, карычневыя, адно ў адно яйкі, пучкі вымытай чырвона-белай радыскі, маладой аранжавай морквы, пахучага кропу, шчаўя, дастае палатняны мяшок са свежымі лісічкамі і ставіць побач літровы слоік-мерку...

Гандляр ён дзіўны. Папытай у кожнага — кожны скажа, як лепш гандляваць: трэба ўсміхацца, дагаджаць пакупнікам, падлізвацца да іх; на мужчыну можна сказаць «парэнь» ці «бярыце, малады хазяін!»,

на жанчыну — «дзевушка», да якой-небудзь старой каргі, якая ўсе перамацае, перанюхае і нічога не купіць, усё адно пажадана звяртацца ласкава — «бабушка»... Сыч — не; стаіць маўчком, насуплены, ганарысты, склаўшы рукі на грудзях, пазірае на ўсіх з вышыні свайго росту і, відаць, пагарджае і нават за людзей не лічыць гэтую публіку, якая толькі сноўдае туды-сюды і не здатная сабе ж вырасціць корчык цыбулі ці з'ездзіць у лес ды набраць вядро лісічак. Кошт за тавар назначае самы высокі і ніколі не скіне. На справядлівае здзіўленне, што «вунь у той бабкі ўдвая танней», без цырымоніяў раіць: «Дык ідзі і бяры ў яе!» Не кожнаму яшчэ скажа, што па чым, перш агледзіць чалавека з галавы да ног, і калі той здасца падазроным, без сумкі ці сеткі ў руках (а такіх тут, каля ўніверсама, таўчэцца свет), таксама спытае:

— А ты будзеш купляць?

— Адкуль я ведаю. Назавіце цану, тады паглядзім.

— Як не будзеш браць, то нашто табе цана?

Ці ён настолькі ўпэўнены ў якасці свайго тавару, ці проста выгляд яго, як гандляра, нейкі па-сялянску сімпатычны, але яшчэ больш дзіўна, што бяруць у яго ахвотна і раскупляюць хутчэй, чым у тых, хто кідаецца дагаджаць пакупніку і адразу ж гатовы скінуць кошт, абы ўзялі.

Распрадаўшы ўсё, Сыч прымацоўвае на багажніку пусты кашэль і няспешна, не зважаючы на людзей вакол, не саступаючы нікому дарогі, кіруецца праз плошчу гандлёвага цэнтра за ўніверсам, за вугал пошты, у двары — туды, дзе на рагу цеснай вулачкі прыляпіўся цагляны аблезлы аднапавярховы будынак з бляклай шыльдачкай паміж дзвярыма і адзіным акном: «Бюро рытуальных паслуг». Тут, каля ганка, на лавачцы пад клёнам, сядзіць жанчына ў чорнай хустцы, каля ног — кошык, поўны штучных пярэстых кветак. Як і Сыч каля ўніверсама, так і яна тут амаль кожны выхадны. Пабачыўшы Сыча, жанчына яшчэ здалёк усміхаецца і пачынае папраўляць на сабе чорную хустку і перабіраць ніз сіненькай трыкатажнай кофтачкі.

— Добры дзень вам, — ціхім, ненатуральна-пакорлівым голасам кажа яна, калі Сыч падыходзіць, і схіляе галаву ў нізкім паклоне.

— Добрае здароўе! — так, як вітаюцца ў іхняй вёсцы, адказвае Сыч, прысланяе да клёна веласіпед і стомлена мосціцца побач на лаўку.

— Як торг ваш сёння?

— А, гарадскія, яны табе чорта з'ядзяць на сухі рот! — гучна, як у сябе дома на вуліцы, аб'яўляе Сыч і махае рукою.

Жанчына палахліва ўздрыгвае і глядзіць на яго з дакорам — маўляў, мог бы такі сур'ёзны, разумны, гаспадарлівы чалавек, як Сыч, абысціся і без згадкі нячыстай сілы.

— Душна сёння, — кажа яна, каб перавесці гаворку. — То дождж быў, а цяпер вось пагоду паслаў Бог.

Сыч сцягвае кепку, прыгладжвае ўзмакрэлыя сівыя валосікі на патыліцы, чухае шырокую чырвоную паласу на лобе, пакінутую кепкай, думае нешта, крэкча, хітравата пазірае на жанчыну.

— Так... — пачынае ён, — вось вы, дапусцім, верыце...

— І вы верыце, і ўсе вераць, — хутка перабівае жанчына, — у малітвах яко ношчных, і кожнаму па веры яго...

— Хай так, — згаджаецца Сыч. — Тады чаму, скажам, — тыцкае ён пальцам у бок гандлёвага цэнтра, дзе каля камерцыйных кіёскаў таўкуцца людзі, — чаму, скажам, Бог дапускае такі балдзёж?

— Воля твая прасвятая, Госпадзі, і Дзевы Марыі непарочнай Багамацеры, і царства тваё ныне і ва векі вякоў... — жанчына, закаціўшы вочы, дробна і часта хрысціцца і неўрастэнічнай скорагаворкай мармыча няўцямныя словы. — І нам, грэшным, плоць твая і навечнае іскупленіе...

Сыч, аднак, цалкам задаволены і сваім пытаннем, і такім адказам. Выслухаўшы, палічыўшы гэты набор слоў за малітву, ён адразу пераходзіць да справы:

— Па чым? — і паказвае на кветкі ў кошыку.

— Даражэй сёння, — вінавата адказвае жанчына, мігам вяртаючыся ў будзённае, практычнае жыццё. — Воск падаражэў. Усё цяпер даражэе па волі Божай... Гваздзічкі па пяць, ружы па восем, рамонкі — па шэсць...

— Тысяч? — як заўсёды, перапытвае Сыч.

— Цяпер усё на тысячы, — як заўсёды, ведаючы Сыча, уздыхае жанчына.

— Лічы, ружы па восемдзесят капеек, а гваздзікі — па пяцьдзясят! — падагульняе Сыч і лезе па грошы ва ўнутраную, знізу пінжака, кішэню, зашпіленую на гузік.

З кошыка ў кашэль перабіраюцца чатыры крывава-чырвоныя буйныя ружы з ярка-зялёнымі, глянцаватымі ад воску лістамі, чатыры пластмасавыя рамонкі — белае з жоўтым, нібы разрэзаныя напал вараныя яйкі, чатыры пунсова-паркалёвыя гваздзікі, да таго падобныя да сапраўдных, што рука цягнецца абламаць са сцяблін малюсенькія нераспокнутыя бутончыкі, якія звычайна бываюць і на сапраўдных, жывых кветках.

Цяпер, калі так удала зроблена асноўная справа, засталося зазірнуць у краму — і дамоў.

У вялікі ўніверсам Сыч не заходзіць: адно, што веласіпед на вуліцы не кінеш, а другое, «балдзёж» там... Перш выберы ў аддзеле, тады на

касу, ды ўсё запомні, ды кожнаму скажы. Ён любіць маленькую, пры выездзе з горада, драўляную крамку, падобную на іхнюю вясковую; там (Сыч лічыць) і выбар большы, і веласіпед можна ўкаціць з сабою, паставіць каля дзвярэй — ніхто сварыцца не будзе, і прадаўшчыц усяго дзве, а галоўнае, казаць шмат не трэба. Глянеш на прылавак, тыркнеш пальцам, і прадаўшчыца ўжо ведае, што чалавеку трэба: хлеба пару боханаў, селядзец, пляшку гарэлкі, кавалак каўбасы...

Назад ехаць лягчэй, сонца свеціць не ў вочы, а збоку, і шаша ад горада як бы патроху збягае ўніз і ўніз. Але Сыч рухаецца акурат з такою з хуткасцю, як і ў горад, — марудна, упарта, бы танк; сінхронна круціць педалі, і проста дзіўна, як з такой хуткасцю яшчэ ўмудраецца трымаць вертыкальна веласіпед. Ды вось, урэшце, паваротка на вёску, адсюль нават відаць бліжнія хаты. Аднак Сыч, спусціўшыся з насыпу шашы, кіруецца не на гэтую вясковую дарогу, а напрамкі праз луг — балазе, расы ўжо няма і ў паміне, — па ледзь прыкметных у траве слядах ад колаў трактара. Там сярод лугу, непадалёку ад хат, якраз насупраць Сычовых двух клёнаў, віднеецца агароджаны зялёны пагорак могілак.

Даўно пераваліла за поўдзень. Над нагрэтай травою ходзіць гарачымі хвалямі паветра, дрыжыць у сіняватай смузе, аж вачам балюча... Ціха, толькі пераспелая пруткая трава стракоча аб спіцы ды аднастайна трашчаць конікі... Сыч абыякава аглядае гэтую летнюю лугавую раскошу, гэтае багацтва самых розных кветак вакол. Кветкі, не паспееш сарваць, як у руках завянуць.

Трактарны след падводзіць прама да могілкавых варотаў, за якімі адразу ж, як зайсці, у куточку пад маладой, абцярэбленай знізу елкаю — акуратная, нядаўна пафарбаваная ў вясёла-блакітны колер агароджа. Магілка дагледжаная, зямля на ёй жоўтая, толькі дзе-нідзе прабітая свежымі іголкамі травіцы. З-пад выпуклага авальнага шкла на помніку, зробленым у выглядзе звычайнага аб'ёмнага трохкутніка з нержавейкі, з крыжыкам зверху, глядзіць трывожна, неяк замучана худы жаночы твар, копія даўняй павялічанай няякаснай фотакарткі. Вось ужо дваццаць гадоў з адным і тым жа выразам глядзіць з помніка на Сыча гэты твар... Сыч прыбірае з магілкі пацямнелыя за тыдзень, паніялыя кветкі, нясе і без жалю выкідвае цераз плот у ямку, куды зносяць старыя вянкі і розны друз. Тады кладзе пад помнік свае, «свежыя» кветкі, сядае каля магільнага грудка на цёплую траву, дастае з кашаля свой слоік-мерку, дзе на дне, сярод жмені забракаваных пакупнікамі чарвівых лісічак ляжаць два трэснутыя, але яшчэ цэлыя яйкі, дастае пляшку, каўбасу; вырваўшы пук травы, праціраe ўзятую з-пад помніка чарачку.

Перад тым, як выпіць, доўга ўглядаецца ў партрэт, і твар яго паскрысе пачынае змяняцца, спаўзае з яго маска заўсёднай упэўненасці, і хутка ўжо замест скептычнага, ганарыстага, такога моцнага для сваіх гадоў мужчыны-Сыча сядзіць каля магілы прыгорблены, расслаблены, адзінокі, няшчасны чалавек... Які не разумее нічога, баіцца і гэтага жыцця і яшчэ больш — блізкай смерці, і адзінае, што ён можа — прыходзіць і туліцца вось да гэтай, такой жа адзінокай, як сам, магілкі...

— Вось, Алена, — ціха кажа, трымаючы чарачку ў здаравеннай далоні, нібы сабраўшыся казаць тост, — вось і зноў я, Лена... — і вечная косназыкасць не дае яму нават у думках звязна пагаварыць з жонкаю.

А пагаварыць, калі б умеў складна, хацелася б багата пра што!.. Пра халодны ўжо дваццаць гадоў ложак, пра тое, што так і не забыўся ён пра сваю Алену, не здрадзіў ёй, не ўзяў нікога, не пайшоў у прымы; расказаць, які цяпер у горадзе ды і ўвогуле ў свеце «балдзёж», паплакацца на іхняга шалапутнага Юрку, сына, пра якога ўжо злосці не хапае думаць, які так і не ўзяўся за розум, хутка сорак, трэба, каб унукі былі, а ўсё не жэніцца, і ў вёску вачэй не кажа, не трэба ні бацька, ні матчына магілка... А нядаўна які фокус выкінуў — прыслаў паштоўку з 9 Мая... з Германіі! Як гэта чалавек можа апынуцца ў Германіі?! І што там, у той Германіі, можна рабіць?..

Патроху, з кожнай выпітай чарачкай Сычу робіцца лягчэй, пачынае здавацца, што і не трэба ніякіх слоў, што Алена і так усё разумее і ківае яму спагадліва, з жалем, з партрэта... Ад гарэлкі і расчуленасці ў Сыча выступаюць слёзы на вачах і ён, каб прамаргаць іх, глядзіць у высокае бела-сіняе неба, тады, калі вочы высыхаюць, углядаецца ў бок вёскі, і там, на вуліцы, каля калодзежнага «бусла», бачыць постаці дзвюх жанчын. Сыч ведае, што яны таксама бачаць яго на могілках, як ведае і тое, пра што яны могуць казаць цяпер.

— Радаўніца ў Сыча!

— У яго кожны выхадны Радаўніца.

— А што чалавеку: ні сям'і, ні хваробы — трэба ж нейкая забаўка!

Але далей абгаворваць не будуць — пабаяцца. Гэта ж як чары хто накінуў на чалавека: дваццаць гадоў так помніць і любіць нябожчыцу-жонку, так даглядаць магілку і амаль кожны выхадны насіць на яе кветкі!.. І вось за гэтую боязь, якую ён усяляе ў аднавяскоўцаў, — спрадвечную боязь звычайных людзей перад рознымі знахарамі, ведзьмакамі, «кручанымі», дурненькімі — і даруец-

ца Сычу яго прагнасць, брахня ў вочы, незразумеласць, нелюдзімасць... Зачэпіш яго, скажаш якое слова не ў час — мала што, яшчэ хваробу накіне...

А ён вып'е, закусіць, пагаворыць са сваёю Аленаю, павышморгвае-праполе з мяккай зямлі траву, — а ў думках перанясецца ўжо ў наступны выхадны, загадае, якая будзе пагода, можа, гуркі першыя падыдуць, мёд яшчэ ёсць, сала, куры добра нясуцца, лісічак яшчэ па нізінах кош можна назбіраць... І зноў у горад, па кветкі.

*1996 г.*

## ПА́МАРАК

Восень, цямнее рана. У хаце стыла, няўтульна, а выпаліць грубку — шкода дроў, невядома яшчэ, якая зіма будзе. Антоля накінула куфайку, сыпнула ў кішэню пару жмень гарбузовых семак, замкнула хату і пайшла цёмнай гразкай вуліцай на другі канец вёскі, да сяброўкі Евы, — «гуляць».

Каб ведала, якая навіна яе чакае, якою бядою для яе гэты візіт прыкінецца, — лепш мерзла б у няпаленай хаце, у тэлевізар, ці ў цёмнае акно, ці ў белую столь глядзела б, а і за дзверы не выйшла б. Але хто ж умее ўгадаць напярод?

Ідзе Антоля, сунецца па гразі. Цёмна — ног не відаць, вусцішна, ні адзін сабака не брахне. Аж чуе, нехта насустрач — чэп, чэп. Дарма, што цямень, а Антоля адразу прызнала:

— Гэта ты, Еўка?

— А то ты, Антолю?

— Я. Я да цябе.

— А я да цябе!

Да Антолі бліжэй, толькі ж сорамна за стылую хату.

— Маладзіца, каля мяне столькі гразі, што чобаты грузнуць... Мо ў твой бок сушэй.

Завярнуліся, прыйшлі да Еўкі, паскідалі ў парозе запэцканыя боты, паздымалі куфайкі. У Евы чыста, цёпла, пасярод падлогі — вялікі, звязаны з квятастых абрэзкаў круг-палавік, на крузе кот ляжыць і хрыкае. Антолінага ката не тое што на падлогу — на печ не загоніш; бывала, як пачуе мароз, дык у самую печ залазіць. Адграбе лапай засланку, залезе і грэецца каля чыгуноў.

— А гэта што? Як бы пір? — застыла Антоля, убачыўшы на стале пачатую бутэльку «Кагору», дзве талеркі, дзве чарачкі. — Зяць хіба прыязджаў?

— Ой, не пытай, маладзіца! Не зяць, — Еўка чамусьці засаромелася, аж прыкрыла хусткаю рот. — Я ж і ішла да цябе рады прасіць...

У Антолі заблішчэлі ад цікаўнасці вочы. Вёска невялікая, тут кошка акоціцца, і то навіна.

— Дык хадзем туды, — запрасіла Еўка, пратупала ў большую хату — маленькая, зграбная, тоўсценькая, адно калываецца трохі з боку на бок, як качка. З малых гадоў дэфект, а мужчынам, наадварот, такая хада даспадобы. Толку, што яна, Антоля, і высокая, і роўная, бы дзяржак, ідзе — не кіўнецца, хоць шклянку вады на галаву стаў — не разалье, а ніхто не пакваліўся, не ўзяў, так і звекавала адна.

Еўка ўключыла тэлевізар, Антоля прысела на зэдлік, прытулілася да гарачай грубкі, высыпала на край зэдліка семкі:

— Бяры, — прапанавала, знарок хаваючы цікаўнасць, нібы кожны дзень тое і рабіла, што давала людзям рады.

— Ай, зубоў на іх шкода! — адмовілася Еўка, а ў самой толькі два ўстаўныя, і то кутнія. Засмяялася нечаму свайму, паківала галавою: — Гэта ж Кузьма прыходзіў, — сказала, сама дзівячыся такой падзеі.

— Чаго?

— Сысціся хоча. От выдумаў...

— Папраўдзе?! — Антоля нават прыліплую да губы лушпайку з семкі выцерці забылася. — А як жа... у яго ж Наста нядаўна памерла!

— Як нядаўна... У Пакровы акурат год.

Еўка ўсё пасміхалася і ківала галавою. А Антоля, агаломшаная, уставілася ў тэлевізар, у якім дон Хуліо каторую ўжо серыю ўпрошваў Сільвію пайсці за яго, глядзела, слухала і нічога не разумела. Як жа так?.. Што ж гэта будзе?.. Яны ж з Еўкаю аднолькавыя. Адзінокія. Яны ж і зрабіліся сяброўкамі, бо Еўка пахавала чалавека і як бы зраўнялася з Антоляй, ім ужо не было чаго дзяліць. Хай у Еўкі дачка, зяць, унукі — але ж далёка, у горадзе, гады ў рады наязджаюць...

І хіба кепска ім было адным? У Еўкі — карова, у Антолі — поплаўчык. Прыйдзе Кузьма, скосіць, яны абедзве раструсяць, высушаць, пераносяць памалу ношкамі да Еўкі ў хлеў. Малака, сыроваткі, сыру, само сабою, хапае абедзвюм. Бульбу трэба садзіць — Кузьма возьме каня. Паарэ адной і другой, пасадзяць... Капаць трэба — Еўка сама ідзе да Антолі, яшчэ і зяця з дачкою вядзе, калі тыя падгадалі прыехаць. Пакапаюць сабе і Кузьму памогуць. Трэба біць кабана — дамовяцца, каму перш, каму пазней. Кузьма заколе, разбярэ, — лепшыя кавалкі нясуць адна адной, і Кузьму перападае. А то, у якое-небудзь невялікае свята, калі можна лёгкую работу рабіць, надумаюцца, пойдуць да Кузьмы, памыюць падлогу. Пабеляць столь.

А хіба кепска ім было «гуляць», вось як цяпер? Калі цёпла, відно — пасядзець на лавачцы перад хатаю, калі цёмна — кіно паглядзець у тэлевізары... Тую ж Кузьмову Насту, калі яна яшчэ была жывая, абгаварыць: як яна «за сваім гора век не знае», «жыве, бы ў Бога за пазухай»... А потым, калі ў адзін год памерла Наста — «рак з'еў», — яны з той жа шчырасцю, з якой абгаворвалі, і пашкадавалі яе, і паплакалі, і абмылі... На памінках, цэлы дзень на нагах прастаяўшы, нагатавалі ўсяго, і на дзевяці былі, і на саракавінах...

Само жыццё зводзіла іх пад старасць у гэты трохкутнік: Антоля — Еўка — Кузьма. Жывіце, памагайце адно аднаму, інакш і быць не можа. І вось табе маеш. Яны пабяруцца, а ёй, Антолі, куды адной? Галавою ў пельку?..

Антоля страпянулася:

— І што ж ты надумала?

— Што ж я яму скажу, маладзічка, — у яго свае дзеці, у мяне свае, прыедуць, я ж сваім больш захачу даць, а ён сваім...

— Ідзі, маладзіца! — горача пачала ўпрошваць Антоля. — Хіба ж ты не знаеш яго дзяцей? Яны ж не п'юць, не кураць, як той казаў, баяцца дыхнуць на чалавека, хіба ж яны табе слова суперак скажуць?

— Ой, не знаю, не ведаю... А есці не так зварыш, мо ён да чаго іншага прывык, то думай, як дагадзіць...

— Што яму ўжо там выварваць — як ні згатуеш, усё лепш, чым ён сам!

Еўка пачырванела і сказала цішэй:

— Ён жа мужчына, хвароба іх знае, што ў іх там на ўме... Яшчэ ў ложак захоча.

— Дык што за канец свету, калі захоча?

— Адчапіся! Я ўжо забыла, што да чаго... Баюся.

У тэлевізары донна Сільвія, сарамліва схіліўшы чорную галаву, упарта адказвала дону Хуліо, што ёй трэба ўсё абдумаць як след. Дон Хуліо не адставаў.

— Дык гэта як, вы і распісвацца будзеце? — пацікавілася Антоля. — І пярсцёнкі мо ў вас будуць?

— От не балбачы! — засердавала Еўка. — Пярсцёнкі... Ты ж хаця маўчы, бо я твой язык знаю.

— Цю! Калі я ўжо каму што гаварыла? От сказала табе адной, каб пасмяяцца.

— А які тут смех, маладзіца? Ідзі — дэй.

Вярталася Антоля да хаты тою ж гразкай цемраю. І што за доля такая, думала, век адна, як тычка пры дарозе, у Еўкі дзеці і ўнукі, у Кузьмы дзеці і ўнукі, а ўсё мала... У каго е — таму і Бог дае...

З таго вечара заселі гэтыя словы стрэмкаю ў галаве. Звіняць у вушах, як начны камар, што і не кусае, і не адчапляецца, адно дзынчыць і дзынчыць, бы насланнё якое. Каб хоць работа была, лягчэй было б. А так — якая работа ў познюю восень? Ну, вугаль з печы, з грубкі выграбці, занесці высыпаць на ярка-зялёную, пасля атавы ўжо, траву поплаўчыка. Ну, хату падмесці. Кабана, курэй пакарміць — вось і ўся работа. Соткі падпараныя, агарод пусты, толькі пачарнелыя, паламаныя цыбукі кукурузы тырчаць паўз мяжу. Холадна, пахмурна і раніцаю, і ўдзень, а чуць пад вечар — ужо і цёмна.

Да Еўкі хочацца — пагаварыць, распытаць, — а нельга. Пасвараныя сяброўкі. Не вытрымала Антоля, на другі ж дзень расказала ўсім у краме:

— Гэта ж вяселле ў нас скора можа быць!

— А дзе ж у нас маладыя?

— Ёсць маладыя...

Еўцы пераказалі, тая засердзілася, вядома, а Антоля і сама да яе цяпер паткнуцца баіцца.

Мо тыдзень, ці пару тыдняў прайшло з той размовы, як раз, пад вечар ужо, Антоля стаіць на дварэ. Падвязвае драцянкаю плот да шула, якое абгніло ў зямлі так, што на адным стрыжні жыве, вось-вось паваліцца. Аж бачыць — ідзе Кузьма, згорбіўся, накульгваючы, і вядзе за повад Еўчыну карову, а ззаду Еўка, падганяе дубцом. Антоля прысела, стаілася. Прайшлі і не зірнулі, адно карова павярнула да яе галаву.

І без таго горка было, але ўсё думалася: а мо раптам пашэнціць? Мо пагавораць людзі — дэй; Кузьма сабе астанецца, Еўка сабе, паміраццa і зноў будуць жыць, як жылі. А цяпер так адзінока, так моташна зрабілася, што хоць ты галасі.

Каб папраўдзе Кузьма з Еўкаю вяселле рабілі — на легкавых машынах, як Антоля ў тэлевізары бачыла, з пярсцёнкамі, з фатографам — і то не было б так крыўдна, як пасля гэтай каровы на паводчыку...

Зусім раскісла Антоля. Запусціла сябе. Ні есці не можа, ні спаць, ні работу рабіць — адно ходзіць, туляецца па хаце, па двары і думае, думае. Абы-што ў галаву лезе. Уключыць кіно, каб думкі перабіць, — а ў кіно зноў дон Хуліо ўпрошвае Сільвію... Здаецца, каб пайшоў да каго ды выгаварыўся, выліў усё з душы, дык і палягчэла б. Але каму ты пра такое скажаш? Смяяцца будуць, разнясуць па вёсцы, Еўцы перакажуць... Як па́марак хто накінуў!

Да таго Антоля дайшла, што нават распранацца перастала, так і клалася ў куфайцы. Ці так, ці інакш, усё адно сну няма. Накрыецца зверху коўдраю, пад бок кот падлезе, грэе трохі, і добра.

Глянула раз у люстэрка — а людцы мілыя, сама спужалася. Счарнела, ссівела, высахла ў цёску, толькі вочы блішчаць, бы ў труса.

— Яна гэта, Еўка, па́марак нейкі накінула!..

Успомніла Насту — і яе ж Еўка абгаворвала, і яе, пэўна, звяла ў магілу. Слова нейкае знае, каб яе жытка не знала. Але ж не будзе па-твойму. Ратавацца трэба!

А як ратавацца? Пажыла Антоля на свеце, любую работу знала рабіць, а самага галоўнага, самага важнага — як памаракі здымаць — так і не ўведала. Патрэбы не было. Усё думалася — ат, гэта з другімі такое бывае, не са мною. Вось і кусай цяпер локці, сохні, марней, спі ў куфайцы...

Ведала, што стрыгуць нейкую поўсць, у сабакі, ці ў авечкі, піхаюць пад страху... Яшчэ след неяк іголкаю бяруць... Жыта неяк завязваюць у вузел... А якія словы пры гэтым казаць? Як стрыгчы, як вязаць, як запіхваць? Усё ж гэта ўмець трэба!

Успомніла Антоля, чула неяк, што жыве ў горадзе бабка не бабка, а маладзіца, якая галаву лечыць і памаракі здымае. Але зноў — у сваіх жа не будзеш распытваць, дзе тую маладзіцу знайсці. Пачні цікавіцца, уміг раскусяць, разнясуць, што «памарачная» яна, раз да знахаркі хоча...

Думала Антоля дзень і ноч і вось што надумала. Цішком, сама сабе паедзе ў горад, ніхто яе там не ведае. Пакруціцца на вакзале, на базары, падгадае часіну ды і папытае: так і так, скажа, сястра захварэла, ці дзеверка, мо вы, людцы добрыя, тут жывяце, дык ведаеце адрас...

Як надумалася, так і павесялела. Нагрэла вады, вымылася ў балеі, прычасалася, новую хустку дастала, сабрала ў сумку грыбоў белых сухіх нізку, мо з паўкіло, цыбулі вязанку, кус сала, узяла пенсію нерасходаваную за тры месяцы.

Ужо як выходзіла, крыху развідняла; убачыла — плот упаў, валіўся ў двор, згніло-такі шула. Усё адно да аднаго, але хай, не да плота, калі самой ратавацца трэба.

Добра было думаць, а прыехала ў горад, вылезла з аўтобуса на вакзале — у каго папытаць, як да каго падступіцца? Гэта ж не падыдзеш, не бухнеш у лоб: «Дайце мне адрас знахаркі», — трэба ж здалёку пачаць, абзнаёміцца, абгаварыцца, а ўжо тады як бы неўзнарок, як бы і патрэбы вялікай няма, а так сабе, успомнілася да месца: «А мо вы ведаеце, ці знаеце, хто б падказаў...»

Ніхто на Антолю пазіраць не хоча. Нікому няма справы да яе. Сунулася туды, сюды, да прыпынку падышла. Стаіць збоку мужчына, у паліто, у шапцы, з перавітай шпагатам зялёнай навагодняй ялінкай каля ног.

— Скажыце, як мне праехаць... — і засаромелася Антоля, ніяк не можа гутарку завязаць.

— Куды праехаць?

— У... паліклініку! — надумалася раптам само сабою.

— А тут ехаць не трэба, — ахвотна стаў тлумачыць мужчына. — Ідзіце гэтай вулічкай уніз, уніз...

Хіба ж Антоля сваёй раённай паліклінікі не ведае? Але абазвалася, дык мусіць ісці. Як пайшла Антоля, азірнецца — стаіць мужчына, глядзіць ёй услед. Так, азіраючыся, і дайшла да паліклінікі, маленькай, драўлянай. Увайшла ў сярэдзіну. На калідоры мала людзей, перад рэгістратурай зусім нікога няма. Антоля прытулілася да батарэі.

— А вы да каго? — аклікнула яе раптам дзяўчына з акенца рэгістратуры.

— Я так сабе зайшла, — разгубілася Антоля.

— Запісвайцеся, цётка, пакуль людзей мала, — параіла дзяўчына. — Што ў вас сама больш баліць?

— Ох, мая доня, усё баліць, і галава, і спаць не магу...

— Вось бачыце. Я вас да тэрапеўта запішу, у яго зараз няма нікога. Толькі распраніцеся.

Запісала, талончык, картачку падала. І так расчуліла Антолю гэтая ўвага, што аж даўкі камяк падняўся ў грудзях і слёзы да вачэй падступілі:

— Дай жа табе Бог, донечка... — і не дагаварыла, пабаялася, што заплача зараз.

Здала паліто ў гардэроб, сумку з сабою ўзяла. Знайшла кабінет. Пастукала, прасунулася ў дзверы.

Сядзіць за сталом малады мужчына, у белым халаце, у акулярах. Піша. Падняў галаву:

— Сядайце, — паказаў на табурэтку. — Ну што з намі такое?

— Галава мне вельмі моцна баліць, мо якое даўленне, ці што. Не сплю, не ем, — пачала Антоля, а даўкі камяк не праходзіць, ціснe і ціснe пад грудзі. Слязьмі просіцца прарвацца...

— Закасайце рукаво.

Абкруціў руку траскучай матэрыяй, «пажмакаў» грушаю:

— Даўленне ў вас нармальнае. Я вам, цётка, выпішу снатворнага, а ад галавы — цытрамону.

— Ох, мой галубок, хоць чаго-небудзь выпішыце, хоць труцізны, каб ужо выпіць, ды мо хто абмые ды закапае, каб гэтая галава дурная не балела! — і не стрымалася, усхліпнула. І яшчэ раз, і яшчэ — і вось ужо плача, аж плечы трасуцца.

Доктар адклаў ручку, паглядзеў на яе ўважліва.

— У вас ёсць хто з радні? — ціха, яшчэ больш мяккім голасам спытаў.

А Антоля раве, слова сказаць не можа, — раўчуком плыве! Доктар падхапіўся, наліў з графіна вады ў шклянку, падаў:

— Ану, перастаньце, што гэта яшчэ за навіны!

— Няма... галубок... нікога! — усхліпваючы, каўтаючы ваду і слёзы, хутчэй пачала расказваць Антоля — каб толькі доктар не сердаваў, даў ёй выгаварыцца. — Адна, як палец! Была падруга, ды замуж пайшла другі раз, бо чалавек яе памёр, а ў таго Кузьмы, за каго яна пайшла, жонка памерла, Наста, якраз год на Пакровы было...

І кажа, і кажа ўсё падрад:

— Не сплю, не ем, чалавеча, я ўжо думала, мо які памарак накінулі на мяне...

А доктар слухае, не перабівае. Выслухаў усё і сказаў:

— Цяпер зразумела. Вашая хвароба ад таго, што вы сябе дужа моцна шкадуеце, падаграваеце ўвесь час гэтае шкадаванне і яшчэ больш самі сябе растраўляеце.

— Ох, шкадую, бо хто ж мяне яшчэ пашкадуе?.. Вы вунь вады падалі — і то мне як лягчэй!

Доктар узяў чысты рэцэптурны бланк:

— Выпішу я вам не снатворнага, а вельмі харошых таблетак, мезапам называюцца, супакойваюць нервы. Спачатку трохі санлівасць будзе, а потым усё пройдзе, павесялееце, а што спаць пачнеце, дык гэта я вам гарантую.

Вось жа залатыя людзі бываюць на свеце!.. Мала, што так хутка і лёгка памарак зняў, дык яшчэ і таблеткі харошыя выпісаць хоча... Антоля раптам схамянулася — сумка ж каля ног стаіць, вось варона, так чаго добрага і забыцца магла б, і панесла б усё назад. Схапіла сумку, бухнула прама на стол перад доктарам.

— Што гэта? — адхіснуўся той.

— Грыбкоў трохі, цыбуля, сала — вазьміце, прашу вас! Вы мне такую работу зрабілі, — Антоля, як вылечылася, пасмялела, ужо настойваць не баіцца. — Грыбы хоць вазьміце, пабачце толькі якія, адзін у адзін!

— Схавайце зараз жа, яшчэ зойдзе хто... — а ўбачыў грыбы, прыцішэў. Узважыў нізку ў руцэ, азірнуўся на дзверы: — Ну, раз вы настроіліся, дык пакладзіце самі, вунь туды, у шафу, на сярэднюю паліцу...

— Усё класці?

— Ну, і цыбулю яшчэ... А вось сала забярыце, катэгарычна!

Шчаслівая — угаварыла-такі, пераканала чалавека, не пагрэбаваў, — Антоля хутчэй да шафы, апаражніла сумку, хацела цішком і сала пакласці, ды пабаялася. Трэба меру знаць.

Зусім другім чалавекам, чым калі заходзіла, выйшла з кабінета, з паліклінікі. Хоць на свет белы глянуць можна, а то ж было не дай Бог...

На вакзале, пакуль чакала аўтобуса, загаварыла першая да суседзяў — адной маладзіцы з чалавекам. Яны здалёку прыязджалі на базар па парасяты, ды спазніліся, добрых разабралі, адзін брак застаўся. Антоля паспачувала, параіла на другі раз, што калі ёсць ім у горадзе ў каго пераначаваць, дык трэба звечара ехаць, бо цяпер добрае парася купіць — праблема.

— А я ж захварэла была, — падзялілася яна. — Але вельмі добры доктар папаўся, уміг даў рады, — і так проста гэтыя словы ў яе выйшлі. З кожным бывае, хварэла і вылечылася, не трэба больш людзей саромецца і нячыстую сілу шукаць.

Тое, што маладзіца з чалавекам была, дык цяпер Антоля ані не зайздросціла і не шкадавала сябе. Побач шчасце — толькі не для яе, як тое кіно пра дона Хуліо і Сільвію: здаецца, і чутно, і відно, і блізка — экран можна памацаць, а чужое, далёкае-далёкае, немагчымае...

У аўтобусе ўжо ўспомніла, што таблетак купіць забылася, і аптэка ж была на вакзале. Хай, мо ўжо другім разам калі.

Не заходзячы да сябе, як толькі з аўтобуса, перш-наперш кінулася на той канец вёскі — да Кузьмы. Няма нікога, хата на замку. Антоля — на другі канец, да Еўкі. Аж, не даходзячы да сваёй хаты, яшчэ здалёк бачыць — ідзе там нейкая работа. Антоля бліжэй — і вачам не верыць: новенькі плот амаль гатовы, Кузьма шула ўкапаў, прыбіў новую жэрдку, цяпер дошкі мацуе, а Еўка збоку стаіць, цвікі падае.

Антоля як была, так да яе:

— Мая ты галубка, а я ж думала...

— Цішэй ты, — цыкнула Еўка. Адышліся ў двор: — Ён дарма што кажа — глухі, — кіўнула на Кузьму, — а што не трэба, уміг пачуе. Я ж не паспела табе сказаць тады, што да яго нейкая баба з Залозак, таксама ўдава, сваталася, у прымы хацела пераманіць... А каб я не перахапіла і ён пайшоў? Што б мы без яго рабілі? Ты ж знаеш, які мой зяць, дарма што разумны, а на работу нікудышны, ён жа ні араць, ні малаціць, ні каня запрэгчы, ні кабана забіць... А гэты будзе нам мужчынаю, адзін на двох. Я ж і рабіла з такім, як той казаў, прыцэлам...

Так і прайшоў у Антолі памарак, дзякуючы добрым людзям. Зняўся сам сабою, як і не было яго. Хоць пад старасць, а і ёй шчасце выпала.

*1998 г.*

## САКРЭТ

Аднойчы Павал зразумеў, што далей цягнуць нельга. Вось-вось мог знайсціся яшчэ адзін такі ж «разумны», і апярэдзіць. Таму для рэалізацыі свайго даўно чаканага, такога заманлівага (і даволі подленькага) плана ім быў выбраны ўжо заўтрашні, будні дзень. Нікога ў рэдакцыі, дзе працаваў, не папярэдзіўшы, нікому нічога не сказаўшы, зраніцы ён проста паехаў на вакзал, купіў білет, сеў у аўтобус, разгарнуў газету, унурыўся ў яе, а апалове дванаццатай нага яго ступіла на высушаны летнім гарачым сонцам перон аўтастанцыі зусім незнаёмага мястэчка, якое дагэтуль жыло толькі ў яго ўяўленні.

Аўтастанцыя і плошча вакол яе з’яўляліся цэнтрам. Некалькі дарог, асфальтаваных і звычайных, земляных, як да Рыма, вялі ўсе як адна да будыніны сельмага пад назваю «Гастраном». На самым відным месцы, ледзь не пасярод плошчы, тырчала прыбіральня — нават не цагляная, а збітая з дошак; уверсе на дзвярах какетліва былі прарэзаны адтуліны ў форме сэрцаў. Якім да болю знаёмым усё гэта раптам падалося!.. І гэты гастраномчык, каля ганка якога зямля ўсеяна «бычкамі» і коркамі з-пад піва; і гэтая прыбіральня, у якой Павал ніколі не быў, але ведаў — усярэдзіне будзе там выкалупленая сцізорыкам паміж дошак шчыліна, каб падглядваць за жаночай палавінаю; і гэтыя дарогі, якія чым далей разыходзяцца ад цэнтра ўглыб мястэчка, тым менш на іх асфальту, а больш пылу і каровячых «аладак», тым вышэй лапухі паўз платы, тым часцей яны разгаліноўваюцца, расцякаюцца на вулачкі, завулачкі і проста сцежкі, захінутыя травою, — сцежкі маленства, на якіх так часта збіваў Паўлік босыя ногі, не ўгледзеўшы камня...

Нічога дзіўнага, што патрэбная хата адшукалася адразу. Трэба было метраў дзвесце прайсці ад аўтастанцыі, затым вось тут, дзе калонка з прывязанай да ручкі цаглінаю, павярнуць улева — і ўсё, вунь шыльда на плоце — «завулак Маставы». Аднак Павал яшчэ дастаў з нагруднай кішэні кашулі паперку і зверыўся. Усё правільна: Маставы, дом тры.

Вуліца была як вуліца, і хата як хата. Стаіць сабе ў прысадзе, свеціцца на сонцы сваім белым шыферным дахам сярод зеляніны яблынь і вішняў. Ціхая такая, задуменная хатка, стомленая ад гэтага гарачага лета, стаіць, марыць хутчэй ужо вымыцца дажджамі, ды высушыцца вятрамі, ды нарэшце соладка заснуць пад белай коўдрай снегу.

Урачыстасці не хапала. Не ў джынсах пажадана было быць, а ў касцюмчыку, пад гальштукам, дзвярыма «Волгі» ці «ўазіка» кал-

гаснага ляпнуць... Павал пасміхнуўся. І калі пачаў намацваць праз дзірку ў веснічках нязвыклую, для чужой рукі наравістую клямку, адзначыў, што вось ужо ў другі раз (першы — замест ладнай хаткі чакалася ўбачыць развалюху) уяўленне падводзіць яго. Сабака не брахаў. Але ж павінен быць сабака! Павінна сядзець у двары кампанія алкашоў, ну, на крайні выпадак, два алкашы. Куча пыльных парожніх бутэлек з-пад гарэлкі, якія чамусьці амаль ніколі не прымаюць, павінна ўзвышацца пад плотам. Баба сварлівая і заплаканая павінна быць...

Ён справіўся сяк-так з клямкаю і зайшоў у двор. Памылка адно падагрэла цікавасць. Як у добрага выжла, што напаў на след, так і ў журналіста Паўла ў прадчуванні блізкай здабычы абвастрыліся пачуцці. З гэтага моманту ён павінен усё запамінаць, адзначаць і ў памяць адкладваць кожны свой крок. Сланечнікі ў агародчыку пад яблынямі, гуркоў загончык, пчолы над жоўтым іх квеценем — Божа мой, калі гэта ўсё было!..

Чысты, без травы дворык. Падмецены. Па дарожцы, выкладзенай з чырвонай цэглы, Павал пайшоў да веранды, нагінаючыся, — так нізка цераз плот перавешваліся галіны; не было ніводнай падпоркі. Тым часам пачулі яго і без сабакі, і ўбачылі. Выскачыла на ганак жанчына, жанчынка, лепш сказаць, расточку Паўлу да грудзей; канечне, такой навошта падпіраць галіны? Выскачыла, застыла, рагі хустачкі цярэбячы, — чакала, па беларускім звычаі, пакуль падыдзе і першы павітаецца чужы чалавек. І на яго сціплую — рэпеціраваў некалі, яшчэ ў студэнцтве, перад люстэркам, на розныя выпадкі жыцця падбіраючы, — усмешку і на «дзень добры» адразу ж абазвалася: «І вам добрае здароўе», а сама прытушыла ў насцярожаных вачах вечную гэту трывогу, спадчыну гэтую горкую, савецкую: толькі бяды можна чакаць ад такіх вось раптоўных наведак. Усё ж была яна зусім не злосная, не заплаканая, на жонку алкаша не падобная. І апранутая даволі ахайна: фартушок, кофтачка імпартовая (з «гуманітарнай» дапамогі неданоскі, падумаў Павал, і не памыліўся), у маленькіх, гумовых, якія дзеці ў дождж абуваюць, боціках — не забываць нічога, усё запамінаць!..

— Гэта ваша прозвішча... — Павал прачытаў з паперкі, хоць помніў гэтае прозвішча не горш, чым уласнае.

— Маё. А што?

— А кім вам даводзіцца... — ды ізноў з паперкі.

— Сынам... А што такое?

— Сынам? — гэты новы, даволі нечаканы паварот прымусіў яго на міг задумацца. Калі даўно, яшчэ мінулай вясною ён упер-

шыню адкрыў у друку плагіятара і паспрабаваў ўявіць яго, толькі два шаблонныя тыпы ўпарта яму маляваліся: першы — стары, альбо малады, што бывае часцей, графаман, замучаны вяртаннем сваіх рукапісаў, і другі — звычайны якісь п'яніца, праўда, з сярэдняй ці нават з вышэйшай адукацыяй — такіх поўна цяпер, якому не хапала на банальную апахмелку. У рэальнасці ўсё атрымлівася інакш. Гэты «клапатлівы сынок», гэты хітра-абачлівы перастрахоўшчык не належаў ні да першага, ні да другога тыпу. І адразу ж новымі гранямі бліснула для Паўла гэтая гісторыя…

— Бачыце, — пасля кароткай замінкі пачаў ён, — я сам журналіст. І па заданні сваёй рэдакцыі хачу напісаць пра вашага сына ў газету. Пра яго творчыя поспехі. Адкажыце мне, калі ласка, усяго на некалькі пытанняў, гэта займе не больш пяці хвілін.

Вось так размаўляць трэба! Раз — і супакоіўся чалавек, і акрыяў, і ўжо шчаслівы ад таго, што не спраўдзілася благая навіна, і ўжо ўсю душу табе вывернуць гатовы…

— Дык чаго ж мы стаім? — праходзьце ў хату! Дый перакусіце заадно, вы ж з дарогі! У мяне і капуста ў печы — як ведала, і з грыбамі, і з мясам…

— Не-не, не магу. Няма калі, — гэта было б тое самае, як паесці гэтай капусты з грыбамі, а потым напляваць у міску. — Давайце лепш у двары пасядзім, дзе-небудзь на лаўцы, — прапанаваў Павал, нават яшчэ не ведаючы, ці ёсць тут увогуле лавачка, але азірнуўся і ўбачыў яе: у закутку каля плота, заценёная дрэвамі, маленькая, акурат двум прыляпіцца, і нізенькая — пад гаспадыню.

— Ды і куру я, — дадаў ён.

— Ну і што, курыце на здароўе! Мае абодва курылі, дык я любіла!

Аднак з неахвотай пайшла ўслед за ім. Перш чым сесці, абмахнула фартухом дошку. У высокага Паўла, калі ён апусціўся на лаўку, калені ледзь не дасталі падбародка.

— Абодва — гэта хто? — спытаў ён, забаўляючыся з цэлым, цвёрдзенькім, нераспакаваным яшчэ пачкам цыгарэт.

— А чалавек мой, і сын. Чалавек памёр, а сын у горадзе, на заводзе — ж ведаеце, мусіць? Дык і курыць няма каму…

— Вашага сына, — усё яшчэ мякка адказаў Павал, — я ведаю толькі завочна. Па публікацыях у газетах і часопісах. Дык ён, значыць, друкуецца, і ўказвае ваш адрас, так? І вы атрымліваеце за яго ганарар… ну, грошы па-нашаму, — пераклаў ён.

— Так! Па пошце мне прысылаюць. Я ўжо нарадавацца не магу, я ўжо ж не думала, не гадала, што ён калі ў людзі выб'ецца… Піў жа

ён у мяне, крэпка піў — вы ж мо ведаеце, і лячыўся, і... — не дагаварыла. — Усяго было! Аж во ўзяўся за розум, дзякаваць Богу...

— Ды няўжо гэта такія вялікія грошы? — сказаў ён са шчырым здзіўленнем. — Ну, я сам друкуюся — гэта ж капейкі.

— Канечне, вам, маладому! А мне ж гэта як з неба сыплецца! Я хоць і сабе што купляць стала, і хаваю — мо ўнукі калі будуць, ён жа нежанаты пакуль, але мо знойдзе, дасць Бог...

— Мо знойдзе, — пацвердзіў Павал. — Скажыце, а даўно ў яго талент прарэзаўся? Даўно яго творчы сверб ахапіў... ну, — як і ў выпадку з ганарарам вымушаны быў папраўіцца ён, — як гэта ваш сын ні з таго ні з сяго друкавацца пачаў, пісьменнікам зрабіўся? Гэта ж не так проста. Многія гадамі вучацца, начамі не спяць — чытаюць, пішуць, а ўсё не атрымліваецца. А ў яго неяк адразу, дужа лёгка ўсё гэта пайшло.

— Дык а ён у мяне заўсёды быў башкавіты! І ў школе хвалілі, і ў арміі, і…— зноў не дагаварыла. — Дзе б ён ні быў, хвалілі! Гэта каб не друззя, каб не тая кампанія, што яго ўцягнула, то ён залаты быў бы!..

— Дык ці даўно?

— Гады паўтара, мо два, — адказала старая, а Павал папраўіў яе ў думках: не паўтара, і не два, а роўна год і сем месяцаў, калі ўжо быць дакладным. Яму добра запомніўся той цёплы травеньскі дзень, чацвер, здаецца, калі ён, пераглядаючы ў рэдакцыйным кабінеце прэсу, у адной з газет зусім выпадкова натыкнуўся на знаёмае апавяданне. Ну, так і ёсць. Твор рускага савецкага пісьменніка С. Маконіна. У Паўла дома — не ў гарадской кватэры, дзе ён перыядычна праводзіў «чысткі», пазбаўляючыся ад рознага літаратурнага хламу, а ў вясковай хаце — нават павінна валяцца недзе гэтая тоўстая кніга. Яму і ўбіўся ў памяць гэты Маконін, бо Павал акурат еў тады, адной рукой перагортваючы занудныя старонкі, а другой **макаючы** аладкай у падсмажаную на сале яечню…

Аднак у газеце нідзе не было сказана, што гэта пераклад з рускай. Над апавяданнем — вельмі пасрэдненькім, дарэчы, — красаваліся іншыя імя і прозвішча. Спачатку ён не надаў гэтаму значэння. Адно на якую хвільку пацешыла, што вось нехта з калег даў маху, а ён, «пільны», «начытаны» Павал, угледзеў. На двары пад самым акном падстрыгалі з газонаў ранкюю веснавую траўку. Трашчалі, бы мапеды без глушыцеляў, пыхкалі сваім бензінавым дымам сенакосныя машыны — гэтая пародыя на такі ўрачысты, ціхі, такі любімы працэс касьбы, гэты няўклюдны плагіят з вострай, звонка адкляпанай, аб росныя спелыя травы сточанай літоўкі, якая не косіць, не рэжа, не

брые і не свішча, а менавіта спявае ва ўмелых руках… І не падзяліўся ні з кім Павал сваёй знаходкай таму, што адразу ж забыў пра яе, як толькі падышоў і шчыльна зачыніў акно. І пазней ніколі, магчыма, не згадаў бы, каб не звычка сачыць за літаратурнымі навінамі і каб не дапамога самога плагіятара, які да катэгорыі гультаёў яўна не адносіўся.

Перакладзеныя з рускай мовы творы яго пачалі з'яўляцца больш-менш рэгулярна. То тут, то там, на старонках таго ці іншага выдання Павал міжволі натрапляў на знаёмыя, несумненна, некалі ім чытаныя навэлкі, кароткія апавяданні, феналагічныя замалёўкі, экалагічныя нарысы (адзін быў пра возера Нарач, дзе пад шум кедраў і лістоўніц чужыя сказы байкальскімі хвалямі білі ў панурыя прыбярэжныя стромы).

Плагіятар працаваў пад рознымі псеўдамнімамі, але пакрысе Павал навучыўся беспамылкова распазнаваць гэтую руку. Спачатку ён нават хадзіў у бібліятэку (з адчуваннем грыбніка, што выпраўляецца з пустым кошыкам у восеньскі, густа-белым туманам захутаны лес), і там, корпаючыся ў падшыўках старых савецкіх і новых расійскіх часопісаў і газет, некалькі разоў перажыў ціхую прыемнасць ад удачы. Потым гэты занятак кінуў. І без таго было зразумела, што чалавек здзірае ўсё ад першага да апошняга слова, ад кропкі да коскі. Павалу часта ўяўляўся сам працэс: позні вечар, круг святла на стале, галава набок, кончык языка злёгку прыкушаны, з-пад пяра шпарка выскакваюць літаркі, а побач, заўжды пад рукою — «Русско-белорусский словарь» пад рэдакцыяй Атраховіча-Крапівы. Не заўсёды і ў бібліятэцы перападалі знаходкі. А галоўнае, Павал з уласнага вопыту ведаў, нельга дапускаць, каб хобі ператваралася ў мэту, у працу. Тут трэба было злавіць гэты момант ператварэння, спыніць яго, застапарыць і балансаваць на ім, як на вузкай кладцы: вось у чым асалода, шаноўныя…

Канечне! На добры лад, калі б па-людску, не ў бібліятэку трэба было ісці, а да першага, які «прамаргаў», рэдактара. Распіць з ім ціхенька бутэльку, пасмяяцца з недарэчнасці, папляткарыць крыху пра сяброў-літаратараў і выйсці з кабінета нармальным чалавекам, хоць і з захмеленай, праўда, галавой, затое з чыстым сумленнем. Але тут пачаў ужо спрацоўваць нейкі дурны азарт. Ды чаму адзін ён, Павал, павінен быць такім пільным? Такім начытаным? Тут ужо сам плагіятар адыходзіў на другі план, робячыся яму ледзь не саюзнікам, а на пярэдні выступала праверка сябе суадносна іншых. Проба, хто на што варты — калі не ў жыцці, дык прынамсі ў літаратуры. І каб зараз хтосьці знайшоўся і выкрыў плагіятара без яго, Павал толькі

парадаваўся б, як радуюцца аднадумцу, толькі ўздыхнуў бы з палёгкаю, як лёгка бывае, калі тваю доўгую і блытаную думку субяседнік пераказвае адным кароткім разумным сказам.

Але ўсе маўчалі. Час бег. Плагіятар, акрылены поспехам, смела працаваў.

Пачаўшы з месцаў аддаленых: часопіс «Уладзівастоцкія зоры», альманах «Амур», тыднёвік «Россыпы Алтая» — ён памаленьку прасоўваўся бліжэй да цэнтральнай і еўрапейскай частак: курскія «Славяне», вяцкі «Набат»…Цікава было назіраць у гэтым руху пэўную заканамернасць, нейкую адваротную прагрэсію: чым хутчэй набліжаўся ён да Еўропы, тым больш аддаляўся ў часе. Мільгануў пераклад на беларускую фрагмента «Вясковых нарысаў» Авечкіна… А вось ужо ранні Паўстоўскі, бесталкова падпраўлены і няўмела перакладзены, дзе кожнае «непаўстоўскае» слова біла па вачах і па нервах, крыкам крычала: «я не на сваім месцы, забярыце мяне адсюль, замяніце мяне!..» Калі ў адным з часопісаў Павал убачыў пераклад школьна-праграмнага Прышвіна, цярпенне яго лопнула. Тады ён і зразумеў, што больш цягнуць нельга.

План будучага артыкула быў абдуманы ім яшчэ раней. На першы погляд бязвінны гэты фельетончык меў двайное дно. У з'едлівых параўнаннях, у дасціпных метафарах, у слоўных выкрунтасах, якія так падабалася смакаваць пра сябе Паўлу, яшчэ больш іх завастраючы, прыхавана была каверза. Гэты артыкул дубінай павінен быў апусціцца на бедныя галовы ні аб чым не падазраючых яго калег, катком для ўкладкі асфальту па іх праехацца, і хоць вельмі хутка, Павал ведаў, яны абтрусяцца, распрамяць плечы, аб'ядноюцца і будзе яму тады «атрымоўвай, вёска, трактар», пачнецца тады ўкладка «пад асфальт» яго самога — хоць ён выдатна ведаў усё гэта, але ані не баяўся. Ён адчуваў у сабе сілы і быў гатовы да змагання, нават і супраць усіх. Яшчэ весялей было — адна думка пра той выклік, які яму неўзабаве кінуць, бударажыла кроў, надавала агрэсіўную энергію душы і целу.

Не хапала апошняй кропкі, апошняга мазка пэндзлем — гэтай паездкі. Дабыць каардынаты аказалася лягчэй лёгкага. Ён проста пазваніў у рэдакцыю, дзе апошні раз быў надрукаваны плагіятар, і яму прадыктавалі адрас.

І вось ён тут. І цяпер ведае ўсё. Несумненна, з гэтымі новымі фактамі, з гэтымі папраўкамі артыкул яшчэ больш ажывае. Плагіятару, хутчэй за ўсё, знойдзецца апраўданне. Не дзеля таннай славы, не дзеля апахмелкі за небагатыя ганарарныя грошы ідзе чалавек на непрыгожыя свае ўчынкі — пра родную маці дбае. Тым больш

выпукліцца на гэтым фоне... — думаў Павал, напаўвуха слухаючы жанчынку.

Ён сядзеў з ёю побач на лаўцы, смактаў цыгарэту і ўсё ніяк не мог наважыцца перайсці да галоўнага. З агарода пахла яблыкамі і кропам. На серабрыстым гамачку павуціны, развешаным паміж лаўкай і плотам, вісеў цыліндрык попелу. Сонца прабівалася праз цень галін над галавою, звінела лета і недзе далёка-далёка, куды сто гадоў ідзі — не дойдзеш, «закідалі хлопцы вуды, хто на хлеб, на чарвяка»...

Нарэшце ён старанна ўтаптаў недакурак у цвёрдую каля лаўкі зямлю і падняўся.

— Я ўжо такая радая, мо хоць пад старасць...

— Вы ведаеце, што ваш сын злодзей? — абарваў ён яе.

Такога вераломства яна не чакала, зусім не была падрыхтаваная да гэтага. Таксама падхапілася, спалохана на Паўла гледзячы, відаць, напужаная не так гэтай раптоўнай пераменай у яго паводзінах, як ягоным голасам, што зрабіўся без дай прычыны такім строгім, халодным, і ў якім яна пачула варожасць да сына.

Аднак хутка справілася з сабою. Выраз страху на твары змяніўся на рашучасць. Цяпер яна гатова была бараніць сваё дзіця да канца і любымі сродкамі.

— А вы на яго не нагаварвайце, — прамовіла таксама і холадна, і строга. — Як ён краў, то ён за сваё адседзеў! Адмучыўся, бедны, ні за што ні пра што! Гэта ж не ён — кампанія крала, а як ён мяккі, за сябе пастаяць не можа, дык на яго і спіхнулі! Папаездзіла я на тую Апанскую, папавазіла перадач, — голас яе ўздрыгнуў, яна ледзь не ўсхліпнула, а ў насцярожаных вачах, якія не спускала з Паўла, чыталася: можа, гэтым цябе праняць? Можа, на шкадаванне клюнеш?

— У кампаніі ён краў, ці адзін, на Апанскай сядзеў, або на Уманскай — мяне гэта мала цікавіць, калі шчыра; я нават не ведаў аб гэтым. Я ведаю толькі, што цяпер ён крадзе чужыя творы. Разумееце? Ён перапісвае тэксты з газет, часопісаў, кніг і друкуе іх як нібыта свае.

Маці плагіятара слухала з недаверам.

— Дык а вам хто так не дае рабіць? — сказала яна.

— Гм... Не дае так рабіць, — паўтарыў Павал, мімаходзь любуючыся яснасцю яе мыслення. — Але так нельга рабіць! Проста нельга, і ўсё. Як вам лепш растлумачыць... Ваш сын выбраў самы лёгкі шлях у літаратуры. Яму не вядомыя творчыя пакуты. Ён ніколі не адчуе слодыч знаходкі аднаго-адзінага патрэбнага слова, — панясло Паўла, — ён не зможа ажывіць нудны тэкст трапным мастацкім вобразам. І гэта не кажучы пра этычны момант, нават крымінальны...

Яна нічога не разумела.

— Мала таго: ваш сын падстаўляе іншых людзей — рэдактараў, пісьменнікаў. Яны ж добрыя, наіўныя, даверлівыя, як дзеці. Іх вельмі лёгка падмануць. Разумееце? Яны нараджаюць свае творы ў пакутах, таму ім і ў галаву не прыходзіць, што нехта можа проста так, без дазволу, беспардонна выкарыстоўваць плады іхняй працы…

— То чаго ж яны не глядзелі? Глядзець трэба было!

Проста абяззбройвала гэтая мілая логіка. Але і тут Павал не змог не адзначыць, што вось і яшчэ адным цікавым бокам раскрываецца гэтая гісторыя: ды не зможа ён, і ніхто ў свеце не зможа даказаць маці, што яе сын горшы за астатніх, як не дакажа ёй і тое, што красці духоўнае — гэтаксама непрыгожа, такі ж грэх, як і машыну дроў з лесу ці мяшок камбікорму з фермы.

Размова была скончана. Больш не было аб чым гаварыць.

— Калі гэта выкрыецца, і вам, і яму сорамна будзе, — толькі і сказаў ён напаследак.

— Выкрывайце! — адрэзала яна. З добрай, даверлівай жанчынкі, якая звала яго ў хату, і збіралася пакарміць, і вы褉івала яму ўсю душу, яна на вачах ператварылася ў каргу. — Мала яму ўсяго было, дык яшчэ і вы… Дзяўбіце!

Замест развітання Павал вінавата пасміхнуўся ёй і пайшоў да веснічак. А ўслед яму прагучала:

— Як вы завідваеце, дык ён жа не вінаваты!

— У чым ён не вінаваты? — павярнуўся Павал.

— Што лепей за вас!..

Заставалася толькі развесці рукамі. Такая вось паездка, такая гутарка, такія з яе высновы...

На вуліцы ён папіў вады, нагнуўшыся над калонкай, расставіўшы шырока ногі, каб не абпырскаць чаравікі.

І ўсё ж не стыкоўвалася штосьці. Не вытанцоўвалася. Шпунты не траплялі ў пазы, зубчыкі не чапляліся адзін за другі і механізм не жадаў круціцца. Ды які механізм? — увачавідкі ўся гэтая задума з «выкрываннем» рассыпалася ў прах. Ну, з'явіцца яго артыкул. Гэта ж проста Госапаці (Госпадзі), як усклікае кітаец у булгакаўскай п'есе! Пазвоняць пару прыяцеляў, павіншуюць няшчыра. Нехта на вуліцы руку пацісне, адводзячы вочы. Усё. Усё!

І за міг гэтага таннага «ўзвышэння», гэтага фальшывага самалюбавання ён павінен будзе прадаць свой сакрэт? Развітацца з ім? Зняславіць свайго, які аднаму яму, Паўлу належыць, плагіятара? Як усё гэта смешна, як несур'ёзна... Артыкул! — думаў Павал, ідучы да аўтастанцыі: — Які артыкул, калі тут трэба маўчаць, як рот зашыўшы!

І справа нават не ў тым, што ён нейкай прыпыленай віхурай уварвецца ў чужое жыццё і проста так, ад няма чаго рабіць, пабурыць гэтае маленькае, крохкае, беднае шчасце, і не ў высакароднасці ягонай, і не ў практычна-эгаістычных пастулатах тыпу: «пакрый чужы грэх, табе Бог два даруе», і нават не ў гэтай маленькай, у гуманітарных абносках жанчынцы, якая вазіла на «Апанскую» перадачы, і не ў яе шалапутным сыне, якога звяла «кампанія», — механізм ніколі не закруціцца, выкрывальніцкі артыкул ніколі не павінен з'явіцца па той простай прычыне, што ўся гісторыя не вартая выедзенага яйка. Тут не знаходзіцца склад злачынства. Віна плагіятара, як і рэдактараў, што за ім не дагледзелі, была мінімальная, калі ўвогуле хоць якая была. Ну, хто з нашага камп'ютарнага пакалення сядзе зараз спецыяльна чытаць таго ж Паўстоўскага? Ці Прышвіна, не кажучы пра Авечкіна? А так, можа, хоць дзякуючы плагіяту, урыўкамі, з газеты, хоць неяк падспудна, хоць у перакладзе на беларускую мову раптам нешта разумнае-вечнае возьме ды і пасеецца ў галовах?

Нібы цвярозы пасля п'янкі, Павал цяпер не пазнаваў сябе ранейшага. Ён толькі дзівіўся, як падобная лухта — выступіць з нейкім артыкулам — магла жыць у ім столькі часу? Няўжо яна ўсур'ёз ім дапускалася? І смешна было, і крыху сорамна. Ну, а мы ўсе, літаратары, «творчыя людзі», — пацягнула яго на філасофію, — што, заўсёды арыгінальныя? У нас усё новае, нічога і нікога мы не паўтараем?

Вось адкуль гэтая ілюзія пазнавальнасці. Вось чаму ўсё вакол здаецца такім знаёмым, нібы быў ужо некалі тут, і не аднойчы, усё тут бачыў і ведаў раней: і гэтае мястэчка, і гастраном, і прыбіральню, і пустую залу аўтастанцыі, куды ён якраз увайшоў і апусціўся, як у ночвы, у адно з тых нязграбных, мулкіх, драўляных крэслаў, якія, баючыся каб іх не ўкралі, замацоўваюць па пяць штук жалезным прэнтам. Каса яшчэ не працавала. У прахалоднай цішыні было чуваць толькі, як звіняць мухі і б'юцца аб высокія мутныя шыбіны. І гэта таксама паўтаралася — як і нядаўні пах кропу з агарода, як і хатка, у якой ён не быў, але ведаў, што будзе там «у нос біць» духам выпаленай печы, што будзе там стол, пакрыты цыратай-«клаёнкай» у сінія і белыя квадраты, са слядамі ад патэльні; як і капуста «з грыбамі і з мясам», якую ён не еў, але ведаў, што, перш чым адправіць у рот лыжку, трэба «падзьмухаць» на яе, сабраўшы вусны ў «курыную гузку», а калі патрапіцца грыб, падсаліць яго ў лыжцы і «ўцягнуць» у сябе «з прыцмокам»... Усё на ўсё было падобна, усё незлічонае мноства разоў паўторанае — і ў жыцці, і ў літаратуры як люстэрку жыцця. Ды па вялікім рахунку, — тут адчынілася акенца касы і Павал паспяшаўся туды, — па вялікім рахунку плагіят закладзены

ў самой прыродзе, у гэтай цыклічнасці яе, у гэтым вечным кручэнні кола! Урэшце, лета падобнае на ўсе леты, якія былі раней, і восень будзе падобная на ўсе ранейшыя восені: надвор'ем, тэмператураю, барвамі, пахамі, настроем… І калі ўжо нават тут, у прыродзе, усё капіруецца, усё «здзіраецца», усё плагіят — калі на тое пайшло, дык што казаць пра жывое, суб'ектыўнае, чалавечае?..

Ён паглядзеў на білет. Месца дасталося наперадзе і каля акна, а нумар білета быў 7355. Добры знак!

Ужо ў аўтобусе ён падумаў, што жыць ягонаму сакрэту нядоўга. Канечне ж, небараку-плагіятара, да якога Павал, аказваецца, прывык, як да кубка кавы кожнае раніцы, як да нумара тралейбуса, якім дабіраецца на працу і назад, хутка выкрыюць. Ну, што ж! І быць таму. Як мінімум застанецца ў душы адчуванне, што ён мог зрабіць хоць і невялічкую, але гадасць, і не зрабіў. Ужо добра. А пакуль хай усё будзе, як ёсць. Пакуль што:

— Цсс, маўчаць, — прамармытаў ён уголас, і толькі цяпер схамянуўся, заўважыў, што ён не адзін, што ў крэсле побач з ім суседка. Здзіўлена на яго пазірае. А нішто сабе, харошанькая…

Ён страсянуў галавою, каб хоць такім, фізічным, дзеяннем пазбавіцца ад ужо вырашаных, ужо нецікавых яму думак.

Самы час быў знаёміцца.

*2001 г.*

## ЧАРНАВІКІ І ПІСЬМЫ

Шаноўны (*закрэслена*). Паважаны (*закрэслена*). Сцяпан Цім… (*закрэслена*).

Не, і яшчэ раз не! Ніякі ты не шаноўны, не паважаны; не падымаецца рука пісаць і не паварочваецца язык называць цябе па-бацьку і на «вы», таксама як і адмаўляюцца вочы верыць таму, што сёння ўбачылі: у газеце... тваё фота! З тваім прозвішчам унізе, з указаннем новай тваёй пасады… Прабач, заўсёды блытаў і блытаю вашыя гэтыя шарашкіны канторы, таму не магу сказаць, у якім з катухоў будзеш ты цяпер сядзець; затое ведаю, што гэта табе, Сцёпа, дадзена ўлада вырашаць чужыя лёсы, што гэта да цябе трэба будзе звяртацца па самых розных пытаннях. Запісвацца да цябе на прыём. Чакаючы, туляцца па калідоры ці нудзіцца ў «прылазніку» пад касым прыцэлам вачэй сакратаркі — а ў цябе, канечне, і такая з'явіцца, як будзе і свой цэлы штат з намеснікаў, падначаленых, лёкаяў, шафёра, ці шохвера, як ты некалі казаў, памятаеш, Сцёпа? у школе? — калі

на пытанне, хто кім хоча стаць, ты першы цягнуў руку і аб'яўляў: «Я — дык шохверам начальнікаў вазіць!» — вяршыня ўбогіх тваіх дзіцячых мараў… Хто, у якім сне мог тады прысніць, што прыйдзе час і будуць вазіць цябе самога!

…Затым, атрымаўшы паблажліва-літасцівы сакратарскі дазвол, стукацца ў дзверы. Ціха кашляць у парозе, просячы да сябе ўвагі. Бо ты ж будзеш заняты, ты ж будзеш унураны ў важныя паперы (Божа мой! — ты і паперы, ушчыкніце мяне!) і не адразу адарвеш ад іх сваю вялікую — не ў сэнсе мудрую, а ў прамым, анатамічным значэнні — дэфектыўную, непрапарцыянальную ў параўнанні з тулавам галаву.

*

Галавач, Галавень, Галавешка, Апалонік… Як толькі не дражнілі цябе ў школе, як толькі не абзывалі — у вочы, а часцей — за вочы, бо не было ва ўсёй нашай васьмігодцы чалавека, у якога б ты не сядзеў у пячонках, якога ты прамінуў бы, не пакрыўдзіўшы: меншых — тумакамі і кухталямі, разумнейшых — брыдкімі мянушкамі, старэйшых і мацнейшых — саладжава-ільсцівым падхалімствам. Ды нават калі ты маўчаў, не рабіў нічога, а толькі хіхікаў, ці падхіхікваў (і цяпер яшчэ, успамінаючы тыя гукі, мароз па скуры і адчуванне шоргату пенапласту па сухім асфальце), крыўдзіў ты ўжо адным сваім карыкатурна-злавесным выглядам, сваёй адвіслай задніцай, сваім рабым тварам і круглай, як шар, галавою, сваімі кароткімі ножкамі і нечакана доўгімі, як у малпы, учэпістымі рукамі, неахайныя пазногці на якіх цвілі белымі плямкамі — на шчасце, трэба ж! — нават калі ты нічога не рабіў, Сцяпан, проста непрыемна было пазіраць на цябе і сорамна і крыўдна рабілася за чалавека як за «прадукт вяршыні эвалюцыі».

Аж недзе ў шостым ці ў сёмым класе нечакана для ўсіх і для сябе самога ты паспраўнеў, выцягнуўся ў рост, нават рабаціння з твару сагнала, нават цвет з пазногцяў прапаў… Думаю, з гэтага — са зменаў біялагічных, гарманальных, з ператварэння брыдкага качаняці ў… не, не ў лебедзя, у звычайнага качара, усё і пачалося; недзе тады, калі ты гадзінамі прастойваў перад люстэркам, сабою любуючыся, цябе і «асяніла» простая, як сем капеек, сентэнцыя: раз нейкія звышнія сілы (скрыпеў твой нязвыклы да перагрузак мозгавы апарат) вось так, у адначассе, змаглі зрабіць з мяне больш-менш нармальнага хлопца, дык чаму б тым самым сілам не здзейсніць такое ж ператварэнне з маім унутраным светам? А што? Раптам прачнуся

аднойчы — і акажацца, што я — ужо не я, а разумны, адукаваны, паважаны… Цікава!

*

Яшчэ і як. Але самае цікавае, самае смешнае і самае жахлівае, што ўсё спраўдзілася, усё амаль так і адбылося. Ты — на вяршыні. Ты — увасабленне тупасці, зайздрасці, жорсткасці, хамства, ты — збіральны тып усяго негатыўнага, што ёсць у маім народзе, раптам, як у чароўнай казцы, узняўся над гэтым народам, займеў права вяршыць чужыя лёсы і распараджацца імі…

Сцёпа! Апамятайся! Пакайся, пакуль не позна, потым перад Богам табе скідка будзе. Выйдзі на плошчу, укленчы, пацалуй зямлю ці асфальт, раскажы ўсім, хто вакол збярэцца, якія грахі на табе, як ты да такога жыцця дакаціўся!

Не выйдзеш. Не раскажаш. Бо даўно ўжо глухой чорнай ноччу закапаў усё, аб чым сорамна ці страшна ўспамінаць, у глыбокую яму, насыпаў зверху груд і ўбіў у гэтую магілу свайго мінулага асінавы кол. З твайго дазволу, Сцяпан, — давай крыху ў той яме пакапаемся? Зробім, так бы мовіць, эксгумацыю… Спакойна, стрымана, няспешна — куды нам спяшацца, праўда?

Кладу вось зараз руку на сэрца, проста сілком прымушаю сябе згадаць хоць штосьці, хоць маленькае каліўка чагось добрага, светлага, чалавечнага, з табой звязанага… І — расстраляй ты мяне, разапні — не магу. Нічога. Па нулях! У грэшніка-скнары з вядомай прытчы, якому пасля смерці чэрці ў пекле прапанавалі назваць хоць адну за ўсё жыццё добрую справу, адшукалася: падаў неяк жабраку шалупініну ад цыбулі (за якую трымаючыся, і выберацца з пекла). Вельмі і вельмі няўпэўнены, што ў цябе знойдзецца хоць такая — мізэрная — магчымасць паратунку…

*

Ды Божа мой, пра што мы гаворым! Якое дабро, якія любоў, спагада, сумленне, чалавечнасць?! Усё гэта не з твайго лексікону, абсалютныя для цябе хімеры, усё гэта заўсёды выклікала ў табе ў лепшым выпадку пагарду (не да тэрмінаў, канечне, а да іх носьбітаў) — да кніг, фільмаў, школы, горада, прыроды… А найбольш — да людзей, ад цябе і ад тваёй сямейкі адрозных.

Мы, твае аднагодкі, шмат чыталі, дзяліліся прачытаным, верылі героям і любілі іх, зайздросцілі ім і іхняму, зусім непадобнаму на

нашае, вясковае, жыццю; ты слухаў, чмыхаў, пырхаў, паплёўваў — «верацъ яны ў гэтую брахню, дзяды кніжак не чыталі, а за нас разумнейшыя былі»; і гэтаксама, як твае любімыя дзяды верылі ў забабоны, у ведзьмакоў, лесавікоў і кланяліся кожнай лясной калодзе і кожнаму балотнаму карчу, так і ты шчыра верыў, што кнігі — зло, што ад іх дурэюць і слепнуць. Увесь твой за дзесяць гадоў вучобы ў школе набыты духоўны багаж так і застаўся на ўзроўні «Янка Купала п'е да ўпавала», «Максім Горкі з'еў махоркі», а «Якуб Колас свішча ўголас»…

Мы захапляліся Райкіным, пераказвалі адзін аднаму ягоныя жарты, — ты, пачухваючыся, праз слова мацюк устаўляў: «Знайшлі мне смешнае — жыд у целявізары дурачка ламае!»; калі ж мы, абураныя, прагнучы абараніць не так артыста, колькі саміх сябе, тыя квёлыя парасткі светлага, па якіх ты таптаўся, налятаді на цябе, — на словах, вядома, бо ты паспеў ужо абагнаць усіх нас у росце, галаваты дэбіл з квадратнымі кулакамі і шклянымі вачыма, — «а што табе тады смешна?!», ты ахвотна расказваў, як гэтым летам з бацькам і братамі знарок набралі і насушылі чарвівых грыбоў, а яўрэйка ў горадзе на базары іх купіла, «…і бацька рагатаў, што трэба было і за мяса з яе ўзяць!»; на гэтых словах ты сам пачынаў душыцца смехам, а вочы твае не смяяліся, а так і цікавалі за намі…

Нам хацелася быць «Цімурам і яго камандай», сябраваць, памагаць старэйшым, — і зноў ты ўмешваўся, вырастаў між намі, і зноў пачынаў вярзці рознае паскудства, ад якога мы чырванелі і стараліся не глядзець адзін на аднаго, бы злоўленыя на чымсьці непрыстойным. «Верацъ яны, — падхіхікваючы, казаў ты. — Ведаеце, чым ваш Цімур там, на гарышчы, займаўся?» — і пачынаў тлумачыць, чым. Тут была каменная сцяна, якую не прабіў бы ніякі таран; ніякія ў свеце сілы не змаглі б пераканаць цябе, што дзяўчынкі з хлопчыкамі, калі яны адныя, зусім неабавязкова толькі тое і робяць, што займаюцца гульнёй у «татумаму», але толькі на гэта ты ўсё і зводзіў, — любімая пасля яўрэйскай тэма, на якую ты мог гаварыць бясконца, у дэталях, з самымі, зразумела ж, біялагічнымі, жывёльнымі падрабязнасцямі. І каб жа толькі гаварыць! Колькі сябе памятаю, з самых малых, з дашкольных яшчэ гадоў вечна былі ў цябе нейкія цёмныя справы, з гэтымі «татамімамамі» звязаныя, нейкія таямнічыя гісторыі, у якія аказваліся замешанымі і твае старэйшыя браты, і стрыечныя сёстры…

Але вось скажы ж ты! Здавалася б, вёска, у адным канцы чыхнеш, у другім ведаюць, што захварэў; з табою ж, з вашай сямейкаю — нічога падобнага, усё як з гусакоў вада! Усе тыя гісторыі так ніколі

і не пераступілі парога вашай хаты… асабістае сваё жыццё ўмеў ты хаваць ад чужога вока…

*

Але добра. Бог з ім, з Цімурам. Калі шчыра, нейкая двухсэнсоўнасць у тым падлеткавым хаўрусе сапраўды ёсць. Але «Палескія рабінзоны»! Аповесць, на якой мы пэўны час проста памешаныя былі. Як марылі самі апынуцца на востраве, як шкадавалі, што няма паблізу вялікай рэчкі, якая б разлівалася, што няма ў нашай вёсцы шпіёнаў, за якімі можна было б сачыць… Смешна, а цяпер успамінаючы, дык і сорамна — што і цябе спрабавалі пераканаць у чароўнасці гэтага твора. Ты панура, недаверліва, усё з тою ж пагардаю да «брахні вучонай» выслухоўваў. Ні сюжэт, ні рамантыка, ні прыгоды не пайшлі табе… толькі аднойчы твар твой ажывіўся тупой цікавасцю — гэта калі Мірон з Віктарам знайшлі бабровыя хаткі. «Хоць бы шкураў насушылі, раз усё адно рабіць няма чаго.»

О, у гэтым ты са сваёй сямейкай разбіраўся добра! Помніш, была ў вас сучка, Сцяпан? Якую вы не адвязвалі ніколі? І потым — кожную вясну вашае хобі, забаўка вашая, нават хутчэй не забаўка, а будзённы занятак — такі ж, як для нармальных людзей ускопваць грады, садзіць соткі, даглядаць сад… З заклапочанымі, сур'ёзнымі тварамі вы абносілі сабачую будку надзейнай агароджаю (не ленаваліся ж, і часу гарачага, веснавога не шкадавалі, бо гэта ж трэба было ў лес цягнуцца, ды слупкі з жэрдкамі нарыхтоўваць, ды потым, дома, усё гэта да ладу даводзіць), самі хаваліся за хлеў — тры дарослыя амаль дзецюкі і адзін сталы мужчына, і цярпліва, як на рыбалцы ці на паляванні ў засадзе, чакалі... Пакуль якісь небарака, прываблены юрлівым сучым скавытаннем, не ўбягаў перш у гасцінна расчыненыя вароты, а потым — і ў пастку. Імгненна шморгалася вяроўка, зачыняліся вароты, і вы ўчатырох — бацька з віламі, вы — з палянякамі-дубінамі, выляталі з засады і з гіканнем урываліся ў загарадку…

Быў у тым забойстве, аказваецца, і інтарэс практычны. «Яблыкі будуць смачныя, — тлумачыў ты, — калі сабак закопваць пад яблыню», прычым, дадаваў ты, пажадана сабак, пазбаўленых жыцця пад час злучкі.

Колькі яблык вы пераварылі ў сваіх чэравах, колькі перавялі «жывога ўгнаення» для іх — хто падлічыць?.. І не магу згадаць ніводнага выпадку, каб хто пасварыўся з вамі, каб хто заявіў у міліцыю; баяліся вас, як чорт крыжа — і нездарма, бо былі вы акружаныя блатам,

аплеценыя сваякамі, вялікай і дробнай начальніцкай раднёю, як павуціннем; ніткі гэтыя ліпкія цягнуліся ад вас і ў сельсавет, і ў школу, і ў міліцыю, і ў райана, і ў гарана; так што скардзіцца на вас, шукаць якой рады ад вас было сабе ж даражэй.

*

Подласць твая сталела разам з табою і чым далей, тым больш набывала дасканаласці, рабілася не груба-прымітыўнай, не лабавой, а нейкай вытанчанай, усё часцей скіроўвалася не на канкрэтнага чалавека, а на штосьці самае дарагое яму: на любімую рэч, якую можна было зламаць ці ўкрасці, на сябра, на якога можна было ўзвесці паклёп, на бацькоў, сваякоў, настаўнікаў, у якіх абсмейваліся фізічныя недахопы, на каханую дзяўчыну, якой давалася брыдкая мянушка і г. д.

Цяпер, ездзячы з сваім уласным «шохверам», ты, відаць, рэдка ўспамінаеш, калі ўспамінаеш увогуле, пра свой даўні, самы першы транспартны сродак: зялёнага колеру матацыкл «Мінск». Навюсенькага, набылі яго табе з рук, за паўцаны, у суседняй вёсцы ў нейкай жанчыны, адзіны сын якой перад гэтым трагічна загінуў, так ні разу, здаецца, на тым «Мінску» не праехаўшы… і зноў, зноў-такі і ў гэтай пакупцы элемент чагось цёмнага, непрыемнага, на чужым горы замешанага; ты проста народжаны быў пад нейкай паганай зоркай, табе проста наканавана было ўсё жыццё выступаць у ролі Мідаса, з тою розніцай, што ў Мідаса ўсё, чаго ён ні кранаўся,ператваралася ў золата, а ў цябе, выбачай, сам ведаеш, у што…

Але не пра тое рэч. Карацей, матацыкл у цябе з'явіўся. У класе восьмым ці дзявятым, калі забытыя былі ўжо і Цімур з камандаю, і рабінзоны з Палесся, калі цягнула ў суседнія вёскі да дзевак гуляць, а з іншага боку — і дзяцінства не да канца адпускала яшчэ, трымала каля сябе — грыбамі сваімі нязнойдзенымі, рыбамі нязлоўленымі, арэхамі-ягадамі нявыбранымі, галамі не забітымі, кніжкамі не прачытанымі… Ды яшчэ — такім мілым, даўнім тэрмінам як «дай пакатацца!». На кані, на лісапеце, на мапедзе і нарэшце — на гэтай зялёнай спакуслівай штучцы, гаспадаром якой ты з'яўляўся…

«Дай пакатацца…»

Ты даваў. Само сабою, не за бясплатна. Браў выпіўкай, цыгарэтамі, грашыма... Помню, нібы прадчуваючы тое, што здарыцца, я авансам заплаціў табе адразу трайны тарыф: пляшку самагонкі, пачак цыгарэт і рубель грошай. І вось яна, музыка руху, гул матора, напятая ветрам кашуля — як ветразь, як крылы за спінаю! Чацвёртая перадача,

газ да ўпору… Ямка, перакошаны руль, кульбіт «галава-ногі»… Ватная цішыня ў вушах, потым знянацку рэзкі, высокі, як ў бензапілы на халастым ходзе, плач матора… І твае вочы, калі ты падбег і павярнуў ключ запальвання, і ўсё сціхла, а я падняўся, абмацваючы сябе і азіраючыся, — твае вочы, у якіх былі боль, страх, адчай, бяда, а потым, калі ты нарэшце больш пільна паглядзеў на мяне, яшчэ і квёлая надзея: а раптам пакалечыўся?!

На мне не было ні драпінкі. Затое матацыкл… Пагнутае пярэдняе крыло, разбітая фара, скурочаны правы паварот… Пакуль ты з ключом і пасаціжамі кешкаўся каля параненага свайго жалезнага сябра, марна стараючыся вярнуць «усё на месца», я лез табе пад рукі, перашкаджаў і зноў усё стараўся зазірнуць табе ў вочы; зазіраў — і страшыўся таго, што ў іх бачыў — слёз. Ты плакаў, Сцёпа, ад гора, і адначасова спяваў. Цадзіў праз зубы, звякаючы металам аб метал:

— Першым дзелам паламаем ма-та-цы-yклы…

— Ну, а дзевушкі? — паныла падхопліваў я.

«А дзевушкі — патом, — адказваў ты і загадкава неяк, вельмі сур'ёзна дадаваў: — Патом будзе суп з катом!»

Загадкавасць гэтая растлумачылася неўзабаве. Калі я знайшоў нежывым свайго ката, сібірака, любімца ўсёй вёскі, які ішоў да кожнага, хто паманіць, на рукі. Ён ляжаў мёртвы на двары каля ганка. Потым мне расказвалі, ты хваліўся, як спрытна ўсё гэта «аформіў»: ты паманіў яго, ён падыйшоў, думаючы, што, як звычайна, будуць яго гладзіць і захапляцца ім; ты ж падняў яго за заднія лапы і біў галавою аб вушак да таго часу, пакуль ён не аддаў Богу душу.

*

Армія, Сцёпа, армія! Вось што крута змяніла твой лёс, вось што ўзняло цябе над марамі пра «шохверства»… Самая цёмная, самая загадкавая паласа ў тваім жыцці, тайна за сямю пячаткамі.

Пачнем з таго, што пісаць для цябе заўсёды было такою ж пакутай, як і чытаць. За цэлы год службы ты падаў аб сабе ўсяго з пару куцых вестачак кшталту «жыў-здароў», і напалоханыя бацькі (яны думалі, што цябе рыхтуюць да адпраўкі ў Афганістан, і таму такая скупасць інфармацыі) ездзілі праўляцца ў ваенкамат, нават самі пісалі тваім камандзірам... Усё марна! Аж раптам, на другім годзе службы, пачалася іншая крайнасць: ні з таго ні з сяго ты пачаў літаральна завальваць іх пісьмамі, па тры-чатыры на тыдзень. Тады ж высветлілася, што служыш ты «ў гаспадарчай роце». Аднак нават гэта было пастаўлена табе ў заслугу. Бацькі ганарыліся сваім

«меншанькім», яго ўменнем уладкоўвацца; калі-небудзь на пошце, ці ў магазіне, ці ў іншым людным месцы бацька пры ўсіх успорваў канверт і зачытваў пра твае поспехі ўголас. Сваім напышлівым стылем, бездакорнай расійскай моваю, граматычна-правільнай пабудоваю сказаў пісьмы тыя настолькі не вязаліся з касноязыкім тваім мысленнем, тым больш з «троечнай» тваёй арфаграфіяй, што аднойчы я не вытрымаў і папрасіў патрымаць пісьмо ў руках... Так і ёсць. Почырк чужы. Усё было зразумела. Не трэба тут вялікай фантазіі, каб уявіць якогась затурканага, няшчаснага салдаціка, уся віна якога ў тым, што загрэблі яго з другога курса ўніверсітэта, што ён — «жыд культурны», а таму ў рэдкія хвіліны свайго вольнага часу вымушаны крапаць за цябе гэтую эпісталярыю...

Усё тут ясна. Акрамя аднаго: чаму, Сцяпан, пасля войска ты не прыехаў ні на адзін дзень дамоў? Не прайшоўся вуліцаю, не пакрасаваўся сваім, алюміневымі і меднымі «ўзнагародамі» абчэпленым кіцелем, зухавата збітай набок фурагаю... Ты не зрабіў гэтага, Сцёпа, — ты, для каго падобны шпацыр без аніякай іроніі ўважаўся за трыумф, за адзін з найважнейшых этапаў у жыцці хлопца, мужчыны!

Замест гэтага ты проста знік. Растварыўся без следу. І нарэшце, дзякаваць Богу, надоўга прапаў з маіх вачэй... хачу напісаць, «і з майго жыцця» — але не: час ад часу ў самых розных месцах і ў самых розных сітуацыях ты аб сабе нагадваў. Ты навучыўся змяняць узрост, ты прыкрываўся іншымі імёнамі і прозвішчамі, маскіраваўся пад іншыя нацыянальнасці, выступаў у мужчынскім альбо ў жаночым абліччы... Аднак мурло тваё ўгадвалася з першага погляду, распазнаць цябе было лягчэй лёгкага, хіхіканне тваё ні з чым нельга было зблытаць, твая пагарда да ўсяго «культурнага» была тая самая, твае «духоўныя набыткі» так і засталіся на ўзроўні «Пятрусь Броўка піша лоўка», тваім досціпам было «жыдоўцы на базары чарвівыя грыбы падсунуць», а самай запаветнай мараю — «вывучыцца на шохвера начальнікаў вазіць»...

*

І вось, калі ласка, — фота ў газеце! І мае пакуты: а можа, я памыляюся?

Перабіраю, як пацеркі, кожны эпізод, кожны выпадак з нашага агульнага мінулага, перасыпаю, як пясок між пальцаў, успаміны... Можа, штосьці важнае недагледзеў, недаацаніў, выпусціў з-пад увагі? Не. Здаецца, нічога. Акрамя таго, сведкам чаму не быў — тваю

армію. І ўпарта здаецца, што менавіта тут, Сцёпа, недзе пад гэтай яблыняю сабака закапаны; тут трэба шукаць прычыны твайго ўзвышэння.

Канечне, вядома — кожная і любая кар'ера прама прапарцыянальная затрачанай для дасягнення яе подласці. Але ў тваім асабіста, Сцяпан, выпадку — ці адна толькі подласць? Дужа неверагодным, да непраўдападобнасці імклівым быў твой узлёт, тут трэба было штосьці звышардынарнае, якісь геройскі подзвіг, альбо наадварот — суперподласць, нават злачынства (пры хаценні якое лёгка можна перакваліфікаваць у «подзвіг»)...

Вось што падаецца мне бліжэй да тэмы.

Ну сапраўды, Сцяпан, — не камандзіра ж ты прыкрыў грудзьмі ад варожай кулі, не таварыша ж параненага з поля бою вынес — тым больш, і не мог гэтага зрабіць, бо два гады пратуляўся на гаспадарцы пры свіннях і ўдзел прымаў хіба што ў іхніх пабоішчах… Дарэчы! Уся ваша сямейка, карыстаючыся блатам у лясніцтве, заўсёды і з поспехам браканьерыла; у цябе было ўласнае ружжо, ты выдатна страляў… Альбо, напрыклад, таго ж кабана забіць адным ударам у сэрца, без піску і шуму, было для цябе раз плюнуць…

Дык ці кабана? А, Сцёпа? Ці не прыехалі неяк уночы (такія заўсёды ездзяць па начах) людцы ў цывільным, з ложка цябе паднялі, у пусты кабінецік завялі… Так і так, слухай і запамінай, заданне няпыльнае, табе прывычнае… завязем і назад прывязем… выканаеш — у даўгу не застанемся… «Чаму я?» — ды таму, што бяспройгрышны варыянт: чым наймаць каго чужога, з вуліцы, дык думай потым, як яго самога нейтралізаваць... А тут — хто ж на салдата падумае? Пяць хвілін на роздум… Усё, усё, маўчу! Прыкладаю палец да вуснаў: цсс! Сапраўды, са свечкаю ніхто не стаяў… хай гэтая чорная тайна так і застаецца толькі тваёю... Для пачатку хопіць і таго, што я хоць крышку павадзіў цябе па закатулках мінулага. Хоць збольшага пастараўся распрануць цябе памяццю, каб убачылі…

*(Усё закрэслена).*

*

Паважаны Сцяпан Цімафеевіч!

Не ведаю, ці помніце Вы яшчэ мяне… На ўсялякі выпадак спяшаюся і свой сціплы голас уплесці ў вянок віншаванняў, якія, несумненна, паступаюць да Вас цяпер у вялікай колькасці. Таксама прашу выбачыць за невялічкае спазненне — не так лёгка было наважыцца патурбаваць Вас, хоць бы і гэтым маленькім пісьмом. Не паверыце,

Сцяпан Цімафеевіч, але давялося нават перамараць колькі чарнавых варыянтаў, перш чым спыніцца на гэтым.

Бачу, бачу, як, чытаючы мае радкі, пасміхаецеся Вы сваёй заўсёднай добрай і крыху хітраватай усмешкаю... Што тут можна сказаць? Віншую. Ганаруся. Зайздрошчу. І глыбока перакананы, што поспех Ваш не выпадковы, але заслужаны ўсім папярэднім жыццём. Як цяпер паўстае перад вачыма нашае сумеснае, на жаль, такое ўжо далёкае маленства, школа, кнігі, гульні, катанне на матацыкле... Дзіўна, але ўжо тады, у тых хлапечых бестурботных забавах Вы чымсьці вылучаліся ад нас, звычайных падшыванцаў. Нават гульні былі для Вас не адно забаўкамі, а як бы плацдармам для нечага большага, вышэйшага. Тады неяк не надавалася гэтаму значэння, але цяпер з вышыні пражытых гадоў усё набывае іншы сэнс...

Многа, многа чаго ўспамінаецца, аб чым хацелася б Вам напісаць, а яшчэ лепш — аб гэтым мая просьба — пагаварыць пры асабістай сустрэчы, калі ў Вас знойдзецца на мяне час і жаданне, вядома...

Шчыра, заўсёды, вечна Ваш — ...

## Графіці

Мой сусед Іван, як толькі падап'е ў кампаніі, так заводзіць адну і тую ж пласцінку: пачынае скардзіцца, што ў свой час ад уладаў пацярпеў. «Каб не гэтая пляма на маёй біяграфіі, — так і кажа ён, — я б цяпер, можа, не баранак круціў, а чалавекам быў бы».

І замаўкае.

Натуральна, адразу пачынаецца — што ды як, ці не рэпрэсаваныя сваякі тут замешаныя, ці не крымінальная якая дурасць па малалецтве?

Аказваецца ж вось што.

Даўно, калі Іван наш быў яшчэ Іванькам-пяцікласнікам, у іх у школьным калідоры вісеў плакат «Вучыся плаваць» (выдатна помню яго, хоць і розных мы з Іванам гадоў і ў розных школах вучыліся): плывец на баку, з ненатуральна паднятай рукою, з мёртвай усмешкай на сінім твары, не столькі на спецыяліста па плаванні падобны, колькі на тапельца, што ўсплыў на паверхню, паказаў пару прыёмаў-практыкаванняў і цяпер спакойна сабраўся сабе назад на дно... Дык вось, аднойчы на плакаце, у ніжняй яго частцы, прыкладна на жываце тапельца-інструктара з'явіўся надпіс:

«Адзін за ўсіх — усе за аднаго!»

Надпіс як надпіс. Яшчэ і не такія з'яўляюцца. Акрамя, канечне, крыху падпсаванага школьнага інвентару, дык і тое лёгка было папрavіць — ну, зацерла б прыбіральшчыца гумкаю, ці лязом сашкрэбла, ці палоскай паперы заклеіла — і ўсе праблемы, пасмяяца і забыць.

Аднак жа нічога падобнага. Ці то час нейкі такі выпаў, калі Таццяне Парфіраўне, дырэктарцы, а менавіта яна адразу ж, рукавы закасаўшы, узялася за расследаванне, больш рабіць не было чаго, ці то вырашыла яна ў зародку прыдушыць малое, каб не мець пасля справы з большым і горшым, ці проста ўмяшалася ва ўсё гэта самая звычайная містыка, і Іванаў (на яго чамусьці першага ўпала падазрэнне) чорны анёл прачнуўся… Хто ведае! І тады прычына, з чаго, з якой трасцы разгарэўся сыр-бор, была загадкаю, а цяпер, праз столькі часу, і падаўна.

Карацей — нават па самых строгіх мерках нязначнай гэтай падзеі надаецца раптам самая сур'ёзная ўвага. Роўная, можа, цяперашняму ананімнаму званку аб тым, што школа замініраваная, альбо што ў кабінеце хіміі разбіўся трохлітровы слоік ртуці… Штосьці такое. Вядуць Іваню ў настаўніцкую. Пад прыцэлам паўтара дзясятка пар вачэй, у каго злорадных, у каго спагадлівых, у каго абыякавых, пачынаецца допыт.

«Што ты хацеў гэтым сказаць?»

«Нічога, бо гэта не я», — напачатку смела, нават весела адказваў Іван. Яму нават шкада крыху было, што хутка, праз якую хвілінку-дзве, максімум да канца перапынку недарэчнасць развеецца, праўда возьме верх і ён выйдзе з настаўніцкай такім жа самым, якім пераступіў парог. Апраўдацца яму было лягчэй лёгкага. Па-першае, надпіс зроблены чарнільнай ручкаю, а ў яго шарыкавая. Па-другое, почырк — не яго каракулі, а прыгожыя, каліграфічныя літаркі — яўна якогась зубрылы-выдатніка ці шасцёркі-харашыста. Па-трэцяе, надпіс зроблены нізка, а Іван росту высокага, значыць, калі б і прыйшло яму ў галаву пяром высечы гэты нявінны мушкецёрскі дэвіз, дык нашто б ён гнуўся ў тры пагібелі?

Але яго жалезныя апраўданні нікому і непатрэбныя былі. Пытанне зусім не ставілася, ён гэта, ці хто іншы:

«Што ты хацеў гэтым сказаць?» — вось як з настырнай зацыкленасцю ставілася пытанне. Дыялог сляпога з нямым.

«А што ў гэтых словах такога? — пацiснуў плячыма стары матэматык. Нават праз шкельцы акуляраў у добрых яго вачах чыталася няўцямнасць. — Калі нават і ён — дык што такога?»

«І вам яшчэ трэба тлумачыць, — ужо ў матэматыка ўперыла ледзяны пагляд Таццяна Парфіраўна, — што тут такога?!»

Запахла крамолаю. Справа пачала набываць небяспечную, двухсэнсоўную, ледзь не палітычную афарбоўку. Івану стала не да смеху. Сярод мёртвай цішыні істэрычна віскнула гістарычка:

«Выключыць з піянераў!»

«Бацькоў штрафануць — і баста!» — басам сказаў фізрук.

«Ды што там — са школы гнаць», — ці то з іроніяй, ці то ўсур'ёз, нічога не зразумець было, адазваўся географ.

Спалоханы Іван заплакаў...

І гэта часткова выратавала яго. Часткова, бо з піянераў яго не выключылі і са школы, канечне, не выгналі, — але адбітак на ім чагось непрыстойнага, замешанасць яго ў нечым саромным так на ім і засталіся. Не памагло нават і тое, што ўжо назаўтра аб'явіўся сапраўдны віноўнік: малакроўная ціхоня-дзяўчынка з паралельнага класа, з каснікамі, большымі за галаву, падобная на Мальвіну і на П'еро адначасова... «Мы цэнім тваю салідарнасць, — выслухаўшы яе пакаяннае лепятанне, сказала Таццяна Парфіраўна, — аднак нельга ж так літаральна разумець і да дзеяння прымаць сэнс дэвіза!» Яна, мабыць, падумала, што дзяўчынка закаханая ў Івана і знарок бярэ віну на сябе.

Калі б Іван быў большы і разумнейшы, дык мог бы супакоіць душу тым, што не за адно, дык за другое кару нясе. Вадзіліся ж у яго і сапраўдныя грахі: цыгарэт паленне, шыбка, футбольным мячом высаджаная… Якая розніца, за што трымаць адказ? Аднак ён быў у тым самым лепшым і самым небяспечным узросце, калі пачуццё справядлівасці гіперразвіта, калі немагчымасць даказаць сваю праўду ўспрымаецца цэлай трагедыяй… Хаця, з іншага боку, усё праходзіць, усё забываецца. Забылася б і тая гісторыя — каб не працяг яе. Пусты гэты выпадак прыліп да Івана — жуйкаю да падэшвы, радзімай плямаю — пачаў жыць разам з ім і міжволі ўплываць на яго характар, паводзіны і нават на лёс. Мянушка ў яго з'явілася — Пісака, і калі ў час звычайных хлапечых разборак, дражнячыся, хацелі мацней, больш балюча яго ўкалоць, дык са злосці замест сярэдзіннага «а» выкрыквалі «я».

Мяняліся настаўнікі, на змену старым прыходзілі новыя, і ім, характарызуючы вучняў, пра Івана, нібы эстафетную палачку, перадавалі: неблагі, старанны хлопец, але вось ручкі нячыстыя… Так дабыў ён да восьмага класа. І калі прачытаў на сябе характарыстыку — у цэлым станоўчую, з маленькай прыпісачкай у канцы: «схільны да псавання школьнай маёмасці…», ён успрыняў яе амаль спакойна. Тым больш гэта была ўжо праўда. Папсаваў ён за апошнія гады і школьнага інвентару, і настаўніцкіх нерваў.

Хапала і пасля ўсяго ў жыцці. І ён крыўдзіў, і яго крыўдзілі — і заслужана, і не заслужана, і па-ўсялякаму… Але нічога падобнага на той першы выпадак, на тую горыч, прыкрасць, адчай ён ужо не адчуваў...

Нядаўна, стоячы ў чарзе ў гастраноме перад сівенькай гарбаценькай бабулькай, Іван раптам прызнаў у ёй… дырэктарку Таццяну Парфіраўну! І яна яго. Адышліся ўбок, разаўспаміналіся. Бабулька пусціла слязу — яе ўсе старыя настаўнікі пры сустрэчы з былымі вучнямі пускаюць.

«А помніце той выпадак, Таццяна Парфіраўна? — не стрымаўся Іван. — Ну, калі вы мяне абгаварылі?..»

Бабулька высмаркалася і адказала ціхім і разам з тым цвёрдым голасам:

«Я цябе вельмі люблю, Іваня. Але зрабіў тое ты», — і відаць было, што гэтае перакананне яна забярэ з сабою ў блізкую магілу.

Шмат чаго загадкавага на свеце!

*2003 г.*

## ПОШЛАСЦЬ

Мне пашэнціла пражыць з ім у адным інтэрнацкім пакоі амаль паўгода, з зімы да летняй сесіі, а раскусіў я яго менш, чым за тыдзень: гэта быў закончаны, завершаны пашляк.

Пошласць сама па сабе адна з горшых чалавечых якасцяў; пашляк і ў сваім сапраўдным, класічным абліччы — не падарунак. Але ўдвая горш пошласць завуаляваная, калі пашляк маскіруецца пад маралістa, калі ён цвярозы, станоўчы, надзелены сякой-такой памяццю, дастатковай для запамінання сентэнцый кшталту «спяшайцеся рабіць дабро», «твор не пра вайну, а пра чалавека на вайне», «людзі створаны для шчасця» («хлеб усяму галава», «беражыце лес ад пажараў»)... Такога не саб'еш з тропу, не зацягнеш на глыбіню, з такім не ўсчыніш дыскусію аб дуалізме таго ж «дабра» — паняцця крайне размытага, адноснага, бо адзін лічыць дабром нарадзіць дзіця, пабудаваць дом і пасадзіць дрэва, а другі — забіць дзіця — напрыклад, абортам, разбурыць дом — каб вызваліць месца для новага будынка, і ссекчы дрэва — бо яно ад старасці і ветру можа паваліцца і нарабіць шкоды...

Напачатку, уражаны гэтым тыпам, які, здавалася, скочыў у жыццё проста са старонак падручнікаў па літаратуры, псіхалогіі і псіхіятрыі, я любіў разыгрываць яго. Мяне забаўляла, што для гэтага таўкача не

існуе ў прыродзе, у свеце і ў сусвеце пытання, над якім ён хоць на хвілінку задумаўся б.

— Для чаго мы жывём на свеце? — стараючыся быць сур'ёзным, пытаў я.

— Каб адшукаць чалавека ў чалавеку.

— Што будзе з намі пасля смерці?

— Небыццё і вечная ноч.

— Ці існуюць рай і пекла?

— Яны ў нас саміх. Кожны атрымае па заслугах.

— Што галоўнае ў жыцці?

— Заставацца ва ўсіх абставінах чалавекам.

Гэта нагадвала спірытычны сеанс, дзе я выступаў у ролі спірыта, а наш герой быў духам. Кусаючы вусны, ледзь стрымліваючыся, каб не зарагатаць, радуючыся таму, што ў пакоі паўзмрок і на маім твары нічога нельга ўбачыць, я працягваў «круціць сподачак»:

— Ці ёсць каханне?

— Каханне валодае светам, — імгненна гучала ў адказ.

— Што такое дабро?

— Жыццё дадзена нам на добрыя справы.

Само сабою, як і ўсе падобныя унікумы, ён вёў здаровы лад жыцця, быў ворагам спіртнога і тытуню, называючы першае «атрутай душы», а другое (чамусьці) «ядам для галаўнога мозгу». На маё сціплае пярэчанне, што цыгарэты хутчэй яд для лёгкіх, гэты дурань паблажліва пасміхнуўся і паказаў пальцам у столь:

— Мозг — усяму галава!

Кожную раніцу ён пачынаў з зарадкі, прысядаў, крактаў, напаўняючы пакой рэзкім пахам поту і начнога нямытага цела. Сінія, бязвінна-бяздумныя гузікі вачэй. Стрыжка «пад бокс», скуласта-насаты баксёрскі твар — і зусім не баксёрскае, не спартыўнае, а рыхлаватае, налітае нездаровай паўнатой цела. Яму было ўсяго дваццаць, а сталасць, нават старасць ужо клалі на яго свой адбітак. Ёсць нейкае афрыканскае племя, людзям якога не вядомы такія фазы жыцця як падлеткавасць і ўзмужанне — яны адразу з дзяцінства, гадоў з васьмі, пачынаюць старэць, прынамсі, тварам і целам; дык ён мог бы сысці ім за неблагога правадыра.

Гардэроб яго складаўся са старэнькага сіняга школьнага касцюма, дзвюх выцвілых ад часу і поту кашуль, трох пар шкарпэтак, заношаных і замытых да таго, што літаральна кожны вечар даводзілася латаць іх — «даваць рамонт», як ён жартаваў, усоўваючы ў шкарпэтку перагарэлую лямпачку; адных і тых жа зімою і летам чаравікаў, адубелых, адпаліраваных дажджом і ветрам, спёкай і сцюжаю, страшэнна слізкіх —

у галалёд, ды нават і на проста ўтаптаным сняжку ён падаў некалькі разоў на адлегласці ста метраў, што трэба было прайсці ад інтэрната да вучэбнага корпуса, грымаўся страшна, як падкошаны, адно ўзляталі ўверх ногі — іншы касцей не сабраў бы, ён жа пругка, як мячык, адскокваў ад дарогі і, абціраючыся, атрэсваючыся, толькі пасміхаўся:

— Чуць не ўпаў!

З дому, з вялікай, здаецца, больш за дзесяць чалавек сям'і грошай яму не перападала, затое прывозіў многа бульбы і часнаку. Нават студэнцкая сталоўка была дарагая для яго, і ён гатаваў сабе сам, заўсёды адну і тую ж страву, «супчык» — адвар з бульбы, прыпраўленай часнаком і кавалачкамі таннай, з белымі ўкрапленнямі неапетытнага сала каўбасы. Часнок, цэлымі зубкамі, еў ён і ў прыкуску, называючы яго «часнык», а каўбасу — «кілбаса», і мяне заўсёды раздражняла гэта, як у рускай мове раздражняе наўмыснае булошная, молошная, вверьх... Еў хутка, прагна, ад вялікай колькасці часнаку ікаў, адрыгваў, кожны раз са словамі:

— Прашу пардон!

Наеўшыся, паляпваў сябе па жываце:

— Нажэрся, як дурны на памінках, — і тут жа, пераходзячы на сур'ёзны тон, тлумачыў: — На памінках звычайна не ядуць, туды збіраюцца, каб аддаць апошнюю даніну памяці нябожчыка.

З філалогіяй у яго ўвогуле былі дзіўныя стасункі. Ён не прызнаваў скарачэнняў і абрэвіятур, казаў не кіно, а кінематограф, не метро, а метрапалітэн, не ўніверсам, а ўніверсальны магазін, не эсэсэр, а эсэсэсэр, або нават расшыфроўваў і гэта.

Як ён — такі — паступіў? Ды звычайна, без экзаменаў, як многія, асабліва дзяўчаты, тады паступалі. Калгас даваў накіраванне і браў падпіску, што абавязкова вернешся назад пасля вучобы. Дзеля гэтага трэба было крыху ў тым калгасе папрацаваць. Наш летам пасля школы палоў буракі і называў гэта — «задзейнічанне ў паляводстве». Маці яго даіла кароў на ферме, ён казаў — «у галіне жывёлагадоўлі», бацька быў звычайным леснікам, і гэта значыла:

— Спецыяліст у лясной гаспадарцы.

Вясною, калі па тратуарах пабеглі вясёлыя брудныя раўчучкі ад расталага снегу, калі прыляцелі і заспявалі шпакі, а на дрэвах пачалі набрыньваць пупышкі, наш герой раптам перастаў рабіць зарадку. І ўвогуле ён змяніўся. Усё больш маўчаў; абкладзены газетамі і канвертамі, памногу штосьці пісаў, машынальна закрываючы напісанае даланёю. Хадзіў нечага на пошту з пашпартам. На яго звычайна гладкім, хоць парасят аб яго бі, лобе з'явілася малюсенькая зморшчынка — прыкмета напружанай разумовай працы.

Зачасціў да яго ў госці нейкі сябрук па імені Юры, зусім малады, прыгожы хлопец, з іголачкі апрануты, не сказаць, каб дурны... Як, дзе яны пазнаёміліся, як сышліся, чаму пасябравалі, чым увогуле кіруецца лёс, зводзячы такіх зусім розных людзей — не ведаю, гэта вечная загадка, якую, мне здаецца, да скону дзён не разгадаць.

Наш ляжаў на ложку ў сваёй любімай позе — рукі за галаву, Юры прысаджваўся побач на табурэтцы. Я сядзеў за сталом спінаю да іх, унураны ў кнігу, і, згараючы ад цікаўнасці, лавіў кожнае слова.

Так — з іх размоў, а з майго падслухоўвання, і стала тайнае яўным. Высветлілася, што за пісьмы ён піша, чаму ходзіць на пошту і куды пачаў знікаць па вечарах... Каханне! Пошукі, як ён прызнаўся сябру, «адданай спадарожніцы жыцця» — праз газетныя рубрыкі знаёмстваў.

Эх, мне б пачытаць тыя пісьмы! Пабыць нябачным сведкам хоць на адным яго спатканні! Дорага б я даў, каб толькі зірнуць на яго абранніцу, не кажучы ўжо, каб паслухаць хоць кавалачак іхняй размовы...

Аднойчы я не вытрымаў, крадком пайшоў следам за ім, цалкам ператварыўшыся ў шпіка, з усімі атрыбутамі: падняты каўнер плашча, насунуты на вочы брыль кепкі, купля непатрэбнай газеты ў кіёску, заварочванне за вугал, калі ён азіраўся... Мяне чакала поўнае фіяска. Ён без усялякай мэты бадзяўся па вуліцах, тупа глядзеў на чужыя балконы, купіў марожанае — хоць было вельмі холадна, пара ішла з рота — і гарачы пончык, перакусіў, спусціўся ў метро, паехаў у Парк Чалюскінцаў і там сядзеў на лаўцы нерухома гадзіну і тры хвіліны (я, змерзлы, прытупваючы, хукаючы на рукі, — за елкаю). Потым паехаў дамоў.

Калі аб'явіўся я, ён паспеў павячэраць і ляжаў на ложку ў сваёй звыклай позе.

Уявіце малюнак: прыцемкі, фортка зачынена, у пакоі застаялы пах шкарпэтак, часнаку і «супчыку», радыё ўключана, а наш дзівак ляжыць — рукі пад галаву, і... марыць. Пра штосьці апетае паэтамі, незямное, веснавое, чыстае, светлае...

Заглянуў Юры. Прымасціўся на табурэтцы, паклаў нашаму руку на лоб, як клапатлівы доктар хвораму, як старэйшы і мудрэйшы брат легкадумнаму малодшаму, як добры бацька любімаму сыну.

— Зайздрошчу я табе, Юры. Ёсць у цябе з кім душу адагрэць.

— Нічога, — суцяшаў сябар. — У цябе ўсё яшчэ наперадзе. А мне не зайздросці. Кажы сабе: магло быць і горш.

— А магло быць і лепш.

— А магло і лепш, — згаджаўся Юры. Тонкія далікатныя пальцы яго пяшчотна церабілі валаскі на чужой мужчынскай галаве.

— Цярпенне, цярпенне... Шукаць, выглядваць, прыслухоўвацца, прымярацца. Была адна — фу, з дзіцем, трэба ты мне. І што яны яшчэ хочуць? Маску я сарваў з іх — нічога пад ёй няма. Усё — не вярнуць.

— Нічога, нічога, ты яшчэ малады.

— Малады, але без барады. (Наш таксама ўмеў адказваць дасціпна, нават у рыфму.) Што ж, трэба вера, цярпенне. Толькі так.

Я пакутаваў не менш за яго. Цікаўнасць раз'ядала мяне, як іржа жалеза. Нарэшце я адважыўся на крайні сродак.

Я пайшоў да самай апошняй — пробаў не было дзе ставіць — шлюхі, вядомай усяму інстытуту, акрамя, канечне, нашага святога героя, і сказаў шчыра, нічога лепшага не прыдумаўшы:

— Света, я заплачу табе сто рублёў (даляраў дзвесце на тыя савецкія грошы), калі ты з ім пераспіш. Мне кроў з носу трэба ведаць, як ён будзе паводзіцца з жанчынаю. Ты перакажаш мне ўсе дэталі, усе яго словы, дзеянні — да кожнай драбнічкі...

— І за гэта — сотку? — аблізнуўшы вусны, недаверліва перапытала Света. — Але навошта табе?

— Мая справа.

Света пайшла. Я толькі-толькі падрыхтаваўся цярпліва чакаць яе на калідоры, як праз дзесяць хвілін яна вылецела з пакоя куляю, задыханая, чырвоная, разгневаная.

— Пайшоў ты са сваімі грашыма!..

— Светка, — лавіў я яе за руку, — ну хоць слова!

Яна спынілася. Працадзіла неахвотна:

— Пачаў чытаць мне Багдановіча...

— Што-о-о?!

— ...І, як на зло, верш, які я ведаю і вельмі люблю. А ён ім сабраўся мяне заводзіць. Дык так гнюсна, фальшыва, кожны радок скажаючы, блытаючыся, ставячы абы-як націскі... Усё б я вытрымала, але не гэта!

Адсмяяўшыся, я дастаў з кішэні падрыхтаваныя чатыры дваццацьпяткі і працягнуў ёй:

— Заслужыла!

Яна адвяла маю руку і, гледзячы мне ў вочы, сказала раптам:

— А ведаеш, што я табе скажу? Ты са сваімі эксперыментамі пашляк яшчэ горшы, чым ён, — і, збягаючы па лесвіцы, перад тым, як знікнуць з маіх вачэй (але не з памяці), азірнулася: — Падумай над гэтым добра!

Вось думаю...

*1997 г.*

## БУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ

У палаце трое: стары, малады і яшчэ адзін — сярэдняга веку, з маленькім дзіцячым тварыкам і нечакана вялікімі, лупатымі, як у спакутаванага лемура, вачыма. Ён толькі пачынае ачомвацца пасля аперацыі і пакуль слаба разумее, дзе ён, хто ён і на якім ён увогуле свеце. Ложак яго каля акна.

Ад дзвярэй злева, як зайсці ў палату, ляжыць дзед — гатовы нябожчык. Бяскроўны твар яго зліваецца з белатой падушкі і нагадвае гіпсавую маску, выпушчаныя з-пад коўдры ручкі пакорліва складзены на грудзях — хоць свечку ўстаўляй. Толькі сухія вусны яго бязгучна варушацца, нібы дзед чытае сам па сабе адыходную малітву.

Нарэшце, трэці, малады, ну як малады? — гадоў дваццаць пяць яму, — ложак якога насупраць чалавека-лемура, не ляжыць, а сядзіць. Падмасціў пад бок і пад спіну па падушцы, прыўзняўся, трымаючыся за перакладзіну над ложкам, і пазірае ў акно, на бальнічны двор і на гарадскую вуліцу, дзе так прыгожа дагарае марозна-звонкі вечар.

Падзалочаны промнямі развітальнага сонца дым з коміна нейкай пабудовы падымаецца ўгару — на мароз, і ад таго ілюзія, што ён і не падымаецца зусім, а стаіць, гэткім роўным, без сукоў і без галін ствалом якогась высокага дрэва.

Сонца пакрысе, праменьчык да праменьчыка, згортвае свой чырвоны веер. Нядаўна ўся сцяна палаты была асветленая, а цяпер толькі ў адным кутку застаўся ружовы сектар, і той увачавідкі меншае, меншае, каб неўзабаве знікнуць зусім.

— Зіма... Вечар, — задуменна кажа, гледзячы ў акно, малады. На яго румяным твары блукае радасная, ды што там радасная — шчаслівая ўсмешка. — Мы тут ляжым, а жыццё сабе ідзе... Вунь бабуля вядзе за ручку ўнучку... Апранутыя цёпла. Рукавіцы, шалікі, шапкі... Яшчэ б — мароз! Колькі прыблізна ад нашай палаты да вуліцы? Сцяна, шыбы, метраў пяцьдзясят газона... Не так і многа. Калі расчыніць акно і крыкнуць — пачулі б. А на справе — касмічная адлегласць! Крык фізічны даляціць, а вось крык душы? Наўрад ці...

Такі ў яго бадзёры, пераканаўчы голас, такі прыгожы твар з маладой русявай шчацінкай, так блішчаць яго мяккія вільготныя вочы, такі ён сам увесь урачысты, заміраны, як бы асветлены нейкім унутраным ззяннем. Міжволі хочацца думаць і верыць, ці не Усявышні гэта вырашыў лішні раз злітасцівіцца з неразумных людзей, даць ім яшчэ адзін шанс, і спусціў да іх з нябёсаў свайго чарговага пасланца... Аналогія тым больш напрошваецца, што «пасланец» літаральна раскрыжаваны — у венах абедзвюх рук па кропельніцы, з грудзіны,

з-пад саменькага сэрца, тырчыць адна трубка, суровымі ніткамі пажывому да скуры прышытая і бурым ад крыві і ёду пластырам залепленая, са спіны — другая. Адна, як пупавіна з мацярынскім лонам, злучае яго з кіслародным вентылем у сцяне, другая апушчана ў бутлю на падлозе. Такой няхітрай сістэмай кіслард прачышчае хворае лёгкае, вымывае з яго сукровіцу і іншую пасляаперацыйную дрэнь. Усё гэта кружыцца ў бутлі, асядае на дно, пеніцца ружовымі бурбалкамі — не раўнуючы, брага ходзіць!

— Кожнаму сваё... Адным ляжаць, хварэць, пакутаваць, іншым — хадзіць па вуліцах, ездзіць у машынах і ў розным транспарце... Адным, як мы, дыхаць нежывым кварцаваным паветрам, ёдам, нашатыром, хлёркаю, нечыстотамі... Другім — бегаць на лыжах па заснежаным лесе, сярод заінелых елак, з якіх сыплецца сняжок на каўнер і на шапку... Дыхаць водарам свежага, адфільтраванага хвояю павет... павет...

Ён раптам хэкае, нібы атрымаўшы далонню па кадыку, пачынае глытаць словы, захліпваецца імі, кашляе, хаўкае, як рыбіна на пяску. Праз некаторы час, аддыхаўшыся, спачатку з цяжкасцю, па адным слове:

— Адфільтраванага... хвояю... паветра, — а потым, усё больш набіраючы разгон, язык яго зноў пачынае мянціць роўна і гладка: — Але вось парадокс! Любое абмежаванне чалавека ў прасторы, часовае — як у нас з вамі, або поўнае, як, дапусцім, у турме ці ў манастыры, любая адсутнасць фізічнага дзеяння — карацей, пазбаўленне волі, прыводзіць, як ні дзіўна, да разумення ісціны! Згадаем хоць бы антычных мудрацоў. Адзін днямі маляваў дроцікам на пяску свае тэарэмы і доказы іх, другі не вылазіў з ванны, ускліваючы час ад часу: «Эўрыка!», трэці ўвогуле жыў у бочцы і сярод белага дня бадзяўся з запаленым ліхтаром, шукаючы, бачыце, чалавека... Аднак гэта не перашкаджала ім быць геніямі, разумець ісціну. А ісціна, мушу сказаць, гэта зусім не набор пастулатаў, гэта не дубовыя максімы, не псеўдафіласофскія абстракцыі, нават — выбачайце за кашчунства! — не хрысціянскія або любыя іншыя рэлігійныя догмы, а! — драбяза, дэталькі, малюсенькія, штодзённыя, якіх мы амаль не заўважаем, а дарэмна, бо на іх трымаецца свет, на іх стаіць жыццё, з іх сумы ўрэшце і складваецца такое нібыта маленькае, але і такое неабходнае, такое сапраўднае — шчасце...

Паслухаць яго, дык гэты балбатун-«філосаф» і ёсць самы шчаслівы на свеце, гэткі алхімік-вынаходнік, які выпадкова замест вырабу каштоўных металаў адкрыў рэцэпт прыгатавання ні многа ні мала самога шчасця, навучыўся складаць яго з рознай драбязы,

як, напрыклад, з нязграбных, недарэчных аскепак мазаікі пад рукой майстра паступова атрымліваецца гарманічны малюнак, і цяпер не толькі сам карыстаецца сваім вынаходніцтвам, а яшчэ і па дабрыні душэўнай гатовы падзяліцца ім з іншымі, хоць бы з гэтымі вось суседзямі па палаце, якія, канечне, пакуль нават не здагадваюцца, што варта было б запісваць усё чутае, у крайнім выпадку запамінаць, бо такі чароўны і разам з тым просты рэцэпт ашчасліўлення чалавецтва можа прапасці, растварыцца ў словах, развеяцца ў паветры.

— Так, сябры мае, — толькі тут, у гэтай бальніцы ў цэлым і ў гэтай палаце ў прыватнасці, тут, у вымушанай ізаляцыі, і адкрываецца чалавеку сапраўдная мудрасць...

«Сябрам маім» яго словы да лямпачкі. Дзед усё варушыць вуснамі, чытаючы сваю бясконцую малітву, — такому не ў філасофію ўдавацца, не пра глабальнае шчасце думаць, а пра пераход у свет лепшы. У вачах чалавека-лемура поўная прастрацыя, ён па-ранейшаму знаходзіцца ў іншым жыццёвым вымярэнні, дзе з усёй разнастайнасці чалавечых пачуццяў засталіся толькі два: пакута і цярпенне.

Маладога ў сваю чаргу ані не бянтэжыць адсутнасць аўдыторыі.

— Бачыце, сябры, — працягвае ён, звяртаючыся да шыбіны, — імкненне да роўнасці — хімера, такое ж пустапарожняе глупства, як вечны рухавік. Не, можна, канечне! — можна якімісь рэвалюцыйнымі зменамі, ці канстытуцыйнымі законамі, ці, урэшце, жалезнай рукою манарха-дыктатара дабіцца адноснай матэрыяльнай роўнасці... Але вось тут акурат і ўмешваецца яе вялікасць прырода, ці Бог, ці лёс — і ўсё ляціць старчаком, усё губляе сэнс! Бо як былі, так і застануцца здаровыя і хворыя, высокія і нізкія, прыгожыя і непрыгожыя, разумныя і дурныя, злыя і добрыя... У вечнай няроўнасці — вялікі неразгаданы сэнс, цэлая філасофія, тут я вам скажу, ёсць над чым паду... паду...

І зноў хэканне, перханне, хліпанне, і зноў кашаль пачынае біць яго так, што ложак трасецца і трубкі разам са скураю паадрывацца гатовы.

Уваходзіць доктар. У пантофлях на босу нагу, у белым халаце, сініх штанах і сіняй, высокай, як клабук, шапцы ён падобны на нясмешнага клоўна. Адразу кіруецца да ложка маладога гаваруна. Дзеду ён не дае ўвагі зусім, чалавеку-лемуру на хаду кідае: «Піць хочацца?»

— Хочацца, — сухім, як наждак, голасам скрыпіць той.

— Цярпі, — і да маладога:

— А ты ўсё гаворыш? А табе ўсё не ляжыцца? А ў цябе да ўсяго рукі цягнуцца? — Падкручвае вентыль, робячы меншым напор кіслароду, і ў бутлі асядаюць на дно чорныя і ружовыя камячкі і перастае так страшна булькаць «брага».

— Якога чорта ты ставіш кісларод на максімум?! Якога хрэна ты яго чапаеш?! З цябе ж за гадзіну к чортавай мацеры разам з лёгкімі ўсе вантробы павыдзімае! Дарослы чалавек, а горш за дзіця! Ну вось што ты сам з сабою робіш?

Нягледзячы на грубасць, у яго голасе не дакор, а хутчэй спачуванне, нават пакута, нібы яму баліць больш, чым неразумнаму хвораму.

— Да цябе яшчэ не дайшло, наколькі гэта сур'ёзна? У цябе ж лёгкае, як спечаны яблык, яно ж згарнулася пасля аперацыі! Табе да новай рыхтавацца трэба! Можа, і не адной! А з такімі тэмпамі ты да раніцы не дацягнеш, к чарцям сабачым! Табе не тое што гаварыць — варушыцца не трэба, вачэй не расплюшчваць! Мы ж да цябе сядзелку не прыставім, ты ж сам павінен адчуваць, калі табе горш...

— А мне, наадварот, лепш, доктар! — перабіваючы, радасна паведамляе малады. — Я не маню! А ваша здароўе як? Не грыпуеце? Як там цяпер на вуліцы? Нябось, мароз?

Доктар няўцямна пазірае на яго. Разумее, што з гэтым хворым толькі марна траціць час, махае рукою, паварочваецца і моўчкі выходзіць.

Не паспяваюць зачыніцца за ім дзверы, як малады зноў прыпадымаецца, лацвей падбівае падушкі і, як ні ў чым не бывала, тым жа ўзнёслым, пранікнёным голасам пачынае па-нову.

— Правільна вы, сябры, кажаце. (Хоць ніхто нічога не кажа.) Мы пазбаўлены самага галоўнага — драбязы, дэталек; мы не можам, напрыклад, зрабіць нават такія простыя рухі, як чырканне запальнічкай, каб прыкурыць цыгарэту і зацягнуцца ёю; мы пазбаўлены такога, я б назваў — культурна-экалагічнага дзеяння, як выкінуць у сметніцу, скажам, абгортку ад марожанага, ці банан авую скурку, ці корак з-пад піва...

— Піва, — са свайго кутка хрыпата паўтарае чалавек-лемур.

Малады ўздрыгвае.

— Так, з-пад піва, — пацверджвае ён. — Здавалася б, драбяза — кінуць корак не пад ногі, а ў сметніцу; але з такой нібыта драбязы і складваецца ўласна жыццё! Мы жывём гэтымі мілымі, прыемнымі, мяшчанска-сентыментальнымі дэталькамі, не заўважаючы іх, не думаючы пра іх, як не думаем пра паветра, якім дыхаем. Але паспрабуй перакрый мне гэты вось кіслародны вентыль...

Пры гэтых словах дзед варочаецца (ён такі лёгкі, бесцялесны, што нават ложак пад ім не прагінаецца і не рыпіць) і пачынае мармытаць гучней.

Малады вытрымлівае пачцівую паўзу, каб даць час чалавеку пагаварыць з Богам, і толькі калі вусны старога на момант перастаюць варушыцца, працягвае:

— Аднаго толькі не разумею: навошта ім, каторыя на волі, здаровым, дужым, гэтая беганіна? Гэтая мітусня? І дзеля чаго? Гэтае ўвесьчаснае жаданне перагнаць адзін аднаго, хутчэй перабегчы вуліцу, у краму заскочыць, у госці не спазніцца, да тэлевізара паспець...

— Пачакай-но, — выразна шэпча дзед. — Сюды ніхто не спозніцца...

Аднак малады, захоплены сваёй новай думкай, не чуе.

— Не кажу ўжо, колькі небяспек падпільноўвае іх на кожным кроку! Можна паслізнуцца, зламаць нагу, руку, можна згарэць у пажары... Можа збіць машына... Скіргат тармазоў, удар, крык, боль, кроў, і вынік — у лепшым выпадку бальніца... Можна, нарэшце, у любы момант элементарна захварэць — добра, калі самому, а калі захварэе блізкі? Яшчэ горш... Жыць увесь час з адчуваннем падвешанага мяча над галавою... Гэта ж, калі ўдумацца, суцэльны кашмар! Наколькі ўсё ж крохкае наша жыццё, наколькі хліпкае наша гэтак званае здароўе, наколькі ўмоўнае гэтак званае «шчасце»! І вось вам чарговы парадокс: мы, скрамсаныя скальпелямі, вернутыя з таго свету калекі, цяжка хворыя ў лёгачнай палаце (заўважце гульню слоў), вышмаргнутыя з жыцця, штучна ад яго адгароджаныя, а гэта значыць — застрахаваныя ад выпадковасцей, мы — у адноснай бяспецы! Мы ў больш выгадным становішчы, чым людзі здаровыя, нам няма чаго баяцца, мы, кажучы словамі кепскай эпітафіі, ужо дома, а яны — усё яшчэ ў гасцях, або на поўнай страхаў дарозе...

— Падажджы-но! — ужо не шэптам, а зусім гучна, нечакана звонкім і тонкім голасам устаўляе дзед. — Нейкі канец ды будзе! Даездзяцца, дабегаюцца, даскачуцца, навернуць галовы! Гэтага ложка ніхто не міне!

Цяпер малады чуе. Але ён зусім не здзіўлены, што ў яго, аказваецца, ёсць слухач, ды яшчэ які ўдзячны, які так трапна, па тэме дапаўняе.

— Цалкам вас, дзядуля, разумею, — ветліва адказвае ён, адвярнуўшыся ад шыбы і звяртаючыся да канкрэтнага субяседніка. — І падтрымліваю. Вы маеце на ўвазе адноснасць волі як катэгорыі? Я ваш саюзнік. Увогуле, усе гэтыя тэрміны, калі шчыра, такая штучнасць, размытасць, недакладнасць... Правільна, на першы погляд можа падацца, што тыя, хто на вуліцы, людзі, якіх мы назіраем толькі праз акно, маюць неабмежаваныя варыянты выбару: хачу да сябра паеду, хачу — дамоў, хачу — да цешчы на бліны... Калі ж капнуць крыху глыбей — выбару ў іх, як такога, няма, маршрут іх загадзя прадвызначаны і звярнуць з яго, змяніць яго зусім не так проста,

як ім здаецца. Усе па вялікім рахунку да кагосьці прывязаныя, да чагосьці прыкутыя — як я гэтымі вось трубкамі да гэтага вентыля і да кропельніц. І калі разабрацца...

Пажылая сярдзітая медсястра ўкаціла столік з медыкаментамі, уключыла святло, зашморгнула шторы, і вечар за акном знік, засталася толькі палата.

Гэтая сястра што ні робіць — ніколі моўчкі; так і цяпер — яшчэ з парога пачала сварыцца, што дыхаць няма чым (а кварцавалі нядаўна), хоць бы фрамугу адкрылі (а хто яе адкрые?), што як ёй абрыдзелі ўжо гэтыя хворыя — «і што мне за доля такая — усё жыццё пазіраць на чужыя задніцы!», а заадно і дактары — «каб яны самі ў гэтыя койкі палеглі!», і бальніца — «не згарыць жа яна!», і што «хутчэй бы на пенсію, ды пасляць усіх к ядрэні фені!»

— Піці хочаш? — пытае яна ў чалавека-лемура, набіраючы ў шпрыц лякарства.

— Хачу, — прывычна, па інерцыі адгукаецца небарака. Нават на слых проста фізічнае адчуванне, як ад смагі зашэрх і ледзь варочаецца яго язык, і, як таму сапсаванаму механізму хочацца даць змазкі, каб перастаў скрыгітаць па нервах, так і гэтаму хочацца хутчэй уліць у рот кубак свежай, сцюдзёнай вады, каб разгусціць застылую кроў.

— А не палучыш ты піці! Губы мокрай ваткаю выцеру — і ўся вада... А ты, — пераходзячы з гатовым шпрыцам да маладога, які пры яе з'яўленні лёг і суцішыўся, — ты зноў уставаў? Зноў гаварыў? Вунь крывянкі нацурболіла! Ты ж на вентыляцыі лёгкага стаіш! Ты ж на адных наркотыках жывеш — у чым душа трымаецца? Табе што было доктарам сказана? Нават рота не разяўляць!

Яна паўтарае амаль тыя ж словы, што і нядаўні доктар, і з тою ж амаль інтанацыяй. Увогуле, усе дактары, і сёстры, і нават санітаркі нечым кланава-, ці клонава-, падобныя, як бы разам з белымі халатамі перадаецца ім адна і тая ж інструкцыя, першы параграф якой — «з хворымі паводзіцца строга, сурова, па магчымасці жорстка».

— Ты дагаворышся! Ты дачакаешся, што табе рот лейкапластырам залепяць ці ніткамі зашыюць!

— Зашывайце, — панура адказвае малады. Імпэт і бадзёрасць яго кудысьці падзеліся.

— «Зашывайце»! — перадражнівае медсястра. — Табе што, пам-рэш — і клопату мала! А жонцы як адной жыць? З дзіцяткам малым? Ляжы, маўчы і варушыцца не смей!

— А ён гаворыць, — ябеднічае дзед, каб задобрыць сястру (ён вельмі баіцца ўколаў). — Браце ты мой, і не сціхае, і не змаўкае...

Аднак замест падзякі дастаецца і старому даносчыку:

— А ў вас чаго як стаяла вячэра на тумбачцы, так і стаіць? Чаму вы не ясцё? Выздараўліваць не хочаце? Тут лепш, чым дома?

— Дурны я вашае бальнічнае есці, — крыўдзіцца дзед. — Мне сваё носяць. Я век чужога не еў... Вой! — загадзя ўскрыквае, хоць яшчэ іголка цела не кранулася.

— Таблеткі чаго валяюцца на падлозе?

— Дурны я іх піць.

— І што за хворыя ў гэтай палаце?! Не слухаюцца, не ядуць, папраўляцца не хочуць... Такі дзень за акном, а яны тут бокі пралежваюць, жыць тут гатовыя...

Так, сердзячыся, буркаючы, а таму коўдру падаткнула, таму вусны змачыла, за дзедам прыбрала, маладому шклянку памыла, яшчэ і не забыла пажадаць, выходзячы: «Папраўляйцеся».

Ледзь яна выйшла, як паўтараецца тая ж карціна, што і па сыходзе доктара. Малады ўмомант займае ранейшае становішча і пачынае казаць далей, з таго самага месца, нават з таго самага слова, на якім яго перапынілі.

— ...І калі разабрацца, воля — бадай, найбольш умоўны з усіх тэрмінаў. Можна быць шчаслівым замураваным у сцяне, і вар'яцець ад няшчасця, валодаючы цэлымі краінамі або ўсім зямным шарам...

— Ох, памаўчаў бы ты, — гучна шэпча, варочаючыся, дзед. — Не замоўкнеш ты хоць на трохі!

Малады слухаецца, замаўкае. Але менавіта «на трохі». І вось зноў:

— Добра. Буду маўчаць. Усё жыццё. Не высоўвацца, не вылучацца... Трэба быць як усе. І тады, магчыма, выжывеш. І, магчыма, будзеш жыць доўга. Магчыма, нават станеш багатым, прыгожым, тоўстым...

— Табе наркату колюць, — ні з таго ні з сяго ўстаўляе дзед і хіхікае. Ён яўна з той мілай пароды людзей, якім добра толькі тады, калі іншым кепска. — Пачакай-но — прывыкнеш і станеш наркотам.

Малады таксама ўсміхаецца, але не зласліва, а сумна.

— Ну, яшчэ б, — згаджаецца ён. — Раз колюць — значыць, прывыкну, раз прывыкну — значыць, стану. Канечне, наркотыкі зло. І звычайная іголка зло. Калі ёю не шыць, а тыркаць у сваё ці ў чужое вока. Дык іголка вінаватая? Ці галава? Здуру можна і хобат слану зламаць.

— Ох, дагаворышся ты...

— Тое і з наркотыкамі. Якая розніца, пры дапамозе чаго здымаецца боль? Няважна, якія лекі, абы памагалі. Мне лёгка, радасна,

не балюча — і пляваць, дзякуючы наркотыкам гэта, ці дзякуючы марознаму зімоваму вечару за акном, ці размове з вамі, дзядуля... А хутчэй за ўсё радасна і лёгка мне ад усведамлення, што мог бы памерці на аперацыйным стале — а я выжыў!

— Не хваліся...

— А я другі раз на свет нарадзіўся! Што гэта, як не знак? Як не сігнал — momento mori, іншымі вачыма на ўсё глядзі, цані жыццё, пі яго маленькімі глыткамі...

— Пі, — панылым, як з глыбокага калодзежа, рэхам адгукаецца чалавек-лемур.

— І як гэтага пераварот можна было дабіцца? Правільна — нечым звышардынарным! Няшчасным выпадкам, бядой, аперацыяй, болем... Раней не разумеў: навошта і каму трэба, каб душы дзіцячыя, бязвінныя, пакутавалі і адляталі? Цяпер разумею — а каб задумаліся тыя, хто побач, хто застаўся! Бо чым яшчэ прабіць нашы тоўстыя закарэлыя скуры, як інакш дабрацца да сэрца, розуму, душы? Як не пакутамі роднага, смерцю блізкага? Усё на сваім месцы, там, дзе яму трэба быць, усё даўно кімсьці размеркавана, і вельмі мудра...

— Адзін ужо ляжаў на тваім ложку, такі мудры, — зларадна шэпча дзед. — Накрылі прасцінаю і вывезлі...

— ...У гэтым не жорсткасць, — не чуе, гне сваё малады, — у гэтым любоў да нас. Чаму мы лічым жыццё сапраўдным толькі тады, калі яно дае нам прыемнасці, калі нам шэнціць? Вельмі і вельмі верагодна, што тое, што раней здавалася нам бядой, трагедыяй сусветнага маштабу, з часам ператворыцца ў аб'ектыўную неабходнасць, якая перасцерагла нас ад няшчасця куды большага! І высветліцца, што калі б не зламаная рука, можна было б апынуцца ў іншым месцы і зламаць шыю. Усё малое — знак, урок, сімвал, папярэджанне аб тым, што магло б здарыцца, але, на наша шчасце, не здарылася... Плюсквампэрфэкт.

— А браце! — уздыхае, варочаецца дзед.

— І калі глянуць на жыццё ў такім ракурсе — усё яно спрэс складаецца з сімвалаў, увесь Сусвет скіраваны на цябе аднаго, усё вакольнае размаўляе з табой на асаблівай мове знакаў, любая драбнюткая драбяза мае важны, важкі сэнс — ад галення да адзення, ад таго, які чаравік ціснe — левы ці правы, якія купюры ў кашальку і ці маецца ў наяўнасці сам кашалёк... Хіба б я задумаўся над гэтым, хіба б адчуваў усё так востра, каб не гэты няшчасны і разам з тым — цяпер толькі разумею! — непазбежны выпадак са мною? Ды ніколі! Адным мазгі былі занятыя — лізінг, маркетынг! Браць ад жыцця, патрабаваць ад яго, нават разумець, што нічога не даецца за

так, задарма, мы з горам папалам навучыліся, вось толькі цаніць не ўмеем! Хіба я цаніў? Прымаў як належнае, само ў рукі плыло, ды і шэнціла мне, каціўся па жыцці абаранкам, не пабываўшы — ні разу! — ні ў бальніцы, ні ў турме...

— Пабудзеш, — шэпча дзед, — пачакай-но.

— Нават у арміі не служыў!

— Яшчэ паслужыш...

— Што ж дзіўнага — рана ці позна павінен быў адбыцца якісь эпізод са мною. Прычым, самы ідыёцкі. Выйшаў з офіса пакурыць у двор. Хлопцы грузяць у кузаў шыны. Тры-чатыры чалавекі, крэкчучы, падымаюць адну. Які чорт, пад якую руку мяне штурхануў? Навошта мне спатрэбілася — у белай кашулі, з цыгарэтаю ў зубах, галоўнае, калі мяне ніхто не прасіў — памагаць ім?! Чаму ім нічога, а ў мяне хрумкнула нешта ў грудзіне, і пачало расці, надзімацца, як футбольны мяч, лёгкае? Чаму яно надарвалася, калі ў людзей звычайна надрываецца штосьці іншае? А вось чаму: не цаніў тое, што меў. На, параўнай. Не адчуўшы смагі захацеў пазнаць смак вады?

— Вады, — гатоўна паўтарае чалавек-лемур.

Ізноў дзверы насцеж — з'яўляецца знаёмы ўжо доктар у сваёй шапачцы-«клабуку» і ў пантофлях на босу ногу, з ім яшчэ адзін такі ж самы. Сталі па абодва бакі ад дзвярэй, рослыя, дужыя, як целаахоўнікі, пачціва прапускаючы трэцяга, маленькага, нізенькага, апранутага не ў доктарскае, а ў цывільнае: касцюмчык, чаравікі, акуляры на апушчаным уніз гарбатым носе, з лысінай на ілбе і з доўгімі сівымі патламі на патыліцы.

Акружылі ложак маладога, разглядалі на святло рэнтгенаўскія здымкі, гарталі, перадаючы адзін аднаму, паперы ў папцы, гаварылі ціха на сваёй доктарскай, для звычайнага чалавека страшнаватай мове... Гэтыя два звярталіся да маленькага і сівенькага — «прафесар». Зноў прагучала гісторыя няшчаснага выпадку маладога пацыента, як ён кінуўся ад дурной зухаватасці падымаць цяжкую шыну, надарваў лёгкае і яно надзьмулася, а пасля аперацыі пайшоў «зваротны працэс», «ускладненне», лёгкае сціснулася і «не разгортваецца»...

Нічога новага прафесар не сказаў. Спытаў толькі, ці ёсць сям'я, і за маладога адказаў доктар: ёсць, жонка і маленькі сын; на што прафесар насупіўся:

— Цяпер толькі маўчаць, маўчаць яму трэба... І спакой.

Хоць малады і так маўчаў увесь гэты час і ляжаў спакойна. Дактары затрымаліся яшчэ на хвілінку каля ложка чалавека-лемура. Перш-найперш прафесар спытаў, ці хоча той піць. Адказ:

— Хачу, — цалкам прафесара задаволіў, і тройца пакінула палату.

На нейкі момант стала ціха. Чуваць толькі, як лямпа дзённага святла гудзе. Але вось малады прыпадымаецца — і пайшло-паехала:

— Які просты рэцэпт. Супакойся, не варушыся — выжывеш сам і ашчаслівіш сяброў, жонку, сына... Маўчы — і не будзе выцэджвацца з твайго цела ў буталь апошняя, магчыма, кроў... Які злавесны і разам з тым паэтычны сімвал! Як шматкроць падымае ён цану літаральна кожнага слова, нават неабавязковага, уводнага, выпадковага! Я калі-небудзь шкадую, што не пісьменнік. Вось так, мне здаецца, і павінны пісаць: кожнае слова — порцыя крыві... Я, каб меў талент, апісаў бы найперш вочы хірурга — апошняе, што бачыў перад тым, як заснуць на аперацыйным стале. У іх было развітанне са мною... Але нават не столькі вочы — самым жахлівым было адчуваць, што можаш памерці, а не сказаў нейкага вельмі важнага слова — родным, блізкім, увогуле людзям, і дзікі, нечалавечы кашмар ад таго, што не можаш гэтае слова ўспомніць, а калі і ўспомніш, дык ужо не будзе як сказаць... Бр-р! Як жа мы павінны проста крыкам крычаць ад страху і болю, калі лёс разлучае нас з блізкімі людзьмі хоць на дзесяць хвілін! Хоць на дзесяць секунд! У любы момант яны могуць стаць апошнімі — так у Буніна...

— Ды якога Буніна — Дуніна! — сярдзіта папраўляе, як яму здаецца, памылку дзед.

— Не зразумеў...

— Дунін такі быў! Каторы восі з воза пакраў, ды міліцыя шукала... Жыў далей туды трохі, трэцяя хата за хутарам...

Малады задумваецца. Падымае руку разам з трубкаю кропельніцы і пацірае лоб.

— Што ж, слушная заўвага. Усё правільна, мудры мой дзядуля. Дакуль мы будзем цытаваць чужых Буніных, забываючы на сваіх Дуніных-Марцінкевічаў? І гэта, сапраўды, вельмі важна, і над гэтым яшчэ трэба ўсур'ёз падумаць...

Чарговае кварцаванне. Сястра — не тая, што рабіла ўколы, але такая ж сярдзітая, унесла сінюю лямпу, уключыла і, засланіўшы вочы далоняй, хутчэй выскачыла з палаты.

— Самі дык не любяць, чэрці, — бурчыць дзед і нацягвае прасціну, хаваецца ледзь не з галавою. Акрамя ўколаў, ён увогуле баіцца, не разумее і не любіць нічога бальнічнага, нават бяскрыўднага танометра і «грушы» для вымярэння ціску. — Раней ніхто не ведаў ні рэнтгенаў, ні кварцаў, ні ўколаў, а жылі не горш за нас і не хварэлі...

— А мне падабаецца святло кварца, — з добрай усмешкай кажа малады (наркотык усё яшчэ дзейнічае!). — Калі паветра робіцца сіняе, мяккае, нават злёгку ў тумане. Як летне-ранішняя смуга над поплавам, а ты ідзеш з вудамі на рэчку... Дзеля гэтага варта перанесці любыя аперацыі! Якая насалода — ведаць, што ўсё страшнае, брыдкае, балючае — ззаду, а наперадзе цэлае жыццё! Цэлае лета! Узяць на ўсе тры месяцы адпачынак, паехаць у вёску; ні пра што не думаць, сесці на беразе, вудку закінуць...

Згадка пра вёску завяла і дзеда. Ён высоўвае галаву з-пад прасціны і таксама вырашае паразважаць больш шырока, відаць, з мэтаю павучыць неразумных цяперашніх маладых.

— Нашто мне вудкі? Мы жылі во там во, дзе хутар калісь быў, тры копанкі, увечары слоік з-пад малака пакладзеш у ваду, такое малако тлустае было, каб адмакаў, дык раніцай абавязкова карась у слоіку...

— А вясна! — не слухае малады. — Калі сок з бяроз капае. Легчы пад бярозу на прагрэтую зямлю, заплюшчыць вочы, раскрыць рот, і хай капае...

— Капае, — гучыць рэха чалавека-лемура.

Дзед дагаворвае сваё адначасова з маладым:

— ... Хоць адзін карась ды ўлезе...

— А восенню! Лісты каляныя пад нагамі... Грыбы — Божа мой! А пахі прэлай лістоты, а агароды восеньскія, і гэтая ўтома на ўсім... Няўжо ўсё будзе?!

— ...Дык папрэбуй выцягні яго, таго карася... Яго цягнеш за хвост, а ён растапырыцца, слоік жа не будзеш біць...

— А зіма! Стаяць і дыхаць, нічога больш... нічога... Носам удыхаць, ротам выдыхаць...

— ...Калоціш, трусіш той слоік, пакуль карась не ўпадзе пад ногі...

Бывае, людзі гавораць на розных мовах, пра зусім розныя рэчы, а выдатна разумеюць адзін аднога. Так цяпер і ў старога з маладым. Малады нават у тым, што чуе, знаходзіць нейкую дарэчнасць і логіку, адшуквае нейкі асаблівы падтэкст.

— І вашая, дзядуля, гісторыя — цуд. Ва ўсім народным — мудрасць, назіральнасць, чароўнасць, прыгажосць... А ў цэлым — Бог! Шукаем яго, забываючы, што ён паўсюль, на ўсім...

— ... А ніякага Бога не бачыў за восемсят два гады... Няма!

— ... Заўсёды вакол нас... — да маладога даходзяць апошнія дзедавы словы. — Як... няма?!

— Так. Яшчэ даўно, маладзейшы за цябе быў, думаю — пайду на могілкі, праверу, ёсць Бог ці няма...

— Уночы хадзілі?

— Дурны я ўночы — удзень! Прыйшоў на могілкі, кажу: «Бог, калі ты ёсць, стань перада мною». Бог не стаў, я памачыўся на нечы на крыж і з таго часу не веру ў Бога.

Паўза.

— Дык няма? — упалым голасам, увесь абвялы нейкі, перапытвае малады.

— Няма. А святы Мікола ёсць! Гэта як калі рэзалі мяне, я паглядзеў на каляндар, акурат на Міколу зімовага аперацыя, тады прашу: «Святы Мікола-заступнік, зрабі, каб не памерці пад нажом!» Святы Мікола-заступнік зрабіў, у яго і веру. А Бога няма ніякага!

Бліжэй да паўночы маладому робіцца горш. Ён яшчэ спрабуе гаварыць, але словы даюцца яму ўсё цяжэй, паўзы паміж імі ўсё большаюць, ён усё мацней і часцей хекае, кашляе, задыхаецца. Твар яго ўвесь у кропельках поту і сіні, як гэтае кварцаванае паветра. Прыбягае сястра, за ёю доктар, робяць маладому адзін укол, другі, але ўжо і наркотыкі не памагаюць.

Пачынаецца ў палаце бесталковая, як заўсёды ў такіх выпадках, мітусня, дзверы то расчыняюцца, то ляпаюць, зачыняючыся. З грукатам прыкацілі рэнтген-апарат, пакруціліся ля яго і патарабанілі назад, так і не выкарыстаўшы. Крыкнуў нехта: «Каталку хутчэй!» — «Асцярожней... кропельніцы...» — «Ды ён сіні вунь ужо!» — «Аперацыйная занятая...» Перавалілі з ложка на каталку, павезлі ледзь не бягом, разам з кропельніцамі і крывавым бутлем.

Толькі тады сціхла нарэшце, хоць вочы прыплюснуць можна.

Раніца ў палаце вызначаецца прыходам санітаркі. Звычайна яна ледзь не нагою адчыняе дзверы, плюхае анучаю ў вядры, грукае швабраю... Сёння ўшмыгнула ціхенька, нязвыкла-заміраная, без вядра і без швабры, з пакункам бялізны пад пахаю. Стараючыся не шумець, узялася перасцілаць пасцель каля акна.

— Нянечка! — чалавек-лемур прачнуўся. — Паглядзіце, там вады не засталося ў яго ў тумбачцы?

Дзед таксама ўжо не спіць, больш таго — нават падымаецца і сядае, маленькі, сухенькі, беленькі і страшны, як вязень канцлагера.

— Во, і сядзець ужо можаце, — ухвальна кажа санітарка. Яна сцягвае, камечыць і кідае на падлогу прасціну, накоўдранік, вывcovapочвае падушку з навалачкі. — Хутка паправіцеся. Выпішуць вас. Дамоў паедзеце. Дома добра, цёпла. Сям'я, дзеці, унукі, праўнукі... Цяпер старыя доўга жывуць, а маладыя мала. Прыйдзі на могілкі, дык на партрэтах скрозь адны маладыя.

— Новага каго пакладуць? — слабым, не падобным на свой голасам пытае дзед. — На гэты ложак?

— Пакладуць, пустым не будзе.

— Але ж і папагаварыў ён! Ды пра смерць, ды пры вудкі, ды пра абы-што... А браце мой! Так жыць хацеў.

— Каб маўчаў, дык жыў бы.

Санітарка — куды ёй спяшацца? — з навалачкаю ў руцэ прысаджваецца на незасланы ложак, гатовая слухаць разумнага чалавека.

— А не знаў нічога, — расказвае дзед. — Бунін, Бунін... А то ж Дунін быў! Я яго ведаў, і жонку яго... Калісь восі пакраў з воза, тады хаваўся ў лесе, міліцыя прыехала, шукалі зямлянку, пароли такімі прэнтамі вострымі...

— Знайшлі? — спагадліва пытае санітарка. Яна слухае гэтую ахінею з непадробнай цікавасцю, нават галаву падперла рукою.

Замест адказу дзед стогне, памаленьку лягае на бок, ікае пару разоў.

— Я люблю са старымі пагаварыць. Гэта ж як задарма розуму набрацца. Мяне ўсе хвалілі, бо слухалася. І цяпер матку слухаю. І бабулю слухала, калі яна жыла. І бацьку слухала, хоць ён і біў мяне папругаю. А ў вас мо і баба яшчэ жывая? Чуеце, дзед? О, дзеду?

А няма каму адказваць. Дзед халодны ўжо. Толькі звісае з ложка да падлогі бяскроўная ручка. Санітарка мацае яе.

— Госпадзі святы, — жагнаецца яна. — Двое за ноч! І чаго яны так мруць, гэтыя людзі? Няўжо паміраць цікавей, чым жыць?

— Нянечка, — падаў голас чалавек-лемур, — кабецінка! Глянь-це, там вады не было ў дзеда?

— Не ўп'ешся ты той вадою! Ужо ставіць няма куды, забіў тумбачку чужымі недапіткамі... На! Вадахлёб... Каб ведала, дык яшчэ пасцель прыхапіла б, а так лішні раз хадзіць...

Учарашні промень сонца прабіўся праз шчыліну ў штрах, паспеў бліснуць на біле ложка. Але быў заўважаны пільнай санітаркай. Яна чамусьці азірнулася на дзверы і зашморгнула шторыны шчыльней.

*2007 г.*

# ЛЁД

## I

Галубоўскі даўно прасіў свайго прыяцеля і калегу па службе Фелікса, каб той хоць раз узяў яго з сабой на зімовую рыбалку. Фелікс абяцаў — ды ўсё не выходзіла нешта.

Ужо і зіма прайшла, снег знік з вуліц Мінска, лёд на рэчках і азёрах вось-вось павінен быў растаць, а яны ўсё не ехалі. Нарэшце Фелікс сказаў:

— Ну што — заўтра?

І вось назаўтра ў суботу яны селі ў электрычку і паехалі. Чаму не на машынах, якія меліся ў аднаго і ў другога? А выпіць? Святое на рыбалцы, рыба ж па сухім не ходзіць...

Дзіўна толькі, што пры іх не было ніякіх рыбацкіх прычындалаў, і адзеліся яны зусім не па-рыбацку: Фелікс — у чыстай куртцы, Галубоўскі — у новым паўпаліто, у Фелікса — на нагах чаравікі, у Галубоўскага — бліскучыя, як рыбіная луска, туфлі, Галубоўскі — у андатравай шапцы, Фелікс увогуле з непакрытай галавой... Усё тлумачылася проста. Ні на якую рыбалку яны не ехалі, гэта толькі для канспірацыі звалася — «рыбалка», а на самай справе яны ехалі здраджваць жонкам. Прычым вопытны Фелікс звыкла схлусіў сваёй, што розныя там лескі-палкі, кручкі-мармышкі, ватнікі і бахілы возьме ў Галубоўскага, а Галубоўскі таксама даволі спрытна, як для першага разу, наманіў сваёй, што ўсё гэта ёсць у Фелікса. Во як хітра прыдумана — малайцы! Начаваць, збрахалі яны, будуць у «спецыяльнай рыбацкай хатцы, дзе іх збярэцца чалавек дзесяць рыбакоў». Жонкі іхнія адна адну не любілі, не перазваньваліся, таму і рызыка выкрыцця была нулявой.

З кожнай новай станцыяй электрычка аддаляла сяброў ад нецікавага Мінска і набліжала да новых прыгод і вострых адчуванняў. Фелікс з Галубоўскім сядзелі каля акна, адзін насупраць другога, і моўчкі, з засяроджанымі тварамі сузіралі аднастайны сакавіцкі пейзаж: як мільгаюць і застаюцца ззаду паляны, пералескі, рабыя бярозы і елкі з касмыкамі пацямнелага снегу на лапах...

Скарыстаемся момантам, пакуль яны маўчаць, нічога яшчэ не адбываецца, і ўставім у паўзу колькі слоў пра іх.

Абодвум каля трыццаці. Фелікс выглядае маладзей за свае гады, а Галубоўскі — старэй. Калі невысокенькага, поўненькага, з жывоцікам, з бакенбардамі-катлеткамі і чорнымі вусікамі-стрэлкамі Галубоўскага вельмі ўмоўна, грубавата можна параўнаць з Пуаро,

дык высокі, светла-русы, блакітнавокі і з вузкім выцягнутым тварам Фелікс — яго цень Гастынгс. Галубоўскі імпульсіўны, рухавы, любіць і ўмее пагаварыць. Фелікс — маўклівы, «флегма», нетаропкі ў рухах. Тонкія вусны яго часта ажыўляе загадкавая ўсмешка, якая сведчыць, што чалавек пазнаў цану і сабе, і людзям, і гэтаму жыццю, у якім вымушаны існаваць з-за адсутнасці лепшага.

І ўсё ж было нават у тварах іхніх нешта агульнае, ледзь улоўнае, што рабіла іх падобнымі. Гэта — узрост, той самы сумна-славуты «крыху за трыццаць», пра які кажуць, што ён «накладвае свой адбітак», узрост, пры якім звычкі спакваля пачынаюць выступаць заменай шчасцю, калі чалавек супакойваецца душою і часткова целам, калі сёе-тое ў жыцці дасягнута (а дасягнуць хацелася, канечне ж, «чаго і ўсе»: сямейка, дзеткі, кватэрка, кар'ерка, машынка...), словам, калі жыццё больш-менш уладкавана, распланавана, калі ведаеш, што было, што ёсць і — на жаль — лёгка ўгадваецца, што будзе (а будзе яшчэ круглейшы жывот, яшчэ большая азызласць, мяшкі пад вачыма, вяласць мышцаў, усё менш будзе заставацца валасоў на галаве і зубоў у роце і ўсё расці будзе пералік хваробаў у медыцынскай картцы...), і — як вынік — пытанне: гэта ўсё?! няўжо ўсё?! — і разгубленасць, нават лёгкая паніка — да чаго ж сапраўды імклівы гэты пракляты час, які ж ён насамрэч няўлоўны, як хутка праходзіць! — гэта ж яшчэ ўчора на вуліцы, у краме, у транспарце звярталіся да цябе «малады чалавек», а сёння — так нечакана, рэзка і непрыгожа — «мужчына», і разам з тым — нехаценне мірыцца, што самае лепшае, самае цікавае — мінулася, усё, што магло адбыцца, адбылося, і ўсё мацней прага нейкага бунту, хоць бы бунціку, усё вастрэй жаданне ўхапіць рэшткі маладосці, паспець «загрузіцца»...

## II

— Як камп'ютар, — прамармытаў Галубоўскі, адрываючыся ад акна і ад сваіх думак. — Нічога! — ён ляпнуў Феліксу рукой па калене. — Тут галоўнае без комплексаў. Проста! Гарэлка дадзена, каб яе піць, жанчыны — каб з імі спаць, электрычка — каб у ёй ехаць, так жа?

— Так, — адказаў Фелікс. І ўсміхнуўся сваёй усмешкай. Хто-хто, а ён выдатна ведаў, што робіцца цяпер на душы ў сябра — Галубоўскі яшчэ ні разу не здраджваў жонцы, таму цяпер балталогіяй хацеў перабіць нерваванне.

— Я чалавек не дурны, згадзіся, — казаў Галубоўскі (нібыта Фелікс спрачаўся), — прывык ва ўсім шукаць і знаходзіць падтэкст. Вось мы цяпер чаму ўперыліся ў акно і маўчым? Ну, само сабою, з натуральнай, цалкам апраўданай асцярогі сустрэць знаёмага, іх жа, знаёмых, чорт у такіх выпадках наносіць, гадамі можна не бачыць, жывучы ў адным пад’ездзе, а тут вырасце перад табою, ды здароў, ды куды, ды чаго...

— Тонка заўважана, — сказаў Фелікс.

— Ці яшчэ момант, — падбадзёраны, працягваў Галубоўскі. — Каму з гэтай электрычкі можа прыйсці ў галаву, што два здаровыя бугаі, дарослыя дзядзькі, з такімі сур’ёзнымі тварамі, едуць не на дачы, не на... ну куды? — не на які-небудзь кангрэс дэмакратычных сіл, а да самых прымітыўных дзевак?

— Ну, не такіх ужо і прымітыўных... Але ў цэлым — праўда. І адкуль у цябе што бярэцца? — шчыра спытаў Фелікс.

— Назіральнасць плюс аналітычны розум, — патлумачыў Галубоўскі. — Цяпер канкрэтна наш выпадак. Пытанне: калі на душы так няўтульна, дык чаго мы едзем? Куды нас нясе нячыстая ды нячысты дух? На ноч гледзячы? Не дзеля блакноціка ж — ведаеш, такія нататнікі, імёнамі спісаныя ледзь не на кожную літару алфавіта, супраць якіх плюсікі... Не для таго ж, каб у забягалаўцы за куфлем піва была магчымасць уплішчыцца: «А вось я раскажу!.. А вось са мной было!..» Цьфу! І ўжо самае агіднае, калі робіцца гэта з прычыны біялагічнай, медыцынскай — ці як сказаць... Калі — не дай Бог, канечне! — хвароба жонкі, астыванне да яе, механічнае жаданне перамены... Тут ужо ніякага апраўдання! Жывёльнасць, голы юр...

— Элементарная подласць, — згадзіўся Фелікс (у якога якраз-такі жонка была хворая, нешта звязанае з парушэннем абмену рэчываў).

— З іншага боку, чаго ламацца? Лепш здаровы цынізм, чым... Канечне, мне, у самай сіле мужчыну, проста... гм... па-чалавечы цікава. У кожнага бываюць моманты, калі так захочацца плюнуць на маральныя ўмоўнасці...

— Адарвацца па поўнай.

— Гэта раз! Другое, мы ж не толькі біялагічныя — мы ж і сацыяльныя стварэнні, нам жа хочацца неяк расквеціць будні новымі фарбамі, гукамі, адчуваннямі... Што называецца — «абнавіць кроў»... Калі з’явіцца нейкая свая маленькая тайна, уласны сакрэт, без якога як жыць нармальнаму чалавеку?

— А вось гэта — вельмі трапна, — без усмешкі пацвердзіў Фелікс.

## III

Перад патрэбнай станцыяй яны падняліся — Фелікс на паўтары галавы вышэй за нізенькага, кругленькага Галубоўскага — і выйшлі ў тамбур. Электрычка задрыжэла і стала, як укопаная. Фелікс з Галубоўскім стукнуліся адзін аб аднаго і злезлі на перон. Адразу на іх дыхнула прыемным пахам чыгункі, вясны, расталага снегу... Было каля шасці вечара, зусім яшчэ светла, хоць пахмурна.

Фелікс адышоў да бардзюра і, затыкнуўшы пальцам вуха, пачаў гаварыць па мабільніку. Электрычка паехала. Галубоўскі закурыў і агледзеўся. Перон. Лаўкі. Будыначак станцыі... Вялікае возера ляжала падковай, канцы якой падыходзілі да самага чыгуначнага палатна, беручы станцыю з абодвух бакоў у абцугі. З вышыні перона, наколькі бачыла вока, возера падобнае было на жаўтаваты ліст паперы, на якім чорнымі кропкамі і коскамі рассыпаліся сагнутыя постаці рыбакоў. Злева возера падпірала сцяна лесу, а прама — на далёкім беразе, там, дзе падкова выгіналася эліпсам, відаць былі дамы дачнага пасёлка. Усё гэта імгненна ўхапіў позіркам і адклаў у памяць Галубоўскі (трэба ж будзе потым штосьці расказваць).

Падышоў Фелікс:

— Ну, усё выдатна. Спозняцца крыху...

— Дзе ж выдатна, калі спозняцца?

— Павячэраем, агледзімся...

План іхні быў — у Фелікса знаёмая, яна прыедзе ўвечары з Мінска ў пасёлак, у спецыяльную «хату», і прывязе сяброўку. Абедзве замужам, што дае пэўную гарантыю чысціні фізічнай і няпэўную — маральнай. Вось такая рыбалка, ха-ха!

Фелікс прапанаваў ісці да пасёлка цераз возера. Калі спусціліся на лёд — веснавы, падшэрхлы, зусім не слізкі — і пайшлі па ім, лавіруючы між накручаных рыбакамі дзірак-палонак, Галубоўскі ў сваіх туфлях адзін раз усё ж паслізнуўся і ледзь не ўпаў. Цяпер, чым бліжэй да мэты, тым актыўней мянціў яго язык.

— Тут галоўнае што? — пытаўся Галубоўскі і сам адказваў: — Якаясьці каверза, нечаканасць... Увогуле, як гэта робіцца? Ну, падрыхтоўка, прэлюдыя? Не браць жа моўчкі за руку і не весці ж! Трэба ж штосьці казаць, неяк сябе паводзіць...

І тут рознае ўяўлялася Галубоўскаму, самае палярнае:

— Каб і не надта груба, і каб не інстытут шляхетных дзяўчат...

Таксама ён дзяліўся ўголас — а як бы ён хацеў, каб было? Так сказаць, у ідэале? Паўзмроку, аказваецца, ён хацеў бы, ружовага або сіняватага адценняў, нейкага флёру... Сціпласці, няўмення. Каб

такі ўтульны пакойчык невялікі, ізаляваны, глухі, які б абавязкова замыкаўся на ключ з сярэдзіны... Чагось такога. Аднак не супраць быў і на адваротнае: на распусту лёгкую, сімпатычную — у пэўных межах, канечне:

— Ведаеш, без гэтых жахлівых «дядя» ці «мущина» — во ўжо ненавіджу!

— Пік пошласці, — пагадзіўся Фелікс.

Дапускаў Галубоўскі і самы горшы варыянт: непрыстойнасць, неахайнасць, развязнасць, калі рэчы называюцца сваімі грубымі імёнамі... Карацей, да ўсяго быў гатовы.

— Натуралізм! — усклікваў ён. — Але таксама някепска!

Асабліва ж карцела яму прасачыць адзін момант. Як гэта чужая, апранутая, недаступна-непрыступная жанчына, якую звычайна праводзіш у лепшым выпадку позіркам, жанчына, якіх сотні на вуліцах, у транспарце, у крамах, паліклініках, бібліятэках, офісах і ў розных канструктарскіх бюро — як яна паступова будзе ператварацца ў індывідуальную, даступную, голую, тваю — па адным тваім жаданні, па адным руху твайго пальца, і належаць будзе толькі табе, нейкаму Галубоўскаму...

— ... Хаця ты не маеш на яе аніякага права! Ці гэта і ёсць адзіна-сапраўдная, несумненная ўлада, дадзеная смяротнаму чалавеку, а зусім не ўлада палітычная?

Фелікс згаджаўся, падтакваў, не забыючы нагадваць, каб гаманкі сябар хоць трохі глядзеў пад ногі.

## IV

Возера прайшлі, ускараскаліся, памагаючы адзін аднаму, па слізкім адкосе і апынуліся на пасялковай вуліцы, вузкай, гарбатай і крывой («Як п'яны бык пасцаў», — заўважыў Галубоўскі) вуліцы. Людзей па дарозе траплялася мала, у асноўным мужчыны-рыбакі ў сваіх ватоўках, бахілах і са скрынкамі на плячах; хто ішоў з возера, хто на возера...

Каля мясцовай крамкі стаяў, пакурваючы, дзядзька з браканьерскай мордаю. Побач, на кавалку цэлафана, раскладзены быў тавар — акуні, шчупакі, плоткі, судакі... Рыбіны былі розных памераў, некаторыя яшчэ варушылі плаўнікамі і жабрамі. Побач стаяў пусты глыбокі таз. У Галубоўскага загарэліся вочы, ён раптам падскочыў да прадаўца і загаварыў холадна, строга, начальніцкім тонам:

— Што за рыба? Адкуль? Чым лавіў — сеткаю? Электравудаю? А дазвол? Пасведчанне паказаць?

Дзядзька цыркнуў слінай, змерыў Галубоўскага сонным поглядам, нібы вырашаў, ці варта траціць на такога словы. Вырашыў, што не варта, і пагардліва адвярнуўся.

— Цяпер разумею, — зрабіў чарговае адкрыццё Галубоўскі, калі ледзь адцягнуў яго Фелікс і яны пайшлі далей па вуліцы, — чаму знаёмыя рыбакі ніколі без улову не вяртаюцца! На якую «рыбалку» ездзяць!

— Ды не. Сапраўдны рыбак смаркатага ярша ніколі не памяняе на самую залатую бабу... Прашу! — Фелікс паказаў на металічныя веснічкі.

Дом. Звычайная дача. Як вясковая хата, толькі высокая, з акенцамі ў паддашшы. Нічога не паказвала, што гэта загарадны публічны дом, ці дом спатканняў, скажам мякчэй.

— Не Капенгаген, — скептычна заключыў Галубоўскі. А калі ўвайшлі ў двор, і навязаны на ланцугу ля будкі сабака, замест таго, каб гаўкаць на чужых, толькі хвастом завіляў, Галубоўскі пасміхнуўся: — Прывык!

У халоднай — пара з рота — верандзе ім насустрач падалася жанчынка, звычайная вясковая бабулька, у пуховай хустцы, вязанай кофце, у пантофлях з кутасамі і ў мужчынскіх шкарпэтках. Рукі ад холаду яна трымала ў рукавах кофты, як у муфце. Твар свяціўся лагоднымі зморшчынкамі, вочы ззялі радасцю, нібы гэта маці сустракала даўно чаканых сыноў.

— Не занята, баба Ганя? — спытаў Фелікс, і Галубоўскі, распранаючыся каля вешака, кідаючы на табурэтку шапку і шалік, паспеў заўважыць, як сябар дастаў нешта з кішэні і пхнуў бабулі ў руку.

— Дзякую, родненькі, — расчулілася тая, ці то парушынку змахнула з павек, ці то нават слязіну. — Ніколі не пакрыўдзіш старую... Абы добра было...

— Абы грошы і харчы харошы, — крыху не ў тэму ўставіў Галубоўскі. Цяпер, калі распрануліся, дык Фелікс нібыта яшчэ больш падрос, а Галубоўскі яшчэ паменшаў. Без шапкі ў яго на самай макаўцы адкрылася круглая, акуратная, падобная на ярмолку лысіна.

Доўгім калідорам прайшлі ў нейкую цесную баковачку. Галубоўскі машынальна агледзеўся, шукаючы вачыма ложка ці канапы, але іх не было. Быў стол пасярэдзіне, засланы сінім у белыя гарошыны абрусам, і некалькі табурэтак. На стале — сальніца і попелка. Нявыветраны тытунёвы пах прымусіў паморшчыцца нават курца Галубоўскага.

— Прысядзем?

Сябры паселі на табурэткі, склаўшы рукі на каленях. Пакуль стол з дапамогай бабы Гані сервіраваўся няхітрымі сялянскімі закускамі, Галубоўскі ад няма чаго рабіць цікаваў за ёю — за гэтай носьбіткай маралі і чысціні духоўнай, за гэтым жывым увасабленнем народнай мудрасці і прастаты, за гэтым адвечным літаратурна-мастацкім сімвалам дабра, справядлівасці, цягавітасці і працавітасці, — словам, сачыў за гэтай старой зводніцай — гаспадыняй прытона, і гучным шэптам дзяліўся з Феліксам сваімі назіраннямі, у прыватнасці, звяртаў увагу сябра на яе рукі — спрацаваныя, сялянскія, патрэсканыя, якія чаго толькі на сваім вяку не перарабілі, перш чым ладзіць ім, такім, як Галубоўскі з Феліксам, пачастункі і перасцілаць для іх пасцелі.

Калі ж стол быў нарэшце сабраны (міска з квашанай капустай, салёнымі гурочкамі, талерка з ружовымі брускамі сала, хлеб — чамусьці не чорны, а нарэзаны батон, і пляшка гарэлкі), Галубоўскі зусім развесяліўся, разышоўся да таго, што пачаў смехам заляцацца да бабкі Гані:

— Вось і дама нашая!

Ламаўся, галантна схіляў у паклоне галаву, выказваў намер пацалаваць «даме» ручку... І дабіўся свайго, угаварыў. Чырвоная, збянтэжаная бабка вымушана была прынесці сабе чарачку, прысела за стол і сарамліва пачала церабіць вузлаватымі пальцамі махры абруса.

— Вясёлы таварыш ваш, дзякуй яму...

Пачалі выпіваць, закусваць, і тут ужо ідылія наступіла поўная: вось прыехалі з горада сыны — памагчы старэнькай матулі, дроў нарэзаць-накалоць, вады нанасіць, хлеўчык паднавіць, і цяпер набіраюцца сілы перад нялёгкай, але важнай, патрэбнай справаю.

Баба Ганя толькі прыгубіла сваю чарку і панюхала кавалачак батона. Фелікс таксама не праяўляў ахвоты ні ў выпіўцы, ні ў закусцы. Затое Галубоўскі еў за дваіх, а гаварыў за траіх. Жарцікі, анекдоты, каламбуры, не зусім прыстойныя і зусім непрыстойныя показкі так і ляцелі з яго набітага рота разам са слінаю направа і налева. Асабліва падабаліся яму самому ўласныя інверсіі, гэтыя смешна-несуразныя перакруткі слоў, такія як «шутка юмора», «рыбалка — любімы спорт віда» (Галубоўскі знарок картавіў, і гучала не «рыбалка», а «ыбалка»), «не в дела курсе», «насчёт картошки дров поджарить»... Таксама бліскаў пярлінкамі: «надуй бліжняга свайго, бо дальні наблізіцца і надуе цябе», «няма часу грудзі мяць», «у лесе пра баб, з бабамі — пра лес», «у рыбака голыя бака, зато абед панскі», «у дзеўкі ўсё шчасце спераду, а калі нагнецца — ззаду», «дамы запрашаюць кавалераў

на палку чая», і вядомае ўжо, неаднойчы паўторанае — «былі б грошы і харчы харошы!»...

Баба Ганя таксама хутка асвойталася, увайшла ў кампанію, пачала памагаць яму рэплікамі, падсыпаць слоўкі і выразы народныя, сакавітыя (якія ў гэтай сітуацыі гучалі куды пашлей, брыдчэй і пахабней за, у прынцыпе, бяскрыўдна-дзіцячыя непрыстойнасці Галубоўскага).

— Ежце на здароўечка... Бронь Божа... У Бога дзевак многа... Мне чужога век не трэба... Усё жыццё з мазаля жыла... Хай вам Бог дае ў ручкі, у ножкі і туды трошкі... Каб ведаў, дзе ўпадзеш — саломкі падаслаў бы... Спанаравіцца — дык станеце часцей наязджаць, будзе вам свая дача...

— Дзеўкі спорылі на дачы — у каго та-та-да-та-ча, — зрыфмаваў Галубоўскі. Ён пагладжваў сабе жывот і глядзеў перад сабой алейнымі, крыху асалавелымі ад гарэлкі і тлустай закусі вачыма.

Баба Ганя яшчэ пасядзела трошкі, ветліва падзякавала, культурна папрасіла прабачэння і выйшла, шлэпаючы сваімі пантофлямі з кутасамі. Фелікс з Галубоўскім засталіся чакаць.

## V

За акном хутка сцямнела. Галубоўскі не мог уседзець на месцы. Ён то курыў, то мераў крокамі пакой, то адхінаў фіранку, узіраўся ў цемру... І — не пераставаў балбатаць.

Звычайна чалавек выгаварыцца, стоміцца і дасць магчымасць пагаварыць іншым. Ды толькі не Галубоўскі. Гэты наадварот — чым больш балбатаў, тым больш сам сябе заводзіў. Спіртное толькі выпукліла яго няўрымслівы характар. І тон балбатні змяніўся — з жартоўна-гуллівага, як з бабкаю за сталом, стаў з’едліва-абвінаваўчым, нават злым.

Фелікс, на якога гарэлка зусім не падзейнічала, супакойваў: «Рана яшчэ... куды спяшацца... уся ноч наперадзе... што цябе каўбасіць?» — і гэтая сяброва ўпэўненасць, панібрацтва, асабліва яго ўхмылачка яшчэ больш распальвалі Галубоўскага.

— Убога, — казаў ён, стукаючы пальцам па падаконніку. — У-бога! У гэтай бабкі Ганькі — дзеці ж, канечне! Унукі! Што, не ведаюць, чым займаецца іхняя клапатлівая матулька і бабулька? Адкуль у яе грошы на падарункі?

— Ды баба як баба. І нашто табе іншая? Сам жа казаў: электрычка — каб ехаць, гарэлка — каб піць, дзеўкі — каб з імі спаць... Ну і бабка — каб спальню арганізоўваць...

— А твар? — гнуў сваё Галубоўскі. — Заўважыў? У жанчын увогуле, чым больш ім гадоў, чым бліжэй да старасці, начыста знікае былая прыгажосць, блякне, адмірае тое, чым раней можна было браць, застаецца голая існасць! І тварамі яны робяцца падобнымі, як блізняты, уладнасць, хцівасць, жорсткасць ледзь не драпежная — усё, што было прыхавана маладосцю, раптам так праяўляецца!..

— Ды звычайны твар. Ну, а калі б замест бабы быў дзед? Якая розніца? Чаго ты яшчэ хочаш?

— Розніца... Дзед, — Галубоўскі курыў ужо трэцюю запар цыгарэту, у клубах сіняга дыму, як вожык у тумане, перасякаў туды-сюды пакой — ад стала да акна, за якім чарнела ноч. — Чаго я хачу...

— Што табе не падабаецца?

— Не падабаецца... Усё! Нейкая баба, нейкія дзеўкі... А то я не ведаю, што іх гоніць сюды! Уцёкі ад кухні, бялізны, руціны, пастыласці, вечна п'янага хама-мужа без кветак... Марна, ад сябе не ўцячэш!

— Не дуры, калі ласка, — не зразумеў Фелікс. — Дзеўкі чыстыя, праверaныя, бясплатныя... Чаго табе яшчэ? Устроіў лекцыю на голым месцы, — з мяккім дакорам ён яшчэ спрабаваў спусціць сябра на тармазах.

Але Галубоўскага ўжо несла:

— ...І як танна, безгустоўна, прыкра! Так нецікава аддаваць сябе! — захапіўшыся, Галубоўскі не заўважаў, што звяртаецца ўжо не да ні ў чым не вінаватага Фелікса, а напрамую да гэтых дзевак, нібы яны сядзяць тут і яго слухаюць. — Я б яшчэ зразумеў, калі б бралі грошы, хоць нейкая логіка! А так — сувакупленне, іменна — механічны акт, з усімі атрыбутамі, з усёй юрыдычнай казённасцю слова! Ад якога патыхае жалезным вузкім скрыпучым ложкам, кратамі на вокнах, голымі сценамі з цвіллю на тынку, рэжымам, строгасцю, пошласцю, сумам, сумам...

— Не трэба было ехаць, — справядліва заўважыў Фелікс. — А раз ужо прыехалі, дык давай рабіць тое, дзеля чаго прыехалі.

— Рабі! — з гарачкі ўсклікнуў Галубоўскі. — Я яшчэ не настолькі апусціўся, каб... Шкада мне вас!

Фелікс памаўчаў. Яму яўна надакучыла ўлагоджваць капрызнага сябрука, нянькацца з ім, як з галоўным тут, як з цэнтрам, вакол якога ўсе яны — другасныя персанажы, павінны кружыцца, бы начныя матылькі вакол лямпы.

— Ды ці не баішся ты, таварыш? — спытаў ён неяк стомлена, без звыклай сваёй іроніі, амаль халадна.

Ад нечаканасці Галубоўскі аж задыхнуўся.

— Ты... ты... Дык вось які ты! Такое яно, тваё сапраўднае нутро?!

А ён тут распінаецца... Перад кім?! Прэч... Прэч... Не марудзячы ні секунды... З гэтага пошлага прытона, ад гэтай вульгарнай бабкі, ад гэтага чалавека, якога некалі лічыў сябрам!..

— Пайсці хочаш? — данеслася яму ўслед. — Дык позна. Ужо...

Далей Галубоўскі не чуў, дзверы за ім ляпнулі.

## VI

На вуліцы востра пахла адлігай і вясной. Галубоўскі ішоў, дыхаў, падстаўляючы свежаму ветру твар. Ён аслабіў шалік, шапку зняў і нёс у руцэ. Неўзабаве стала холадна. Галубоўскі спыніўся. Надзеў шапку. Цёмна, пуста, незнаёма... Ад станцыі данёсся шум электрычкі.

Павярнуў назад. Пастаяў каля веснічак, чакаючы, калі выйдзе Фелікс, папросіць прабачэння і тады ён, Галубоўскі, трохі паламаецца і пойдзе ў хату. Бо на самай справе ён хацеў толькі адвесці душу, выгаварыцца, пакрычаць для парадку, з'едлівасцю і найгранай, перабольшанай злосцю паказаць, што сітуацыі ён не адабрае, але вымушаны застацца.

У хаце свяціліся вокны. У двары сабака пазвоньваў ланцугом. Ніхто не выйшаў.

«Баішся, таварыш?» — успомнілася Феліксава. Крыўда і злосць зноў падступілі да душы. Усё ж такога ён ад рахманага, ціхага, вечна на другіх ролях Фелікса аніяк не чакаў.

Гусь свінні не таварыш!.. Пазней можна будзе абыграць — якнебудзь: голуб свінні не таварыш... Каб адразу ясна было, што свіння менавіта Фелікс, бо нельга так з сябрамі.

Пальцы намацалі ў кішэні мабільнік. Таксама выйсце... «У крайнім выпадку пазваню. А пакуль прагуляюся, хоць бы да возера, ці нават да станцыі, і назад... А што? Заадно працверазею».

Пайшоў. Цяпер дарога — мо ад таго, што была знаёмая, — падалася не такой і доўгай. Завулак. Крама, каля якой днём Галубоўскаму запраста маглі даць па мордзе. Адкос, спуск на лёд... Возера. Успомніліся кропкі і коскі на лёдзе — сагнутыя постаці рыбакоў. І цяпер сям-там па ўсім возеры мільгалі слабыя агеньчыкі — ліхтарыкі ў палатках рыбакоў, якія засталіся на ноч.

Галубоўскі спусціўся на лёд, пакрочыў апасліва, пазіраючы ўніз, помнячы, колькі дзірак накручана ў гэтым рыхлым, як сыр, лёдзе. Месяц то хаваўся, то выплываў з-за хмарак, нібы прапаноўваў гульню: ці запомніў ты шлях? Але і без месяца арыенціраў хапала. Тыя ж

рэдкія агеньчыкі ў палатках, чорная сцяна лесу справа і цьмяная пляміна святла ў тым баку, дзе станцыя.

Яшчэ адна электрычка, ужо з Мінска, праехала, на гэты раз бліжэй, весялей яе перастук, і ўжо не толькі вачыма, а і вушамі можна арыентавацца. Месяц перастаў гуляць у хованкі, выплыў з-за хмараў увесь, на лёд легла роўная светлая палоска. Галубоўскі забыў пра асцярожнасць і даволі бадзёра тупаў па гэтай сіняватай падманлівай сцежцы.

Так ён перасёк амаль усё возера. Ужо бераг і лес былі зусім блізка, ужо выразна бачыліся агні ліхтароў на пероне... У гэты момант лёд нечакана і яшчэ не страшна трэснуў звонкімі стрэлкамі — ці-і-іў!.. Але не праламаўся, толькі ўвагнула яго пад цяжарам цела. Галубоўскі запрацаваў нагамі, стараючыся выбрацца з гэтай неглыбокай варонкі з ледзяным скатам, заслізгацелі тонкія падэшвы гарадскіх туфляў... Марна — лёд! Галубоўскі наверх, а яго цягне на дно ўвагнутай варонкі, Галубоўскі на карачкі, грабсціся рукамі, а няма счаплення — паехаў уніз, дзе ўсё больш нецярпліва і грозна патрэсквае — грабіся, паўзі, а будзеш ты мой! І вось чарговы раз трэснула, вухнула пад нагамі, і Галубоўскі шухнуў у ледзяную ваду па пояс. Апякло не холадам, а жарам, і ў мазгі нібы тысячы голак утыркнулі. Вады было яму па пояс, а здалося — па шыйку. Ногі, праўда, стаялі на цупкім дне.

Ён, раскінуўшы ў бакі, як купальшчык, рукі, сунуўся быў уперад, да берага — а яно глыбей, дна няма! Ён назад, каб выбрацца зноў на тоўсты лёд — а яно ніяк, лёд крышыцца, ламаецца ў пальцах! Позна зразумеў, што собіла яму праваліцца акурат на закраінах, на саменькай мяжы, дзе стары, падточаны знізу вадою лёд пераходзіць у малады, прыбярэжны, які чым бліжэй да берага, тым танчэйшы, бо днём растае, а на ноч схопліваецца...

Ён паспрабаваў легчы на жывот, распластацца, каб выпаўзці з палонкі чарапахаю... Але хрумснула пад ім яшчэ мацней, паламалася, ды так, што ён ледзь не даў нырца з галавою, паспеўшы падумаць: шапка намокне! І гадзіннік, і цыгарэты, і тэлефон... Якраз тое, што трэба ратаваць!..

У паніцы кінуўся ў адзін бок, другі, і трэці, і чацвёрты... Ужо хоць бы куды, хоць уперад — да станцыі, электрычкі, хай мокраму, без рыбы і без сябра, у горад, да жонкі, кухні, канапы, тэлевізара і фікуса ў гаршчку, хоць назад — у прытон, да Фелікса і бабы Гані... Усё роўна! Абы не стаяць, абы рухацца!

Ды не можна было. Ён ужо бачыў, што куды ні рынься — толькі горш. Супакоіцца... Пастаяць. Апамятацца. Абдумаць план ратунку.

Званіць Феліксу? І ён прыйдзе, насмешлівы або злосны, і пачнуць яны перазвоньвацца на ўсё возера, бо не адразу ж знойдзеш, і пойдуць потым назад, і ён, Галубоўскі, мокры, аблезлы і нікудышны, паўстане перад «дамамі»...

Гукаць рыбакоў? А мо сам выграбуся? Мо не так усё кепска? Яно ж нібыта не глыбока, утапіцца не ўтопішся...

Ён сціскаў у руцэ тэлефон — і не званіў. Набіраў у рот паветра — і маўчаў. Холадна вельмі было... І вельмі сорамна.

Вось табе прынцыповасць! Вось яна, плата за маральнасць — замест ўзнагароды! А не трэба было акторстваваць, дурыць, капрызіць не трэба было — і не праваліўся б, не замярзаў бы цяпер, не боўтаўся б, як дзярмо ў пельцы, не стаяў бы раскіракаю — а ляжаў бы ў цёплым ложку з дзеўкаю, як Фелікс, мабыць, зараз... Трэба яна табе была, гэтая прынцыповасць? А калі б Фелікс не сказаў бяскрыўднае «баішся» — застаўся б? Не, не застаўся б... Калі б Фелікс нават каўнер адрываў, утрымліваючы, — уцёк бы. Чаго ўжо тут... Не кожнаму, дарагі мой, дадзена, не так гэта проста, як у тваіх анекдоціках!..

Плакаць хацелася і ад холаду, і ад бяссілля, і ад сораму... А сама больш — ад несправядлівасці.

Ён і заплакаў. Стаяў па пояс у ледзяной вадзе, пад гэтым вечным месячным святлом, маленькі, скалелы, напалоханы, бездапаможны — мікраскапічная пылінка ў Космасе, і хныкаў, румзаў так, што салёныя слёзы ажно ў нос зацякалі!

Ужо ў мазгах у яго пачало муціцца. Месяц, вада, лёд, снег, лес, агеньчыкі палатак і агеньчыкі зорак, і белае, і чорнае, і сіняе... Ён перастаў усхліпваць. Закінуў галаву, углядаючыся ў неба, невядома што там шукаючы. Месяц быў той самы, што суправаджаў яго ўсё жыццё, ад дзяцінства і да сёння, зазіраў у яго пакой, у кухню, асвятляў яму сумесна з ліхтарамі мілыя мінскія вуліцы... А цяпер сеяў сваё сіняе, халодна-прыцягальнае, мёртвае святло і не было яму аніякай — абсалютна ніякай справы да таго, што чалавек так несправядліва гіне!..

— Хто тут? — раптам пачулася зусім блізка.

Ён хацеў адказаць: «Памажыце, замярзаю, таплюся», — але не змог, словы захраслі ў горле.

— Руку давайце!.. Ды смялей, не бойцеся... Як вас уперла сюды?

## VII

У палатцы, ці хутчэй гэта быў нейкі шалаш, гарэлі, ціха патрэскваючы, штук пяць свечак-лампадак, невялічкіх, але ад іх было светла, цёпла і нават утульна. Пахла плаўленым парафінам, свежай рыбай і трохі бамжатняю.

Галубоўскі сядзеў у кутку на лахманах, прагна глытаў гарачы чай з алюміневай конаўкі, адчуваючы, як марудна, млявай прыемнай хваляю разліваецца цяпло па змучаным целе і спалоханай, збалелай душы.

Яго збавіцель корпаўся нешта ў кутку, перабіраў свой рыбацкі скарб і (быў, відаць, з пароды «галубоўскіх») усё гаварыў, гаварыў — ціха, манатонна:

— А я чую, нехта боўтаецца... Плёхае... Спалохаліся? Ды тут не ўтопішся — неглыбока... Адно холадна... Вы піце, сёрбайце хоць гарбату! Як ведаў — заварыў акурат... Трэба ж, як калоціць вас, беднага! Яно каб у пасёлак, ды выкруціцца, пасушыць вас... Бо як вы ў электрычцы паедзеце? Ці потым па горадзе? Як-ніяк сталіца, а вы ў мокрым... Пазіраць будуць, падумаюць немавед што...

Галубоўскі не мог вызначыць яго ўзрост, не бачыў і яго твару — рыбак увесь час нібы знарок паварочваўся да яго то спінаю, то бокам. Але здавалася, чалавек гэты яшчэ не стары, чамусьці абавязкова з барадою, з мяккімі, вельмі добрымі і вельмі сумнымі вачыма. І ад таго, што ён так шкадуе яго, чужога і дурнога Галубоўскага, называе бедным, асабліва ад гэтага мілага «выкання» Галубоўскаму хацелася прытуліцца да яго і яшчэ трохі ціха паплакаць.

— Грэйцеся, піце на здароўе... На электрычку ішлі? Дача тут? Мабыць, дача... У мяне таксама была... І дача, і машына, і жонка, і кватэра ў Мінску... Усё было, як у людзей. Цяпер толькі халупа тут, у пасёлку... Больш нічога няма. Я б вас завёў, дык там месяц не палена, халадрыга, дроў няма... Памерла ў мяне жонка, во дзе бяда... І паліць няма каму... І навошта? А ў мінскай кватэры дачка, з сужыцелем жывуць... Хай жывуць. Я ім не суддзя. Зімой толькі кепска — холадна ў хаце, у халупе маёй... Адзінока... А вы жанатыя? І дзеці ёсць? І працуеце? На фірме? І машына свая? Хаця цяпер у каго іх няма... Толькі жыві... Шчаслівыя вы, і такія маладыя яшчэ... І мне грэх скардзіцца! Многа не трэба — як, мусіць, і вам... Што маю — тое і маё. Скора пацяплее, а там вясна, лета, жыві не хачу... Возера, сонца, рыба, палатка гэтая... Рыбакі выкінулі, я падабраў, падлатаў, яно і нічога, жыць можна... Яшчэ гарбаткі? Піце на здароўе, пакуль гарачая... Ды і пойдзем патроху. На станцыю... Бо ў пасёлак, да чужых, толькі сунься —

яшчэ ў прытон пападзеш, тут гэтага дабра поўна... Хто наркатой займаецца, хто самагонам, хто блудам... У мяне ў самога, сказаць вам, дачка такая. Гэта каторая ў Мінску. Выгнала вось з кватэры... Хай. Я не ў крыўдзе... Жывіце. Яе вось толькі шкада, нібыта і замужам — і бл...дзь. А ў вас нічога! Усё добра ў вас... Пасядзіце, дапівайце, я вас да самага вагона давяду. Палкі толькі пабярэм, ды і пойдзем — яно хоць месячна, светла, а паспрабуй прайдзі такім лёдам!..

*2002, 2007 гг.*

## «КУДА ИДТИ В ЛЕСУ?»

Іван Аляксеевіч вяртаўся з грыбоў на станцыю.

Дарога паўсюль вяла праз лес, ён цягнуўся ледзь не да самага перона. Нядаўна адкропаў дожджык, яшчэ не паспела распагодзіцца. У паветры стаяла імжа, між дрэў вісеў сіняваты туман. Было волка, ціха і неяк сонна, пахла летам, лесам, дажджом, туманам і, канечне ж, грыбамі — тым непаўторна шчымлівым, бясконца мілым водарам моху, сырасці і грыбной цвілі.

Іван Аляксеевіч нікуды не спяшаўся. Суботні дзень, электрычкі бегаюць часта. Крочыў сабе па перасечанай каранямі, усыпанай мокрай ігліцай і лісцем дарозе, і крыху шкада яму было, што мала пабыў у лесе, не выхадзіўся так, каб ногі гудзелі. Сваё дзесяцілітровае вядро ён не заўважыў, як набраў, прычым адных белых і асінавікаў, нарэзаў іх неяк хутка, напоўніў вядро даверху, акурат каб накрыўка легла: ён хутчэй без шкадавання выкінуў бы лішняе, чым вязці напаказ, дражніць чужое вока — нельга хваліцца ўдачай!

Каля апошняга павароту Іван Аляксеевіч спыніўся пад хвояй, зладзеявата паглядзеў па баках і пачаў спраўляць малую патрэбу... Як тут зусім блізка ці то жаночы, ці то дзіцячы голас крыкнуў пранізліва, рэзка:

— Э-гэ-гэй!!!

Іван Аляксеевіч уздрыгнуў ад нечаканасці. Людзей у лесе ён увогуле не цярпеў, звычайна калі яшчэ здалёк заўважаў грыбніка-канкурэнта, затойваўся, стараўся схавацца, мяняў маршрут — абы не перасячыся дарогамі; што ўжо казаць пра розных крыкуноў-галёкалаў — такіх ён амаль ненавідзеў. Усё ж цяпер нават не павярнуўся на голас, спакойна дарабіў, што хацеў, і толькі пачаў прыводзіць сябе ў парадак, як — зноў:

— Э-ге-гэй! Ку-дай-це-лісу!!! — прычым гэтую лісу патрабавалі вось зараз, кроў з носу.

Іван Аляксеевіч крэкнуў, сплюнуў, ціха вылаяўся. І якіх толькі прыдуркаў няма на свеце! Вось ужо сапраўды, і сеяць не трэба — самі растуць...

— Ку-дай-це-лісу?!! Ку-дай-це-лісу?!! — проста-такі залямантаваў голас — нейкія скандальна-істэрычныя, зусім не лясныя ноткі зазвінелі ў ім, такія недарэчныя, настолькі чужыя гэтым хвоям, верасам ды імхам, гэтай спакойнай цішыні і адзіноце, што Івану Аляксеевічу не па сабе стала, крыху нават страшнавата і разам з тым цікава: якую лісу? навошта? хто яе так дабіваецца?

Ён асцярожна, хоць і ведаў, што заўважыць яго, апранутага ў цёмна-зялёны плашч-дажджавік, амаль немагчыма, рушыў на голас. Стаіўся за кустом арэшніку, адагнуў галінку...

Зусім блізка, метраў за дзесяць ад куста, на палянцы, стаяла жанчына, а мо дзяўчына — твару не відаць было. У руках — нічога. Зграбная постаць. Адзенне не ляснoe — кідкае, стракатае. З-пад кароткай скуранай куртачкі знізу і зверху вытыркаецца світар, высокі каўнер шчыльна аблягае шыю. Шнураваныя боцікі чыстыя, глянцавата блішчаць...

Івану Аляксеевічу захацелася ўбачыць яе твар. Прыгінаючыся, хаваючыся за дрэвамі, усё гэтак жа ціха ступаючы, ён абышоў палянку, падкраўся яшчэ бліжэй, паднырнуў пад старую елку, густыя лапы якой звісалі да зямлі, шалашом, і з гэтага надзейнага схову ўжо добра, у профіль, разгледзеў жанчыну... Якая жанчына! — гадоў сямнаццаць ад сілы... Твар юны, чысты, з тонкімі рысамі... Валасы, вусны... Прыгожая, дагледжаная, шляхетна-пародзістая (умомант і беспамылкова вызначыў чалавек вясковай гадоўлі Іван Аляксеевіч). Абсалютна нармальная! Што за чорт? Ну, голас-то, праўда, псіхаваны...

«Гарадская? Распешчаная? — падумаў Іван Аляксеевіч. — Аранжарэйная?» Прыпёрлася з сям'ёй ці з кампаніяй, адстала... Разгубілася, спалохалася... Заблудзіцца тут малое дзіця не можа. Месца вытаптанае-выхаджанае, станцыя побач, перыядычны шум з чыгункі, скрозь поўна сцежак, якія ўсе зліваюцца ў адну — да станцыі.

Ну што. Усё ясна. У цябе свой клопат, у мяне — свой, табе стаяць на палянцы і лісу гукаць, мне — дамоў ехаць, справы рабіць...

— Ку-дай-це-лісу?!! Ку-дай-це-лісу?!! — не ўнімалася дзяўчына, толькі рэха па лесе ляцела. — Ку-дай-це-лісу?!!

«Не — вы мяне ў гэта не ўблытаеце», — падумаў Іван Аляксеевіч. Такое ў яго было правіла, адно на ўсе выпадкі жыцця — «вы мяне ў гэта не ўблытвайце!» Правіла як правіла. Не горшае за іншыя. Прынамсі, не падвяло яго яшчэ ніколі, «ні ў прозе, ні ў дарозе», — як

сказаў паэт, ні ў грыбах, ні на рыбалцы, ні ў сям'і, ні ў адпачынку, ні на рабоце, а працаваў ён шафёрам, ці, па-іхняму, «вадзіцелем»: зорачкі ў тры рады на кабіне яго «МАЗа» сведчылі, колькі год пракруціў ён «баранку» без аварый — роўна столькі, колькі за яе трымаўся. Такія ж зорачкі можна было смела маляваць нябачнай фарбай і на скрыжалях яго лёсу. Жыццё яго кацілася роўна, ціха, гладка — як «мазаўскія» колы па харошай дарозе. Вясковую асцярожнасць, педантызм, падазронасць ён некалі ўдала прышчапіў да гарадской практычнасці, учэпістасці, цынізму і дажыў гэткім гібрыдам да 50 гадоў прыпяваючы. Ніколі не курыў. Піў рады ў гады і толькі пад закуску. Жонка — медсястра ў паліклініцы. Двое дарослых сыноў, жанатыя, уладкаваныя, жывуць асобна, унук ад Пеці — Сярожка і ўнучка ад Колі — Машанька. Тыповая сярэдняя беларуская сям'я. Усе больш-менш здаровыя (дзякуючы Богу і жончынаму блату ў паліклініцы), усе адносна шчаслівыя...

Што яшчэ пра яго сказаць? Якія штрыхі дадаць да яго партрэта? Напрыклад, якая была ў яго палітычная арыентацыя? Ды ніякай. «Вы мяне ў гэта не ўблытвайце!» — вось і ўвесь сказ, ці тычылася гэта незапланаванай выпіўкі, ці сямейных разборак, ці праблем на працы, ці палітычных размоў любога ўхілу. І за такую цвёрдасць, яснасць пазіцыі заслужыў ён людскую павагу, справядліва заняў сваё месца пад сонцам, і называлася яно — «сапраўдны мужык». Сябры вымаўлялі гэта з павагай, а жонкі сяброў — з некаторай зайздрасцю.

— Ку-дай-це-лісу!!! Ку-дай-це-лісу!!! — ужо праз слёзы надрывалася дзяўчына.

А каб на цябе, ды з тваёй лісой разам!

Трэба было заварочвацца ды ісці. Аднак жа не адпускала нешта. Іван Аляксеевіч яшчэ і яшчэ раз крадком агінаў паляну, так і гэтак з розных месц разглядваў, дзівіўся на псіхаванага чалавека... Ды якая псіхаваная?! — ну нармальная ж абсалютна з выгляду! Мяняючы чарговы раз месца назірання, не пасцярогся, галінка трэснула пад нагою... Дзяўчына, мабыць, пачула, бо хутка павярнулася і, здалося, не некуды ў лес, а яму, Івану Аляксеевічу, крыкнула:

— Ку-дай-це-лісу!!! — зусім адчайна, як чалавек, якога рэжуць, які крычыць «караул, ратуйце!»

У Івана Аляксеевіча мурашкі прабеглі па спіне. Ён застыў спалоханы… Але не ад таго, што яго нібыта заўважылі, — бачыць яго яна не магла, — проста толькі цяпер ён змог разабраць яе словы, пачуў выразна:

— Куда идти в лесу?!! — вось што яна крычала.

Іван Аляксеевіч выцер з ілба кроплі імжы разам з потам. Цьфу! Прыдумаць жа такое... Аж злосць на сябе ўзяла, што стаў такі нервовы, і на яе, гэтую дурніцу, што на роўным месцы ўмудрылася напалохаць сталага, сур'ёзнага чалавека.

— Куда идти в лесу?!!

Чортава дурніца! Ды ў якім ты «лесу»?! Дзе ты яго бачыш? Не стой пнём, а прасунься ў любы бок на дваццаць крокаў — і выйдзеш са свайго лесу!.. Вар'ятка, несумненна. А такая яшчэ маладая, прыгожая... Нібыта не п'яная... Наркаманка? Іх разбярэш... Карацей, так. Бяры ты, Іван Аляксеевіч, ногі ў рукі і давай адсюль, к чортавай матары...

Ён рашуча павярнуўся, зрабіў крок... І зноў яго скаланула ад немага:

— Куда идти в лесу?!! — і далей ужо без перапынку, не змаўкаючы, бы спружыну накруцілі ў ёй: — Куда-идти-в-лесу, куда-идти-в-лесу, куда-идти-в-лесу?!! — усё з тым жа безнадзейным адчаем, мальбою, вусцішнасцю...

Іван Аляксеевіч ішоў хутка, не азіраючыся, амаль бег па сцежцы, ужо далекавата быў ад паляны — а голас усё даганяў і біў па вушах і па мазгах, як малаток у суседзяў за сцяною, калі табе, адурэламу, нічога не застаецца, як чакаць і механічна лічыць: раз... два... сем... сямнаццаць... Ужо станцыя відаць была ўперадзе, лес застаўся ззаду, платы прыстанцыйных хат пайшлі і скончыліся, а ўсё яшчэ чуваць было:

— У-а-і-у-у!.. — нібы гэта не ён уцякаў, аддаляўся ад яе, а яна ад яго — мо і сапраўды пайшла ў лес, далей, глыбей. З такой галавой заблудзішся... Блудзішся... Блуд...

Нечаканая падобнасць такіх, здавалася б, розных слоў азадачыла і зацікавіла Івана Аляксеевіча, і нават на міг прымусіла забыць на лясную няшчасніцу. Заблудзіцца — і блуд... Мала знаёмы з тонкасцямі філалогіі, хіба што на ўзроўні ненарматыўнай «вадзіцельскай» лексікі, ён (як, зрэшты, і мы ўсе) пад словам «блуд» звычайна разумеў адно: оргіі, распусту, амаральнасць поўную... А мо гэта ўсяго толькі ад нявіннага заблудны — заблукалы? Разгублены ў незнаёмым месцы, у чужым горадзе, у лесе... У жыцці... Збіўся з тропу — вось і блудзіць, кідаецца з боку ў бок... І трэба ўсяго толькі падказаць яму дарогу... Во хітра!

Заняты гэтай новай, такой, аказваецца, цікавай штукай, Іван Аляксеевіч дайшоў да станцыі, купіў білет і неяк не паспеў заўважыць, якія змены адбыліся вакол. А між тым пацямнела добра, напаўзла хмара, аблажыла неба. Зноў пайшоў дождж. Іван Аляксеевіч нават

пад навес станцыі не стаў хавацца, наадварот, яшчэ і галаву падняў, падстаўляючы твар рэдкім пакуль кроплям. Душна яму было. Ажно пад пахамі ўзмакрэў... І неспакойна неяк.

Сапраўдны дождж лінуў, калі пад'ехала электрычка, і людзі — а многа іх было, поўны перон — рынуліся, палезлі, караскаючыся па крутых сходах-прыступках, у вагоны, тады ён і хлынуў, як неба парвала — такі ўмазаў!

Івана Аляксеевіча ўнеслі ў тамбур, затым у вагон. Электрычка кранулася. Зацісначы, перакручаны, мокры ад поту, ён глядзеў у акно і нічога не бачыў там, адно суцэльную залеву. Чыйсьці локаць балюча ўпіраўся ў левую грудзіну. Які рэзкі перапад атмасфернага ціску!.. І чаму так ціснуць з усіх бакоў людзі!... І як цёмна, нічога не відаць, толькі густыя цяжкія кроплі стукаюць у шыбіны... А ёй як там, на палянцы?.. Ці здагадалася хоць пад дрэва стаць? Ён жа нічым не рызыкаваў... Не рэзалі ж яе, не тапілася яна, не было нікога побач... Пытала ж усяго толькі, куды ісці... Ну што, зямля правалілася б пад нагамі, калі б падышоў, паказаў, вывеў... Мала ці што... Мала што! Як жа цесна, душна, кепска, і сэрца баліць!..

На чарговым прыпынку людзей яшчэ дабавілася, ніхто не выходзіў, толькі залазілі, шумныя, мокрыя, са сваімі сумкамі, вёдрамі, парасонамі, вудкамі, кошыкамі, калясками, чорт ведае з чым, і ўсё гэта такое агрэсіўнае, калючае, штурхаецца, чапляецца, б'ецца, драпаецца і ціснe, ціснe адусюль...

Ад духаты ўсё мацней балела сэрца. Пот... Млявасць нядобрая, ліпкая, брыдкая... Іван Аляксеевіч ледзь трымаўся на нагах. Каб у тамбур выпаўзці, дык і туды не праб'ешся... Хоць проста тут на падлогу сядай. Адчуваючы, што вось-вось грымнуцца можа, баючыся гэтага новага, страшнага, чаго раней ніколі з ім не было, ён, усур'ёз задыхаючыся, папрасіў у хлопца, над якім стаяў:

— Можна я сяду? — і сам не пазнаў свайго спалоханага, жаласлівага голасу. — Мне кепска...

Хлопец адагнуў навушнік — давялося паўтарыць, адказаў коратка:

— Мне — таксама, — і заплюшчыў вочы.

І тут Іван Аляксеевіч успомніў. Ды так жыва, востра, што ўспамін гэты нават перабіў млоснасць і боль у сэрцы. Прыгадалася яму, як гадоў дваццаць назад, у тралейбусе, гэтак сама папрасіла ў яго, тады яшчэ не Аляксеевіча, а проста Івана, саступіць ёй месца не старая яшчэ жанчына. Ён неахвотна ўстаў, яна не села, гледзячы перад сабой поўнымі ад слёз вачыма, нібыта ў пустату, а на самай справе да яго, добрай душы чалавека, звяртаючыся, сказала: «Даеду да Апан-

скага і скінуся з моста. На рэйкі. Даеду — і ўніз галавой». Хутчэй з агідаю, чым са шкадаваннем, абы адчапілася ад яго і ні ў што не ўблытвала, ён выціснуў з сябе: «Нашто ж адразу на рэйкі? Трэба жыць». Але жанчыне хапіла і гэтага, яна ажыла, і пахарашэла, і пасвятлела, і заплакала — ужо ад радасці: «А і праўда! Які ж вы добры! І праўда — трэба жыць! Пamіруся з зяцем, мо і сама вінавата, не так усё кепска, жывуць людзі горш...» — і ўсё дзякавала яму, ледзь рукі не цалавала, ад чаго нават ён, ужо тады абсалютны, кончаны эгаіст, уразіўся: гэта ж трэба! Да чаго давесці сябе, каб нават такія, на адчэп кінутыя словы, халодныя, сухія, абыякавыя, пошлыя як не ведаю што — «трэба жыць» — успрыняліся ледзь не голасам Божым! Да чаго трэба дажыцца, каб у аграмадным горадзе, сярод мільёнаў сабе падобных — ці галавой на рэйкі, ці на калені пасярод людной вуліцы — і завыць, як таму ваўку ў цёмным дрымучым лесе!

...Потым ён зрэдку ўспамінаў той выпадак, з усмешкай расказваў жонцы, сынам, нявесткам, сябрам, што, маўляў, вось які я круты псіхолаг, адным словам, за секунду, жартуючы, чалавека ад смерці адвёў...

Цяпер нават слова не знайшлося. Перамены за дваццаць гадоў.

«Куда идти в лесу, куда идти в лесу?!» — тукала ў яго вушах, у скронях, у сэрцы нейкім заклінаннем, і ён схамянуўся, калі заўважыў, што ўжо не дзявочая, а яго ўласная інтанацыя гучыць у гэтым дзіўным, нібыта бязглуздым, дзікім пытанні.

Вось іменна — «куда идти в лесу?..» Куды ў гэтым лесе, у гэтым жыцці мы ідзём, каго, як малыя неразумныя дзеці, усё гукаем, хто ж і калі нарэшце злітасцівіцца над намі і пакажа дарогу?.. Ну вось, напрыклад, куды, якім лесам ён, «сапраўдны мужык» Іван Аляксеевіч ішоў усе свае 50 гадоў? «Вы мяне ў гэта не ўблытвайце»?.. «Не чапайце мяне, а я вас сто гадоў не зачаплю»?.. «Грабі пад сябе, пакуль грабецца, а перастане — лягай на спіну і лапкі ўгору»?.. Дык а не тыя ўжо лапкі, не грабецца ўжо так, тупяцца кіпцюры... Вось і сэрца, і нервы, і адышка-задышка... Колькі яшчэ ліпець? Гадоў 25 — удвая менш, чым пражыў... Пражыў?! Гэта жыццё?! Што са свайго паўвека людскага, сапраўднага ён можа ўспомніць? Пустату. Вазьмі прыстаў пісталет яму да патыліцы і загадай: успомні! — не атрымаецца. Жанчына ў тралейбусе, і ўсё...

«Куда-идти-в-лесу?! Куда-идти-в-лесу?..»

Перад Мінскам патроху пачалі выходзіць. Паслабаднела ў вагоне, пасвятлела за акном. Дождж хоць і ліў, але ўжо не такі. Івану Аляксеевічу лягчэй не рабілася. Курасоўшчына?.. Яшчэ не так далёка, тры-чатыры прыпынкі ўсяго... А да вакзала? Ну, канечне! Божа,

як проста. Трэба выйсці. Хутчэй, зараз жа, на наступным прыпынку! Перасесці на стрэчную электрычку... Ну, канечне!

Як усё лёгка! Ён вернецца назад. Ён адшукае тую прыгожую вар'ятку-блудніцу... Распытае яе, давядзе куды трэба... І, можа, толькі разам з ёю і сам некуды выйдзе... Ён... удачарыць яе! Чаму не? Дачкі ў яго няма... Ён учэпіцца, як клешч, у гэтую магчымасць, ён скарыстае свой шанс напоўніцу, ён яшчэ паспрабуе выдрацца з гэтага жыццёвага «блуду», з цёмнага душнага лесу, у якім ён, як аброслы імхом, каравы, непатрэбны пень пратырчэў на адным месцы паўвека!..

Дзесяць хвілін падаліся вечнасцю. Хутчэй бы станцыя! Толькі каб не было позна! Толькі каб не выйшла яна сама, каб ніхто не адгукнуўся ёй, не апярэдзіў яго... Ён загадзя пачаў прабівацца да выхаду, наступаючы на чужыя сумкі, вёдры і ногі, не зважаючы на крыкі і лаянку, якімі аблівалі яго ззаду.

Вылез. Паехала электрычка. Іван Аляксеевіч застаўся на пероне адзін, з вядром каля ног. Трэба было пераходзіць праз чыгунку, купляць білет і там чакаць. Але спачатку аддыхацца, апамятацца, супакоіцца... Ён стаяў і прагна глытаў мокрае паветра. Дождж яшчэ ішоў, даволі спорны, не шкадаваў неасцярожнага пасажыра, сек па твары, зацякаў шчодрымі струменьчыкамі пад каўнер, халодзячы да дрыжыкаў спіну і грудзі. Іван Аляксеевіч успомніў жончыну медыцынскую параду: як правільна дыхаць, роўна, глыбока — удых носам, выдых ротам... І праўда, памагае.

Пакрысе на свежым — яшчэ якім свежым! — паветры, пад натуральным халодным душам пачало адпускаць. Памалу Іван Аляксеевіч спакайнеў. Сілы фізічныя і духоўныя патроху вярталіся да яго. Цела і душа прыходзілі ў парадак. Падняць бы таго вагоннага хама за шкірку, разам з яго навушнікамі, ды... Наўрад ці! Наўрад ці яна дасюль стаіць там... Ну, паедзе ён зараз (Іван Аляксеевіч уявіў вагон-душагубку, і яму зноў млосна). Канечне, яе ўжо на паляне не будзе. І дзе шукаць? І ўсё-ткі — як яна туды патрапіла? Ці... памаглі ёй «патрапіць»? Жыве дзесь «на хаце», прастытуткай, падпольна або адкрыта, у чатырох сценах — адсюль аранжарэйнасць... Сабе і сутэнёрам на хлеб надзённы зарабляючы... (Іван Аляксеевіч любіў крымінальныя выпускі па тэлевізары і быў у курсе, што ўсё магчыма.) Правінілася, вывезлі ў лес, каб прыпалохаць, кінулі адну... Многа ёй трэба? А мо не кінулі? А стаяць недзе блізка... Ну, дапусцім! Дапусцім, здарыцца дзіва, ён знойдзе яе. Вось тут яны і аб'явяцца, выйдуць з дажджу і з туману, як трыццаць тры багатыры, будуць дужа разбірацца, якія ў яго намеры — атаварацць на ўсю катушку, адмяцеляць па поўнай, адмантуляць за мілую душу, замочаць, як таго

негра з песні, пакажуць, «куда идти в лесу»... І правільна зробяць — не лезь!

...Чарговая электрычка на Мінск ужо не была такой поўнай. Нават сесці ўдалося. Мокры Іван Аляксеевіч сеў, задумаўся. Нечага не хапала. Ён паляпаў рукой каля сябе, тупа паглядзеў уніз, на падлогу... Не было вядра з грыбамі — забыў на пероне.

*2007 г.*

## ВЕЦЕР

Знаёміцца ён так — падыходзіць да любога століка ў кавярні і піхае руку, жанчыне ці мужчыну, няважна:

— Вецер. Не псеўданім — сапраўднае прозвішча. Няўдачнік-рыфмаплёт. Непрызнаны геній. Графаман, якіх пашукаць.

І нявопытных, неабазнаных падкупляе тым, забываюцца людцы, што прыніжэнне горшае за гонар, і прымаюць яго ахвотна ў кампанію, запрашаюць прысесці, тым больш ён не халяўшчык, заўсёды са сваім графінчыкам і шклянкай соку.

П'е ён хоць патроху, але часта, забягаючы перыядычна ў кавярню, балазе, работа дазваляе — працуе ён побач, паркоўшчыкам, што, праўда, аніяк не звязана з рамантычным зялёным скверам, а ўсяго толькі з нецікавым і банальным збіраннем грошай з людзей за тое, што яны пакідаюць на стаянцы аўтамабілі. П'е — і не п'янее, адно чым бліжэй да вечара, тым часцей і гучней пачынае мармытаць, бялеючы і сціскаючы зубы:

...Не — я толькі ад лютага ветру,
Я ад ветру схаваўся ў карчму!

Яму гадоў трыццаць. Гэткі мача, прыгожы, высокі, статны, яму нават аляпавата-нязграбная паркоўшчыцкая спяцоўка пасуе; ён яшчэ трымаецца, але да пары да часу гэта, хутка — ужо на ім напісана, год-два, ну, пяць — і ад яго прыгажосці і кінагеройства следу не застанецца, яшчэ не такіх ламала, пераможвала і глытала жыццё, і не давілася, сволач, толькі шкуркі выплёўвала.

Амаль кожны вечар прыязджае яго забіраць жонка, дагледжаная такая дамачка, пародзістая, модненькая, абыходзіцца яна з ім лагодна, замірана, ніякага табе крыку, шуму, скандалаў і папрокаў, наадварот, так яна ўжо да яго падлашчваецца — як шкадлівая кошка, толькі што аб ногі не трэцца, нібы гэта не ён, а яна вінаватая, і хоча цяпер загладзіць гэтую віну, так паддобрываецца, што, гледзячы на

яе, не можаш пазбавіцца думкі, што яна яму здраджвае, а ён ведае, і настолькі звыкся з тым, што нават не вельмі перажывае.

— Я не п'яны, — папярэдзіў ён аднойчы, спыніўшыся са сваім графінчыкам і сокам каля майго століка. — Заслужаны дрынк!

— Я і не кажу, што вы п'яны.

— Гэтак, на вы? Тады прысяду? (А сам сядзіць ужо.) Вецер. Сапраўднае прозвішча. Паэт-няўдачнік. Графаман-аматар.

— Ну, калі чалавек так сам пра сябе — ён як мінімум ужо не графаман…

— Дзякую. Добра. Пытанне. Што такое паэзія, а што графаманства? Звычайнага якогась рабацягу-дзядзьку можна назваць паэтам, калі ён стараецца заўсёды гаварыць у рыфму? «Ой, пайду я к магазіну, убачу прадаўшчыцу Зіну, жыць на свеце мне не міла, я куплю сабе чарніла»? Гэта паэзія? Ці прафанацыя?

Я пацiскаю плячыма — адкуль я ведаю?

— Тады яшчэ пытанне. (А сам і не пытае, толькі канстатуе.) «Былі ў мяне мядзведзі» — Уладзімір Караткевіч, «Быў у мяне Магнат» — Мікола Гіль, «Была ў сабакі хата» — прымаўка… Дык вось — была ў мяне Аксана.

Мне спяшацца няма куды. За акном восень, вечар, дождж; куды такой парой на вуліцу, што на той вуліцы рабіць?.. У цёплай кавярні так прыемна, утульна... «У самовара я и моя Маша, а на дворе совсем уже темно, печальный дождь стучит в окошко наше…» — у тэму гучыць з тэлевізара перапеўка, цяпер гэта модна, браць старыя чужыя цудоўныя песні і казлінымі галасамі ўродаваць іх, але гэтая яшчэ па-божы, не раздражняе. І я, хоць звычайна цярпець не магу такія знаёмствы, а тым больш розныя «цікавыя» гісторыі», у якіх «усё так і было на самай справе», цяпер, у такі вечар, ахвотна пагаджаюся сядзець і слухаць — стрэкат дажджу аб шыбу, галасы за столікамі, песню пра Машу і гэтага самага Ветра.

— ...Цяпер то я разумею, — вяртае мяне слых да яго слоў, — каго кахаеш — той і харошы, хто па душы — той і прыгожы... Словам, прыехала Аксана на канікулы да дзеда з бабаю. Але дзед з бабаю — асобная гісторыя, сюжэт у сюжэце… Сачы за думкай, лаві файл.

Ён і праўда зусім не выглядае на п'янага, гаворыць складна, талкова, сказы будуе хоць і залішне па-літаратурнаму, але з мінімумам банальнасцей, «красівасцей».

— Усё, як трэба — лета, вёска, вакацыі, акацыі... Лаўка, пах скошанай атавы... і раса, і зоры, і шпоканне спелых яблыкаў у траву... Жнівень, а адчуванне чамусьці, што чэрвень. Я ў тым годзе скончыў школу, яна — студэнтка. Мне сямнаццаць, ёй дваццаць адзін. І я па-

чынаю карыстацца гэтым — розніцай ва ўзросце — напоўніцу. Яна ж нібыта вінаватая перада мной, што старэйшая. Плюс я адразу ўбачыў, што спадабаўся ёй. Хаця ў першы вечар, калі мы пазнаёміліся, яна была дзікая і дзіўная, напалоханая, яўна штосьці здарылася з ёю ў мінулым, якаясь цёмная, непрыемная гісторыя. Але ўжо ў другі вечар яна ажыла, пачала глядзець на мяне шырока раскрытымі вачыма, з падзякаю, з павагаю, з замілаваннем — так глядзяць на мага, гіпнатызёра, шаптуна, які пры дапамозе слоў-заклінанняў вяртае з небяспечных цянётаў да знаёмага, звыклага, любімага жыцця. Я не распытваў яе ні аб чым, проста бачыў, што ёй са мной добра, што яна адтаяла, акрыяла, і гэтага мне было дастаткова. Жадання дабівацца яе неяк ніколі не ўзнікала, бо я не ўспрымаў усур'ёз ні яе, ні сітуацыі. Яна была для мяне ўсяго толькі гульнёй, баўленнем часу... Цэлае жыццё — сапраўднае! — наперадзе, а гэта так, падрыхтоўка, прэлюдыя, размінка, назапашванне матэрыялу, набыццё вопыту… Аб чым бы яна ні загаварыла, я ўсё пераводзіў у жарт, у сцёб.

Патроху я ўжо і тады бухаў, бо якая б яна ні была падатлівая, як бы вольна з ёю ні пачувалася, усё ж гэта была дзяўчына — невядомы сусвет (тады здавалася), чужароднае цела, іншапланецянка, таму для вядомай смеласці, для падвешанасці языка пажадана было крыху паддаць. Так я і рабіў. З шасці нашых вечароў чатыры прыходзіў п'янаваты. Чытаў ёй:

> Часта бывае, што выбраць не ў стане:
> злева — гарэлка, справа — Аксана.
> Ды ў выпадку тым я нядоўга гадаю,
> стары анекдот я тады ўспамінаю:
> «Як толькі гарэлка зашкодзіць каханню —
> пашлі ты падалей... каханне сваё!»

— Па логіцы — гарэлку трэба паслаць, — тлумачыць Вецер, — а атрымоўваецца — дзяўчыну.

Яна была ў захапленні. Такой пяшчотаю ззялі яе вочы, так аддана яна на мяне глядзела, убірала ў сябе кожнае, нават дурное маё слова. «Божа, які ты таленавіты... Я адразу ўбачыла — ты не вясковы, не просты... Ты разумны, назіральны, начытаны... Я адчуваю, пэўна ведаю, што ў душы ты не кепскі, не жорсткі, а добры, мяккі і ранімы... Проста за гэтай бравадаю ты хаваешся... Нават цынізм твой сімпатычны, не хамскі, як у іншых...»

Што да цынізму, дык сапраўды, хапала яго ў мяне.

Яе дзеда з бабаю звалі Пятро Козыр і Ева. Славутая на ўвесь раён сям'я. У вайну Козыр быў на фронце, Еўка, як і належыць, чакала

яго, тут прыходзіць аднекуль аж з Алтая вестка, са шпіталя, што так і так, ваш муж Пятро Пятровіч Козыр цяжка паранены, сляпы, без рук, без ног... Яе нічога не спыніла, сабрала клуначак (як у «Баладзе пра салдата») і ваенным ліхалеццем паперлася — вясковая беларуская цёмная маладзіца — праз увесь Саюз у той Алтай, і дапала-такі шпіталя, дзе высветлілася, што гэта не яе Козыр, проста поўны цёзка, а яе Пятро ваяваў, патрапіў у палон, выжыў у канцлагеры — тым, што кінуў курыць і мяняў цыгарэты, якія ім выдавалі, на лішнюю лустачку хлеба, і так яму пашэнціла, што пасля вайны яго нават не пасадзілі — наадварот, прызначылі леснікам і дазволілі трымаць каня. Кожнае раніцы ў любую пару года Козыр яго запрагаў, Еўка стаяла побач і сачыла за кожным яго рухам — так любіла яго.

Я пацяшаўся і з той паездкі — маўляў, дурная твая Еўка, раз ужо дабралася да Алтая, дык хоць бы скарысталася гэтым, цёзка дарма што скалечаны, але ж да мужчынскіх абавязкаў прыдатны; сцябаўся і з запрагання каня, і з таго, што калі Пятро быў пад мухай, абавязкова, выпраўляючыся ў свой лясны абход, цалаваў на развітанне жонку. «Запрягает Козырь лошадь, — пятнаццаць разоў за вечар мог паўтараць я, — Ева вожжи подаёт, Козырь Еву поцелует, Ева козырем пойдёт», — іншая плюнула б, Аксана ж, добрая, мілая душа, была ў захапленні і ад гэтай дурной цыганшчыны, толькі мякка ўшчувала:

«Божа, як табе не сорамна, які ў цябе ў галаве вецер!» — і глядзела на мяне закаханымі вачыма.

Вецер выпівае свае грамаў сорак — класічны дрынк, глыток соку і працягвае:

— Калі мы развіталіся, яна была такая сур'ёзная, маўклівая, толькі ў канцы сказала: «Ведаю, ты не кахаеш мяне... Але калі не дай Бог нешта здарыцца з табою — не тое што да Алтая, да краю свету дайду, і знайду цябе, і не кіну любога!» У мяне сэрца зайшлося — дзе, калі я знайду такое дзіва, такую дзяўчыну, ды і нашто шукаць, калі вось яна, побач?.. А ўголас сказаў, хіхікнуўшы: «Пешкі прыйдзеш? Босая?»

Зноў дрынк, сок... Вецер пачынае часціць. Я пасля паўзы задаю недарэчнае, абыякавае пытанне:

— Прыйшла?

— Мгу... Як тыя хлопец з дзеўкаю выходзяць з аўтобуса, хлопец культурна падае руку, памагае ёй выйсці, яна — ціхмяна, любоўна: «Ты же смотри, не убегай». — «Да... От тебя убежишь!» Так і ад маёй Аксаны.

— Што?! Вы... хочаце сказаць...

— Ну так. Гэта мая жонка. Якая, як толькі выйшла з ЗАГСа, з міленькай ціхоні ператварылася ў такую дрэнь, якіх пашукаць, якая толькі і ўмее, што з ложка ў ложак скакаць... З кім толькі не здраджвала мне! І развесціся — неяк лянота, ды і не бачу прычын, усё адно наступная будзе такая ж, усе яны аднолькавыя для мяне цяпер. Такія планы, талент, жыццё — усё загубіла! Ды каб не яна, я паэтам мог бы стаць! Што паэтам — чалавекам! У каго яна мяне ператварыла? Дзе падзеўся мой гумар, мой бяскрыўдны цынізм, памяць, цікавасць да жыцця, да людзей, да літаратуры?!

— Ну, чаму, — няўпэўнена кажу я; а што яшчэ казаць у такіх выпадках. — Усё гэта засталося... ёсць і цяпер...

Але ён ужо не слухае. Бялеючы, гледзячы паўз мяне — туды, у свае лета, дзе сярод акацый згубілася яго Аксана, ён ледзь не крычыць:

— Ну чаму мне не было якога знака? Я ж быў малады зусім! Дурны зусім! Дык навучыце! Такім трэба сігналы падаваць, уключаць святло ў мазгах: чырвонае — небяспека, жоўтае — асцярожна, зялёнае — вось тады можна... Я ж не вінаваты! Я думаў, гэта яна святая, наіўная, чыстая, а то я быў у той перыяд наіўны, чысты і... дурны!

Бачыць жонку, яе парасон праплывае за акном. Аксана ідзе забіраць мужа. Ён падымаецца хістаючыся:

— І натрапіш на гэткую нетру, — мармыча, ці то жонку маючы на ўвазе, ці то сваё незразумелае, пустое існаванне, — бы ў прыдонную чорную цьму... Не — я толькі ад лютага ветру, я ад ветру схаваўся ў карчму!

*2009 г.*

## УНОЧЫ

### I

Раз ці два ў год гэта здаралася з Берасевічам.

Ён пачынаў востра, без аніякай, здавалася б, прычыны баяцца і ненавідзець людзей. Не ўсё чалавецтва, а менавіта бліжняга свайго, які абганяў яго на аўтамабілі, ехаў побач у метро, выступаў па тэлевізары, ішоў па тратуары.

Палохалі, і ад гэтага ледзь не да якогась агрэсіўнага памутнення розуму даводзілі абрыўкі чужых размоў на вуліцы, стук лыжак і відэльцаў і чаўканне чужых ратоў у кавярні, чэргі ля касаў у магазінах, чужыя твары, чужая вопратка.

Ён пераставаў разумець, чаму яны апранаюцца, куды едуць, куды баяцца паспець, перабягаючы вуліцы, даганяючы транспарт?

Калі жонка прасіла з'ездзіць з ёю на базар, ён не вылазіў з машыны, чакаў, пакуль яна перыядычна падносіла і складвала ў багажнік ці на задняе сядзенне пакункі з прадуктамі; праз шкло ён бачыў доўгія рады, мітусню людзей, аднолькава выродлівых — як пакупнікоў, так і гандляроў, і ўсярэдзіне ў яго ўсё бушавала, і так хацелася набыць пісталет, каб трымаць яго (як дулю) у кішэні; прымяніць яго маладушны, труслівы па натуры Берасевіч, канечне, ніколі не адважыўся б, але мо хоць дакрананне да зброі, сціскание яе ў руцэ дало б супакой.

Цікава, што сам ён добра разумеў, чаму вечарам кладзецца ў ложак, а раніцаю ўстае, чаму голіцца, снедае, апранае касцюм і гальштук, чаму спяшаецца на працу, чаму яму трэба хутчэй перабегчы вуліцу і дзеля чаго закупацца прадуктамі на базары і ў магазіне. Але іншым ён адмаўляў у праве на гэта. Яму, які некалі выбіўся з гразі ў князі, які паклаў столькі сіл і здароўя на свой цяперашні адносны дабрабыт, яму, які пачынаў з таго, што скупляў у мянял каля ўнівермага па пяць-дзесяць даляраў і хаваў іх ледзь не ў панчоху, калі ён азіраўся на сваё жыццё і параўноўваў, кім быў і кім стаў, — яму здавалася, што ён заслужыў свой спакойны, сыта-мяшчанскі маленькі сусвецік, а яны — не. Дык як яны могуць прэтэндаваць на тое, што і ён?

З кожным днём спружына ўсярэдзіне ўсё накручвалася, накручвалася... Трэба было штосьці тэрмінова рабіць.

Але не магло памагчы яму — ведаў з вопыту — ні вароччанне жалеззя ў фітнэс-клубе, ні віктэйлі ў кегель-бары, ні дзеўкі ў саўнах, ні більярдна-снукерныя залы, не паможа загадзя арганізаванае платнае паляванне, дзе ўколаты снатворным, асалавелы кабан не тое што бегчы, стаяць не можа, такая ж рыбалка, дзе растлусцелых, смярдзючых камбікормам карпаў ледзь на падвешваюць табе ў вадзе на кручок... І справа не ў тым, што ўсё гэта каштуе грошай — знойдуцца грошы, здароўе даражэй, не — там увесь час кампанія, а Берасевічу самому ад сябе не было дзе схавацца, не тое што ад такіх, як сам; ясна, што гэта будзе за «пераключэнне»-лячэнне, калі ў галаве адна думка — пра пісталет.

І вось нарэшце, калі цярпець станавілася больш немагчыма, выматаны страхам, нянавісцю, бяссонніцай, схуднелы, з запалымі вачыма Берасевіч ні дома, ні на працы нікому нічога не тлумачачы, сядаў у машыну (ніякіх мабільнікаў — толькі грошы!), выбіраўся за горад і гнаў па трасе з максімальна дазволенай хуткасцю ў любым на-

прамку. Кіламетраў праз 200–300 зварочваў каля любога ўказальніка з якім-небудзь «Заполлем» ці «Залессем» і ехаў да вёскі.

Вось толькі яна яго і ратавала. Толькі тут ён мог псіхалагічна разгрузіцца. Пажыць некалькі дзён сярод простага люду, пабыць у скуры звычайнага чалавека, параўнаць яго жыццё са сваім — тады сваё больш пачнеш цаніць. З'явіцца зноў энергія, і вернецца ён, як неаднойчы бывала — актыўны, энергічны, свежы, як агурок, і адпрацуе ўдзесяцера за тыя некалькі няшчасных, але такіх для яго неабходных, прапушчаных дзён.

## II

Так ён апынуўся ў вёсцы са смешнавата-глухаватай назвай Цяцеркі, каля крамы пагаварыў з мясцовымі і неўзабаве знайшоў таго, хто яму трэба быў — Лёню, бабыля гадоў трыццаці, у кожнай вёсцы, у любым месцы такія знаходзяцца: невядома, што яны робяць, дзе працуюць, з чаго жывуць, за што п'юць, слабыя, добрыя, бязвольныя, за бутэльку гатовыя звадзіць хоць на той свет і назад прывесці.

Без лішніх тлумачэнняў Берасевіч выклаў сваю праграму. Што яму трэба? Пацерціся сярод «простага народа». Падыхаць вольным паветрам. Выматацца фізічна. Выпіць. Бо ад гарадскога жыцця ён крыху стаміўся і трошкі як бы атупеў.

Лёня слухаў з разуменнем, ківаў галавою і на ўсё адказваў:

— Не праблема!

— Было б пажадана, — працягваў Берасевіч, — калі атрымаецца, пад занавес, на закуску — якую-небудзь больш-менш прыстойную, не надта брыдкую...

— За асобную плату, — дадаў ён, ведаючы, як спрацоўвае гэта.

Аднак якраз тут Лёня задумаўся.

— За плату? — перапытаў ён і аблізнуў вусны. — Калі за плату — не праблема... Ёсць адна. Сірата, з бацькам жыве. Вось толькі...

— Што?

— Малаватая... Маладая зусім.

Гэта Берасевіча толькі рассмяшыла.

— Ложак усіх раўняе. Ногі ёсць у яе?

— Гэта ёсць, — без энтузіязму пацвердзіў Лёня, не ацаніўшы ці не зразумеўшы жарту. Па тым, як адводзіць ён вочы, відаць было, што нечага ён усё ж не дагаворвае. Але Берасевіч не стаў распытваць — не да таго.

Пачалі дамаўляцца аб цане. Лёня прасіў сто даляраў, Берасевіч даваў дзесяць. Сышліся на пятнаццаці.

— Не праблема. З'арганізуем!

Павесялелы гід абыякава, быццам увесь час з імі мае справу, скамечыў грошы, запіхнуў у кішэню і пайшоў выкочваць з-пад паветкі веласіпед. А Берасевіч падумаў, дзе яшчэ, на якіх Канарах і ў якіх Мінсках магчыма было б за капейкі знайсці сабе такі экстрым, наладзіць такі экатурызм, які павінен памагчы яму паправіць здароўе, вярнуць душэўны супакой і фізічную бадзёрасць?

Хаця і даляраў было шкада, канечне.

## III

На возера дабіраліся ў прыцемках — ішлі нейкімі гарэлымі тарфянікамі, хмызняком, балотам, і калі Берасевіч адставаў, Лёня азіраўся і чакаў яго са словамі: «Паспеем, не праблема!..»

Возера ўсё абрасло высокімі, як бамбук, чаратамі (рай для камароў і браканьераў). Над вадой, над берагамі слаўся белы туман. Пара была майская, час цвіцення чаромхі, салаўі цёхкалі звонка і рэзка, зябкі холад добра браў за плечы, але пра вогнішча і думаць не было чаго — возера рыбхознае, ганялі на ім і ўдзень, і ўночы, з берага і з вады.

Пакуль Берасевіч падшукваў сабе лацвейшае месца, Лёня наладжваў «павук», даволі складаную сістэму: убітая ў чвашсты бераг тоўстая патырчака, на канец якой, у разгаліну, кладзецца доўгая жэрдка, да яе падвязваецца на вяроўцы распятая на жалезных прутах сетка метры два на тры. Зусім гэта няпроста, браканьерыць такім спосабам, тут трэба фізічная сіла — раз за разам навальвацца ўсім целам на гэтую жэрдку, каб яна, як рычаг, паволі выдзірала з вады ўсю канструкцыю...

Пакрысе яшчэ больш цямнела. Рыбы не было. Лёня нерухома, як высокі чорны пень, стаяў каля свайго «павука». Берасевіч сядзеў за некалькі метраў ад берага, на сушэйшым месцы на абярэмцы чароту, і біў на сабе камароў. Яны віліся над галавою, лезлі ў рот, шыліся ў рукавы, пад шапку, звінелі ў валасах... Зрэдку пасярэдзіне возера праязджала маторка, тады Лёня сам прысядаў і рабіў знак Берасевічу, каб і той хаваўся.

Берасевіч чыркнуў запальнічкай, зірнуў на гадзіннік. Нічога сабе — здаецца, толькі прыйшлі, а ўжо адзінаццаць. Ён падняўся — і камарыная хмара над ім паднялася, паразгінаў зацеклыя ногі

ў рыбацкіх ботах з адкасанымі халявамі. Патроху, рассоўваючы ў бакі шапоткія чараціны, пайшоў берагам. Пад нагамі чвякала. Куды ні глянь — туман і чарот, і на чарацінах каля мятлушак лепяцца гронкамі камары... На адной чараціне зусім блізка сядзеў і драмаў, гойдаючыся, маленькі вальдшнеп са сваёй дзюбай-дудачкай.

Недзе гаварылі людзі, пахла цыгарэтным дымам. Берасевіч паглядзеў на далёкія, расплывістыя ў тумане агні за возерам, потым вярнуўся назад — і ўбачыў тое самае: каля вады сярод чаратоў у белым тумане цямнее постаць, а над ёй німбам вісяць-віюцца камары...

Берасевіч прыслухаўся да сябе. Пот і сверб ад камарыных укусаў, холад, фізічная нечыстата цела, жаданне паесці і выпіць спіртнога ўзрадавалі яго — гэта былі нармальныя чалавечыя пачуцці. На міг ён быў падумаў, што ўсё, насыціўся, адпускае яго, малой крывёй на гэты раз абышлося, і, можа, дасць Бог, гэта яго першая і апошняя ноч тут, і вось ужо прайшла амаль палова яе. Але не паспеў ён так падумаць, як зноў накаціла, нібы каменная магільная пліта легла на грудзі, і захацелася разарваць адзенне, кашулю, і самі грудзі разрэзаць, рассекчы якім нажом, каб выйшаў з сярэдзіны гэты страшны, нячысты дух, што пасяліўся ў ім і не даваў жыць.

## IV

— Ну, досыць! — загадаў Берасевіч.

Лёня адразу ж замітусіўся, пачаў разбіраць і хаваць па частках у чароце «павука».

Патэпалі назад. Зноў лес і халодны туман, раса на траве і на лісцях, камары і салаўі, і знаёмае чвяканне пад нагамі.

— Хто ў Ленінгра-ад прабіраўся бало-отамі, — нягучна заспяваў Лёня, пасвістаў крыху і змоўк.

Скончылася роснае кустоўе, пасвятлела, паказаўся высокі, парослы травою насып, і запахла шпаламі — гэта была чыгунка. Берасевіч з Лёнем падняліся наверх, паабціралі аб рэйкі гразь з ботаў і падкасалі халявы.

— Далёка яшчэ?

— Ву-унь, да стрэлак, дзе семафор. Бачыце?

Берасевіч паглядзеў і нават сваімі добрымі шафёрскімі вачамі нічога не ўбачыў. Пайшлі збоку паўз пуць, дзе паміж шпаламі было больш камення і лягчэй ступалася. Дыхнуў аднекуль ветрык, адагнаў праклятых камароў, пасвяжыў твар. Берасевіч зняў шапку

і ўзбіў далоняй мокрыя валасы. Зноў яму крыху стала лягчэй, зноў паверылася, што ўсё хутка скончыцца, адпусціць гэтая дрэнь і настане час, калі мазахісцкая камарыная ноч успомніцца не як кашмар, а як штосьці лёгкае, нават рамантычнае, успомніцца не гразь пад нагамі і не бруд на душы, а салаўіны спеў, шолах чаратоў, гэты ветрык, што так прыемна пахне мазутам і далёкай дарогай, і Лёнева спіна ўперадзе...

Цяпер Берасневіч разглядзеў зялёную ў тумане пляму семафора. Яны дайшлі да яго і спыніліся перакурыць. Адсюль пачыналася двухпутка, быў раз'езд, папярочную дарогу з двух бакоў перакрывалі шлагбаумы. Унізе ля самых пуцей, аддзеленая ад чыгункі невысокім бетонным плоцікам, утульна, заманліва свяціла маленькім акном хатка. Мала дзе засталіся цяпер на пераездах такія мініяцюрныя будачкі, звычайна дагледжаныя, пабеленыя, з садзікам пад вокнамі; тым больш, калі яны яшчэ трапляюцца, ёсць у сузіранні іх штось мілае, даўняе, рамантычна-самотнае, звязанае з марамі, з дзяцінствам, калі хацелася, як вырасцеш, стаць бакеншчыкам, леснікам, стрэлачнікам ці станцыйным наглядчыкам.

Але Берасевічу не да рамантыкі было. Ён курыў, часта зацягваючыся, і пляваў пад ногі.

— Чакаюць, — паказаў Лёня акуркам на акно. — Я ж казаў, не праблема, — і пакашляў збянтэжана, усё нешта мыліўся. — Гэта... пра дзеўку я. Як вам сказаць. Ну, не зусім яна...

— Што ты нясеш?! Не зусім дзеўка?

— Не гаворыць яна. Не ўмее. І не чуе, — Лёня дакрануўся далонямі да вушэй, нібы гэта не дзеўка, а Берасевіч быў глуханямы, і яму трэба было тлумачыць на мігах. — Не — а так, усё астатняе ў яе — не праблема!

— Ну і чорт з ёю, — Берасевіч старанна растаптаў, як чарвяка, акурак. — Вядзі!

Гучна ляпнулі веснічкамі. Пастукалі ў шыбу. Адразу ж засвяцілася яшчэ адно акно, такое ж малюпасенькае. На ганак выйшаў босы дзядзька ў белым, з доўгімі сівымі валасамі, падобны на прывід, ці на смерць мужчынскага роду, толькі без касы.

— А-а, вось і госцейкі дарагія, няжданыя-няпрошаныя, нязваныя-няклiканыя!..

І адступіў са святла ў ноч, прапускаючы іх.

## V

Яны зайшлі. Моцна запахла прэллю, брагай і вагонным тамбурам.

Прадаўгаваты калідорчык і падобны быў на тамбур, вузкі, ледзь прайсці, ды яшчэ ляпіліся паўз сцяну нейкія скрынкі, бочкі, дзежкі, заваленыя зверху лахманамі. Асобна ў кутку, як ганаровы самавар у рускіх, стаяў старадаўні стрэлачнікавы ліхтар з ручкаю, і на падлозе, рассыпаныя, ляжалі брудныя, у мазуце, трубкі чыгуначных флажкоў. У канцы калідора ў паласе святла паказалася дзяўчына, міг усяго пастаяла, зырачыся са святла на незнаёмцаў, і адразу ж знікла ў баковачцы. Але і гэтага хапіла — Берасевіч паспеў заўважыць, якая яна рослая, якая русая каса ў яе цераз плячо, як шчыльна абляга-юць спартыўныя штаны яе ногі і як адтатурчваюцца грудкі на кашулі з закасанымі рукавамі. Ухапіў ён усё гэта вокам і радасна і нядобра ўздрыгнуў: нічога сабе «малая». Хоць тут пашэнціла. Звычайна ў яго ну хто былі? — даяркі-цялятніцы, праўда, адна школьніца-гулёна, але часцей зусім нікога: каму тут узяцца ў цяперашніх вёсках, дзе на дзясяткі кіламетраў вакол адны бабулі, бярозы ды сосны.

У пакойчыку Лёня з Берасневічам знялі мокрыя ад расы і туману цяжкія ватоўкі. У рваным старым адзенні (якое ў Лёні ў запечку знайшлося), брудных ботах, няголеныя, змораныя, яны цяпер зусім сталі падобнымі на класічных браканьераў ці на кулакоў са старых фільмаў, толькі абрэзаў не хапала. Што да гаспадара, дык той у сваім споднім нагадваў знянацку засталага, раптоўна ўспоратага з ложка сельсаветчыка, па душу якога кулакі і заявіліся.

Тут, на святле, праступіў прыблізны ўзрост кожнага. Лёня, спіты і скураны, выглядаў на пяцьдзясят, Берасевіч на сорак, а гаспадар — на ўсе восемдзесят з гакам. Хаця, маючы такую дачку, наўрад ці быў ён намнога старэйшы за Берасевіча.

Берасевіч падышоў да маленькага люстэрка, умураванага ў сцяну. На яго глянуў аброслы, з чорнымі пісягамі ад расчаўленых камароў твар з дзікімі, трывожнымі вачыма. Раптам ён убачыў, што гаспадар стаіць ззаду, таксама пазірае ў люстэрка і нават як бы падміргвае яму, Берасевічу, нібы ведае пра яго непрыстойны сакрэт і вось-вось збіраецца агучыць яго.

— Што табе?! — Берасевіч хутка і чамусьці спалохана адвярнуўся ад люстэрка.

Сціплы стол ужо чакаў іх. Пачак солі, бохан хлеба і буталь самагону. Лёня з Берасевічам прыселі, «дзядзька Іван» — так Лёня паважна назваў гэтую старую сволач (а хто ж ён яшчэ, калі ганд-

люе ўласнай дачкой?) — абмыў у вядры маладую цыбулю, культурна паклаў перад кожным па корчыку — з белымі нітачкамі каранёў. Берасевічу дасталася чарка, якую дзядзька Іван выцер крысом сподняй сарочкі, Лёню — шклянка, а гаспадару — кубак з адколатай ручкай.

Дзядзька Іван узяў буталь, узважыў у руцэ:

— Вось я неяк...

— Дай сюды! — Берасевіч забраў буталь, наліў аднаму сабе, выпіў, тыцнуў у соль цыбулю і зачвякаў.

Лёню стала няёмка, а дзядзьку Івану хоць бы што. Ён падняў кубак (Лёня паспеў напоўніць) і, хітра пасміхаючыся, пачаў гаварыць тост:

— Хоць і сказаў Гарбачоў — нікакіх магарычоў...

— Ты на якім свеце?! — уперыўся ў яго, ажно жаваць перастаў Берасевіч. — Гарбачова няма ўжо гадоў трыццаць!

Лёня вырашыў умяшацца: маўляў, ціха, зараз я ўсім дагаджу.

— Вып'ем за тых, хто камандаваў ротамі... хто ў Ленінград прабіраўся балотамі...

Берасевіч са злобаю глядзеў на іх, слухаў і думаў — гэта ж жывыя Навінкі. Гарбачоў, Ленінград... А — зрэшты, хіба не гэтага ён шукаў, не такога хацеў? Апрашчайся, апускайся, ачышчайся — вось ён, народ, жыві ў ім. Аднак калі ён убачыў, як Лёня п'е — прагна, коўцькоўць, самагонка цячэ з куткоў рота, капае на грудзі, — Берасевіч не змог не пазайздросціць і яму, і гэтаму дзядзьку Івану чорнай зайздрасцю, іхнім простым, як сем капеек, паводзінам, прамому, як лінейка, мысленню, іхняму прымітыўна-амёбнаму ўспрыманню жыцця. Іх не будзе трэсці ад нерваў (хіба што з пахмялюгі), гэтыя не ведаюць пакутаў душы, у іх надзейныя лекі: выпіў — і «няма праблем».

Берасевіч перавёў вочы ўніз. З-пад стала вытыркаліся босыя ногі дзядзькі Івана, з парэпанымі ступакамі, бруднымі пятамі, крывыя пальцы з тоўстымі выпуклымі пазногцямі залазілі адзін на аднаго. Белыя кальсоны-споднікі з адарванымі матузкамі тут, на святле, аказаліся бруднымі, заношанымі, у жоўтых леапардавых плямах. Лёня перахапіў погляд Берасевіча.

— Адзецца не паспелі, дзядзька Іван? — спагадліва спытаў ён.

— Не, я так заўсёды ў іх хаджу. У кальсонах. Слабадней целу, — ахвотна адгукнуўся дзядзька Іван.

## VI

Дзядзьку Івана ўвогуле не бянтэжылі ні свае споднікі, ні прысутнасць гасцей. Пачуваўся ён менавіта як гаспадар — спакойна, упэўнена, з выглядам чалавека, у якога ўсё ў жыцці задалося і няма аб чым больш марыць. Не ён жа прыйшоў — да яго прыйшлі, значыць, маюць у ім патрэбу.

— ...Тады Пятро чапляецца — пі, — расказваў ён манатонна, да ванітаў нудна. — Я кажу, не буду. Пі. Не буду. Ён зноў падступаецца — пі. Я ні ў какую...

Зацята маўчаў Берасевіч, глядзеў у стол перад сабой. Маўчаў, прыплюснуўшы вочы, натомлены, аглушаны алкаголем на старыя дрожжы Лёня.

— ...Рыбакі лавілі рыбу, а спаймалі рака, — між тым перайшоў да новай тэмы дзядзька Іван. — І што ў той рыбе, было б там што есці, а то галава ды косці...

— Не хоча, — спахапіўся на слова рыба, пацёр вочы і крыху не ў лад адказаў Лёня. — Рыбка плавае па дне... Няма ні халеры.

— Ёсць. Лавіць трэба ўмець. Гэта ў вас у горадзе нічога няма. Толькі бегаюць узад-уперад. Таўкуцца, душацца...

— А вы даўно былі ў горадзе, дзядзька Іван?

— Даўно, і быць не хачу. Пятро расказваў. Прыедзь у Жыткавічы — не павярнуцца. Картоплі купляюць, — зарагатаў дзядзька Іван. — Як гэта, каб чалавек картоплі купляў?

Так завязалася і пайшла яшчэ адна бязглуздая тэма: гаспадар пачаў лаяць горад — адтуль, на яго думку, ішла распуста, гультайства і «амерыканскія грошы», Лёня вяла гэты горад абараняў:

— Чаму вы так кажаце... З розумам і ў горадзе можна жыць...

Калі субяседнікі замаўкалі, у цішы чуваць быў звон камароў. Берасевіч сядзеў насуплены, як сыч. Чым больш ён слухаў гэта, тым больш накатвала на яго, ціснула, распірала нутро. Рукі сціскаліся ў кулакі і хацелася неяк аслабаніцца фізічным дзеяннем, затупаць нагамі, закрычаць, каб гэтыя выродкі заткнуліся, ці проста моўчкі падняцца і надаваць аднаму і другому па мардасах. Але замест гэтага ён перыядычна наліваў сам сабе і піў не закусваючы.

Лёня з дзядзькам Іванам самі ўжо разумелі, што зацягваюць да бязбожнасці. Нарэшце Лёня памаленьку пачаў накіроўваць размову на галоўнае.

— Як Ларыска ваша?

— Ай! Ларыска... Чытаць-пісаць навучылі ў інтэрнаце, гаварыць пальцамі, а тады ўцякла, прыбегла сюды. Без жывата яшчэ. Але не

надоўга. Такая сучка, што хай Бог крые і бароніць. Добра, што маці-нябожчыца не чуе, не бачыць — лёгка ёй на тым свеце ікнецца, — дзядзька Іван набожна перакрысціўся на пусты кут.

— Можа, сюды пазавеце? Час тавар глядзець...

— Ай! Што на яе глядзець. Маўчыць ды маўчыць. Гэта маці-нябожчыца, у той рот не закрываўся. І ў сне гаварыла, і сама з сабой, і памерла гаворачы. Хусткаю сківіцу падвязвалі, як хавалі. Зямелька ёй хай будзе пухам...

Дзядзька Іван перакрысціўся ўжо на Берасевіча, якому і адрасаваны былі словы. Затым так і складзенымі ў шчопаць пальцамі пачухаў падэшву, паднёс пальцы да носу, панюхаў...

Берасевіча перасмыкнула.

— Замаўчыце, п'яныя скаты!!! — ён грукнуў кулаком аб стол і ўсхапіўся. Адкінуў нагою табурэтку, падышоў да цёмнага акна і, упёршыся далонямі ў брудны, шашалем сточаны падаконнік, пачаў глядзець у ноч.

Яго трэсла ўсяго.

## VII

Спалоханыя Лёня з дзядзькам Іванам маўчалі. Берасевіч ведаў, што яны баяцца нават сагнутай, нямой спіны яго. Ён пастаяў яшчэ крыху і, не зірнуўшы ні на кога, нікому нічога не кажучы, быццам і не было тут нікога, цяжка шлэпаючы рыбацкімі ботамі па падлозе, пайшоў у калідор, шукаць дзяўчыну ў спартыўных штанах і з русай касою.

Ён зайшоў у абсалютна цёмны пакой, шчыльна прычыніў за сабой дзверы, чыркнуў запальнічкай, шукаючы ўключальнік. Прамільганула ў галаве: сціплая, напалоханая, забітая ў куточак, з нацягнутай коўдрай да падбародка... Але ў гэты момант чужыя дзявочыя рукі яшчэ ў цемры абхапілі яго за шыю. Яна ажно павісла на ім. І ён зразумеў — якая тут коўдра да падбародка! — за сваё кароткае жыццё яна проста не ведае іншых адносін з мужчынамі, акрамя такіх, а можа і не хоча ведаць.

Лапаючы свабоднай рукой па сцяне, ён уключыў святло. Голая лямпачка спускалася на дроце са столі. Разасланая канапа. Стол, на якім аловак, блакноцік і паўбохана хлеба... Ён няўцямна глядзеў асабліва на гэты блакноцік. Затым моцна, аберуч сціснуў яе за плечы, падцягнуў да сябе, блізка ўзіраючыся ёй у вочы. Як ва ўсіх, у каго фізічны недахоп аднаго органа кампенсуецца развіццём другога,

вочы замянялі ёй і слых, і голас, і былі занадта выразныя, сур'ёзныя, і старылі яе.

Берасевіч адвярнуўся.

— Я... не той, не такі... Калі не хочаш — не трэба... Я ўсё роўна заплачу, дам грошы, многа!..

Яна толькі пасміхалася. Яна не разумела, што ёй кажуць. Яго дабрыня ні прама, ні ўскосна не магла быць ацэнена ў гэтым глуханямым, мёртвым царстве. І тады ён вылаяўся брудна, адчайна, бо ўсё было супраць яго, — наваліўся на яе, сапучы, раз'юшана распранаючы, выдзіраючы «з мясам» гузікі на кашулі... І ўзяў яе моўчкі, без прэлюдыяў, па-жывёльнаму. А калі ўсё скончылася, адарваўся ад яе, сеў за стол, адламаў кавалак хлеба ад бохана і пачаў есці. Варушыліся скіівіцы, падалі з рота крошкі. Працягваючы жаваць, ён падцягнуў да сябе нататнік, аловак і дрыготкай рукой, ламаючы графіт, накрэмзаў вялікімі друкаванымі літарамі: «Пішы заяву ў міліцыю!»

Накрэмзаў, перачытаў. Але нататнік ёй падаваць не спяшаўся. Хіба так, у зашмальцаваным блакноціку заявы пішуцца? Хто такую разглядаць будзе, хто ўсур'ёз прыме? Хто паверыць? Зрэшты, знойдзецца нармальная папера... І тады раптам возьмуць... ды і павераць. І ўсе твае, Берасевіч, клопаты звядуцца да адбой-пад'ёму, да таго, плюхнуць у алюмініевую міску большую порцыю баланды ці меншую...

І ён зноў адчуў, як падымаецца ў ім, накрывае яго з галавой знаёмая, яшчэ большая хваля страху, бяссілля і злобы, і няма ад яе ратунку, не памагае ні гарэлка, ні гэтае дзяўчо, якую ён таксама пачынае ненавідзець, і не паможа міліцыя — хіба што сатана на тым свеце! Ён ляпнуў аб падлогу блакнот, рынуўся да яе — хруснуў пад ботам аловак, падмяў пад сябе і з яшчэ большым азвярэннем, з юрам адурэлага самца зрабіў тое ў другі раз, і ў трэці. І толькі тады пустата, млосць, знямога, як у наркамана пасля ўколу ці ў п'яніцы пасля пахмельнай шклянкі, ахапілі яго, закружылі, і ён заснуў хутка і мёртва — так, што нават не чуў, як яна выграбалася з-пад яго бязвольнага, друзлага цела.

## VIII

Раніцай Лёня, пазяхаючы, матляючы галавою, распраўляючы зацеклыя косці, — спаў ён адзеты, дзе і сядзеў, на табурэтцы, галавою на стале, — убачыў Берасевіча, які ўвайшоў у кухню... І не пазнаў яго.

За ноч Берасевіч ператварыўся ў іншага чалавека. З вачэй сышла трывога, на твары гуляла ўсмешка абсалютна здаровага, дужага, упэўненага ў сабе мужчыны. Шчаціна на шчоках не старыла, а наадварот, свяжыла яго. На такіх звычайна прыемна глядзець, і хочацца парадавацца чужой радасці, сказаць добрае слова ці хоць бы ўсміхнуцца ў адказ на ўсмешку.

Аднак нічога гэтага Лёня не зрабіў.

— Ну што, вып'ем за тых, хто камандаваў ротамі? — адводзячы вочы, вяла прапанаваў ён.

— Не, дзякую! За руль жа мне.

— А, тады не праблема...

У вёску Лёня ісці адмовіўся. «Галава трашчыць... Самі дойдзеце. За семафорам — гравійная дарога, гэта ж не ўночы, днём — не праблема...»

Берасевічу і не трэба былі праважатыя. Сапраўды, цяпер ён дойдзе, куды трэба. Да таго ж ён разумеў, што Лёня не столькі хоча застацца, колькі не хоча больш бачыць Берасевіча, не хоча ісці з ім побач, і што цяпер, пасля гэтай ночы, яго гняце роля зводніка... Прыгнечаным, непахмеленым і няшчасным ён выглядаў.

Берасевіч нават адчуў некаторую віну перад ім. Але нічога не зробіш. Не ім такое жыццё прыдумана.

Калі расплачваўся, Берасевіч першы раз у жыцці саступіў свайму заўсёднаму правілу: даваць роўна палову ад абяцанага. Разлічыўся з усімі напоўніцу, нікога не пакрыўдзіў, кожнаму, як і абяцаў, па пятнаццаць даляраў. Лёню, такім чынам, дасталося ажно трыццаць.

— За гасціннасць!

Дзядзька Іван, разгублены ад шчасця (яму здавалася, што даў ён мала, а атрымаў многа), то пазіраў на тры зеленкаватыя пяцёркі ў сваёй руцэ, то пераводзіў вочы на такія ж самыя, што трымала дачка. Ён не разумеў, за што ёй заплацілі, чым яна заслужыла? Ён забыў ужо, як лаяў учора «амерыканскія грошы», і ўсё паўтараў-перапытваў:

— Вось выдумалі — ёй даваць... Нашто яны ёй?

Потым дайшло да яго, а раптам гэта аванс.

— Можа, яшчэ чаго? Вы хоць не пакрыўдзіліся? Ці ўсё добра? Самагонкі з сабой вазьміце!

— Нічога не трэба.

— Тады яшчэ наведайце калі!.. Прыязджайце!..

— Прыедзе, не праблема, — сказаў Лёня.

Берасевіч не сказаў нічога. Думкамі ён быў ужо далёка. Трэба было яшчэ заехаць па дарозе да цесця ў дом састарэлых (не, не любіў

гэтай назвы Берасевіч — лепш — у «хоспіс»), купіць дачцэ смартфон — зімой яшчэ абяцаў, ды і жонка даўно нікуды не выбіралася, варта заказаць пуцёўку, у сэнсе дзве: жонцы і дачцэ — у той жа Егіпет ці ў Турцыю, а мо раскашэліцца і на Італію... Цяпер ён усё можа. Яго цягнула на добрыя справы. Хутчэй бы да машыны, такой мілай, камфортнай, любімай больш за... Дома найперш вымыцца, пагаліцца, пазногці апратаць, адзецца ў чыстае, гальштук...

Берасевіч дайшоў да семафора, убачыў свой учарашні сярод шчэбеня акурак. Перад тым як спусціцца з чыгуначнага палатна на гравійку, азірнуўся. Дзядзькі Івана ўжо не было, пайшоў у хатку. Лёня курыў адвярнуўшыся. Лора стаяла ля ганка. На рух Берасевіча яна ўзрадавалася, заўсміхалася, пацалавала кулачок з заціснутымі ў ім грашыма і памахала яму — так дзякавала і развітвалася.

І Берасевіч таксама памахаў ёй у адказ:

— Да пабачэння!

Адступала ноч, пачыналася раніца, не сціхаў салаўіны пошчак, ад зямлі ішлі цёплыя хвалі, пахла чаромхай, росным гравіем, і неба на ўсходзе з фіялетавага ператваралася ў радасна-ружовае.

*1993, 2009 гг.*

## МЫЛА

Той верасень быў надта халодны, дажджлівы і... хацеў напісаць «нудны», але на няпраўдзе спынілася рука.

Які нудны, калі табе дваццаць адзін год, ты паступіў у вышэйшую навучальную ўстанову любімага горада-героя Мінска, і вось цябе паслалі «на бульбу», разам з незнаёмымі пакуль хлопцамі і сямнаццацігадовымі дзяўчаткамі…

Якая нуда, калі вакол такая прыгажосць — азёрная Віцебшчына, са сваімі вёскамі, дзе хаты не адгароджваюцца ад вуліцы платамі; са сваёй асаблівай гаворкай — гэтымі «мальцамі» замест «хлопцаў» ды «прыехаўшы» замест «прыехаў»; са сваімі выспачкамі барвоважоўтых пяшчотных бяроз і асін проста пасярод бульбяных палеткаў; са сваім дрымучым яловым лесам, у якім, аднак, пад цёмнымі шатамі растуць белыя грыбы; са сваім дымком ад вогнішча, дзе ў прысаку пячэцца самы смачны ў свеце ласунак — бульба; са сваім (а цяпер на месяц і нашым) трактарыстам Фрэдзькам, мясцовым мудрацом, які ведаў толк у народных прыкметах і часта, пазіраючы ў неба, упэўнена заяўляў:

— А не, сёння дажджу ня будзіць! — і заўсёды амаль разам з гэтымі словамі пачынаў накропваць дождж, які затым паступова пераходзіў у аблажны, на суткі-двое.

Не — нудным назваць той верасень ніяк нельга. Але тое, што быў ён дажджлівы і халодны — факт.

Вячэралі і снедалі мы «самапасам» — што Бог пашле ці што гаспадары, у якіх мы кватаравалі, адшкадуюць. Абедалі на калгасным мехдвары пад навесам за доўгім, знарок для нас збітым з новенькіх дошак, сталом.

У будынку майстэрняў, або ў «ангары», як звалі яго механізатары, там, дзе ў бетоннай падлозе спецыяльная яма для рамонту тэхнікі, паўз сцяну было восем умывальнікаў, з халоднай, канечне, вадою. Можна ўявіць, якімі мы вярталіся з поля: адубелыя, злыя, мокрыя, а галоўнае — брудныя. Закарэлыя ад ліпкай, як гліна, зямлі рукі з чорнымі «манікюрамі» пазногцяў ажно свярбелі, такія паспрабуй адмый, каб можна было ўзяцца пасля за лыжку, за хлеб. А тут на ўсіх, чалавек трыццаць, не лічачы механізатараў, адзін разлезлы абмылачак, які, калі і дачакаешся яго, не столькі знішчае гразь, колькі, здаецца, яшчэ больш уцірае яе ў скуру. Непрыемна! Я падумаў, што вось мне харошы шанс вылучыцца сярод сваіх (абавязкова ж заўтра нехта спытае: чыіх рук работа? — а хтосьці абавязкова адкажа), а заадно прысароміць мясцовых, паказаць ім, што хоць бы дзеля нас, гасцей, маглі б парупіцца аб такой неабходнай рэчы гігіены.

Увечары я купіў у мясцовай краме восем кавалкаў мыла, самага таннага, «Туалетнага», па чатырнаццаць капеек за штуку, паразгортваў і паклаў каля кожнага ўмывальніка, і падалося, што змрочны «ангар» нібыта крышку пасвятлеў, неяк больш утульна, пачалавечы там стала.

У абед наступнага дня ніводнага кавалка на месцы не аказалася. Гм...

Ёсць у мяне адна ці то добрая, ці то дрэнная рыса — упартасць. Вечарам, да немалога здзіўлення прадаўшчыцы, я набыў чарговыя восем кавалкаў. І на наступную раніцу, перад тым, як ісці на поле, забег у майстэрні і зноў параскладаў іх акуратна...

І зноў у абед не было ніводнага кавалка.

Гэта ўжо насцярожыла. Хто з механізатараў настолькі бедны? Ці гэта — свядомая акцыя? Але — навошта? Каб не лез са сваім статутам у чужы «ангар»? Хай так і застаецца адзін на ўсіх абмылак? Мы ж не мыемся — мы табе памыемся?..

Не! У людзей, у кожнага, ёсць элементраны сорам, і ён павінен абудзіцца рана ці позна.

Я пачаў купляць мыла рэгулярна, гэтак жа рэгулярна яно пачало знікаць. Быў момант, калі ў мяне на поўным сур'ёзе ўзнікла дурная думка — прыносіць яго, гэтае мыла, толькі ў абед, а на ноч забіраць. Вось даставіў бы ім (чамусьці ўяўлялася, што «іх» многа) радасці!

Недзе праз тыдзень я падлічыў фінансы і задумаўся. З такімі тэмпамі да канца «бульбы» мне хопіць на адно толькі мыла. А цыгарэты? А хлопцам, з якім разам харчуюся, што даваць у складчыну? Можа, напісаць маці, папрасіць, каб прыслала грошы пераводам? Тлумачачы тым, што трэба восем кавалкаў мыла ў дзень? Глупства... Аднак жа і не здавацца, не складваць лапкі. Думай, галава, шапку куплю!

І галава надумала: чатыры кавалкі, аказваецца, лёгка падзяліць напал. Абломкам старой касы я пачаў разразаць сваё «Туалетнае» — не разгорнутым, канечне, — і класці, як скупы армейскі старшына, каля ўмывальнікаў палавінкі.

Той самы вынік. Мыла знікала, нібы якаясь дурная карова злізвала яго сваім дурным языком. І тое ж пытанне — навошта?! Каму трэба, каб было горш? Я ж не клаў атруту, ад якой магла б пайсці на руках кароста, — наадварот... Што гэта? Звычайнае вясковае дзікунства? Як у тым выпадку з ракамі? Калі адзін мясцовы (прытыраны!) хімзаводзік зліў у сажалку ядавітыя адходы, і ў ёй передохла ўсё жывое — акрамя ракаў; яны выкарабкаліся на бераг і пайшлі да суседняга чыстага возерка. Паўзлі — у спёку, чапляючыся клешнямі за сухую траву, нязграбныя, калючыя, шапацелі, грэбліся... На бяду, іхні маршрут перасёкся з вясковай вуліцай. Угледзеўшы працэсію, павыбягалі стары і малы, дужы і слабы, хворы і здаровы, лупілі дручкамі, чавілі нагамі, хвасталі дубцамі — і не супакоіліся, пакуль не знішчылі «ворагаў» усіх да аднаго.

Навошта, спытаеце, іх было чапаць, калі не есці?

А мыла нашто забіраць?

Пайшоў трэці тыдзень. Я ўжо чацвертаваў свае кавалкі — апошняя крайнасць, далей не было куды. Прадаўшчыца ў краме прывыкла да мяне і, пабачыўшы, не пытаючыся, звыкла апускала руку ў скрынку з мылам. Не ведаю, што яна пра мяне думала.

Пачаўшыся амаль як жарт, як бязвіннае спаборніцтва: хто каго? — мыльная гісторыя паступова зрабілася для мяне ідэяй фікс — навязлівай ідэяй, перайшла ў зацятае змаганне, калі не ў вайну — вайну здаровага сэнсу і этыкі з тупасцю і цемрашальствам. Прычым усё часцей пачынала мне здавацца, што ў вайне гэтай з супрацьлеглага боку дзейнічаюць не жывыя людзі з рукамі, нагамі і галовамі, а яка-

ясь няўлоўна-нябачная, злая сіла, моц якой у тым, што намераў яе не было ніякай магчымасці разгадаць.

На дваццаць пяты дзень я здаўся. Узнікла была, праўда, думка дзяліць яшчэ і чацвертаваныя кавалачкі, але тое было б нашмат горш, чым годна прызнаць сваё паражэнне і ў думках пацiснуць працаўніку яго нямытую руку.

Але гэта не канец. Той эпізод стаўся толькі прэлюдыяй да маёй будучай жыццёвай «мыльнай оперы».

Аднойчы ўлетку на канікулах, у роднай вёсцы, надумаўся я зрабіць цераз нашу вузенькую рэчку масток, хоць бы з чатырох кладак, бо ляжала там усяго адно бервяно, круглае, вечна слізкае, нязручнае, небяспечнае. Я насёк у лесе жэрдачак, абчасаў, паклаў, зрабіў парэнчы, палюбаваўся на сваю работу, пакурыў, папляваў у ваду і пайшоў задаволены. Назаўтра ўсё было пабурана, зламаныя парэнчы плавалі ў вадзе, жэрдак не было і следу. А ляжала на іх месцы тая ж слізкая калодзіна. Чатыры дні я ўпарта «наводзіў» свой масток (паміж культураю і дзікасцю), і кожная спроба заканчвалася няўдачай.

У Магілёве — зноў-такі ў студэнцкія гады, на практыцы, быў у нас у інтэрнаце вахцёр, ніякі не адстаўны вайсковец, як многія з вас, напэўна, падумалі, — звычайны мужчынка, інтэлігентнага выгляду, прыстойна апрануты, з акулярамі на носе і са свежай газетаю ў руцэ; дык вось — ён ніколі не вітаўся. На працягу месяца ў кожную яго змену я гучна жадаў яму «добрай раніцы!», а ў абед — «добрага дня!». Нуль на масу. Ні слова ў адказ.

Бог ты мой! — толькі цяпер цюкнула ў галаву: дык а наша пісьменніцкая праца хіба гэта не тое ж «мыла»?! Адсюль «мыльныя оперы», серыялы, «мыльныя эпапеі» і г. д. «Мылам» называюць літаратурную цягамоціну... I як тут не згадаць бессмяротнага Лёвіна з «Ганны Карэнінай», які, «разглядаючы і разгортваючы духмяны кавалак мыла, прамовіў: — Гэта ж твор мастацтва!»

Хіба мы, майстры пяра, не займаемся тым усё жыццё, як толькі «наразаем» раманы, п’есы, аповесці, навелы і кладзем іх для агульнага карыстання, паняцця не маючы, хто іх забірае, якая з іх каму карысць, у якую прорву яны знікаюць?..

Сізіф ускачвае на гару камень, той затрымліваецца на імгненне — і па-а-акаціўся! Сізіф выцірае з ілба пот, спаўзае на «пятай кропцы» ўніз — і ўсё па-новаму...

*2007 г.*

# ЗМЕСТ

**МЯЖА. Раман-эсэ** . . . 3
**Частка першая** . . . 4
1. «Хвабула» . . . 4
2. Сорак пяць . . . 4
2 (а). Круці не круці, а трэба . . . 6
3. Пахілае дрэва . . . 7
4. Смерці няма? . . . 8
5. Хлеб . . . 9
6. Стрыечны брат . . . 10
7. Вольнаму — воля, уратаваным — рай . . . 11
8. Кнігі . . . 12
9. Слівы . . . 13
10. «Адзін летні дзень» . . . 13
11. «Таварыства цвярозасці» . . . 24
12. «Адзін зімовы дзень» . . . 24
13. Настаўнік . . . 35
14. «Міхаіл Іванавіч» . . . 36
15. Здзірай з «Вожыка» . . . 41
16. Палітэх . . . 41
17. «Сачыненне» . . . 43
18. «Рэцэнзія-водгук» . . . 51
19. Тупы . . . 52
20. Лагун і Алёшкіна . . . 52
21. Пераблыталі . . . 53
22. Іна . . . 53
23. Навушнікі . . . 54
24. Рэктар . . . 55
25. Камандзір морга . . . 55
26. Сіні канверт . . . 55
27. Эпілог першай часткі . . . 57
**Частка другая** . . . 58
1. Трыццаць дзве літары . . . 58
2. Мікашы . . . 58
3. «У выхадныя дні» . . . 59
4. Люда . . . 65
5. Пяцьдзясят грамаў для паху . . . 66
6. Юля . . . 66
7. Міша . . . 67
8. Армія . . . 68
9. Хахлы . . . 70
10. Капсула . . . 72
11. Песні і пісьмы . . . 72
12. «Іслач» . . . 74
13. «Пісьмо» . . . 75
14. Прамое дзеянне . . . 82
15. «Вясковы сшытак» . . . 83
16. Крама . . . 88
17. Вёска . . . 89
18. Субяседаванне . . . 90
19. Мінск . . . 91
20. Вечарына . . . 91
21. «Заява» . . . 92
22. Буклет і рэкорд . . . 97
23. «Гарадскі сшытак» . . . 97

24. «Трыолет» . . . 99
25. Адступленне . . . 100
26. Эпілог другой часткі . . . 101
**Частка трэцяя** . . . 102
1. Пашэнціла . . . 102
2. Не пашэнціла . . . 104
3. ? . . . 105
4. Грошы . . . 106
5. Чытачы . . . 107
6. «Труцень» . . . 109
7. «Хорошэ» . . . 112
8. Слава . . . 113
9. Спачуванне . . . 114
10. «Я на гару, а чорт за нагу» . . . 115
11. «Сіндром» . . . 116
12. Гарантыйны ліст . . . 118
13. Папярэдняе размеркаванне . . . 119
14. Булгакаўшчына (Васілю Гігевічу) . . . 120
15. СП . . . 122
16. Дзённікі . . . 123
17. Душ . . . 123
18. Смірнова . . . 124
19. Ліліт . . . 124
20. Наташа . . . 125
21. Аксана . . . 125
21(а). Дыялог . . . 126
22. Псіхааналіз . . . 126
23. Тэорыя Фрэйда . . . 127
24. Тэорыя Паўлава . . . 128
25. Тэорыя Зошчанкі . . . 128
26. «Хворыя прадметы» . . . 130
27. Фантазіі на тэму . . . 133
28. Абвяржэнне . . . 135
29. «Банальнае дарожнае знаёмства» . . . 136
30. Сыход . . . 138
31. Прымакі і жарцікі . . . 139
32. Апошні сыход (Смерць маці) . . . 141
33. Ружовыя акуляры . . . 142
34. Кантрасныя межы, або «У люстэрка паглядзі» . . . 142
35. Эпілог трэцяй часткі . . . 143

**АПАВЯДАННІ** . . . 145
Галя . . . 146
Аднакласнік . . . 163
Сыч . . . 168
Пáмарак . . . 175
Сакрэт . . . 183
Чарнавікі і пісьмы . . . 192
Графіці . . . 201
Пошласць . . . 204
Бунін-Марцінкевіч . . . 209
Лёд . . . 222
«Куда идти в лесу?» . . . 235
Вецер . . . 242
Уночы . . . 246
Мыла . . . 258

Літаратурна-мастацкае выданне

*Лімаўскі фальварак*

**ФЕДАРЭНКА** Андрэй Міхайлавіч

**МЯЖА**

Раман-эсэ, апавяданні

Рэдактар *М. А. Макрэцкая*
Мастак *В. Г. Паўлавец*
Камп'ютарная вёрстка *А. А. Губар*
Стыльрэдактар *В. А. Аляксеева*

Падпісана ў друк 14.02.2011.Фармат 60×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 16,50. Ул.-выд. арк. 16,52. Тыраж 1800 экз. Заказ 640.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня "Перамога"».
ЛП 02330/0494182 ад 03.04.2009.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.



Андрэй Федарэнка нарадзіўся 17 студзеня 1964 года ў вёсцы Бярозаўка Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Мазырскі палітэхнікум у 1983 годзе, бібліятэчна-бібліяграфічны факультэт Мінскага інстытута культуры ў 1990 годзе. Працаваў мулярам, транспартным рабочым, служыў у арміі. З 1990 года працаваў загадчыкам аддзела навукі, культуры, грамадскага жыцця і публіцыстыкі часопіса «Полымя», цяпер — рэдактар аддзела прозы часопіса «Маладосць». Аўтар кніг прозы «Гісторыя хваробы», «Смута», «Шчарбаты талер», «Афганская шкатулка», «Нічые». Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа (1994).

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2011

ISBN 978-985-6994-07-7

Андрэй ФЕДАРЭНКА

# МЯЖА

ЛІМАЎСКІ ФАЛЬВАРАК